Андрэй Каляда

Сцэнічная мова

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў у якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў спецыяльнасці 1-17-01-01 «Акцёрскае мастацтва»

Мінск
«Беллітфонд»
2006

УДК 8.085.4 [075.8]
ББК 83.7я73 К 17

Рэцэнзенты: А. В. Сабалеўскі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, Р. І. Баравік, кандидат мастацтвазнаўства, дацэнт

МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў выказваюць падзяку спадарыні Ірэне Калядзе-Смірновай, старшыні Дабрачыннага фонду «Ethnic voice of America» (Парма, ЗША) за чынную дапамогу ў выданні кнігі.

ISBN 985-6819-13-X

© Каляда А. А., 2006

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА
ўсім, у каго я вучыўся;
усім, хто ў мяне вучыўся.

ПРАДМОВА

Ва ўсе часы свайго існавання Тэатру патрэбны былі артысты розных амплуа, якія б дасканала валодалі ўнутранай і знешняй тэхнікай, г. зн. тэхнікай перажывання і ўвасаблення. Якога б амплуа ні быў артыст, ён павінен бездакорна валодаць асновамі сцэнічнага дзеяння — без гэтага немагчымы творчы працэс, немагчыма стварыць ні асобны мастацкі вобраз, ні спектакль у цэлым.

На працягу больш чым шасцідзесяці гадоў Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў (у 1945 — Беларускі дзяржаўны тэатральны інстытут) з'яўляецца кузняй акцёрскіх кадраў, найперш для драматычных тэатраў краіны. І ва ўсе часы вучэбная дысцыпліна «Сцэнічная мова», што з'яўляецца асноваваызначальнай у прафесійнай падрыхтоўцы (сістэме выхавання) творчай (тэатральнай) моладзі, была цесна звязана з іншымі прафілюючымі дысцыплінамі тэатральнага факультэта на спецыялізацыі «Акцёрскае мастацтва драматычнага тэатра і кіно»: майстэрства акцёра, сцэнічны рух, вакал, сцэнічны танец...

Творчае жыццё, шматгадовы педагагічны вопыт аўтара дапаможніка і яго калег па кафедры «Сцэнічная мова і вакал» пераканальна сведчаць, што вучыцца на артыста могуць толькі тыя маладыя людзі, у якіх ёсць пэўныя творчыя задаткі, закладзеныя прыродай. Пад прыроднымі задаткамі (знешнімі і ўнутранымі) мы разумеем: фактуру (своеасаблівасць і адметнасць знешнасці: твар, вочы, рост, фігура, прывабнасць, абаяльнасць); галасавыя і дыкцыйныя магчымасці; тэмперамент (псіхічная ўзбудлівасць, акцёрская заразлівасць, эмацыянальнасць, прыцягальнасць); здольнасць вобразна і лагічна мысліць, імправізаваць; вера ў мастацкі вымысел... Ужо на кансультацыях і, вядома ж, на уступных экзаменах (менавіта «сцэнічная мова» — першы творчы іспыт) выкладчыкі сцэнічнай мовы звяртаюць увагу, спрабуюць выявіць і такія ўласцівасці (якасці) абітурыентаў, якія неабходны для паспяховага авалодання асновамі акцёрскай прафесіі: фізічнае развіццё; наяўнасць музычнага слыху і пачуцця рытму; каардынацыя і пластычнасць цела; працаздольнасць і вынослівасць...

Яшчэ ў далёкім 40-м годзе XX ст. У. Неміровіч-Данчанка — адзін са стваральнікаў Маскоўскага мастацкага тэатра — пісаў невядомаму

адрасату: «Я хотел Вам написать по поводу страстного желания Вашей дочери идти на сцену... Эта сторона не должна пугать Вас. Достаточно, если она поймёт, какая фальшь, какое гримасничество и в жизни у людей, всегда что-то играющих. И второе — что и на сцене это не хорошо, и что первые уроки школы заключаются в том, чтобы **научиться пойти на подмостки** (выдзелена мною. — А. К), ничего не играя.

Пугать Вас может другое: есть ли у Вашей дочери дар для сцены? А узнать это нелегко. Но, во всяком случае, первые признаки определить не так уж трудно: внешние данные. Это не значит — красивое лицо. Главнейшее — голос, достаточно ли крепок и привлекателен. Дикция — чистота речи (акцент может потом исправиться). Выразительность лица, естественная, искренняя. Фигура.

Если данные внешние хорошие, чувствуется темперамент, заразительность (драматическая или комическая) и есть большое стремление, то полезная актриса всегда может выработаться...» (13, 505)[1].

Абсалютная болыпасць студэнтаў першага курса творчых (тэатральных) вышэйшых навучальных устаноў — выпускнікі агульнаадукацыйных школ, 17-18-гадовыя дзяўчаты і юнакі. Як правіла, аб прафесіі артыста яны маюць толькі агульнае ўяўленне. Да таго ж мала хто з іх ведае, што такое творчая праца, таму выкладчыкам спецдысцыплін даводзіцца шукаць такія шляхі, метады і прыёмы выхаваныя будучых артыстаў, якія б дапамаглі як найхутчэй разварушыць, растрывожыць творчую (мастакоўскую) прыроду кожнага студэнта, выклікалі б у яго жаданне еучыцца на Артыста. Выкладчыкам спецдысцыплін неабходна сфарміраваць у студэнтаў канкрэтнае разумение своеасаблівасці прафесіі акцёра (артыста), які мусіць быць духоўна багатым, шырока адукаваным, фізічна развітым, душэўна чуйным чалавекам. Акрамя гэтага, студэнтам трэба выпрацаваць і шматлікія прафесійныя ўменні, навыкі, без якіх немагчыма стаць Артыстам, немагчыма стаць майстрам драматычнага мастацтва.

Асновавызначальная метадалагічная база вучэбнай дысцыпліны (курса) «Сцэнічная мова» — сістэма К. Станіслаўскага, якая «распадается на две главные части: 1) внутренняя и внешняя работа артиста над собой; 2) внутренняя и внешняя работа над ролью.

Внутренняя работа над собой заключается в выработке психической техники, позволяющей артисту вызывать в себе творческое самочувствие, при котором на него легче всего сходит вдохновение.

---

[1] Лічбы ў дужках абазначаюць: першая — парадкавы нумар выдання ў спісе бібліяграфічных спасылак, другая — старонку, на якой змешчана цытата.

Внешняя работа над собой заключается в приготовлении телесного аппарата к воплощению роли и точной передачи её внутренней жизни.

Работа над ролью заключается в изучении духовной сущности драматического произведения, того зерна, из которого оно создалось и которое определяет его смысл, как и смысл каждой из составляющих его ролей» (1, 498).

К. Станіслаўскі меў на мэце гармашчнае развіццё творчай прыроды будучага артыста драматычнага тэатра і не дапускаў ніякай нівеліроўкі акцёрскай індывідуальнасці. Беларуская тэатральная школа прытрымліваецца індывідуальнага падыходу ў выхаванні будучых артыстаў драмтэатра і кіно, ідучы па шляху рэалізацыі фізічнага і псіхічнага патэнцыялу кожнага студэнта, удасканальваючы сродкі і метады, якія спрыяюць аптымізацыі яго стану ў складаных, а часам і экстрэмальных умовах творчай дзейнасці. Адным з такіх сродкаў можна лічыць фізічны трэнінг, а таксама псіхічную рэгуляцыю, якая выкарыстоўваецца ў час псіхалагічнай настройкі на творчы працэс. Пры выбары сродкаў рэгуляцыі, на аснове фізічна-псіхічных элементаў, абавязкова ўлічваюцца індывідуальныя асаблівасці тэмпераменту кожнага студэнта, іх асобасныя ўласцівасці, псіхічныя якасці і ўменні кіраваць сваім акцёрскім апаратам.

Паколькі слова ў драматычным тэатры з'яўляецца першакрыніцай акцёрскіх задач і адначасова творчым «матэрыялам» пры стварэнні сцэнічных характараў, вобразаў і спектакля ў цэлым, то на занятках па сцэнічнай мове, пачынаючы з другога курса, шмат увагі і часу ўдзяляецца распрацоўцы сцэнічнага расповяду мастацкіх тэкстаў (5-7 хвілін), выхоўзаюцца паважлівыя адносіны да аўтарскага слова, выпрацоўваецца ўменне ўвасабляць напісапае (друкаванае) слова ў вуснае (сцэнічнае). Да таго ж, ад самага пачатку навучання неабходна выбіраць такія мастацкія тэксты, якія б дапамагалі выявіць і раскрыць творчую своеасаблівасць і адметнасць будучых артыстаў.

За два гады заняткаў сцэнічнай мовай студэнты размінаюць, рыхтуюць свой псіхафізічны апарат да акцёрскай працы. Хоць далека не заўсёды і не з усімі курсамі (шмат залежыць ад «якасці» набору) удаецца дасягнуць стопрацэнтных станоўчых вынікаў у справе авалодання студэнтамі псіхатэхнікай прафесіі, але практика нашай акадэміі сведчыць, што пераважная большасць з іх спраўляецца з гэтай задачай (выконваюць, засвойваюць праграму навучання). Пачынаючы з пятага семестра, а з асобнымі (найбольш здольнымі і працавітымі) і з чацвёртага, мэтазгодна пераходзіць да больш «абёмнай», складанай і творчай працы як над асобнымі апавяданнямі,

вершамі, байкамі, урыўкамі з паэм, аповесцяў і раманаў (7-10-12 хвілін), так і над літаратурнымі (празаічнымі, вершаванымі, празаічна-вершаванымі) кампазіцыямі.

Паколькі на трэцім годзе навучання ў акадэміі на занятках майстэрствам акцёра студэнты ўжо прыглядваюцца, падступаюцца да дыпломных спектакляў (пастановак), то і на занятках сцэнічнай мовай мэтазгодна выходзіць на акцёрскі ход (рашэнне) працы над мастацкім (літаратурным) творам. што, безумоўна, не толькі паспрыяе трэніроўцы, развіццю і замацаванню шмат якіх элементаў акцёрскай псіхатэхнікі, але і прымусіць будучых артыстаў дзейпічаць словам ва ўмовах сцэнічнага «пераўтварэння мёртвых літар у жывыя словы» (К. Станіслаўскі), яны набудуць практычны (прафесійны) вопыт не толькі распавядаць пра літаратурных герояў, іх характары, жыццёвыя справы і ўчынкі, а і «дзейнічаць, перажываць за іх» (К. Станіслаўскі) — уздзейнічаць сваім (сцэнічным) жывым словам на слухачоў-гледачоў.

У 5-8-м семестрах (праца над дыпломнымі спектаклямі) выкладчык сцэнічнай мовы абавязаны разам з рэжысёрам-пастаноўшчыкам актыўна ўдзельнічаць у працы студэнтаў над словам у ролях, г.зн. дапамагаць маладым артистам (гэта ж іх пачатак акцёрскага жыцця, першыя спробы!) пераўтвараць мсртвыя літары п'есы ў жывыя сцэнічныя вобразы.

Такім чынам, за чатыры гады навучання (прафесійнай падрыхтоўкі) на тэатральным факультэце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў будучым артыстам неабходна:

— выпрацаваць уменні і навыкі валодання асноўнымі тэхнічнымі сродкамі выразнасці мастацтва сцэнічнай мовы (натрэніраваць камбінаваны тып дыхання, развіць моўны і, па магчымасці, вакальны голас, удасканаліць дыкцыю, пластыку і міміку, засвоіць нормы беларускага і рускага літаратурнага вымаўлення);

— навучыцца мысліць услых, г.зн. публічна, вобразна і лагічна, эмацыянальна і пераканальна выказваць сваё разумение і адносіны да тых з'яў, падзей, фактаў, учынкаў людзей, сведкамі або ўдзельнікамі якіх яны былі ці пра якія прачыталі ў мастацкім творы;

— на матэрыяле разнастайных па жанрах і стылях мастацкіх твораў навучыцца ўвасабляць у жывым сцэнічным слове найцікавейшыя, найбагацейшыя думкі, сапраўдныя эмоцыі, пачуцці і страсці;

— авалодаць асновамі арганічнага і мэтазгоднага слоўнага дзеяння ва ўмовах сцэнічнага маналогу, дыялогу і палілогу;

— выхаваць у сабе духоўную патрэбу творчай ініцыятывы і самаўдасканалення.

Структуру дапаможніка «Сцэнічная мова» складаюць два асновавызначальныя раздзелы гэтай прафілюючай (на спецыялізацыі «Акцёрскае мастацтва драмтэатра і кіно») вучэбнай дысцыпліны:

1.«Настройка акцёрскага інструмента» (К. Станіслаўскі): псіхафізічны трэнінг будучага артыста; нараджэнне слова (ад псіхафізічнага дзеяння да слоўнага).

2. «Сцэнічны расповяд аўтарскага тэксту» (пазнанне, пражыванне, увасабленне, уздзеянне).

К. Станіслаўскі быў перакананы, што «все искусства имеют основы... В Европе уже гибнут основы... я знаю лишь одно средство, чтобы бороться с этим гибельным для театра положением: это изложить в стройной системе всё то, что добыто моими долгими исканиями, и дать таким образом в руки стремящихся на сцену актёров руководство, целый ряд упражнений, которые практически показывали бы им, как путём работы над самим собой и над материалом роли актёр может создавать условия, благоприятные для подлинного сценического вдохновения, и тем самым вызвать его в моменты, необходимые для его искусства» (1, 606).

ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

Задачы:

— распрацаваць сродкі псіхафізічнай выразнасці сцэнічнай мовы: дыханне, голас, дыкцыю, пластычную і арфаэпічную культуру, лагічнасць, вобразнасць, эмацыянальнасць;

— пазнаёміцца з працэсам «нараджэння» вуснага жывога слова (ад псіхафізічнага дзсяння да слоўнага).

К. Станіслаўскі:

— Артисту, точно грудному ребенку, приходится всему учиться с самого начала: смотреть, ходить, говорить и так далее. Все это мы умеем делать в жизни. Но беда в том, что в подавляющем большинстве мы это делаем плохо, не так, как установлено природой. На сцене надо смотреть, ходить, говорить иначе — лучше, нормальнее, чем в жизни, ближе к природе: вопервых, потому, что недостатки, вынесенные на свет рампы, становятся особенно заметными, вовторых, потому, что эти недостатки влияют на общее состояние актёра на сцене (2, 191).

— Прежде чем начать творить, надо привести в порядок мышцы, чтобы они не сковывали свободы действий... Мускульное напряжение мешает внутренней работе и тем более переживанию. Пока существует физическое напряжение, не может быть речи о правильном, тонком чувствовании и о нормальной жизни роли (2, 186).

— Мало зажить искренним чувством, надо уметь его выявить, воплотить. Для этого должен быть подготовлен и развит весь психофизический аппарат. Под физическим аппаратом мы подразумеваем хорошо поставленный голос, хорошо развитую интонацию, фразу, гибкое тело, выразительные движения, мимику (3, 423).

— Внутри человека живут и работают воля, ум, чувство, воображение, подсознание, а тело, как самый чуткий барометр, отражает их творчество. Для этого все мельчайшие мышцы должны быть развиты, «проработаны». Надо так развить тело и движения и все то, что дает возможность выявлять переживания артиста, чтобы инстинктивно, быстро, ярко воплощалась эмоция. Первое условие для этого — не должно быть непроизвольного напряжения ни в теле, ни в голосе (3, 423).

— Чтобы отражать тончайшую и часто подсознательную жизнь, необходимо обладать исключительно отзывчивым и превосходно разработанным голосовым и телесным аппаратом. Голос и тело должны с огромной чуткостью и непосредственностью, мгновенно и точно передавать тончайшие, почти неуловимые чувствования. Вот

почему артист нашего толка должен гораздо больше, чем в других направлениях искусства, позаботиться не только о внутреннем аппарате, создающем процесс переживания, но и о внешнем, телесном аппарате, верно передающем результаты творческой работы чувства, — его внешнюю форму воплощения (2, 64).

— Работа по культуре тела, голоса, речи и прочее особенно важна в нашем искусстве, в котором телесному аппарату воплощения предназначена исключительно сложная роль передачи тончайшей подсознательной жизни человеческого духа, изображаемого артистом образа (3, 453).

— Каждый человек, взойдя на подмостки, должен переучиваться всему сначала: смотреть, ходить, действовать, общаться и, наконец, говорить. Огромное большинство людей плохо, вульгарно пользуются речью в самой жизни, но не замечают этого, так как привыкли к себе и своим недостаткам. Артист должен знать свой язык в совершенстве... К чему тонкости переживания, если их на сцене будет выражать плохая речь? (3, 76-77).

— Мы не только на сцене, но и в жизни говорим пошло и безграмотно; наша житейская тривиальная простота речи недопустима на сцене; уметь просто и красиво говорить — целая наука, у которой должны быть свои законы (1, 452).

— В работе превращения трудного в привычное, лёгкое, красивое надо усиленно и беспрерывно помогать ученикам с самого начала их вступления в школу, для того чтоб успеть за время пребывания в ней выработать необходимые навыки, довести их до степени автоматичности, превращающейся постепенно во вторую натуру (3, 456).

— Основная задача психотехники: подвести актёра к такому самочувствию, при котором в артисте зарождается подсознательный творческий процесс самой органической природы. Через сознательную психотехнику создать подсознательное творчество артиста (2, 437).

— Любая техника мертва без затраты живой души артиста (2, 37).

НАСТРОЙКА АКЦЁРСКАГА ІНСТРУМЕНТА

Псіхафізічны трэнінг будучага артыста

Комплексны псіхафізічны трэнінг мае на мэце: развіць у студэнтаў фізічныя і пачуццёвыя пачаткі, ад якаснага ўзроўню якіх у значнай ступені залежыць іх здольнасць і ўменнс рэагаваць, успрымаць, асэнсоўваць, перажываць і выконваць самыя разнастайныя (простыя і складаныя) творчыя заданні педагога, рэжысёра-пастаноўшчыка;

развіваць здольнасць выклікаць у патрэбны момант станоўчыя і адмоўныя эмоцыі, канцэнтраваць увагу, псіхалагічна настройвацца на ўнутраную і фізічную працу; уключаць уяўленне (фантазію); выклікаць веру ў мастацкі вымысел і жаданне слоўпага дзеяння. У псіхафізічны трэнінг уключаны практыкаванні як чыста фізічныя і маторныя, так і набліжаныя па форме і зместу да сцэнічных эцюдаў, у якіх акрамя фізічных дзеянняў выконваюцца і канкрэтныя творчыя задачы. Комплексны псіхафізічны трэнінг паспрыяе студэнтам у авалоданні тэхнікай акцёрскай прафесіі і псіхатэхнікай творчага працэсу — нязмушанага і арганічнага існавання ў прапануемых абставінах, дзе «слово является самым конкретным выразителем человеческой мысли» (К. Станіслаўскі).

Псіхафізічная рэлаксацыя і актывізацыя

(развіццё і ўдасканаленне мышачнай сістэмы, пластычная выразнасць паставы, паходкі, позы, жэстаў, мімікі, пантамімікі; тэмперамент, фантазія, вера ў прапануемыя сцэнічныя абставіны).

Адной з перадумоў арганічнага пластычнага і слоўнага дзеяння на сцэне з'яўляецца мышачная свабода артыста, яго гарманічнае фізічнае развіццё. Таму з першых заняткаў студэнтам прапануюцца практыкаванні, накіраваныя як на фізічнае іх развіццё (эластычнасць, вынослівасць, павелічэнне масы ўсіх мышцаў), так і на развіццё неабходных псіхічных уласцівасцяў (узбудлівасць, рашучасць, настойлівасць, мэтанакіраванасць, «выбуховасць» і інш.). Выкладчык павінен зарыентаваць студэнтаў не толькі на дакладнае выкананне прапанаваных практыкаванняў псіхафізічнага трэнінгу, але і на выхаванне ў сабе здольнасці да самастойнай творчасці, да выяўлення ўласнай акцёрскай індывідуальнасці, свайго разумення, бачання і, галоўнае, увасаблення рэжысёрска-педагагічных задач. Як вядома, навучыць прафесіі нават творча адораных людзей бывае вельмі цяжка, таму выкладчык сцэнічнай мовы старасцца разварушыць, выклікаць да актыўнай творчасці прыродныя задаткі будучых артыстаў, накіроўвае, падказвае ім шляхі навучання-спасціжэння і авалодання асновамі прафесійнага майстэрства. А для гэтага неабходна ўключэнне на кожных занятках, у час трэнінгу як нервовай (псіхічнай), так і ўсёй мышачнай сістэмы студэнта, бо фізічнае дзеянне немагчыма аддзяліць ад псіхічнага стану чалавека — як у жыцці, так і на сцэне яны ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя. Выразнасць і пераканальнасць сцэнічнага жыцця артыстаў у прапануемых абставінах п'есы шмат у чым залежыць і ад таго, як выканаўцы роляў

рухаюцца, як стаяць, як гавораць, г.зн. жывуць у вобразах сваіх герояў.

Паколькі большасць сучасных маладых людзей, якія паступаюць на тэатральны факультэт, маюць зусім няправільнае ўяўленне пра эстэтыку знешніх паводзін людзей, не ведаюць, што прыгожа і што непрыгожа (неэстэтычна) у іх пластыцы і вуснай мове, то на занятках выкладчыку неабходна расказаць аб правілах паводзін «на людзях», патлумачыць і паказаць разнастайныя фізічныя дзеянні, якія чалавек выконвае штодзённа, прааналізаваць пластыку кожнага студэнта, каб пазней перайсці да вывучэння і засваення імі на занятках па сцэнічным руху і сцэнічнай мове спецыяльных фізічных і слоўных дзеянняў, таму што кожны спектакль — гэта творчае адлюстраванне пэўнага (магчымага) рэальнага жыцця.

Так, да прыкладу, у жыцці ніхто і, напэўна ж, ніколі не задумваецца над тым, як выканаць звычайныя бытавыя дзеянні: сесці, устаць, прайсціся па пакоі, спыніцца ля акна, пераставіць крэслы, узяць шклянку з гарбатай і да т. п. Усе гэтыя простыя дзеянні выконваюцца без асаблівых валявых (псіхічных) і фізічных намаганняў, бо яны засвойваюцца чалавекам у вышку штодзённай практыкі. Праўда, робяць гэта розныя людзі вельмі па-рознаму: адны — прыгожа і бясшумна, другія — неэстэтычна і развязна, трэція — няўважна і нядбайна, чацвёртыя... Тое самае адбываецца і са студэнтамі, калі ім прапануецца выканаць названыя простыя дзеянні ва ўмовах «публічнай адзіноты» — на групавых занятках перад аднакурснікамі. Прычыны гэтага — нс толькі няведанне, як трэба зрабіць, але і псіхафізічны заціск, празмернае хваляванне з-за таго, што «ўсе глядзяць на цябе».

Распрацоўваючы комплекс практыкаванняў для развіцця розных навыкаў руху (пастава, паходка, позы, жэсты, міміка, пантаміміка), аўтар дапаможніка абапіраўся на багаты вопыт І.Э. Коха, набыты ім у прафесійным выхаванні акцёраў.

У. І. Даль характарызуе паставу як стройнасць, велічнасць, прыстойнасць і прыгажосць усіх рухаў цела. Добрай паставе ўласцівы наступныя прыкметы:

— пазваночнік крыху прагнуты у паяснічнай частцы цела, плечы распрастаныя, шыя прамая, ніжнебрушныя мышцы злёгку напружаныя, рукі свабодна апушчаны;

— ногі самкнуты ці трохі расстаўлены, калені прамыя, ступні злёгку развернуты ў бакі.

Калі вага цела пераносіцца на адну нагу, то яна павінна быць прамая ў калене, а другая трохі выстаўлена ўперад і аслаблена ў каленным суставе.

Правільная бытавая паходка, магчымая толькі пры правільнай паставе, патрабуе, каб пяткі ставіліся па адной лініі, а наскі злёгку разварочваліся ў бакі (гэта асабліва добра відаць пры хадзьбе па неглыбокім снезе або мокрым пяску). Крокі павінны быць роўныя, плаўныя. Такая паходка выпрацоўваецца пры актыўнай рабоце мышцаў абедзвюх ног, якія забяспечваюць рух наперад. Кожны крок суправаджаецца ўзмахамі правай і левай рукі (узмахі гэтыя не павінны быць шырокія ці высокія). К. Станіслаўскі быў перакананы, што «в основу пластики надо поставить совсем не видимое внешнее, не видимое внутреннее движение энергии. Энергия движется не только по рукам, по спинному хребту, по шее и по ногам. Она возбуждает действие ножных мускулов и вызывает походку, которая имеет чрезвычайно важное значение на сцене. Человеческие ноги — от таза и до ступней — напоминают мне хороший ход пульмановского вагона. У него благодаря множеству рессор, сгибающихся и умеряющих удары во всех направлениях, верхняя часть, где сидят пассажиры, остается почти неподвижной, даже при бешеном движении вагона и при толчках во все стороны. То же должно происходить при человеческой походке или при беге. В эти моменты верхняя часть туловища с грудной клеткой, плечами, шеей и головой должны оставаться без толчков, спокойными и совершенно свободными в своих движениях... Этому прежде всего во многом помогает спинной хребет. Его назначение — наподобие спирали изгибаться во всех направлениях при малейшем движении, для того чтобы соблюдать равновесие плеч и головы, которые, по возможности, должны оставаться спокойными и безо всяких толчков.

Роль рессор выполняют бёдра, коленки, щиколотки и все суставы пальцев ног. Их назначение — умерять толчки при ходьбе и беге, а также при раскачивании тела вперёд, назад, направо, налево, то есть, так сказать, при килевой и носовой качке.

У всех у них есть ещё другое назначение, заключающееся в продвижении вперёд тела, которое они несут. Это надо делать так, чтобы корпус плыл ровно по горизонтальной линии, без больших вертикальных опусканий и подъёмов.

Походка не должна быть ползущей, а должна быть летящей... чтоб не было ни остановки, ни замедления в поступательном движении тела» (3, 37, 39, 40, 44).

У чалавека з прыгожай паставай позы заўсёды натуральныя і эстэтычныя. Будучым артыстам варта пра гэта памятаць і сачыць за сваёй паставай. Паколькі ад таго, як артыст стаіць ці сядзіць, у значнай ступені залежыць, як ён гаворыць, то студэнтам трэба давесці, што ў позах седзячы ў мужчын ногі могуць быць самкнуты або трохі расстаўлены. Занадта шырока расстаўленыя калені робяць позу неэстэтычнай. Несамкнутыя ногі ў жанчын і дзяўчат — поза яўна адмоўная, а калі ногі расстаўлены шырока, то і вульгарная. Ступні ног могуць быць пастаўлсны побач, адна каля другой; адна нага можа быць трохі выстаўлена ўперад. Дазваляецца класці ступню на ступню (такое становішча называецца «ногі банцікам»). Пры гэтых становішчах калені могуць быць настолькі сагнутыя, што ступні будуць знаходзіцца пад крэслам або каля крэсла, ці нават трохі выстаўленыя ўперад. Расстаўленыя ў бакі стугіні — поза дрэнная, а калі яны яшчэ і павернутыя ў сярэдзіну, то ўвогуле брыдкая. Нельга наскамі ног чапляцца за ножкі крэсла. Поза «нага на нагу» дапушчальная ў сучасным касцюме, карыстацца ёю можна на адпачынку, у сяброўскай кампаніі, у тэатры, на канцэрце, нельга прымяняць у афіцыйных сітуацыях. Тое самае можна сказаць і пра позу «ногі банцікам», калі яны выцягнуты ўперад.

Пра рукі не варта клапаціцца, яны самі нязмушана прымуць становішча, найбольш зручнае ў пэўных абставінах, аднак варта адзначыць, што класці рукі пад сябе або ў кішэні штаноў, паліто, пінжака нельга. У час яды не варта абапірацца на спінку крэсла або грудной клеткай датыкацца да стала, але можна трымаць кісці рук на стале (11, 67, 68).

Увогуле позы седзячы як у афіцыйных, так і неафіцыйных выпадках вельмі разнастайныя і шмат у чым залежаць ад індывідуальных асаблівасцяў характару студэнта, яго тэмпераменту, звычак, узроўню яго агульнай культуры. Аднак будучыя артысты яшчэ ў акадэмі? павінны не толькі пазнаёміцца і карыстацца сучаснымі агульнапрынятымі правіламі паводзін у грамадскім жыцці, але і вывучыць (ведаць), якія позы седзячы лічыліся эстэтычнымі ў розныя часы нашай гісторыі ды і ў іншых народаў.

Выразныя фізічныя дзеянні рук, ног, галавы ўтвараюць жэсты, якія з'яўляюцца дадатковым інфармацыйным (семантычпым, ілюстрацыйным, эмацыянальным) сродкам у працэсе сцэнічнага дзеяння. Трэба адзначыць, што найбольш актыўна людзі жэстыкулююць рукамі. Узровень гэтай актыўнасці найчасцей вызначаецца нацыянальнай прыналежнасцю чалавска. Да прыкладу, «народы паўднёвыя —італьянцы, французы, іспанцы, каўказцы, афрыканцы, яўрэі і інш.,

ведучы гаворку ці нешта распавядаючы, вельмі шмат жэстыкулююць. Паўночныя народы — скандынавы, фіны, англасаксы, славяне, наадварот, у падобных жа абставінах вельмі стрыманыя на жэсты. Больш таго, шырокія жэсты рукамі, хутка і дробна выкананыя, лічацца ў гэтых народаў прыкметай дрэннага выхавання. Усе гэтыя асаблівасці акцсры і рэжысёры павінны вывучаць, рыхтуючы ролю (або зарансй), і ўмець імі карыстацца, ствараючы пластычныя характарыстыкі сваіх герояў» (11, 69).

Назіраючы ў жыцці за людзьмі (дарослымі ці дзецьмі), лёгка пераканацца ў тым, што ўсе яны ў час гутаркі карыстаюцца жэстамі і мімікай — выразнымі рухамі мышцаў твару як адпой з формаў праяўлення пачуццяў. Калі ж да жэстаў і мімікі арганічна далучаюцца яшчэ выразныя рухі цела — паптаміміка, то усе гэта ажыўляе вусную мову артыста, робіць яе больш экспрэсіўнай і зразумелай, а сцэнічнае дзеянне — натуральным і пераканальным. «Конечно, учить мимике нельзя, так как от этого разовьётся неестественная гримаса. Мимика получается сама собой, естественно, через интуицию от внутреннего переживания... Я только что вернулся от дяди Шустова, куда меня повел почти насильно Паша. Дело в том, что к ним приехал старый друг дяди, известный артист В..., которого, по словам племянника, мне необходимо было видеть и наблюдать. Он прав. Я познакомился сегодня с замечательным артистом, который говорит глазами, ртом, ушами, кончиком носа и пальцев, едва заметными движениями, поворотами...

Ещё поразительнее были безмолвные реплики гостя во время рассказа дяди Шустова о том, как в молодости они вдвоём с другом ухаживали за одной и той же дамой. При этом дядя смешно восхвалял свой успех и ещё смешнее демонстрировал неуспех В... Последний молчал, но в известных местах рассказа он вместо возражения только переводил глаза на своих соседей и на всех нас и точно говорил при этом: «Каков нахал! Врёт, как сивый мерин, а вы, дураки, слушаете и верите».

В один из таких моментов толстяк закрыл глаза от мнимого отчаяния и нетерпения, застыл в позе с поднятой кверху головой ч стал двигать ушами. Казалось, что он смахивается ими, точно руками, от навязчивой болтовни друга.

При других репликах расхваставшегося дяди Шустова гость коварно двинул кончиком носа сначала в правую, а потом в левую сторону. Потом он повёл одной бровью, другой, сделал что-то со лбом, пропустил улыбку по толстым губам и этими едва заметными движениями мимики красноречивее слов дискредитировал нападки.

После обеда, за кофе, дядя заставил своего друга и гостя показать молодёжи и нам его прославленный номер «Грозу», которую он изумительно изображал не только образно, но и психологично, если так можно выразиться, пользуясь для этого одной мимикой и глазами»[2] (3, 25, 27).

Славуты Марсэль Марсо перакананы, што «мим — это философия чувства, переданного движением... за каждым движением — чувство, а за ним поток молчания, движущееся молчание» (20, 227).

Нягледзячы на тое што фактура і многія сродкі выразнасці маюць даволі вялікае значэнне для акцёрскай прафесіі, усё-такі зыходнымі ці, так бы мовіць, асноватворнымі матэрыяламі для прафесійнага развіцця і станаўлення артыста з'яўляюцца фантазія і вера ў мастацкі вымысел, воля і тэмперамеит. Пранікненне ў прафесію, пазнанне і засваенне яе асноў магчымыя толькі шляхам успрыняцця, асэнсавання, засваення тэатральных ведаў і выпрацоўкі неабходных уменняў і навыкаў. У справе прафесійнай падрыхтоўкі будучых артыстаў такія творчыя пачаткі (задаткі), як фантазія (здольнасць ствараць новыя вобразы, бачанні, выклікаць да іх адпаведныя эмацыянальныя адносіны, адчуванні, перажыванні), вера ў мастацкі вымысел (здольнасць да пераўвасаблення, выключэння ўласнага «я» ў сваім героі), воля (здольнасць здзяйсняць канкрэтныя і мэтанакіраваныя дзеянні, якія вымагаюць пераадолсння фізічных цяжкасцяў і псіхалагічных перашкод), тэмперамеит (актыўнасць псіхічнага жыцця, эмацыянальная ўзбудлівасць чалавека) маюць першаснае значэнне і ролю. Акцёры драматычнага тэатра выяўляюць на сцэне не толькі сябе — уласныя думкі, уражанні аб навакольным свеце, свае адчуванні і перажыванні, але і характары людзей, вобразы якіх стварыў аўтар п'есы. Артысту даводзіцца іграць, г.зн. жыць жыццём гэтых людзей, да таго ж не толькі сваіх сучаснікаў, а і прадстаўнікоў розных народаў, розных часоў. Каб навучыцца рабіць гэта арганічна, жыццёва праўдзіва і пераканальна, студэнтам трэба шмат часу, фізічных намаганняў і псіхічнай энергіі выдаткаваць на тое, каб найлепшым чынам развіць у сабе названыя вышэй творчыя задаткі акцёрскага майстэрства.

Вялікі іспанскі мастак Ф. Гойя гаварыў, што фантазія, пазбаўленая розуму, вытварае страшыдлаў; паяднаная з ім, яна — маці мастацтва і крыніца яго цудаў. І ў драматычным мастацтве непарыўнасць працэсу мыслення і палёту акцёрска-рэжысёрскай фантазіі відавочная. Ды толькі каб мець магчымасць фантазіраваць,

---

[2] Этот «прославленный номер» использовался самим Станиславским как пример упражнения по мимике: он как бы иллюстрировал выражением лица переход от ясной солнечной погоды к пасмурной и от пасмурной к наступлению грозы, то есть передавал в мимике постепенные переходы от весёлости к гневу, от добродушия к ярости (3, 491).

трэба валодаць пэўным запасам ведаў, уяўленняў пра навакольны свет, жыццё чалавека, яго псіхіку і ўзаемаадносіны з іншымі людзьмі і яшчэ шмат пра што. Наконт ведаў і ўзроўню агульнага развіцця сённяшніх абітурыентаў гаварыць цяжка, бо ў большасці з іх ён вельмі нізкі. Сям'я і школа мала клапоцяцца аб выхаванні духоўна багатых і культурных маладых людзей. Вось і даводзіцца вышэйшай творчай навучальнай установе давучваць і давыхоўваць тых, хто вытрымаў вялікі і псіхалагічна нялёгкі конкурс па спецыяльнасці, хто стаў першакурснікам.

Значную дапамогу ў гэтай справе можа аказаць кніга, дакладней, мэтанакіраванае чытанне вершаваных і празаічных мастацкіх твораў сусветнай класічнай і сучаснай літаратуры, а таксама знаёмства з іншымі відамі мастацтваў: музыкай, жывапісам, графікай, скульптурай, манументальна-дэкаратыўным і прыкладным мастацтвамі. Далучэнне да мастацкай творчасці ў розных яе праявах, сур'ёзнае і паглыбленае вывучэнне драматычнага мастацтва — усё гэта разам дае плён і з цягам часу выклікае ў большасці студэнтаў унутраную патрэбу самастойнага духоўнага ўзбагачэння і ўдасканалення, а таксама пашырае іх кругагляд, садзейнічае развіццю творчага ўяўлсння, фантазіі.

Без развітай, багатай фантазіі студэнтам цяжка, а найчасцей яны проста бываюць няздольныя выклікаць у сабе захапленне зместам літаратурнага тэксту, а пазней і зместам ролі, паверыць у мастацкі вымысел. У такіх выпадках тэкст не становіцца «сваім», «уласным» і ў выканаўцы не можа ўзнікнуць творчае жаданне распавесці слухачам аўтарскі тэкст або ўвасобіць (напоўніць думкамі, пачуццямі, дзеяннямі) той ці іншы вобраз, створаны фантазіяй драматурга. Таму напачатку будучыя артысты вучацца выпрацоўваць уменне карыстацца магічным «калі б», прыдуманым К. Станіслаўскім для арганічнага ўваходжання ў творчы працэс пераўвасаблення. Паступовае асэнсаванне тэксту, набліжэнне і спасціжэнне, дзякуючы творчаму прыстасаванню «калі б», яго эмацыянальна-вобразнай сутнасці, перапляценне, узасмапранікненне акцёрскай фантазіі ў рэаліі аўтарскага змссту твора выклікаюць у студэнта веру ў мастацкі вымысел, у існаванне свайго героя, а затым можа пачацца працэс «прысваення» аўтарскага тэксту і пераўвасаблсння, гэта значыць, нязмушана і непрыкметна народзіцца творчая патрэба дзейнічаць так, як герой ці гераіня п'есы. Працэс гэты марудны і цяжкі і без валявых высілкаў студэнту ніяк не абысціся.

З'яўленне ўнутранага жадання, творчай патрэбы дзейнічаць выкліча пэўную псіхічную актыўнасць і падштурхне на пошук і адбор

выяўленчых сродкаў увасаблення аўтарскага напісанага (друкаванага) тэксту ў вуснае сцэнічнае слова або ў характар канкрэтнага вобраза. Але далёка не ўсс студэнты, якія знайшлі цікавае рашэнне, неардынарны ход увасаблення творчай задачы, сутыкнуўшыся з пэўнымі цяжкасцямі, могуць праявіць настойлівасць і сілу волі, каб давесці распачатую творчую працу да канца. Прычыны гэтай з'явы не толькі ў тым, што бацькі і настаўнікі, за рэдкім выключэннсм, ні дома, ні ў школе амаль што не звярталі ніякай увагі на выхаванне ў дзяцей такіх неабходных кожнаму чалавеку рыс характару, як воля, рашучасць, настойлівасць, вытрымка, цярплівасць, але і тым самым садзейнічалі ляноце, інфантылізму... Сангвінікі, халерыкі, флегматыкі, меланхолікі зусім па-рознаму паводзяць сябе ў жыцці і на сцэне. У кожнага з іх свой, адметны рытм унутранага жыцця, які залежыць ад асаблівасцяў іх вышэйшай нервовай дзейнасці. Вядомы псіхолаг Я. Каламінскі адзначае, што «добрых» ці «дрэнных» тэмпераментаў не бывае, і на базе любога тэмпераменту можна выхаваць у сабе любыя рысы асобы, што сярод вялікіх людзей сустракаюцца прадстаўнікі ўсіх чатырох тыпаў: І.А. Крылоў і М.І. Кутузаў былі флегматыкамі, А.С. Пушкін і А.В. Суворaў — халерыкамі, М.Ю. Лермантаў і Напалеон — сангвінікамі, а М.В. Гогаль і П.І. Чайкоўскі — меланхолікамі, што ў «чыстым» відзе кожны тып сустракаецца рэдка і большасць людзей аб'ядноўваюць у сабе рысы розных тэмперамснтаў (10, 209).

Своечасова заўважыць, зразумець, адчуць своеасаблівасць індывідуальных рыс характару і ўласцівасці тэмпераменту студэнта, накіраваць яго на развіцце станоўчых асаблівасцяў і пераадоленне адмоўных — задача для выкладчыкаў спеддысцыплін першачарговай важнасці. Пра тэмперамеит студэнтаў можна меркаваць ужо на першых групавых занятках па некаторых асноўных яго ўласцівасцях: сейзітыўнасць, або адчувальнасць. Аб'ём вызначаюць па тым, якая наймсншая сіла знешняга ўздзсяння неабходна для таго, каб у чалавека ўзнікла тая ці іншая псіхічная рэакцыя, з якой хуткасцю гэтая рэакцыя ўзнікас. Іншымі словамі, якой павінна быць сіла ўздзеяння, каб да чалавека, так бы мовіць, «дайшло».

Рэактыўнасць. Гэтая ўласцівасць выяўлясцца ў тым, з якой сілай і энергіяй чалавек рэагуе на тое ці іншае ўздзеянне.

Актыўнасць. Аб гэтай уласцівасці мяркуюць па тым, з якой энергіяй чалавск сам уздзейнічае на навакольны свет, па яго настойлівасці, засяроджанасці ўвагі і г.д.

Асаблівая ўласцівасць — суадносіны рэактыўнасці і актыўпсісці. Адны людзі дзейнічаюць у асноўным пад уздзеяннем выпадковых

знешніх ці ўнутраных (захацелася!) прычын, другія самі свядома вызначаюць лінію сваіх паводзін.

Эмацыянальная ўзбудлівасць. Пра яе мяркуюць па тым, якой сілы неабходна ўздзеянне для ўзнікнення эмацыянальнай рэакцыі.

Тэмп псіхічных рэакцый: пластычнасць і рыгіднасць праяўляюцца ў тым, як лёгка і хутка прыстасоўваецца чалавек да знешніх уздзеянняў. Пластычны імгненна змяняе паводзіны, калі мяняюцца абставіны, рыгідны з вялікай цяжкасцю мяняе звычкі і меркаванні.

Тэмперамент цесна звязаны з асаблівасцямі зносін чалавека з іншымі людзьмі... Швейцарскі пеіхолаг канца XIX — пачатку XX ст. К. Юнг заўважыў, што калі для адных людзей найвялікшае значэнне маюць знешнія прадметы і падзеі, калі адны звернуты, так бы мовіць, вонкі, то другія заглыблены ў сваё ўнутранае жыццё, іх не так цікавяць знешнія падзеі, колькі ўласныя перажыванні і ўласнае жыццё. Разглядаючы плынь чалавечага жыцця (паводле Юнга), мы бачым, што лёс аднаго абумоўліваецца пераважна аб'ектамі яго інтарэсаў, у той час як лёс другога — перш за ўсё яго ўласным унутраным жыццём, яго суб'ектам. Першых ён назваў экстравертамі, другіх — інтравертамі (10,277, 212).

Будучых артыстаў пажадана пазнаёміць не толькі з асноўнымі ўласцвасцямі тэмпераменту, але і з табліцай псіхалагічных тыпаў тэмпераментаў, якую склаў расійскі псіхолаг В.С. Мерлін:

Сангвінік. Павышаная рэактыўнасць. Нязначная прычына выклікае рогат. Неістотны факт можа моцна раззлаваць. Жыва і з вялікай узбудлівасцю адгукаецца на ўсё, што захапіла яго ўвагу. Жывая міміка і выразныя рухі. Па яго твары лёгка здагадацца, які ў яго настрой, якія яго адносіны да прадмета ці чалавека. Хутка засяроджвае ўвагу.

Высокі ўзровень адчувальнасці. Вельмі слабыя гукі і святлораздражальнікі не заўважае.

Павышаная актыўнасць. Вельмі энергічны і працаздольны, можа доўга працаваць не стамляючыся, энергічна бярэцца за новую справу.

Актыўнасць і рэактыўнасць ураўнаважаныя. Яго лёгка дысцыплінаваць. Ён добра стрымлівае праявы сваіх пачуццяў і міжвольныя рэакцыі. Хуткія рухі, хуткі тэмп мовы, хутка ўключаецца ў новую работу. Востры розум, кемлівы.

Высокая пластычнасць. Пачуцці, настроі, інтарэс і імкненні вельмі зменлівыя. Ён лёгка ідзе на кантакт з новымі людзьмі. Легка прывыкае да новых патрабаванняў і абставін. Хутка пераключаецца з адной работы на другую. Хуткае засваенне і перабудова навыкаў. Гнуткасць розуму.

Экстраверт. У большай ступені адгукаецца на знешнія ўражанні, чым на вобразы і ўяўленні аб мінулым і будучым.

Халерык. Як і сангвінік, адрозніваецца малой сензітыўнасцю, высокай рэактыўнасцю і актыўнасцю. Але рэактыўнасць прэвалірує над актыўнасцю. Таму ён нястрыманы, нецярплівы, запальчывы. Менш пластычны і болын рыгідны чым садгвінік. Ад гэтагага большая ўстойлівасць імкненняў і інтарэсаў, большая настойлівасць, цяжкасці ў пераключэнні ўвагі. Хуткі псіхічны тэмп.

Флегматык. Малая адчувальнасць. Мала эмацыянальны. Цяжка рассмяшыць, разгневаць або засмуціць. Калі ўсе смяюцца з нейкай прычыны, застаецца абыякавы. Пры вялікіх непрыемнасцях застаецца спакойны. Міміка бедная. Рухі невыразныя. Энергічны, вызначаецца працаздольнасцю. Высокая актыўнасць значна перавышае малую рэактыўнасць. Адрозніваецца цярплівасцю, выТрымкай, самавалоданнем. Павольны тэмп рухаў і мовы, някемкі. Павольна засяроджвае ўвагу. Рыгідны. З цяжкасцю пераключае ўвагу, з цяжкасцю прыстасоўваецца да новых абставін і перабудоўвае навыкі і звычкі. Інтраверт. З цяжкасцю сыходзіцца з новымі людзьмі, з цяжкасцю адгукаецца на знешнія ўражанні.

Меланхолік. Высокая сензітыўнасць. Павышаная адчувальнасць. Нязначная прычына можа выклікаць слёзы на вачах. Празмерна крыўдлівы. Хваравіта крыўдлівы. Малая рэактыўнасць. Міміка і рухі невыразныя. Голас ціхі. Рухі бедныя. Плача ціха. Рэдка смяецца на ўвесь голас. Паніжаная актыўнасць. Няўпэўнены ў сабе, нясмелы, нават невялічкая цяжкасць прымушае апускаць рукі, неэнергічны, ненастойлівы, легка стамляецца і малапрацаздольны. Адцягнутая і няўстойлівая ўвага. Павольны псіхічны тэмп. Рыпдны. Інтраверт (10, 213, 214).

Як вядома, кожны від мастацтва мае свой матэрыял, свае асаблівасці, патрабуе ад выканаўцаў як творчага мыслення, так і пэўных тэхнічных навыкаў. Як піяністу-прафесіяналу трэба штодня дзве-тры гадзіны праводзіць за раялем, каб развіць і ўдасканаліць тэхніку выканання складанага музычнага твора, артысту балета штодзённа займацца «станком», вакалісту — распеўкай, так і будучым артыстам драматычнага тэатра неабходна падрыхтаваць сябе тэхнічна — «размяць» мышцы, натрэніраваць дыханне, развіць моўны голас, выпрацаваць дыкцыйную выразнасць, каб быць здольным вырашаць задачы творчага ўвасаблення вобразаў мастацкай літаратуры ў сцэнічным слове, бо «творчество есть прежде всего — полная сосредоточенность всей духовной и физической природы» (К. Станіслаўскі).

Дыхание. «Все живое дышит. Человек тоже дышит — это первое, что он делает, вступая в мир. Но не это знают о нем окружающие, те, кто «принимает» его: им он заявляет о своем существовании не дыханием, а криком. Что же такое крик? Громкое, со звуком соединенное выдыхание. В том негодном воздухе, который мы возвращаем природе, мы выражаем наши чувства, наши мысли. Значит, в смысле выразительного средства второй момент в процессе дыхания важнее первого: вдыхание (в процессе речи) есть приготовление, а исполнение — в выдыхании. Третий момент — остановка. В обыкновенном дыхании (нужном для жизни) остановка следует после выдыхания, она предшествует вдыханию; в речи остановка следует после вдыхания, она предшествует выдыханию. Вот схема:

В ораторском дыхании упражнение должно сводиться к тому, чтобы вдыхать как можно быстрее, а выдыхать как можно дольше» (8,18).

Дыхание	Речь
1. Вдыхание	1. Вдыхание
2. Выдыхание	2. **Остановка**
3. **Остановка**	3. Выдыхание

Дыхание — жыццёва неабходны фізіялагічны працэс спажывання арганізмам кісларода і выдзялення вуглякіслага газу. У штодзённым жыцці людзі не звяртаюць увагі на працэс дыхання, бо яно не патрабуе фізічных намаганняў. Арганізм чалавека сам рэгулюе дыханне, клапоціцца пра своечасовы ўдых і выдых. «Вдыхание и выдыхание — как бы микрокосмос нашего существования: вдыхание — рождение, выдыхание — смерть. И как после рождения должна быть смерть, так после вдыхания должно быть выдыхание; и как смерть не может быть без рождения, так без вдыхания не может быть выдыхания. Такое же соотношение, как между началом и концом: всякое начало должно иметь конец, и не может быть конца без начала. Всякое начало есть действие, усилие, утверждение, всякий конец есть отказ, ослабление, отдохновение; во всяком начале есть элемент самозарождения, во всяком конце — элемент неизбежности» (8, 32).

Існуюць два віды дыхання: газаабменнае, або фізіялагічнае, асноўная функцыя якога — вентыляцыя лёгкіх і забеспячэнне арганізма кіслародам, і фаиацыйпае, або моўнае, якое служыць не толькі для забеспячэння арганізма кіслародам, але і для гукаўтварэння. Не ўсе людзі дыхаюць аднолькава. У працэсе дыхання ўдзельнічаюць розныя

комплексы мышцаў, таму ў адных людзей прыўздымаюцца плечы, у другіх — грудная клетка. З улікам гэтага вызначаюцца чатыры асноўныя тыны дыхання: плечавы, грудны, рэберны, брушны (або дыяфрагмавы). Ні адзін з гэтых тыпаў у чыстым выглядзе не адпавядае тым патрабаваниям, якія прад'яўляюцца да дыхання мастацтвам сцэнічнай мовы: дыханне павінна быць актыўнае і непрыкметнае.

Найбольш нрыдатным у гэтых адносінах з'яўляецца камбінаваны, або рэберпа-ніжпебрушны, тып дыхання.

Цэнтральная нервовая сістэма чалавека кіруе працэсам дыхання адвольна і міжвольна. Калі міжвольнае (газаабмсннае) дыханне выхоўваць няма патрэбы (арганізм сам рэгулюю гэты працэс), то адвольнае (фанацыйнае) дыханне вымагае самай пільнай увагі і абавязковай трэніроўкі. Будучым артыстам трэніраваць фанацыйнае дыханне неабходна таму, што ім давядзецца на сцэне шмат гаварыць, у сцэнічным слове перадаваць самыя разнастайныя адценні эмацыянальнага стану тых персанажаў (вобразаў, герояў), якіх яны іграюць у спектаклі. Артысту трэба дыхаць не толькі так, як гэта робіць сам яго арганізм, але і так, як таго будзе патрабаваць логіка сцэнічных (жыццёвых) паводзін той ці іншай дзейнай асобы п'есы. «Таинственность сопровождается слышимым выдыханием, которое в высшей ступени превращается в шёпот. Выдыхание обозначает серьёзность, любопытство, удивление, также отвращение (перед предметом, смущающим наше благоденствие), также — насмешку, формы презрения, как падающие с высоты спокойного сознания нашего авторитета и непогрешимости. Последняя степень насмешки — усиленное выдыхание без слова, но со звуком — свист. Напротив, вдыхание обозначает восторженную оценку, восхищение, все формы уважения, благоговения, молитву. Дыхание — средство слишком сильной выразительности, чтобы форма его не влияла на смысл речи. Бывают случаи, когда сила страсти увлекает говорящего, когда слова нагромождаются с неудержимой стремительностью, когда нарастание эпитетов не дает времени вздохнуть, когда надо все сказать одним махом, когда от перерыва выйдет слабо; в этих случаях нужно всю фразу говорить на одно дыхание» (8, 34, 28, 29).

На сцэне артыст дзейнічае словам у статыцы, у руху, седзячы, стоячы, лежачы... Каб падрыхтаваць будучага артыста да тыповых умоў яго прафесійнай дзейнасці, практыкаванні для фізічнага развіцця (пластычная выразнасць цела), трэніроўкі дыхання, пастаноўкі голасу, удасканалення дыкцыі выконваюцца як у розных позах, так і ў розных тэмпах. І абавязкова — на сцэне. Гэта мая прынцыповая пазіцыя: будучых прафесійных Артыстаў трэба рыхтаваць (вучыць,

выхоўваць) у прафесійных умовах, г.зн. на сцэне Студэнцкага (вучэбнага) тэатра.

Заўважана, што многім першакурснікам пад час слоўнага дзеяння не хапае дыхання, таму што яны робяць «перабор» кісларода, ствараючы ў арганізме яго лішкі. Менавіта такі «перабор» ускладняе працэс маўлення, перашкаджае натуральнаму гучанню мастацкага тэксту. На занятках у акадэміі трэба натрэніраваць (развіць і ўмацаваць) усе мышцы, якія рэгулююць працэс дыхання, настолькі, каб студэнт мог у любым становішчы, у самых нязручных позах гаварыць нязмушана і выразна.

Пасля знаёмства і пэўнага засваення абавязковага навучальнага комплекснага псіхафізічнага трэнінгу студэнты яшчэ самастойна працуюць над стварэннем уласных (індывідуальных, парных і групавых) трэнінгавых кампазіцый.

Голас. К. Станіслаўскі настойліва паўтараў сваім вучням: «Артист должен явиться на сцену во всеоружии, а голос — важная часть его творческих средств» (3, 51).

«Быть в голосе!» — какое блаженство для певца, так точно, как и для драматического артиста! Чувствовать, что можешь управлять своим звуком, что он повинуется тебе, что он звучно и сильно передаёт все малейшие детали, переливы, оттенки творчества!.. «Быть не в голосе» — какое это мучение для певца и для драматического артиста! Чувствовать, что звук не повинуется тебе, что он не долетает до зала, переполненного слушателями! Не иметь возможности высказать того, что ярко, глубоко и невидимо создаёт внутреннее творчество!» (3, 49).

Праблема выхавання моўнага голасу існуе вельмі даўно. Таму перад выкладчыкамі сцэнічнай мовы і сольных спеваў (вакала) стаіць задача развіць і палепшыць тыя галасавыя якасці і ўласцівасці, якімі прырода надзяліла кожнага студэнта, навучыць яго берагчы свой голас і найлепшым чынам карыстацца ім на сцэне.

На пачатку XX ст. агульнапрынятай тэорыяй гукаўтварэння была мышачна-эластычная (міаэластычная). Прыхільнікі гэтай тэорыі лічылі, што гукаўтварэнне адбываецца пад уздзеяннем дзвюх сіл: сілы ціску паветра і сілы напружанасці самкнутых галасавых звязак. Больш новая тэорыя гукаўтварэння — нейрахранаксічная, паводле якой працэс гукаўтварэння адбываецца не ў выніку ціску паветра на галасавыя звязкі, а пад уздзеяннем нервовага шпульса-каманды з кары галаўнога мозга, які прымушае галасавыя звязкі змыкацца. Гэтая тэорыя была распрацавана рускімі вучонымі-фаніятрамі J1. Рабатновым і Я. Малюціным, а ў 1950-я гады эксперыментальна пацверджана французскім фізіёлагам Р. Юсонам.

Навуковыя даследаванні рускіх і замежных спецыялістаў апошняга часу сведчаць, што міаэластычныя і нейрахранаксічная тэорыі гукаўтварэння павінны не выключаць адна адну, а дапаўняць, таму што ўсе органы, якія ўдзельнічаюць у гукаўтварэнні, узаемазвязаны, а іх дзейнасць падпарадкоўваецца нервовай сістэме і рэгулюецца ёю. Нервовая сістэма кіруе дзейнасцю чалавечага арганізма рэфлекторна: галаўны мозг імгненна аналізуе ўспрынятае арганізмам раздражненне і ў адказ пасылае імпульсы з адчувальных цэнтраў на цэнтры фізічных дзеянняў, дзе ўзнікаюць новыя імпульсы-каманды рабочым органам, г.зн. мышцам, якія і выконваюць канкрэтнае дзеянне.

Каб лепш зразумець, як адбываецца працэс гукаўтварэння, неабходна пазнаёміцца з будовай моўпага апарату, які складаецца з двух аддзелаў: цэнтральнага і перыфсрычнага.

Цэйтральны аддзел моўнага апарату знаходзіцца ў галаўным мозгу і складаецца з кары галаўнога мозга (пераважна левага паўшар'я), прадаўгаватага мозга і перыфсрычных нерваў, што звязаны з дыхальнымі, галасавымі і артыкуляцыйнымі мышцами Кара галаўнога мозга з'яўляецца вышэйшым органам нервовай дзейнасці чалавека.

Перыферычны аддзел моўнага апарату складаюць дыхальны, артыкуляцыйны і галасавы аддзелы. Працэс гукаўтварэння адбываецца ў выніку іх адначасовай дзейнасці пад кантролем галаўнога мозга.

Дыхальны аддзел не толькі забяспечвае жыццёва неабходную для чалавека функцыю — газаабмен арганізма, але і прымае самы непасрэдны ўдзел у працэсе гукаўтварэння. Асноўныя органы дыхання: лёгкія, трахея, бронхі — маюць здольнасць хутка прыстасоўвацца да патрабаванняў, якія вызначае галаўны мозг. Як толькі перад моўным апаратам ставіцца задача фарміравання гукаў мовы, дзейнасць дыхальнага аддзела надзвычайна ўскладняецца і цалкам залежыць ад работы органаў гукаўтварэння.

У артыкуляцыйным аддзеле фарміруюцца гукі мовы. У артыкуляцыі моўных гукаў удзельнічаюць губы, язык, мяккае і цвёрдае паднябенне, поласць рота і поласць носа, глотка. Галоўным артыкуляцыйным органам з'яўляецца язык, ён удзельнічае ў фарміраванні ўсіх галосных і большасці зычных гукаў.

Галасавы аддзел складаецца з гартані і галасавых звязак.

Гартань уяўляе сабой трубку конусападобнай формы, якая складаецца з некалькіх храсткоў, знешніх і ўнутраных мышцаў і размешчана паміж трахеяй і глоткай. Гартань — орган рухомы, які выконвае тры асноўныя функцыі ў жыццёвай дзейнасці чалавека: засцерагальную, дыхальную і галасавую. Гартань — месца ўзнікнення першапачатковых гукаў моўнага і вакальнага голасу.

Галасавыя звязкі — мышцы складанай будовы, пакрытыя слізістай абалонкай. У спакойным стане галасавыя звязкі ўтвараюць трохкутную адтуліну для праходу паветра, якую называюць галасавой шчылінай. Пры фанацыі галасавыя звязкі збліжаюцца, напружваюцца і пачынаюць вібрываць. Гукавыя хвалі, што ўзніклі ў гартані, распаўсюджваюцца ва ўсе бакі: не толькі ў навакольнае асяроддзе, але і па ўнутраных шляхах арганізма. У арганізме чалавека ёсць шмат розных поласцяў і трубак, у якіх можа развівацца рэзаніраванне (трахея, бронхі, гартань, глотка, насаглотка і інш.). Рэзаніраванне выкарыстоўваецца пры пастаноўцы голасу для паляпшэння першапачатковага гуку, што ўзнікае ў галасавой шчыліне, і якасці гучання жывой (вуснай) мовы ў цэлым. «В звуке мы различаем высоту, качество, силу. Каждое из этих трёх свойств звука имеет неизмеримую шкалу разнообразия... Каждый из этих звуков разнообразится ещё большей или меньшей своей длительностью. Вот всё, что производит выдыхание до своего прохождения мимо языка, зубов, губ и носа. Прохождение через эти органы говорильного аппарата порождает уже то разнообразие согласных звуков, из сочетания которых с гласными образуются слоги, а из них — слова.

Теперь же разновидности — высоты, качества, силы, которые мы отметили в простом звуке, распространяются на слоги (ударение), на их сочетания, то есть на слова (логическое ударение), на сочетания слов, то есть на предложения, периоды, из которых составляется речь. Все три разновидности порождают новый род разновидностей благодаря чередованию, сопоставлению, вообще движению. Высота, сочетаясь с движением, даёт переходы, переливы, сила, сочетаясь с движением, даёт нарастания и оспаблеиия. Наконец, всё это, размещаясь во времени, подчиняясь разнообразию требований длительности, порождает ритм речи: периодически повторяющиеся сочетания длительностей в связи с периодически повторяющимися ударениями превращают простую (прозаическую) речь в стихотворную» (8, 21).

Такім чынам, «звуки речи представляют собой «природную материю» языка. Без звуковой оболочки не существует языка слов. Звуки речи сами по себе не имеют значения, но они являются тем средством, при помощи которого выражаются все значения. Верно рождённый и правильно направленный звук неизбежно поможет и правильному произношению того или иного гласного или согласного. Никакая артикуляция не может содействовать правильному звукообразованию, как бы мы ни старались. Но верное звукообразование подразумевает собой и свойственное ему правильное артикуляционное выражение.

Необходимо вырабатывать каждую букву — и гласную и согласную — на едином принципе звукообразования и дыхания. Гласные и согласные зачаты в дыхании, в голосе. Будучи целиком в зависимости от содержания, от действия, от подтекста, от мысли, они не превращаются в некую дикционную и голосовую подробность, а, незаметно переливаясь из одного тона в другой, как бы являются сквозным тональным стержнем, на котором покоится разговорная изменчивость и подвижная речь действующего актёра» (12, 41).

Толькі ўсвядоміўшы значэнне прафесійна натрэніраванага дыхання ў працэсе работы над голасам, студэнты змогуць авалодаць асновамі гукаўтварэння і такімі важнымі ўласцівасцямі і элементамі голасу, як апора дыхання, рэзанатары, сіла гуку, палётнасць (пасыл), вынослівасць, дыяпазон, рэгістры, тэмбр.

Без дыхання не можа нарадзіцца ніякі гук, таму што дыханне і голас узаемазвязаныя, а шмат якія якасці голасу залежаць менавіта ад дыхання, дакладней, ад яго аб'ёму і апоры (канцэнтрацыі, мабільнасці). «Без хорошо выработанного, активного потока дыхательной струи, стремящейся снизу вверх — в резонирующие полости лица, лобной пазухи, головы («теменные кости»), невозможно добиться ни правильно летящих гласных, ни ровной в регистрах линии звучания, ни, наконец, характерного «мычания»...» (12, 44).

Добра «абапёртае» (зафіксаваны ўдых на ніжнебрушных мышцах) дыханне праходзіць праз галасавую шчыліну і калі сустракас на сваім шляху самкнутыя галасавыя звязкі, то спрэсаваным струменем паветра цісне на іх, прымушаючы вібрыраваць і ўтвараць гук, які затым афарбоўваецца і ўзмацняецца дзякуючы рэзанатарам: поласць носа, лобныя пазухі, верхняя частка чэрапа, патыліца, цвёрдае паднябенне, зубы, грудная клетка... Студэнтам трэба зразумець, што «тайна большого красивого голоса заключается не в механическом и физическом явлении звучания голосовых связок, происходящем от давления на них воздуха, а в том, чтобы уловить этот спетый тон в голове и во рту и с помощью всех данных для этого природой резонансовых и вибрирующих аппаратов сконцентрировать его и оформить» (12, 61, 62).

Сіла гуку ў значнай ступені залежыць ад актыўнасці работы органаў моўнага апарату. Чым з большым напорам выдыхаецца паветра праз галасавую шчыліну, тым большую сілу набывае гук. Нельга блытаць сілу гуку з крыкам (павышаная гучнасць). Выкарыстоўваць гук вялікай сілы ў сцэнічнай мове можна доўга, а крыкам можна карыстацца вельмі абмежаваны час. Крык звязаны з празмернымі перагрузкамі органаў гукаўтварэння (асабліва галасавых звязак), што

можа выклікаць іх пашкоджанне і захворванне. Каб гэтага не здарылася, будучыя артысты павінны навучыцца разумна карыстацца голасам, развіць такія надзвычай неабходныя яго якасці, як палётнасць і вынослівасць.

Палётпасць (пасыл) гуку — здольнасць голасу распаўсюджвацца на пэўную адлегласць. Правільны (актыўны, накіраваны) пасыл забяспечвае добрую чутнасць нават пры невялікай сіле голасу. Кожнаму, хто выступае публічна, у тым ліку і артысту, неабходна навучыцца інтуітыўна вымяраць адлегласць, на якой знаходзіцца субяседнік (партнёр) або слухач (глядач), і ў залежнасці ад гэтага рэгуляваць актыўнасць пасылу. Калі ж дыханне ў чалавека слаба натрэніраванае, гук яго голасу распаўсюджваецца дрэнна, таму «эмоциональную энергию надо искать в дыхании, а не в мышцах горла» (6, 24).

Вынослівасць — здольнасць голасу вытрымліваць значныя фізічныя і псіхічныя (эмацыянальныя) нагрузкі. Развіць вынослівасць магчыма толькі пры наяўнасці прафесійна натрэніраванага дыхання, здаровых галасавых звязак, актыўнай унутрыглоткавай і знешняй артыкуляцыі, якаснай работы ўсіх рэзанатараў. Голас артыста павінен быць чысты, звонкі, сакавіты і роўны пры гучанні ва ўсіх рэгістрах моўнага дыяпазону.

Дыяпазон — аб'ём голасу, які вызначаецца інтэрвалам паміж даступнымі яму самым нізкім і самым высокім гукамі. Звычайна дыяпазон прафесійнага (акцёрскага) голасу складае паўтары актавы. Асноўная нагрузка выпадае на сярэднія ноты моўнага голасу, якімі артыст карыстаецца і ў жыцці (у размове, пры чытанні ўслых).

Рэгістр — частка дыяпазону чалавечага голасу. Э. Чарэлі лічыць, што ў моўным голасе існуюць трудны, або ніжні, рэгістр, змешаны, або сярэдні, і галаўны, або верхні. Межы рэгістраў моўнага голасу найчасцей залежаць ад індывідуальных асаблівасцяў моўнага апарату чалавека. Трэніруючы моўны голас, трэба асаблівую ўвагу звяртаць на выпрацоўку ўменняў і навыкаў плаўнага, мяккага, непрыкметнага пераходу з рэгістра на рэгістр.

Тэмбр — афарбоўка голасу, якую яму надаюць абертоны. У сваёй болыласці чалавечыя галасы звычайныя, толькі невялікая колькасць людзей мае рэдкія па тэмбру галасы, якія адразу звяртаюць на сябе ўвагу. Змяніць тэмбр моўнага голасу цяжка, аднак зрабіць яго больш чыстым (зняць сіпату, хрыпласць, гугнявасць, вісклівасць і іншыя недахопы) можна, займаючыся спецыяльнымі практыкаваннямі. Канчаткова тэмбр голасу фарміруецца ў юнацкім узросце.

Найбольш распаўсюджанымі недахопамі моўнага голасу, з якімі даводзіцца сутыкацца ў працы са студэнтамі тэатральнага факуль-

тэта БелДзАМ, з'яўляюцца наступныя: афанія — невыразнасць, цьмянасць гучання (голасу не хапае чысціні і гучнасці); дысфанія — адсутнасць устойлівага, роўнага гучання, у выніку чаго голас часта зрываецца, дрыжыць; фонастэнія — хуткая стамляемасць голасу; псеўдафонастэнія — перарывістасць голасу, выкліканая няўменнем чалавека кіраваць сваімі эмоцыямі.

Прычынамі гэтых недахопаў могуць быць хранічныя прастудныя захворванні, фізічнае і псіхічнае стамленне, курэнне (асабліва калі курыць пачынаюць у раннім узросце) і інш. Але найчасцей яны (недахопы) з'яўляюцца вынікам элементарнага няведання фізіялогіі чалавека і парушэння патрабаванняў гігіены голасу. Дрэнных галасоў наогул няма, ёсць галасы неапрацаваныя. Каб развіць і палепшыць уласцівасці голасу, будучым артыстам трэба штодзённа яго трэніраваць. Калі гэтым не займацца, з цягам часу нават добры голас можа страціць сваю сілу і мілагучнасць.

Частковае выкарыстанне таго станоўчага, што ёсць у метадычнай рабоце выкладчыкаў сцэнічнай мовы і вакала, якія жылі і плённа працавалі ў XX ст. (Л.Ф. Сарычава, Л.Б. Дзмітрыеў, Г.М. Пятрова, Э.М. Чарэлі і інш.), а таксама ўласны шматгадовы педагагічны вопыт далі магчымасць аўтару гэтага дапаможніка распрацаваць і ўкараніць у практыку сістэму падрыхтоўчых практыкаванняў для развіцця моўнага голасу будучых артыстаў драматычных твораў. Сістэма гэтая ўяўляе сабой узаемазвязаны комплекс разнастайных фізічных практыкаванняў і псіхолага-метадычных прыёмаў, якія дапамагаюць студэнтам тэатральнага факультэта авалодваць (за чатыры семестры навучання) прафесійнымі ўменнямі і навыкамі кіравання моўным голасам. Развіццё (пастаноўка) моўнага голасу разглядаецца як частка ўсяго працэсу выхавання і навучання будучых артыстаў. Заняткі плануюцца так, каб паступова прывучыць кожнага студэнта да сістэматычнай працы па ўдасканаленні ўсяго псіхафізічнага апарату — «акцёрскага інструмента».

Распрацоўка моўнага голасу з'яўляецца адзіным псіхафізіялагічным працэсам, які складаецца з трэніроўкі дыхання, выпраўлення недахопаў дыкцыі і развіцця голасу для авалодання асновамі майстэрства драматычнага артыста. Ванеса Рэдгрэйв, выпускніца Лонданскай школы музыкі і драмы, успамінала:«... .в четыре года у меня появился первый учитель пения. С пяти до тринадцати лет меня учили танцевать. Потом я много занималась речью и ораторским искусством» (20, 323).

Дыкцыя — «по латыни dicere — произносить, diction — произношение, а хорошая дикция обозначает чёткость и ясность произ-

несения, чистоту и безукоризненность каждой гласной и согласной в отдельности, а также слов и фраз в целом» (19, 6). Ад выразнасці прамаўлення залежыць чысціня і прыгажосць вуснага, жывога сцэнічнага слова. Дыкцыйная выразнасць вуснай мовы з'яўляецца для будучых артыстаў жыццёвай і прафесійнай неабходнасцю.

Мова чалавека можа быць правільная — выразная, чыстая, зразумелая, а таксама няправільная, г.зн. у ёй могуць быць пэўныя хібы і заганы. Моўныя недахопы даволі разнастайныя і залежаць ад стану цэнтральнай нервовай сістэмы, ад будовы языка, губ, зубоў, падняцення, сківіц, насаглоткі; падзяляюцца на арганічныя (звязаныя з фізіялагічнымі парушэннямі моўных органаў) і неарганічныя (звычайна яны — вынік механічнага пераймання чужых недахопаў або нядбайнага выхавання вуснай мовы чалавека). Выпраўляць недахопы прамаўлення можна шляхам медыцынскай аперацыі або штодзённай трэніроўкі некаторых частак моўнага апарату, для чаго абавязкова трэба высветліць прычыну моўных недахопаў. Таму людзі, у тым ліку і студэнты-першакурснікі тэатральнага факультэта, у мове якіх ёсць такія недахопы, як картавасць, шапялявасць, гугнявасць, павінны атрымаць кансультацыю лагапеда, каб правільна вызначыць шлях іх выпраўлення.

Самастойна і пад наглядам (кантролем) выкладчыка сцэнічнай мовы варта займацца выпраўленнем менш цяжкіх, але даволі распаўсюджаных моўных недахопаў. Да іх адносяцца: маларухомасць губ — у час фанацыі адсутнічае артыкуляцыйная выразнасць губ; прамаўленне «скрозь зубы» — гукі ўтвараюцца пры адсутнасці шчыліны паміж зубамі для выдыхаемага паветра; парушэнне арфаэпічных нормаў беларускай мовы.

Адпрацоўку прамаўлення асобных гукаў і іх спалучэнняў мэтазгодна пачынаць з галосных. Яны ўтвараюцца толькі голасам — паветра выходзіць з гартані праз шчыліну, якую ўтвараюць моўныя органы, свабодна, не сустракаючы на сваім шляху перашкод. Змяняючы становішча і форму языка, губ, г.зн. форму і шырыню праходу для выдыхаемага паветра, галосным можна надаць розныя адценні гучання.

Прамаўляючы зычныя гукі, выдыхаемае паветра сустракае на сваім шляху тыя ці іншыя перашкоды — язык, зубы, губы. Шум, які суправаджае зычныя гукі, — вынік трэння выдыхаемага паветра аб гэтыя перашкоды. Прамаўленне зычных гукаў патрабуе большых фізічных намаганняў, чым прамаўленне галосных.

Прамаўленне кожнага зычнага гуку мае свае асаблівасці. Дапамагае засваенню правільнага прамаўлення зычных гукаў чытанне

ўголас прыказак, прымавак, чыстагаворак, у якіх ёсць неабходныя для трэніроўкі гукі. Чытаць мэтазгодна ў такой паслядоўнасці: першы раз тэкст прамаўляецца амаль па складах; другі раз яго трэба прачытаць цэлымі словамі, не спыняючыся; трэці раз той, у каго вялая мова (найчасцей гэта флегматыкі), павінен прамаўляць тэкст даволі хутка. Робіцца гэта для паступовага павелічэння «дынамікі» прамаўлення. Абавязкова трэба сачыць за выразнасцю прамаўлення, а таксама за выяўленнем сэнсу тэксту.

Будучыя артысты павінны засвоіць (усвядоміць), што «гласные — это жизнь слова, это дыхание речи; без гласных речь вянет; гласные — это кровь, согласные — тело, скелет и мускулы» (8, 51). Вядома, што «буквы, слоги, слова не придуманы человеком; они подсказаны нашим инстинктом, побуждениями, самой природой, временем и местом, самой жизнью.

У всех звуков, из которых складывается слово, своя душа, своя природа, своё содержание, которые должен почувствовать говорящий. Если же слово не связано с жизнью и произносится формально, механически, вяло, бездушно, пусто, то оно подобно трупу, в котором не бьётся пульс. Живое слово насыщено изнутри. Оно имеет своё определённое лицо и должно оставаться таким, каким создала его природа. Если человек не чувствует души буквы, он не почувствует и души слова, не ощутит и души фразы, мысли» (3, 60-61). Нездарма К. Станіслаўскі, звяртаючыся да сваіх вучняў, казаў: «...советую вам теперь же, на первых двух курсах, однажды и навсегда покончить с элементарными требованиями дикции и звука. Что же касается тонкостей искусства говорить, помогающих художественно, красиво и точно выявить неуловимые оттенки чувства и мысли, то их вам предстоит разрабатывать в течение всей жизни» (3, 68).

Арфаэпія (ад грэч. orthos — правільны; epos — мова) — сістэма правіл, якія вызначаюць правільнае літаратурнае вымаўленне.

Па тым, як артыст гаворыць — увасабляе ў жывым слове думкі і пачуцці, — можна вызначыць узровень яго культуры і прафесійнай падрыхтоўкі. Вуснае слова артыста павінна адрозніваццa ад побытавай мовы, вызначацца пэўнай выразнасцю, адпавядаць нормам (правілам, патрабаванням) літаратурнай мовы.

На Беларусі значная большасць насельніцтва ў сваёй моўнай практыцы карыстаецца дзвюма мовамі — беларускай і рускай, што абумоўлена шэрагам сацыяльных, гістарычных, эканамічных, культурных і псіхалагічных фактараў. Наша рэспубліка характарызуецца не толькі вялікім пашырэннем двухмоўя, але і асаблівасцю яго рэальнага функцыянавання. Двухмоўе ў нас мае характар літаратурнага

двухмоўя, дзе кожная мова — раўнапраўны партнёр у працэсе камунікацыі. Аднак даводзіцца канстатаваць, што сёння на Беларусі неабходна яшчэ шмат зрабіць для пашырэння роднай мовы і павышэння ўзроўню яе культуры.

Беларуская літаратурная мова — гэта ў сваёй аснове агульнанародная мова, але адшліфаваная і апрацаваная. Беларуская літаратурная мова багацейшая за любую асобна ўзятую мясцовую гаворку і сваім слоўнікавым складам, і фразеалогіяй, і сінтаксічнымі канструкцыямі. Вядома, літаратурнай мовай з'яўляецца не толькі мова мастацкай літаратуры. Літаратурнай павінна быць мова перыядычнага і навуковага друку, мова школы, радыё, кіно, тэатра, тэлсбачання. Істотнай асаблівасцю літаратурнай мовы з'яўляецца наяўнасць у ей агульнапрынятых нормаў, ці, так бы мовіць, літаратурная мова — гэта нармалізаваная агульнанародная мова.

Сучасная беларуская мова, як і любая іншая літаратурная мова, мае свае лексічныя, граматычныя, арфаграфічныя і арфаэпічныя нормы[3]. Засяродзімся на нормах арфаэпічных.

Арфаэпічныя нормы як нормы вуснай формы літаратурнай мовы патрабуюць адзінага вымаўлення, акрэсліваюць, як вымаўляюцца гукі і спалучэнні гукаў у словах і спалучэннях слоў. Літаратурнае вымаўленне сведчыць пра культуру вуснай мовы чалавека і ўзровень яго культуры ўвогуле. Калі ў дачынсннi да пісьмовай формы зразумела, што маецца на ўвазе пад правільнасцю мовы, то ў адносінах да вуснай паняцце правільнасці з'яўляецца менш выразным і акрэсленым. Тым не менш існуюць фанетычныя рысы, якія лічацца абавязковымі для літаратурнага вымаўлення. Гэта пэўны характер мяккасці зычных як перад галоснымі, так і перад зычнымі; цвёрдае вымаўленне ч і р; вымаўленне нескладовага ў і афрыкаты дж у адпаведных фанетычных пазіцыях; акаючае вымаўленне ненаціскных галосных; фрыкатыўны характар звонкага г і інш. Менавіта гэтыя фанетычныя рысы адрозніваюць беларускую мову ад суседніх славянскіх моў, найбольш блізкіх да яе паводле лексічнага складу.

Засваенне нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення пачынаецца ў маленстве. Вялікая роля ў гэтай справе належыць сям'і, школе, вышэйшым і сярэднім спецыяльным навучальным установам. Значны ўплыў на засваеннс той ці іншай асобай правільнага літаратурнага вымаўлення аказвае асяроддзе людзей, дзе карыстаюцца літаратурнай мовай. На жаль, пры падрыхтоўцы спецыялістаў у

---

[3] Выкарыстаны матэрыялы з наступных прац: Янкоўскі Ф.М. Беларускае літаратурнае вымаўленне. Мн., 1976; Падлужны А.І. Нормы беларускага літаратурнага вымаўлення // Сучасная беларуская мова: Пытанні культуры мовы / Пад рэд. А.І. Жураўскага, Г.У. Арашонкавай. Мн., 1973.

рэспубліцы ўсё менш увагі надаецца практычнаму засваенню курса беларускай фанетыкі. Адсюль недасканаласць вуснай мовы многіх настаўнікаў, журналістаў, дыктараў радыё і тэлебачання, артыстаў нацыянальнага тэатра.

Асноўнай прычынай адхіленняў ад нормаў літаратурнага вымаўлення з'яўляецца захаванне ў мове дыялектных рысаў, якія не супадаюць з фанетычнымі рысамі літаратурнай мовы. Гэта можа быць змяненне якасці галосных, вымаўленне на месцы падоўжаных зычных значна скарочаных, а часам і зусім кароткіх, адступленне ад правілаў акання і якання, амаль поўны пропуск зычнага г у канчатках прыметнікаў і дзеепрыметнікаў, рэдуцыраванае вымаўленне спалучэння сць, парушэнне правілаў аглушэння і азванчэння зычных і інш.

Другой прычынай парушэння арфаэгіічных нормаў з'яўляецца двухмоўная сітуацыя, пры якой адзін і той жа чалавек карыстаецца то рускай, то беларускай мовай. Пры слаба выпрацаваных навыках вымаўлення звычайна парушаюцца арфаэпічныя правілы як адной, так і другой мовы. Адхіленні, выкліканыя двухмоўем, сведчаць пра недасканалае валоданне беларускай і рускай мовамі. Спрыяльнай умовай для адхіленняў часта з'яўляецца тое, што асобныя фанетычныя рысы беларускай мовы супадаюць з фанетычнымі рысамі рускай мовы. Гэта датычыцца галоўным чынам ненаціскных галосных, бо ў паўночна-ўсходнім дыялекце назіраецца іх рэдукцыя, якая ў пэўных фанетычных умовах нагадвае рэдукцыю ў рускай літаратурнай мове.

Пад уплывам рускай мовы магчыма не зусім цвёрдае вымаўленне зычнага ч; губна-зубнога в на месцы губна-губнога ў нескладовага; вымаўленне афрыкаты дж як спалучэння гукаў або замена яе на зычны ж; паўмяккае р; няпоўнае змякчэнне або цвёрдае вымаўленне з', с' перад мяккімі зычнымі і іншыя адхіленні.

Трэцяй істотнай крыніцай памылак у вымаўленні з'яўляецца палітарнае чытанне. Літары не заўсёды абазначаюць тыя гукі, якія трэба вымаўляць. Таму пад час вусных выступленпяў, калі прамова падрыхтавана раней, частка гукавых асаблівасцяў павінна ўзнаўляцца без апоры на запіс. Але гэта магчыма толькі пры добра адпрацаваных навыках вымаўлення. Часта не звяртаюць увагі на адрозненні паміж пісьмом і вымаўленнсм і чытаюць, як напісана. Палітарнае чытанне прыводзіць да таго, што адхіленні, якія ўзніклі пад уплывам дыялектных асаблівасцяў гаворкі і рускай мовы, замацоўваюцца. Адначасова ўзнікаюць і спецыфічныя памылкі: вымаўленне ў некаторых выпадках галоснага і без нрыстаўнога й; нескладовага ў у пачатку слова; няправільнае ўжыванне г выбухнога, які сустракаецца

ў запазычаных, галоўным чынам з польскай і літоўскай моў, словах, бо асобнай літары для гэтага гука ў бсларускай мове няма; вымаўленне часціцы не і прыназоўніка без з галосным е, калі яны стаяць перад словам з націскам на першым складзе, у той час як тут трэба вымаўляць я.

Арфаэпічныя нормы, як і іншыя з'явы мовы, толькі адносна стабільныя, вельмі марудна, але ўсё ж яны змяняюцца. Гэтыя змены абумоўлены тымі ж прычынамі, якія выклікаюць адхіленні ад вымаўленчых нормаў. Для эвалюцыі беларускага літаратурнага вымаўлення найбольшае значэнне маюць прычыны, звязаныя з уплывам дыялектнай мовы.

Удакладненне правілаў арфаграфіі таксама прыводзіць да змянення гучання слоў. Каб мова магла быць зручным сродкам камунікацыі, трэба строга прытрымлівацца вымаўленчых нормаў. Вывучэнне і засваенне нормаў літаратурнага вымаўлення мае вялікае грамадска-практычнае значэнпе. Парушэнні і розныя адхіленні ад нормаў літаратурнага вымаўлення, як і парушэнні арфаграфічных нормаў і правілаў, з'яўляюцца перашкодамі ў моўных сувязях, моўным кантактаванні паміж людзьмі.

Патрабавальнасць да ўзроўню культуры вуснай мовы розная і залежыць ад абставін яе ўжывання. Пры звычайнай размове людзі менш уважліва сочаць за сваім вымаўленнем, часам рэдуцыруюць спалучэнні зычных, дапускаюць больш поўную іх асіміляцыю, менш выразна артыкулююць гукі. Умоўна такі спосаб выказвання можна назваць размоўным стылем.

Пры карыстанні вуснай мовай у афіцыйных абставінах дыкцыя больш выразная, тэмп больш павольны, кожны гук вымаўляецца дакладна і ясна. У гэтым выпадку карыстаюцца поўным стылем вымаўлення. Ён патрабуе строгасці, афіцыйнасці, таму тэкст выступления часта рыхтуецца загадзя. Чалавеку вельмі важна не прыцягваць увагу слухачоў асаблівасцямі свайго вымаўлення, таму ён імкнецца гаварыць асабліва выразна, старанна артыкулюючы гукі. Зразумела, што пры такім спосабе вымаўлення найбольшая небяспека ў пераходзе на палітарнае чытанне.

Для авалодання нормамі літаратурнага вымаўлення неабходна ўважліва ўслухоўвацца ў яго лепшыя ўзоры і засвойваць іх. І хаця вымаўленне — нрацэс аўтаматычны, усё ж яго можна і трэба кантраляваць. Пры належнай трэніроўцы можна навучыцца добра ўсведамляць становішча языка, форму губ, мяккага паднябення і іншых моўных органаў. Пазбегнуць адхіленняў і парушэнняў правіл арфаэпіі можна толькі ў тым выпадку, калі чалавек заўважыць (пачуе, усвядо-

міць) адрозненні, якія існуюць паміж узорным і сваім уласным вымаўленнем. А для гэтага вельмі важна ведаць тэхніку артыкуляцыі паасобных гукаў і характар іх зменаў у моўнай плыні.

Галосныя А, Э, О

Пры вымаўленні галоснага а рот шырока раскрыты, язык трохі падымаецца ў сваёй сярэдне-задняй частцы да паднябення. Губы не ўдзельнічаюць у фарміраванні галоснага а.

Пры вымаўленні галоснага э рот раскрыты на таўшчыню вялікага пальца, язык трохі адцягваецца назад, губы прымаюць авальную форму.

Пры вымаўленні галоснага о ніжняя сківіца трохі апускаецца, язык адцягваецца назад, губы прымаюць акруглую форму.

Яркай асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца аканне — супадзенне ў вымаўленні галосных о, э пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных з галосным а, калі з іх сыходзіць націск: ногі - - нага, кол — калы, дрэмле — драмлю, вол — валы. Такое супадзенне галосных назіраецца як у пераднаціскным, так і ў занаціскным складах.

Аднак ёсць група слоў, якія аканню не падпарадкоўваюцца. Гэта некаторыя словы з націскнымі складамі ро, ло. Калі галосны о ў аднакарэнных словах аказваецца не пад націскам, то ён супадае з галосным ы: кроў — крыві, глотка — глыток, крошка — крышыць.

Ненаціскны э захоўваецца ў шмат якіх запазычаных словах: рэгламент, тэкстыль, эканоміка, рэвалюцыя...

Пры вымаўленні галоснага і рот раскрыты адвольна, паміж зубамі невялікая шчыліна для выдыхаемага паветра. Пярэдняя частка языка набліжаецца да ніжніх пярэдніх зубоў, бакі языка шчыльна прыціскаюцца да верхніх бакавых зубоў.

Пры вымаўленні галоснага ы губы злёгку расцягнуты ў бакі, паміж зубамі невялікая шчыліна для выдыхаемага паветра. Язык трохі адцягнуты назад і прыўзняты да сярэдняй часткі паднябення. Ва ўсіх выпадках вымаўленне нязменнае.

1.Галосны і ў пачатку слова ў формах займеннікаў вымаўляецца як спалучэнне нескладовага й з галосным і (йі): йіх, йіхні, ЙІМ, ЙІШШЫ (іх, іхні, ім, іншы).

2. Такое ж вымаўленне будзе і ў тым выпадку, калі галосны і стаіць у сярэдзіне або на канцы слова пасля галоснага: крайіна, твайіх, ручайіна, свайіх; у майі, у родным крайі, у бярозавым гайі (краіна, тваіх, ручаіна, сваіх, у маі, краі, гаі).

3. Калі пасля слова на галосны няма паўзы або яна кароткая, ненаціскны і ў незапазычаных словах можа вымаўляцца як нескладовы й або як спалучэнне нескладовага й з галосным і (йі): паслалі дайвана, дайівана (да Івана); вазьмійголку, вазьмійіголку (вазьмі іголку); дарога найвацэвічы, найівацэвічы (дарога на Івацэвічы), найржышчы, пайіржышчы (па іржышчы).

4. Злучнік і часціца і пасля слова на галосны пры адсутнасці працяглай паўзы вымаўляюцца як нескладовы й: збярусяйпайду, бацькайсын, зямляйнеба (збяруся і пайду, бацька і сын, зямля і неба).

5. Галосны і пасля слоў, якія заканчваюцца на цвёрды зычны, вымаўляецца як ы: ёнышоў, голупыгалупка, лёныканогілі (ён ішоў, голуб і галубка, лён і каноплі).

6. У складаных словах пасля цвёрдага зычнага галосны і вымаўляецца як ы: міжынстыгуцкі, медынстытут, бортынжынер (міжінстытуцкі, медінстытут, бортінжынер).

Галосны У

Пры вымаўленні галоснага у губы выцягваюцца ўперад, паміж імі — невялікая шчыліна, якая нагадвае трубачку. Галосны у ўтвараецца на выдыху пры паднятай і адцягнутай назад спінцы языка.

1. У словах, якія абазначаюць прозвішчы, імёны, геаграфічныя назвы, галосны у вымаўляецца як нескладовы ў: паўладзімірскага (па Уладзімірскага), наўкраіне (на Украіне), заўэльсам (за Уэльсам).

2. У запазычаных словах розных значэнняў галосны у вымаўляецца як нескладовы ў: заўнівермагам (за універмагам), ваўніверсітэце (ва універсітэце), ваўнісон (ва унісон).

3. У сярэдзіне сказа пасля знака прыпынку, калі ў прамаўленні няма паўзы або яна кароткая, галосны у вымаўляецца як нескладовы ў: Калі з роду баравік, то лезь брацеўкошык (Калі з роду баравік, то лезь, браце, у кошык).

Галосныя Е, Ё, Ю, Я

Ётавыя галосныя гукі — гэта спалучэнні двух гукаў: нескладовага й і адпаведнага галоснага. Пры вымаўленні ётавых галосных рот раскрываецца не вельмі шырока і гукі з'яўляюцца больш закрытымі. Спінка языка падымаецца вышэй да паднябення, а месца пад'ёму перасоўваецца значна бліжэй да пярэдніх зубоў.

Адной з асаблівасцяў беларускай мовы з'яўляецца яканне — супадзенне галосных е, ё з галосным я пасля мяккіх зычных у першым

пераднаціскным складзе: вецер — вятры, вёсны — вясна, мёд — мядовы. У астатніх пераднаціскных і паслянаціскных складах ё пераходзіць у гук е: веснавы, медагонка і інш.

Галосны е захоўваецца ў першым пераднаціскным складзе ў запазычаных словах: сезон, электрон, перон, бензін.

Трэніраваць вымаўленне галосных гукаў трэба такім чынам: бязгучна (такое прамаўленне канцэнтруе ўвагу на правільным размяшчэнні частак моўнага апарату, што садзейнічае артыкуляцыйнай выразнасці галосных гукаў); шэптам (дапамагае дасягнуць не толькі артыкуляцыйнай выразнасці, але і правільна накіраваць гукавы пасыл галосных; практыкаванне трэба выконваць лёгка і спакойна, без усякага напружання галасавых звязак); голасам (выконваецца спакойна, без узмацнення).

А Э І О У Ы — бязгучна
А Э І О У Ы — шэптам
А Э І О У Ы — голасам
Е Ё Ю Я — бязгучна
Е Ё Ю Я шэптам
Е Ё Ю Я — голасам

Уважліва прачытайце (бязгучна), зрабіце пісьмовы арфаэпічны аналіз тэксту, затым паўтарыце ўслых прыказкі, прымаўкі, строфы вершаў, прытрымліваючыся нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення.

Каторы конь цягне, таго і паганяюць.
Круцель на круцялі едзе і круцялём паганяе.
Крамар як камар: дзе сядзе, там і п'е.
Няма платы, няма і працы.
Калі з'елі кароўку, то з'ешце і вяроўку.
Чыя сіла, таго і праўда.
Адною рукою і вузла не завяжаш.
Змяшаўся між людзей, то і ён чалавек.
Куды людзі, туды і я.
Іх і вадою не разальеш.
Можна і не рукацца, але прывітацца.
Які госць, такое і частаванне.
Дождж у маі — будзе хлеба і на гультаі.
Мароз казаў: і ў маі тры дні маю.
Ён і паміраць час не знойдзе.
Адзін сынок Юзік і той — як гарбузік.
На лейцах і конь разумны.

Язык і да Кіева давядзе.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Усяго Старонкай роднаю.

Я. Купала

У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.
І спеў ліецца ўсё мацней, —
Гулянку справіў пан Падвей.
У бубны дахаў вецер б'е,
Грыміць па ім, звініць, пяе.

М. Багдановіч

А я між курных сцен
Вучыўся словам матчыным,
І веру я,
У праўду іх, у іх дакладны сэнс.

П. Панчанка

Калі стамлюся некалі праз меру,
Адчуць бы мне падтрымку рук тваіх;
І я ў прыліў магутных сіл паверу,
Бо мы ўдваіх.

А. Пысін

Дыханне сушыць вільгаць твару,
Ад цеплыні ўзаемнай іх
На вопратцы знікае парай
Вільготнасць кропляў дажджавых.
Пад бляск маланкі ў гэтым стане
У ноч рабінавую ім
Аголены ўвесь свет паўстане,
Абмыты ліўнем агнявым.

М. Аўрамчык

Ландышы!
Я іх табе вясной прынёс
З зялёнае лясное далі.
Празрыстыя крупінкі рос
Яшчэ на лісцях трапяталі.

А. Астрэйка

Як хораша, што ты жывеш на свеце,
Як хораша, што я цябе сустрэў!

Цяпер па-іншаму мне сонца свеціць,
І ў сэрцы радасны гучыць напеў.

Э. Валасевіч

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях
Сынава сэрца рыдае.

П. Панчанка

А сняжынкі сеюць кволую імглістасць,
Падаюць бялюткі за маім акном.

П. Трус

Глыбокія, бяздонныя віры
І ручаі з празрыстаю вадзіцай,
Ссівелыя, калматыя бары,
Што жоўтаю цярушаць гліцай.

С. Дзяргай

Род абжыў мой і лес і пожні.
Ён і шчодры, ён і харобры,
Ён вітаецца першы з кожным:
— Дзень добры!

У. Паўлаў

Нам здаралася часта з табой разлучацца,
Неабсяжны прастор беларускіх палёў.
Нам здаралася іншай красой захапляцца,
Але праўду кажу і гатоў паспрачацца,
Што вясною нам трэба вяртацца дамоў.

М. Лужанін

Ледзь падумаў — як з вачэй дрымота
Адлятае, ў сэрцы халадок,
Дзе падзенецца тады спякота, —
Мераеш ізноў за крокам крок.
Так і сёння, як іду ў атаку,
Аж гарыць зямелька пада мной.

М. Сурначоў

А калісьці і я прачынаўся ў бацькавай хаце.
Чэрвень. Раніца. Росы і цішыня.
На гародзе спявае пацiху маці
Пра жаўнера маладога, пра гнядога каня.

П. Панчанка

Лівень падаў імкліва,
Адчуваў ён і сам,

Як патрэбны ён нівам,
Каласам і лясам.
Ён іграў на цымбалах
І спяшаўся, дзівак,
Натварыў ён нямала,
Гэты лівень-юнак.

Э. Агняцвет

Па кроплі сок, салодкі і густы,
Сцякаў на мох і леташнія трэскі,
І, як ад шчасця, закрычала ты:
«Глядзі, пралескі! Першыя пралескі!»

С. Грахоўскі

На Украіне, дзе Дняпро
Ля кручы пеніцца бруісты,
Гудуць вячэрняю парой
Дубы — старыя бандурысты.
Гудуць дубы па-над Дняпром.
Каб лепей чуць іх спеў узнёслы,
Мы ціха міма іх плывём,
Не налягаючы на вёслы.

М. Танк

Зычныя Й, Ў

Пры вымаўленні нескладовага й пярэдняя частка языка злёгку прыціскаецца да ніжніх пярэдніх зубоў і адштурхоўваецца ад іх. Сярэдняя частка языка падымаецца да цвёрдага паднябення, пакідаючы вузенькі праход для выдыхаемага паветра.

Пры вымаўленні нескладовага ў становішча частак моўнага апарату такое ж, як і пры вымаўленні галоснага у, толькі гук атрымліваецца больш кароткі.

Зычныя Т, Д

Пры вымаўленні глухога зычнага т рот трохі раскрыты, пярэдняяя частка языка шчыльна прыціскаецца да верхніх пярэдніх зубоў і адштурхоўваецца ад іх, выдыхнутае паветра з шумам вырываецца ў шчыліну паміж зубамі.

Пры вымаўленні звонкага зычнага д артыкуляцыйнае становішча частак моўнага апарату такое ж, як пры вымаўленні глухога зычнага т, алс гук напаўняецца голасам, які надае яму звонкасць.

1. Глухі зычны т перад звонкімі зычнымі б, д, г у сярэдзіне слова вымаўляецца як д: фудбол, баскедбол, дзеддом, дзеддомавец, дзеддомаўка, рэндген (футбол, баскетбол, дзетдом, дзетдомавец, дзетдомаўка, рэнтген).

2. Калі ў слове побач стаяць два зычныя т, то яны вымаўляюцца як асобныя гукі: шматтысячны, шматгонны, шматгыражны.

3. Спалучэнне зычнага т з наступнай афрыкатай ц утварае падоўжаную афрыкату цц: няўсякай чуццы вер (не ўсякай чутцы вер), сіццо (сітцо), тваёй маццы (матцы) рады ў кожнай хаццы (хатцы).

4. Звонкі зычны д на канцы аглушаецца і вымаўляецца як т: калі мае няўлат (не ў лад), то я ссваім назат (з сваім назад). Кожны гат (гад) мае свой ят (яд). Трапіў у нерат, ніўзат (ні ў зад), ніўперат (ні ў перад).

5. Калі ў слове побач стаяць два звонкія зычныя д, то яны вымаўляюцца як асобныя *гукі: наводдаль, паддувала, самааддаиа, цепладдача, паддаць.

6. Звонкі зычны д у сярэдзіне слова перад глухімі зычнымі вымаўляецца як т: атхадзіў (адхадзіў), брыткі (брыдкі), аттуль (адтуль), натхмар'е (надхмар'е), натшываць (надшываць), натшыць (надшыць).

7. Спалучэнне звонкага д з наступнай мяккай афрыкатай дз утварае падвойную звонкую афрыкату дз'дз: падз'дзёўка (паддзёўка), бяз'людз'дзе (бязлюддзе), адз'дзячыць (аддзячыць), паўнаводз'дзе (паўнаводдзе), шасцідзесяцігодз'дзе (шасцідзесяцігоддзе), ладз'дзя (ладдзя).

8. Спалучэнне звонкага зычнага д прыстаўкі ці прыназоўніка з наступнай афрыкатай ц (ць) вымаўляецца як тц або падвойная афрыката цц (цць): патцэглаю, пацццэглаю (пад цэглаю), атцадзіць, аццадзіць (адцадзіць), пацццяжарам (пад цяжарам), ацьцьвісьці (адцвісці), пацьцеплівацъ (падцеплівацъ).

9. Спалучэнне звонкага зычнага д са свісцячым с Перад глухім зычным т вымаўляецца як афрыката ц: самаўлацтва (самаўладства), справавоцтва (справаводства), пацтава (падстава), спацстоліна (з-пад Століна).

10. У спалучэнні звонкага зычнага д са свісцячым с перад глухім зычным к звонкі д вымаўляецца як т або афрыката ц: атскочыць (адскочыць), атскрэпці (адскрэбці), бургунцкае (бургундскае) віно, наваграцкі (наваградскі) замак, добрасусецкі (добрасуседскі);

11. У спалучэнні дс, калі д з'яўляецца часткай прыстаўкі ці прыназоўніка, звонкі зычны д можа вымаўляцца як т або афрыката ц (ць): патслухоўвае, пацслухоўвае (падслухоўвае), нацьсьвіцязьзю (над

Свщяззю), патслупам, пацслупам (пад слупам), ацьсьцябаць (адсцябаць), ацьсьвярбела (адсвярбела).

12. Спалучэнне зычных д і т з наступнай афрыкатай ч утварае падоўжаную афрыкату чч: гладчэйшы (гладчэйшы), дасьвеччанасць (дасведчанасць), здабыччык (здабытчык), дыспеччар (дыспетчар), аччэпнага (адчэпнага).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

ат, эт, іт, от, ут, ыт
т-д, т-д, т-д д-т, д-т, д-т
та, тэ, то, ту, ты
да, дэ, до, ду, ды
тадда, тэддэ, тоддо, тудду, тыдды
датта, дэттэ, дотто, дутту, дытты
тыдытытты, тудутутту, тодототто, тэдэтэттэ, тадататта
дытыдыдды, дутудудду, дотододдо, дэтэдэддэ, датададда

Дудар дудару дарма грае.
Пытае люты, ці добра абуты.
Грамада за аднаго — і адзін за грамаду.
Будзь здаровы на ўвсеь год, як калядны лёд.
Каб Кандрат ды вінават — у яго Агата вінавата.
Хто роднай мовы цураецца, той і маткі сваёй адцураецца.
Як у раю ды на краю, то лепей у пекле на скавародцы.
Казаў Ігнат: адклад не ідзе ў лад.
Гаспадарлівы не надта раскінецца.
Дарагі не абед, а прывет.
Паглядзім, з якога ты поля ягадка, з якога гнязда птушка.

Трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме.

Слова сказаў — сякераю адсек. Прывык, як дзіця да матчынай калыханкі.

Хай адсохне таму рука, хто жыве з людзьмі, а сам нялюдскі.
Хто дужэйшы, той прудчэйшы.
Так яно і было: хто дужшы, той прудшы.
Ідучы па кладачцы, на бакі не глядзі.
Шчасце адчуеш, калі добра папрацуеш.
Зарабіў на соль салонага селядца пасаліць.

Ад прадзедаў спакон вякоў

Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Я. Купала

Ёсць аднадумцы,
А ёсць аднадудцы.
Дудуць у дуды,
Што ў адну дуду.
У аднадудцаў
Усе песні вядуцца,
Калі не пра гэту —
Дык пра тую бяду.

К. Кірэенка

Радзіма!
Усім карэннем — у табе,
Адной галінкай — над табою...
Чым заслужыў, калі паспеў,
Што ты мяне з крыніцаў поіш?

А. Лойка

Сэрца — то спрасаваны стагоддзямі порах,
Міна незразумелай дакладнасці:
Бывае, не разрываецца ад вялікага гора,
А ўзрываецца ад маленькай радасці.

Я. Сіпакоў

Дзень згас... і чорная паводка па шыю места заліла.
Плыве віць нанач гнёзды горад пад бункеры, на змрочны пляц.
Ніхто не дбае, што над тынам муроў не ўспыхнуў маладзік.
Ад дзён, калі глядзелі ў сіню, — мінула вечнасць, не гады.

Н. Арсеннева

Шыпіць пласцінка.
У сэрцы многа дум.
Кручу: «Над домам флюгер ёсць у любай».
І Шуберт падзяляе ціхі сум.
О «Зімні шлях!» Забытыя будынкі,
Забыты водар ад каханых губ.

У. Караткевіч

Хто пытаецца ў мяне дарогу на ўсход,
хто — дарогу на захад...
Нібы раздарожжа, я паказваю
ўсім, куды ісці,
а сам застаюся на месцы —

на гэтай зямлі, пад гэтым небам.
Занадта лёгкі для глыбіні,
занадта цяжкі для вышыні,
занадта цэласны, каб падавацца
ў які-небудзь бок...

А. Разанаў

А ў полі кветкі адцвіталі...
Адны ўзыходзілі гусцей.
Ой, песня, песня дарагая,
У душы ты век не адцвіцеш!..
Не адцвіцеш і не завянеш!
І толькі ўвечары адна
Журыцца будзе на кургане
У жаўтацвецені сасна.

П. Трус

Ад спёкі пышуць дахі і асфальт.
На вулцы ўецца пыл, і грукаціць фурманка;
«Каробушку» пяе дзіцячы альт,
І надрываецца абрыдлая шарманка.

М. Багдановіч

О навагрудскі край — мой родны дом,
Праслаўлены Трамбецкага пяром,
Куды б мяне ні кінуў лес жыццёвы,
Забыць я не змагу твае палі, дубровы.

А. Міцкевіч

Будучыня.
Не бачу яе — прадбачу,
не чую — а прадчуваю,
не ведаю — а прадведваю...
Зямля запяклася, як чорная кроў.
Шчэрацца ззаду здані.
Боязь засцерагае: у будучыні — смерць!..
Адвага натхняе: у будучыні — неўміручасць!..
Мы аддзіраем сябе ад зямлі.
Мы ацярушваем ад глухаты свой слых,
адтуляем ад слепаты свой зрок,
з няўцямнасці выплаўляем сваё разуменне.

А. Разанаў

Вось так — з адкрытым небам — заначую,
А зоркі будуць днець у вышыні.
І праз траву гаючую адчую,

Як у зямлі б агата цеплыні.

Я. Янішчыц

Напоўніўся весткаю позірк,
а слых — цішынёю...
Рукі, што бралі,
усё адцалі, не ўтрымаўшы,
і ад цаюць:
раняць патайна рэчы,
якія мець сабе хочам,
і ўсё, што ні хочам, — раніць...
Блаславёны, хто ўбогі...
хто плача... хто церпіць...
і хто сябе аддае беззваротна...
Звязаліся дні ў сем дзён —
кожны прычынай і вынікам кожнаму,
а за паземам тамлее восьмы,
і вестка адтуль:
хто сябе аддае беззваротна...

А. Разанаў

Ёсць тайны знак у песні неўміручай,
А гукі-словы — сэрца спарышы.
Ці знацьмеш ты, о колькі рос гаручых
Змясцілася на дне маёй душы.
Хай над усім мяккі вятрэч трапеча
І молада хвалюецца жытцо.
Прашу цябе: у гэты светлы вечар
Не гавары мне праўды пра жыццё.

Я. Янішчыц

Страшна ўвечары жыць
З незагойнай ранай.
Ты сказаў: «Адбаліць,
Заставайся каханай».
Страшна ноччу мне быць
З гаркатой апантанай.
Ты сказаў: «Адшчыміць,
Заставайся каханай».
Ах, нуда — не бяда
Ў цішыні расстралянай.
На праломе ільда
Застаюся каханай.

Я. Янішчыц

Зычныя С, З

Пры вымаўленні свісцячага зычнага с рот раскрыты адвольна, пярэдняя частка языка злёгку дакранаецца да ніжніх зубоў, бакі языка — да верхніх бакавых зубоў. Паміж языком і цвёрдым паднябеннем застаецца невялікая шчыліна, праз якую выходзіць выдыхаемае паветра. Вымаўляецца свісцячы зычны с вельмі лёгка, без націску, таму што ўзмацненне гуку выклікае празмерны свіст.

Пры вымаўленні звонкага зычнага з артыкуляцыйнае становішча частак моўнага апарату будзе такое ж, як і пры вымаўленні зычнага с, толькі гук напаўняецца голасам, які надае яму звонкасць.

Няправільнае вымаўленне свісцячых і шыпячых гукаў называецца сіглштызмам. Найбольш вядомыя варыянты сігматызму: паміжзубны — кончык языка пры вымаўленні не дакранаецца да ніжніх пярэдніх зубоў, а прасоўваецца паміж верхнімі і ніжнімі зубамі, і свісцячыя гукі набываюць адценне шапялявасці; бакавы — выдыхаемае паветра накіроўваецца не да цэнтра пярэдніх зубоў, а ў правы ці левы бок, таму пры вымаўленні свісцячыя і шыпячыя гукі суправаджаюцца непрыемным хлюпаннем; насавы — выдыхаемае паветра накіроўваецца ў нос, і вымаўленне свісцячых гукаў напамінае храп; губна-зубны — свісцячыя вымаўляюцца як губна-зубныя в і ф.

1. Свісцячы с перад мяккімі зычнымі с, л, м, н, ц, п, в вымаўляецца мякка: сьсівеў (ссівеў), бясьсьмерце (бяссмерце), бясьсьледна (бяссследна), восьсю (воссю), касьсё (кассё), усьсесьці (уссесці), церасьсядзёлак (церассядзёлак);

сьлетусьлет (след у след), сьляпіць (сляпіць), сьлёзы (слёзы), сьлізгота (слізгота), сьлюда (слюда), сьлясак (слясак), цесьля (цесля);

сьмерч (смерч), сьмяшыць (смяшыць), сьмертухна (смертухна), сьмецьце (смецце), усьмятку (усмятку);

цісьненьне (цісненне), сьнегапаг (снегапад), сьнедаць (снедаць), уДзісьне (у Дзісне), блісьне (блісне);

учарсьцьвелы (учарсцвелы), шасьцярня (шасцярня), чысьцюткі (чысцюткі), дзьвесьце (дзвесце), дасьціпнасць (дасціпнасць), сьцізорык (сцізорык);

сытектакль (спектакль), сьпецыяліст (спецыяліст), сьпецыфічны (спецыфічны), сьпёка (спёка), сьіеўнік (спеўнік), эксьперымент (эксперимент), эсьперанта (эсперанта);

сьветапогляд (светапогляд), сьвердзел (свердзел), сьвяжэйшы (свяжэйшы), сьветлавокі (светлавокі), усясьветны (усясветны), Сьвержань (Свержань).

2. Свісцячыя зычныя с, сь перад звонкімі вымаўляюцца як з, зь: айзьберх (айсберг), хрэзьбіны (хрэсьбіны), казьба (касьба), нозьбіт (носьбіт), нрозьба (просьба), солзьберскі (солсберскі), фазген (фасген), бейзбол (бейсбол), бейзбаліст (бейсбаліст), дызгармонія (дысгармонія).

3. Свісцячы зычны с перад мяккімі зычнымі к, ф, х вымаўляецца цвёрда: склеіць, скепсіс, скерца, скіба, сківіца, скінуць, сфера, сфінкс, схема, схільнасці, схінацца, схімічыць.

4. Свісцячы зычны с перад зычнымі ш, ч вымаўлясцца як ш. шшытак (сшытак), шшараваў (сшараваў), рашшыраны (расшыраны), шшыць (сшыць), шшаткаваць (сшаткаваць), шшэрхлы (сшэрхлы);

шчакаць (счакаць), шчарнець (счарнець), шчытваць (счытваць), шчэрчваць (счэрчваць), шчысціць (счысціць), шчэгілівацца (счэплівацца).

5. Звонкі зычны з перад мяккімі зычнымі дз, л, з, б, в, м, н вымаўляецца мякка:

зьдзейсьніць (здзейсніць), зьДзімам (з Дзімам), безьдзяцей (без дзяцей), зьдзеравяненьіе (здзеравяненне), зьдзівіць (здзівіць), нязьдзейсьнены (няздзейснены);

зьлёну (з лёну), зьлета (з лета), церазьлес (цераз лес), зьлёх (злёг), безьліч (безліч);

зьзяе (ззяе), зьзімы (з зімы), зьЗінаю (з Зінаю), безьзярняці (без зярняці), зьзямлянкі (з зямлянкі);

зьбянтэжанасьць (збянтэжанасць), зьберагу (з берагу), зьбехчы (збегчы), зьбірацца (збірацца), зьбіць (збіць);

зьвесткі (звесткі), зьВераю (з Вераю), зьвініць (звініць), зьвярынец (звярынец), зьвязаць (звязаць);

зьмяя (змяя), церазьМір (цераз Мір), зьмесца (з месца), зьмены (змены), зьмяркаецца (змяркаецца);

зьнябыцца (знябыцца), зьнерваваццa (знерваваццa), зьняць (зняць), зьНясьвіжа (з Нясвіжа), церазьНёмап (цераз Нёман).

6. Звонкі зычны з перад мяккімі зычнымі п, с, ц аглушаецца і вымаўляецца мякка:

сьПетрыкава (з Петрыкава), бесьпячаткі (без пячаткі), сьПетрусём (з Петрусём), сьгіесьнямі (з песнямі), сьперамогай (з перамогай);

сьсенажаці (з сенажаці), сьсемінара (з семінара), бесьСяргея (без Сяргея), бесьсярпа (без сярпа), церасьСвіслач (цераз Свіслач);

сьцеста (з цсста), сьцёскам (з цёзкам), сьціра (з ціра), сьцесьцем (з цесцем), бесьцьвіка (без цвіка).

7. Звонкія зычныя з, зь на канцы слова аглушаюцца і вымаўляюцца як с, сь: грась (гразь), мась (мазь), злась (злазь), наскрось (наскрозь).

8. Звонкі зычны з перад глухімі ш, ч вымаўляецца як ш: шіпафы (з шафы), церашШклоў (цераз Шклоў), шшахматыстам (з шахматыстам), шшоўку (з шоўку), цсрашшашу (цераз шашу);

грушчык (грузчык), шчэрвеня (з Чэрвеня), шчабору (з набору), шчэмпіёнам (з чэмпіёнам), шЧарнігіным (з Чарнігіным).

9. Звонкі зычны з перад цвёрдымі глухімі зычнымі к, х, т, с, ц, іі вымаўляецца як с:

падмаска (падмазка), бліска (блізка), скалена (з калена), скнішкі (з кніжкі), бясклею (без клею), сканапель (з канапель);

схваробаю (з хваробаю), схаты (з хаты), схоладу (з холаду), схвалі (з хвалі), схвоі (з хвоі), схутара (з хутара);

ствайім (з тваім), стым (з тым), статам (з татам), сТарасам (з Тарасам), стабой (з табой), сторбаю (з торбаю), сТалачына (з Талачына);

ссалам (з салам), ссошкаю (з сошкаю), бяссолі (без солі), ссэрца (з сэрца), ссынам (з сынам), ссырога (з сырога), ссырадою (з сырадою);

сцарквы (з царквы), сцэглы (з цэглы), сцыркулем (з цыркулем), сцырульні (з цырульні), сцэбра (з цэбра);

спустога (з пустога), споля (з поля), церасплот (цераз плот), беспастуха (без пастуха), сПарыжа (з Парыжа), церасПружаны (цераз Пружаны).

10. Звонкі зычны з перад зычнымі ж, дж вымаўляецца як ж: жжуравін (з журавін), цераж Жлобін (цераз Жлобін), жжыта (з жыта), мажжачок (мазжачок), бежжалеза (без жалеза);

бражджаць (бразджаць), заежджаны (заезджаны), жджунгляў (з джунгляў), жджасаркестрам (з джаз-аркестрам), цераж Джакарту (цераз Джакарту), яжджалы (язджалы).

11. Звонкі зычны з перад мяккім зычным г вымаўляецца цвёрда: згіп (згіб), з геаграфіі, з геолагам, з гейзера, без Генадзя.

12. Звонкі зычны з перад мяккімі зычнымі к, х аглушаецца і вымаўляецца як свісцячы с: сКемерава (з Кемерава), сКёльна (з Кёльна), скефальлю (з кефаллю), скіраўніком (з кіраўніком), церасКенію (цераз Кенію), скеліха (з келіха);

схітрынкаю (з хітрынкаю), схібамі (з хібамі), сХеменгуэем (з Хеменгуэем), сХелемскім (з Хелемскім), схійьдзі (з хіндзі), церасХерсон (цераз Херсон), схеўраю (з хеўраю), бесхіхійхехехе (без хі-хі і хе-хе-хе).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

ас, эс, іс, ос, ус, ыс

са, сэ, сі, со, су, сы

с-з, с-з, с-з з-с, з-с, з-с
се, сё, сю, ся зе, зё, зю, зя
сасса, сэссэ, сіссі, соссо, суссу, сыссы
зазза, зэззэ, зіззі, зоззо, зуззу, зыззы
сазасаса, сэзэсэсэ, сізісісі, созососо, сузусусу, сызысысы
засазаза, зэсэзэзэ, зісізізі, зосозозо, зусузузу, зысызызы
сессе, сёсё, сюссю, сясся
зеззе, зёзё, зюззю, зяззя
сезесесе, сёзёсёсё, сюзюсюсю, сязясяся
зесезезе, зёсёзёзё, зюсюзюзю, зясязязя
Згода збірае, нязгода растрасае.
Сем седакоў — не воз, абы конь вёз.
Ідзі з людзьмі, то не згубішся.
Калі раіш суседу, то абмазгуй да следу.
Чаго спяшацца: хутчэй, як барзджэй, не будзе.
Бегла ліска каля лесу блізка: ані яе дагнаць, ані следу спазнаць.
Ілля блізка, гніся, бабка, нізка.
Уставай раненька ды жні да пазненька.
Нясмелага з няўмелым не распазнаеш.
З печы, з полу — усе да столу.
Сей жыта ў прысак, авёс у гразь, то будзеш князь.
Барзджэй то барзджэй, але не хапайся дужа.
І з Пракопам і без Пракопа — усе роўна ні стуль, ні ссюль.
Прайдзісвет не пройдзе свет — у пастку ўваліцца.
Дзе просьбаю, дзе грозьбаю, але разжыўся на зуб палажыць.
Не смейся з людзей — смейся з сябе ці з сваіх дзяцей.
Свой сячыся, рубайся, а чужы не мяшайся.
Звер не звер, але чорт яму вер: віляе хвастом, а вые ваўком.
Кошцы смешкі, а мышцы слёзкі.
Што робіцца наспех, тое выходзіць курам на смех.
Ад вялікага смеху да слёз недалёка.
Дзе мужык з слаўцом, там за ім пуга з вузлом.
З языком, як з мячом: завіхайся, але не спяшайся.
Хто косіць, хто не косіць, а есці ўеякі просіць.
З чужога каня і ў гразі ссядаюць.
Работа не бясчэсціць чалавека, а корміць і поіць яго.
Бяда без дзяцей, але і бяда з дзецьмі.
І з сынамі траеуць сумамі.
Не бойся звяглівага, а бойся куслівага.
Сады садзі і ў маладосці і ў старосці.
Ці з перцам, ці не з перцам — абы з шчырым сэрцам.

Ад спеху нарабіў смеху.

Сляпой курыцы і жвір — пшаніца.

Сцеражонага і бог сцеражэ.

Лепей хлеб з вадою, як пірог і мёд з бядою.

Быў бы хлеб, а мышы збягуцца.

Не хочаш у маладосці працаваць, будзеш на старасці з торбачкай танцаваць.

Дзесь цвіркун бесперастанку
Цягне сумную спяванку.

Я. Колас

Сем семярэй, сем старых свіней, свінка, свінок, свінчын браток і адно парасятка.

Я. Брыль

Ляціць Змей над зямлёю, а за ім такая віхура ўзнімаецца, што ўсе дрэвы з карэннем выдзірае з зямлі.

Каваль-асілак, казка

Выпадковы, нязнаны, няпрошаны госць.
Ад'язджаю, ні з чым пакідаю
Край, які, як забыў, што мінулае ёсць,
Што ноч будучыні — не пустая.

А. Лойка

Жытло маёй душы
Заселена табою,
Святло маёй тугі
Зацеплена табой.
Світае мне ўначы,
Я высветлен табою.
Не пакідай жытла,
Святло маёй тугі...

Р. Барадулін

Сам да цябе прыйшоў пакорна я
З няўтульнасці, як з вечнае разлукі,
У кайданы твае, любоў мая,
Падставіўшы добраахвотна рукі.
Я без цябе — без рэчышча вада,
Якой ніколі не сустрэцца з морам.
Багінямі да нас прыходзяць жонкі
З нявест у шлюбнай квецені вясны.
Звініце ж, абручальныя пярсцёнкі,
Кахання залатыя кайданы.

П. Макаль

Вартуюць зрэбны змрок
счарнелыя руіны —
мінулых, жорсткіх дзён
нязжатае дабро.

Н. Арсеннева

Дзікай спакусніцай прычараваны,
Боль адчуваеш ты сэрца,
Блудзіш, пакінуты і ашуканы,
Дзеўчына ж недзе смяецца.
Хіба патрэбна блукаць тут з журбою
Аж да праменняў світальных?
Лепей, юнача, мы будзем з табою
Плаваць у водах крыштальных.

А. Міцкевіч

Падаюць сняжынкі —
дыяменты-росы,
Падаюць бялюткі
за маім акном...
Расчасалі вішні
шоўкавыя косы
І ўранілі долу
снегавы вянок.
Адхінае вечар
тонкія мярэжы,
На акне альвасы
дагарэлі ў сне.
А ў душы кзяцістасць
і такая свежасць,
І з вачэй усмешкі
сыплюцца на снег.

П. Трус

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помню, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
Глянь іншы раз на яе, — у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

М. Багдановіч

Свет захлынаўся ад святла.

Ступаў я ў твой гарачы след.
Была вясна.
І ты была.
Як снег, кіпеў вішнёвы цвет.
Не ведаў я ні звад,
Ні здрад,
Сузор'яў распазнаў сакрэт.
Твой смех звінеў,
Яснеў пагляд вясновы,
Як вішнёвы цвет...

Р. Барадулін

Вось я
шнурок пацерак з медзі
з шыі зняла без прынукі:
хай нас асенняй дакукай
не харашаць і не параняць.

Н. Арсеннева

Нікога,
хто ў гэты свет прыходзіць,
не абыходзіць доля:
атрымліваюць усе без вынятку
два найвялікшыя падарункі —
жыццё і смерць.

А. Разанаў

Спасцігаю і слова, і справу,
але ўсім жыццём даводзіцца спасцігаць,
што свет, які ты намерваешся здабыць,
ты ўжо здабыў і так —
самім з'яўленнем на свет.

А. Разанаў

Спазніўся ўстаць
і спазніўся легчы,
спазніўся пачаць работу
і спазніўся скончыць —
і сталі мяняцца месцамі дні і почы,
вынікі і прычыны,
і я апынуўся насупраць самога сябе.

А. Разанаў

Калісьці мы разумелі,
што такое дабро,
што такое зло,

і напісалі пра гэта кнігі.
Цяпер мы разумныя тым,
што напісана ў кнігах,
але самі дабро ад зла
адрозніць не можам.

А. Разанаў

Ішоў па зямлі,
еў яблыкі,
зярняты збіраў і
высейваў у дол...
Калі прайду ўсю зямлхо —
вярнуся
ў квітнеючы сад.

А. Разанаў

Жыву між зямлёй і небам,
Каб стаць з цягам часу
асобна зямлёй і
небам.

А. Разанаў

Плылі, плылі дамы
над сцерплай Беларуссю.
Змяталі след па тых,
што мусілі пайсці.
З пабітых шыб, з пустых сяней
глядзела вусціш.
А ліпень, хоць бы што,
іх сонцам залаціў.
Пад хатай Дзянісоў —
як мур, быллё буяла
ды ластаўкі крыллём
чыркалі цішыню.
І веяла з пустых кустоў
старой навалай
і новаю,
якой — і нам не абмінуць.

Н. Арсеннева

Вось і прыйшлі мы.
Цяпер уявіце паляну.
Зубр на паляне стаіць
нерухомы, як быццам
Роздуму поўны над светам і зменлівым лесам.

Будзем спяваць аб адным, хоць у вершах часамі
Можна сустрэць і чароды аднолькавай масці.
Дзіўнага шмат выпадала пабачыць мне ў лесе,
Большага ж дзіва, чым тое, калі звар'яцела
Зубр на ахвяру нясецца з падскокам, не бачыў.
Страхаў жа бачыў нямала. Аднойчы ў дуброве
Звер падчапіў жарабка з седаком і рагамі
Так шыбануў, што сядок апынуўся ў абдымках
Дуба галлістага — там і знайшоў паратунак.

М. Гусоўскі

Зычныя Ш, Ж

Пры вымаўленні глухога зычнага ш паміж зубамі невялікая шчыліна, шырокі канец языка ўзнімаецца да цвёрдага паднябення. Гук утвараецца ў выніку трэння выдыхаемага паветра аб цвёрдае паднябенне і суправаджаецца лёгкім шумам.

Пры вымаўленні звонкага зычнага ж паміж зубамі невялікая шчыліна, шырокі канец языка больш, чым пры вымаўленні шыпячага ш, загінаецца да цвёрдага паднябення, галасавыя звязкі і кончык языка вібрыруюць.

У беларускай літаратурнай мове зычныя ш і ж заўсёды вымаўляюцца цвёрда.

1. На канцы слова звонкі зычны ж аглушаецца і вымаўляецца як ш: гуш (гуж), нядуш (не дуж), рэш (рэж), паўзьбярэш (паўзбярэж), уздоўш (уздоўж).

2. У спалучэнні зычных жск пры вымаўленні выпадае звонкі зычны ж: сураскі (суражскі), печанескі (печанежскі), калескі (калежскі), Белавеская (Белавежская) пушча, Нясьвіскі (Нясвіжскі) замак, рыскі (рыжскі) бальзам.

3. У спалучэнні зычных шск пры вымаўленні выпадае шыпячы ш: латыскія (латышскія) стралкі, манаская (манашская) сутана, чэскае (чэшскае) шкло.

4. Спалучэнні шс, жс паміж галоснымі вымаўляюцца як падоўжаны мяккі сьсь: Калі топісься (топішся), той (то і) за брытву хопісься (хопішся). Каля вады ходзячы намочысься (намочышся), каля агню апячэсься (апячэшся). Ня васься (не важся) чапаць яго.

5. Спалучэнне звонкага зычнага ж і афрыкаты дж у сярэдзіне слова вымаўляецца як два асобныя гукі ж і дж: даж-джавік (дажджавік), маж-джэр (мажджэр), драж-джаванне (дражджаванне), задаж-джылася (задажджылася), бездаж-джоўе (бездажджоўе),

бяздож-джыцца (бяздожджыцца), а на канцы слова спалучэнне ждж аглушаецца і вымаўляецца як шч: дошч (дождж).

6. Пасля слова на галосны часціца ж аглушаецца і вымаўляецца як ш толькі ў тым выпадку, калі яна стаіць перад глухім зычным: дзешдзенесься (дзе ж дзенешся), прыйшлашяна (прыйшла ж яна), каліштоебудзе (калі ж тое будзе), былош пустое (было ж...), кахаюш Кацярыну (кахаю ж...).

7. У сярэдзіне слова перад глухімі звонкі зычны ж аглушаецца і вымаўляецца як ш: цяшка (цяжка), снешкі (снежкі), на берашку (беражку), мушчына (мужчына), нябошчык (нябожчык), перабешчык (перабежчык), дарошка (дарожка).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

ш-ж, ш-ж, ш-ж ж-ш, ж-ш, ж-ш
аш, эш, іш, ош, уш, ыш
ша, шэ, шо, шу, шы
жа, жэ, жо, жу, жы
шажжа, шэжжэ, шожжо, шужжу, шыжжы
жашша, жэшшэ, жошшо, жушшу, жышшы
сашажа, сэшэжэ, сошожо, сушужу, сышыжы
зажаша, зэжэшэ, зожошо, зужушу, зыжышы

За справу бярэшся — не бойся і не хваліся.

Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета — за снапы і вазы.

Добра будзе — напрацуешся і накрасуешся.

Кепска будзе — нагаруешся і накукуешся.

Вады не засіліш не паварушыўшыся, рыбы не зловіш не намачыўшыся.

Свая сярмяжка нікому не цяжка.

Саплівага не дабудзішся, ляпівага не дашлешся і не дажджэшся.

Пасля дажджу ўсё расце, як на дражджах.

Калі да дваццаці работу рабіць не павучышся, то да сівой барады намучышся.

Каб не ежка ды не адзежка, была б грошай поўная дзежка.

Горш, калі баішся: і ліха не мінеш, і надрыжышся.

На чужы каравай рот не разявай, караваю не праглынеш, а рот да вушэй раздзярэш.

Калі ўлетку на сонцы не напячэшся, то ўзімку з холаду натрасешся.

Дружба дружбаю, а служба службаю.

Хто парасё ўкраў, таму ў вушшу пішчыць.

Гарошку хваліў і поп, і Ярошка, і я трошка.
Хвалілі патрохі, патрошку, ды перахвалілі Гарошку.
Жыць, пажываць ды дабро нажываць.

Дожджык, дожджык дробненькі.
Будзь жа, дожджык, добранькі.

З народной песні

Халодныя ад дожджыкаў вяргіні,
Халодны ўжо ад кропляў дажджавых
Сумуе яблык на паўгольм дрэве:
Забыліся.

У. Караткевіч

Вось ён — бізон ваш, што ў нас называецца зубрам!
Масці паджарай, як мешанка бурай і чорнай,
Быццам з вякоў у вякі пераходзіў праз горны
І гартаваўся, сабраўшы адцепні стагоддзяў.

М. Гусоўскі

Тата казаў мне, што сповы мужчыны
Не заслугоўваюць веры,
Бо хоць у словах і спеў салаўіны,
Ды ў сэрцы ліса памеры.
Злога падману я вельмі баюся,
Здрады каварнай, мой дружа...
Можа, я к просьбе тваёй і схілюся,
Толькі ці любіш ты дужа?

А. Міцкевіч

Дождж манатонны і густы, —
Сум, нібы дождж, і дождж, як сум,
Намоклі стрэхі і шчыты.
У сэрцы цяжка іх нясу.
Куды ўцячы ад горкіх дум?..
Паромшчык, мо паможаш ты?..
Ды сум, як дождж, і дождж, як сум,
На гэтым беразе і тым!..

А. Лойка

Лінія небасхілу.
У дзяцей пераймаюць дарослыя
Гэтую зманлівую, як матчына песня, нітку,
Каб адкрываць невядомае
Тое, што ёсць за домам;
Каб за ніткай ісці без стомы,

Некалі выйшаўшы з дому;
Каб не заседжвацца дома —
З падарожжаў вяртацца дадому.
Ах, гэтая зманлівая нітка!
Вечна яна дражніцца новымі небасхіламі.

Я. Сіпакоў

У добры шлях! У добры час!
Трывога адкалосіцца.
Смяешся ты — і я ў адказ,
Хоць смех на слёзы просіцца.

Я. Янішчыц

Калі дажджуеш у самоце
Пад шэпт суцішаны дажджын,
Здаецца, з імі ты ў палёце,
А не вось тут — адзін, адзін.
    Здаецца, з імі — ёсць патрэба! —
    Ляціш, вяртаешся здаля
    З халоднае краіны Неба
    Ў краіну цёплую — Зямля.
    Вяртаешся — дамоў, як птушкі,
    Ляціш, як вырай, на сады;
    І вольным летам пазагушканы,
    Вясеннім небам пахнеш ты.
Дажджыны шэпчуцца наўкола,
Паспешна крыллем шапацяць.
А з імі ты ляціш, вясёлы,
Да ніў — зялёнага жыцця.

Я. Сіпакоў

Ні гукам, ні званком не адгукнешся.
Атуліць колкай памяці сувой.
Праз лес мой
    ты, як бура, пранясешся.
    І дождж размые воблік твой.

Я. Янішчыц

Калі прыходжу на раздарожжа
і чытаю на камені
надпісы-перасцярогі —
разумею,
што чалавеку нічога не застаецца,
як, зрэшты, выбраць
тую дарогу, якая яго спакон веку чакае, —

дарогу ўгору.

А. Разанаў

Калі нячутна снег ляціць над светам
І доўга не праходзяць маразы,
Ты нібы дар з'яўляешся паэту,
Здзіўляючы да чуйнае слязы.
Не адхіліць бы кволую былінку,
Не размяняць на дробязь пачуцця!
О, гэта ты — нязгасная іскрынка:
Метафара сумнення і жыцця.

Я. Янішчыц

— Бачыш, дожджык па лузе ідзе,
Дажджанятак за рукі з сабою вядзе.
- Дзе?
Дажджаняткі?
То ж буйныя кроплі.
Уцякайма, пакуль не прамоклі.

Э. Агняцвет

Зычныя ДЖ, Ч

Пры вымаўленні зацвярдзелай звонкай афрыкаты дж рот раскрыты адвольна, язык шчыльна прыціскаецца да всрхніх пярэдніх зубоў і з сілай адштурхоўваецца ад іх, выдыхаемае паветра з шумам вырываецца ў шчыліну паміж зубамі.

Пры вымаўленні глухой афрыкаты ч становішча частак моўнага апарату такое ж, як пры вымаўленні афрыкаты дж, толькі ўтвараецца ч без удзелу голасу.

1.Вымаўленне афрыкаты дж як звонкага зычнага ж парушэнне нормы беларускага літаратурага вымаўлення: джас (джаз), джазавы, джала, джаліць, джгнуць, джагануць, джагаць, джунглі, джынсы, джын, джып, джэм, Джамбул Джабаеў.

2. У словах, дзе д — гук прыстаўкі, а ж — гук ко раня, трэба вымаўляць два асобныя зычныя гукі, а не афрыкату дж: паджаць (паджаць), ад-жыў (аджыў), пад-жылкі (паджылкі), паджаўціць (паджаўціць), пад-жартаваць (паджартаваць), аджывіць (аджывіць), ад-жлукціць (аджлукціць).

3. На канцы слова звонкая афрыката дж аглушаецца і вымаўляецца як ч: калеч (каледж), катэч (катэдж), Джорч (Джордж), брыч (брыдж).

4. Спалучэнне глухіх зычных чц вымаўляецца як падоўжаная зацвярдзелая афрыката цц: пазвыццы (па звычцы), у хустаццы (у хустачцы), у спадніццы (у спаднічцы), у сароццы (у сарочцы), у чашаццы (у чашачцы).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

т-ш, т-ш, т-ш
тш, тш, тш, тш, тш
тштш-ч, тштш-ч, тштш-ч
тша, тшэ, тшо, тшу, тшы
тшач, тшэч, тшоч, тшуч, тшыч
ча, чэ, чо, чу, чы
ач, эч, оч, уч, ыч
тшачча, тшэччэ, тшоччо, тшуччу, тшыччы
чачча, чэччэ, чоччо, чуччу, чыччы
ч-дж, ч-дж, ч-дж
дж-ч, дж-ч, дж-ч
джа, джэ, джо, джу, джы
джача, джэчэ, джочо, джучу, джычы
чаджа, чэджэ, чоджо, чуджу, чыджы
джачча, джэччэ, джоччо, джуччу, джыччы
чаджджа, чэджджэ, чоджджо, чуджджу, чыджджы
джаджджа, джэджджэ, джоджджо, джуджджу, джыджджьт
Шэршань так джагнуў, ох балюча, гад, джагнуў.
Дзеці паджгалі ў лес без аглядкі.
Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш.
Вясна кажа: ураджу, восень кажа: яшчэ пагляджу.
Цякучае нацячэ, бягучае набяжыць.
Будзе дождж ісці, будзе хлеб расці.
Сціснуліся, як селядцы ў бочцы.

Чалавеча, чалавеча, чаму часам скачаш, а часам плачаш? Дзяўчынка Чарнічка мае чатыры чатырнічкі: на кожным чатырнічку па пяці пяцірнічкаў.

Ашчаджаўся, ашчаджаўся, хлеб з'еў,.а квас астаўся.

Ні чуткі, ні прачуткі, а чатыры чорныя карчы чарнелі чорнымі чубамі.

Рыбак рыбачыў, а рыбы не бачыў.

Ніхто не бача, як сірата плача, а ўсякі бача, як сірата скача.

Быць бычку на лычку, а цялушцы на вяровачцы.

Не чын чалавека падвышае, а чалавек чын.

Каб у дамочку, у садочку, у хлявочку, у полечку ўсё радзіла і пладзіла.

Хвошча, хвошча дождж.
Воўк схаваўся ў хвошч.
Сам пад хвашчом,
А хвост пад дажджом.

В. Вітка

Няма на іх, вужак, паморку,
Вось па такіх чартоў лазатых,
На гэтых джынджыкаў праклятых!

Я. Колас

Княжацкі ўказ пад пагрозай адказнасці строгай
Не дазваляе знішчаць ні зубрыцаў, ні моладзь
І ашчаджае тым самым багацці лясныя.
Скарбы свае пашы людзі на золата пават
Не прамяняюць. Здаўна іх жыццё навучыла:
Нашы лясы — гэта нашых даброт і багацця
Невычарпальны калодзеж.

М. Гусоўскі

Тачу, тачу, абточваю,
Начыста заточваю,
Канцы з канцамі сточваю.
Калі што не даточана,
А можа ператочана, —
Хутчэй,
Хутчэй даточвайце
І не пераплочвайце.

В. Вітка

Джагнула штосьці Нінку —
бо асу ўзяла за спінку.
Нінка, пэўна, і не знала,
што кусака мае джала.

Э. Агняцвет

Я там ужо быў,
і гэта я ўжо рабіў,
і тое ўжо зведаў... —
стаю сярод белага дня
з жыццём ашчаджоным
для невядомай справы,
для невядомай думкі

і для невядомага дня.

А. Разанаў

Скача чапля па балоце,
Чачотка — у чароце,
А губаты чачот
Топча, топча агарод.
Я чачота падпільную,
Чапялою пачастую.
Чаплі-шызапёрцы —
Неразлучнай парачцы
Паднясу па чарачцы
Чарнічнага кісялю.
Дам цётачцы чаплі
Кавалачак вафлі.
А чачотцы — чачавіцы,
Табе ж, чачот, — чамярыцы.

В. Вітка

Надакучыла хадзіць паводле сваёй хады,
надакучыла ездзіць паводле правілаў дарожнага руху,
надакучыла лятаць паводле законаў аэрадынамікі...
Паклаўшыся на зямлю,
Гляджу ў неба —
асвойваю думкаю неабсяжнасць.

А. Разанаў

Па-над шчыраю Шчарай, па-над шчодраю Шчарай,
Па-над плынню чырвонай і рыжай травой
Плачуць чорныя цені на фоне пажару,
Моляць кані аб кронлі вады дажджавой.

У. Караткевіч

Зычныя ДЗ, Ц

Пры вымаўленні звонкай афрыкаты дз рот раскрыты адвольна, пярэдняя частка языка прыціскаецца да верхніх пярэдніх зубоў і адштурхоўваецца ад іх, выдыхнутае паветра з шумам вырываецца ў шчыліну паміж зубамі.

Пры вымаўленш глухой афрыкаты ц становішча моўнага апарату такое ж, як і пры вымаўленні афрыкаты дз, толькі ўтвараецца ц без удзелу голасу.

1. Вымаўленне звонкай мяккай афрыкаты дзь як дь будзе парушэннем нормы беларускага літаратурнага вымаўлення: дзьве (дзве),

дзьверы (дзверы), дзея, дзевачка, дзеванька, дзет (дзед), дзетка (дзедка), дзедзіч, дзенебудзь (дзе-небудзь), дзенідзе (дзенідзе), дзесьці (дзесьці), дзесяць.

2. Звонкая афрыката дз, дзь на канцы слова аглушаецца і вымаўляецца як ц, ць: ксёнц (ксёндз), непагаць (непагадзь), мядзьвець (мядзведзь), сяць ды ець (сядзь ды едзь).

3. У словах, дзе зычны д з'яўляецца часткай прыстаўкі, аз — гукам кораня, трэба вымаўляць два асобныя зычныя, а не афрыкату дз: ад-завіся (адзавіся), пад-зямельле (падзямелле), адзваніць (адзваніць), над-зем'е (надзем'е), пад-золісты (падзолісты), пад-зорная (падзорная) труба, ад-зычыць (адзычыць).

4. Звонкая мяккая афрыката дзь перад глухімі зычнымі вымаўляецца як ць: някосіць Фецька, бо ў торбе рэцька (Не косіць Федзька, бо ў торбе рэдзька).

5. Цвёрдая звонкая афрыката дз сустракаецца толькі ў асобных словах, у іншамоўных геаграфічных назвах і прозвішчах: дзынкаць, дзвынкаць, дзвынкнуць, дзылінканьне (дзылінканнс), дзылінкнуць, дзылінкаць, дзын-дзын, дзот, дзындра, вандзэлак, нэндза, пэндзаль, завэдзгаць, Дзаўджыкаў, Гудзонаў заліў і іншых.

6. Афрыката ц псрад мяккім зычным в вымаўляецца мякка: чацьвяртак (чацвяртак), збуцьвелы (збуцвелы), пазнацьвет (пазнацвет), зацьвярдзелы (зацвярдзелы), цьвіркун (цвіркун), чацьвер (чацвер), цьвінтар (цвінтар), цьвярозы (цвярозы).

7. Глухая афрыката ц, ць перад звонкімі зычнымі г, б, бь вымаўляецца як дз, дзь: маладзьба (малацьба), жанідзьба (жаніцьба), барадзьба (барацьба), клядзьба (кляцьба), барадзьбіт (барацьбіт), спедзі руна (спецгрупа).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

т-с, т-с, т-с; тс, тс, тс; тс-ц, тс-ц, тс-ц, тс-ц, тс-ц
тсац, тсэц, тсіц, тсоц, тсуц, тсыц
ац, эц, іц, оц, уц, ыц
ца, цэ, ці, цо, цу, цы
цатсац, цэтсэц, цітсіц, цотсоц, цутсуц, цытсыц
ець, ёць, юць, яць це, цё, цю, ця
дзе, дзё, дзю, дзя
цедзе, цёдзё, цюдзю, цядзя
дзеце, дзёцё, дзюцю, дзяця
дзецьце, дзёцьцё, дзюцьцю, дзяцьця
цедзьдзе, цёдзьдзё, цюдзьдзю, цядзьдзя

цецецецецыде, цёцёцёцёцьцё, цюцюцюцюцьцю, цяцяцяцяцьця

дзедзедзедзедзьдзе, дзёдзёдзёдзёдзьдзё, дзюдзюдзюдзюдзьдзю, дзядзядзядзядзьдзя

цецеце-дзецыце, цёцёцё-дзёцьцё, цюцюцю-дзюцьцю, цяцяця-дзяцьця

дзедзедзе-цедзьдзе, дзёдзёдзё-цёдзьдзё, дзюдзюдзюцюдзьдзю, дзядзядзя-цядзьдзя

Пытае марац: ці цёпла ў палец?

Пабудзе ў вадзе, а не мокры підзе.

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.

Зямелька маці наша: і корміць, і поіць, і адзявае.

Адзін жыве — як хочацца, другі як прыйдзецца.

Як пра цябе чуюць, так пра цябе і мяркуюць.

Дзятлы дзюбамі дзяўблі дрэва.

Дзяўблі-дзяўблі, дзяўблідзяўблі, ды дупло і выдзяўблі.

Сядзіць ды на неба глядзіць: туды цень, сюды цень, абы прайшоў дзень.

Ці табе заяц, а мне баран, ці мне баран, а табе заяц.

То так і выходзіць: мне баран, а табе ўсё-такі заяц.

Хвасць хлеба не дасць.

Будзь што будзе! Будзе толькі тое, што будзе.

Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі.

На градзе ў лебядзе лебядзёначак гудзе.
Малы лебядзёначак кагадзе з пялёначак.

Э. Агняцвет

Як папу ўдаецца, дык і пападдзя смяецца.

Цецярук, цецярук, дзе твая цяцера? — Мая цяцера цецераняткам цеста месіць.

Хоць мядзведзяў не вадзілі, ды за імі хадзілі.

Пусці свінню пагрэцца, то і самому не будзе дзе дзецца.

Да арла паляцела цяцера і папала цяцера арлу на вячэру

Мусіць, у сераду нарадзілася, што да ўсяго згадзілася.

Хто бязгучна мякка ходзіць?
Хто без рук павейкі зводзіць?
Не відаць яго нідзе,
А на ложак спаць кладзе? (Сон)

Лепш не кратай, лепш не руш
Мой дзіравы капялюш.
Падабаецца — надзень,
Але толькі не на дзень.

Раз надзень, два раздзень,
Куды хочаш, туды дзень.
В. Вітка
Бубніла-нудзіла бубнела, хадзіла,
Пакуль кракадзіла
з далёкага Ніла
не разбудзіла.
Р. Барадулін
Цянькі зводзяць дзянькі, калі седзень седзьма сядзіць.
Пайшла Гандзя жыта жаць, ды забыла Гандзя серп узяць
Дзе маці нарадзіла, там і радзіма.

Бацькі быць вернымі нам радзілі.
Бацькам, Радзіме мы не здрадзілі.

Каб на дзятла не стралец, быў бы дзяцел маладзец.
Лепей сядзьма на калодзе, пагаворым аб прыгодзе.
Дзеяслоў — дзея слова: падзея, надзея, —
І душа маладзее, і голас цвярдзее.
В. Зуёнак

Я знайшла паблізу пня
Дзіўны корань буры.
Ну якраз медзведзяня
З мордачкай панурай.
Э. Агняцвет

Па суседству дзядзька Чорны
Прадаваў старыя жорны.
Р. Барадулін

Фарбы я ўзяла, вадзічку,
І малюю я сястрычку...
Бегаў пэндзлік мой, стараўся,
Ды мядзведзік атрымаўся.
К. Камейша

— Цвіркунок, цвіркунок,
Што ты робіш, мой кумок?
— Ночку сустракаю
І на скрыпцы граю.
В. Коўтун

У чацвер — чацвёрты дзень —
У грыбы хадзіў алень.
Х. Жылка

На памылках ці трэба вучыцца?
Імі трэба, як зеллем, лячыцца.
Ад зласлівасці, ганарлівасці,
Ад халуйства і ад ліслівасці.
А калі хвароба не паддаецца, —
Значыць, сэрца ўхаластую б'ецца.

А. Грачанікаў

Дзічка-дзічка, чаму ты не груша?
Вось і піла ўжо зубіцца на цябе,
і вострыцца ўжо сякера.
Але хіба ведае дзічка, чаму яна дзічка?
А хіба ведаюць людзі, чаму яны людзі?
Нешта пагасла ў евеце, нешта
замоўкла, нешта асірацела.
Не ўсё, што расце, расце для яды,
і ўсё, што расце, расце адною ядою.
Прыходзіць з мінуўшчыны на апусцелае месца
сівы дзядуля.
З будучыні выбліскваe ў нашы вочы пажар.
Пад вечар запаліцца ў печы.
І загаворыць — апошні раз —
з намі дзічка на самай відушчай
мове — на мове агню.

А. Разанаў

Дзе ні глянеш — вясна, ды якая!
Не саступіш — папхне, перакіне!
Марны скверык — раскінуўся гаем,
неба латка — бязмежжам сінім!
Песцяць сэрца й худыя вазоны,
й брукі ў белі паперкавай лускі,
і ўсё чыста —
бо вецер з Гудзона
сёння нейкі зусім беларускі!

Н. Арсеннева

Дабрыдзень, ліст вясковага спакою,
Уяўнага, як люстра ціхіх вод.
Калі ж душа зліваецца з ракою —
Няма тады падманнага спакою, —
Ёсць ціхіх думак вольны ход.
Таму і жыць, і жыць мне тут заўсёды,
Любіць твой дух настойна-смаляны,

Пакуль бруяцца бэзавыя воды
І як стагоддзі роднае прыроды —
Стаяць на вечнай варце валуны.

Я. Янішчыц

Кажуць, было гэта даўным-даўно —
Адсюль не відно,
Было недалёка недзе
Хадзіў мядзведпік з мядзведзем.
Па гарадах і вёсках яны хадзілі,
Абняўшыся, быццам бы роўныя,
Дарослых смяшылі, дзяцей весялілі
Гэтыя артысты вандроўныя.
А мядзведзь быў артыст не просты —
прыгожы, высокі ростам.
Пачне паказваць, як п'яныя ходзяць, —
Усе маўчаць у здзіўленні:
Не разумеюць, выходзіць,
Сэнсу яго прадстаўлення.
А калі ён упрысядку пойдзе
Пры ўсім лясным пародзе,
Пачне махаць над галавою лісцінай,
Нібы хусцінай,
Усе рагочуць,
Аж слёзы ім засцілаюць вочы:
— Што з ім такое?! Чаго ён хоча?!

Я. Сіпакоў

Я ўваходжу штодня ў агонь
Там, дзе ў хцівую цемру — далонь
Хтось камусьці ў перэдадзень-дзень
Трыццаць срэбранікаў кладзе.
Я ўваходжу штодня ў касцёр
Там, дзе холад, дзе голад, дзе мор,
Слёзы, горыч зямная, дакор
Шлюць літанні-надзеі да зор.

А. Лойка

Едзем на возе з Хведаркам Барадатым
па даўняй лясной дарозе.
Апавядае Хведарка Барадаты,
як шмат тут чаго за вякі адбылося:
як людзі людзьмі пераймаліся,
як людзі людзьмі рабаваліся,

як забіваліся людзі людзьмі...
— Я ведаю, — кажа ён, — толькі трохі,
ды ўсё, што тут было, да самых апошніх драбніц,
адкрыецца на судзе,
на тым самым страшным судзе,
дзе ўзважвацца будуць людскія душы.
Просяцца ў нас, каб падвезлі, каго
даганяем: дзядзькі, дзецюкі, маладзіцы, падлеткі,
жанкі, старыя, — і мы іх бяром,
бо ўсе, хто ні ёсць на гэтай дарозе,
ужо не стороннія нам, не чужыя,
ужо, нейкім чынам, свае.
Цесна пасеўшы, усім хаўрусам
едзем, па даўняй лясной — па людской!.. —
дарозе, едзем на страшны суд.

А. Разанаў

Людзі
глядзяць у будучыню,
мінулае — на людзей.

А. Разанаў

Ёсць лепшыя за мяне,
ёсць горшыя,
але сам я
ні лепшы, ні горшы —
адзіны,
угледзьцеся... — чалавек
моўчкі
кажа людзям.

А. Разанаў

Каб зразумець сябе — думка
дзеліцца на дзве часткі:
адна становіцца паляўнічым,
другая — уцекачом і
спасцігаецца, калі гіне.

А. Разанаў

Шукаць карэньчыкі роднасці сваёй?
А тут — лясы, падзолістая глеба.
А тут — каторы дзень! — ільё пралой.
Як Дастаеўскі, схмарылася неба.
Язычнікаў куточак? Не, музык!
Вось паляшук узяў скразную ноту.

Струна душы, падобная на ўскрык,
Перажагнала радасць і гаркоту.
І ў гэтай дзіўнай, грознай цішыні,
Дзе сад здзічэў, дзе звялі пералескі,
Як струны, перабраўшы ночы й дні,
Я вас не раз успомню, Дастаеўскі.

Я. Янішчыц

Зноў цішыня... І ў ёй зусім выразна
Мы чуем, як усюды на планеце
Спяшаюцца пясочныя гадзіннікі —
Перасыпаецца бязлітасна иясок...
Ну дзе ты, сонца?.. Вось штосьці дзынкнула...
Нарэшце! Гэта промень
Завёў сланечнік — сонечны гадзіннік.

Я. Сіпакоў

Зычныя К, Х, Г

Глухі зычны к утвараецца ў выніку рэзкага выдыху паветра, якое адрывае заднюю частку языка ад цвердага паднябення і вырываецца ў шчыліну паміж зубамі. Пярэдняя частка языка не дакранаецца да ніжніх пярэдніх зубоў, бо павінна быць адцягнута назад.

Пры вымаўленні глухога зычнага х рот раскрыты адвольна, язык свабодна адцягнуты назад так, каб пярэдняя частка яго не дакраналася да ніжніх пярэдніх зубоў, а задняя была прыўзнята да цвёрдага паднябення. Выдыхаемае паветра з невялікім шумам выходзіць у шчыліну паміж зубамі.

Пры вымаўленні звонкага зычнага г артыкуляцыя такая ж, як і глухога х, толькі задняя частка языка злёгку напружваецца і больш прыўзнята да цвердага паднябення, а гук напаўняецца голасам, які надае яму звонкасць.

Няправільнае вымаўленне зычных к, х, г — капацызм — можа ўзнікнуць пры адсутнасці такой уласцівасці языка, як выгінанне, або пры недастатковым яго выгінанні. Каб развіць гэтую ўласцівасць языка, трэба зрабіць наступнае: шчыльна прыціснуць кончык языка да дзяснаў ніжніх пярэдніх зубоў, затым пальцам (чыста вымытым!) націснуць на сярэдшою частку языка і адсунуць яго назад, —^ у гэтым становішчы языка вымаўляць зычныя к ці г.

1. Звонкі зычны г на канцы слова аглушаецца і вымаўляецца як х: снех (снег), берах (бераг), лух (луг), плух (плуг), апсях (абсяг), батох (батог), бех (бег).

2. Звонкі зычны г перад глухімі зычнымі аглушаецца і вымаўляецца як х: лёхка (лёгка), прухка (пругка), дрохкі (дрогкі), бехчы (бегчы), стрыхчы (стрыгчы), махчымасьць (магчымасць), ганхстэр (гангстэр), гаахская (гаагская) канферэнцыя, дзяхцирия (дзягцярня).

3. У запазычаных словах замест фрыкатыўнага трэба вымаўляць выбухны звонкі зычны г: гуз, гузік, ганак, гонты, гарнец, гвалт, прса, нягеглы, газа, газніца, газнічка, газоўка, гарсэт, гарчык, гвалтаваць, гвалтаўнік, гергетаць, гізаваць, гільза, гіпс, гіпсаванне, гузасты, гузаваты, гузічак, джганне, джгануць, джгаць, джыгіт, джыгаць, джыгі гоўка, джыгітаваць, магерка, мегера, нязграбнасьць (нязграбнасць), нязгрэба, цэгла, цагельня, цагляны парох (парог).

4. Глухі зычны к перад звонкімі зычнымі з, д, г у сярэдзіне слова вымаўляецца як выбухны г: вагзал (вакзал), вагзальны (вакзальны), эгзамен (экзамен), эгзамеиавацца (экзамснавацца), эгзархат (экзархат), эгзотыка (экзотыка), эгзальтацыя (экзальтацыя), эгзекуцыя (экзекуцыя), эгзерсіс (экзерсіс), ругзак (рукзак), анегдот (анекдот), аиегдатычны (анекдатычны), паггаўс (пакгаўз).

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

х-г, х-г, х-г г-х, г-х, г-х
га, гэ, гі, го, гу, гы
ха, хэ, хі, хо, ху, хы
ка, кэ, кі, ко, ку, кы
кахха, кэххэ, кіххі, кохxо, кухху, кыххы
хагга, хэггэ, хіггі, хогго, хуггу, хыггы
гакка, гэккэ, гіккі, гокко, гукку, гыккы
кахахха, кэхэххэ, кіхіххі, кохохxо, кухухху, кыхыххы
хагагга, хэгэггэ, хігіггі, хогогго, хугуггу, хыгыггы
гакакка, гэкэккэ, гікіккі, гококко, гукукку, гыкыккы

Кулік ды чайку схапіў за чубайку, а чайка кігіча: «Ды згінь ты, куліча!»

Капылы перакапылілі, перавыкапылілі.

Капыты перакапыцілі, перавыкапыцілі.

І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу.
Каму па каму, а каму па два камы.
Ішоў поп каля коп, каля капы, каля паўкапы.
Кумка кумцы па сакрэту, а кумка ўсяму свету.
Як Якімка, так і Хімка, а як Хімка, так і Якімка.
Галубыя галубы гулялі ў галубятні дзеда Голубева.

Няхай так, няхай сяк, няхай будзе з грэчкі мак.
Ходзіць ціхенька, ды думае ліхенька.
Гаварыў, гаварыў, не дагаварыў, дагаворваў, дагаворваў, ды каб не загаварыўся.
Карп і Пракоп, і Пракоп і Карп, то чатыры, а не Карпы, не Пракопы, а Карпавыя Пракопы і Пракопавыя Карпы,
Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць.
Бацька быў стралок, а я яго сынок.
Нага нагу падпірае, рука руку абмывае.
Бацька за парог, дзеткі за пірог.
Хто з кім, хто з каторай, а я — са сваёю Хадорай.
Гадзіна з гадзінаю, а год з годам — не роўныя.
Гнаёк ды лубінок — хлеба і на другі гадок.
З музыкі хлеб невялікі, а з гулякі ніякі.
Лёгка грош аддаць, а ці лёгка зарабіць?
Лёгкі здабытак — лёгкі і пражытак.
Ведаў бог, што не даў свінні рог. Хто шукае гуза — знойдзе.
Ты яго маслам маж, а ён дзёгцем смярдзіць.
Змог, не змог — пад ніз лёг.
Хоць махалам махай, то не адгонішся.
У няўмекі рукі калекі.
Лепш зухаваты, чым тхараваты.
Запрагай у дугу, я па хамут пабягу.
Не гуляй з вугольчыкам — рукі папячэш.
Да прыгоды не тры годы, а кожны год мае багата прыгод.
Гуз на гузе, а колькі гузакоў наперадзе.
Не піток, не ядок — не вялікі рабоцька.
За разумнаю галавою і рукам лёгка.
Байка без канца, як кабылка без хваста.
Хоць дрогка, ды нагам лёгка.

У Вільні
Разносчыкі крычаць ля кожмай брамы...
Грук, гоман, гул, — усё ракой імкне.
А дальш — за радам кас, ламбардаў, банкаў —
Агні вакзала... павадка фурманкаў...
Віры людзей... сіпячы паравоз...
Зялёны семафор... пакгауз... склады...
Заводаў коміны пад цьмой нябёс..
О, горада чароўныя прынады!

М. Багдановіч

Лёгка, соладка дыхаць вогкаю
цеплынёю красавіка,
мескім пылам, шпаковым цоканнем,
запыняцца,
глядзець,
чакаць
нейкіх словаў, якіх не вымавіў
шчэ ніколі ніхто нідзе,
хоць шукаюць паэты стымулаў
да паэм у агні й вадзе!

Н. Арсеннева

Калі пад'язджаеш начною парою
І станеш да возера тварам, —
Мігцяць зоркі ў небе, мігцяць пад табою,
Мігціць там і месяцаў пара.
Не знаеш, — з-пад ног, можа, гэта шкляная
Ідзе аж да неба дарога
Ці неба шкляное скляпепне схіляе
Табе аж пад самыя ноп!
І той, другі, бераг убачыць не ў сілах —
З вышынямі возера зліта.
Нібыта вісіш ты на птахавых крылах
У нейкім бяздонні блакіту!

А. Міцкевіч

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць немагчыма.

Я. Янішчыц

А ў адверстыя дзверы ляпечуць лугі пад вятрыскам,
І няма ім канца, і на іх зелянеюць дубы,
І ля рук маіх цвёрдых так блізка, так блізка, так блізка
Легкакрылыя бровы і вочы, якіх не забыць.

У. Караткевіч

Дакуль дасягае мой слых і зрок — датуль мой абсяг.
Ён мае прадаўжэшіе, мой поступ, мая заваёва.
Аднак часам я чую, як на межах майго абсягу

перагаворваюцца галасы:
«...Небарака, ён яшчэ ўсё на месцы...
Ён яшчэ ўсё ніяк не можа пераступіць свой абсяг...»

А. Разанаў

«Давай, — ты сказаў, — адпачынем хвілінку:
Зуброўка ў тутэйшых мясцінах вядзецца.
Крані спадысподу пазногцем травінку,
Калі серабрысты налёт застаецца,
Яна, значыць — рві!»

А. Лойка

Для сваёй адзінае дачушкі,
На вякі (вядома ж, на вякі!)
Вышыла матуля мне падушкі,
Лёгкія, як дым, пухавікі.
Вунь яны, нрывезеныя з дому,
Хораша цвітуць, як сенажаць.
...Ты даруй мне, мама, што мілому,
Так, як ты, не ўмею мякка слаць.

Я. Янішчыц

Нешта скранулася ў наваколлі, нешта адтала.
Пятая пара года — адліга. Што забіралі
Усе іншыя поры, яна вяртае:
і зноў магчыма сустрэча,
і зноў магчымае шчасце,
і зноў магчымая неўміручасць.

А. Разанаў

Зычныя П, Б

Глухі зычны п вымаўляецца без удзелу голасу. Шчыльна стуленыя губы з лёгкім шумам разрываюцца пад націскам выдыхаемага паветра.

Пры вымаўленні звонкага зычнага б артыкуляцыйнае становішча частак моўнага апарату такое ж, як і пры вымаўленні глухога зычнага п, толькі гук напаўняецца голасам, які надае яму звонкасць.

1. Звонкі зычны б на канцы слова аглушаецца і вымаўляецца як п: грап (граб), лоп (лоб), дуп (дуб), голуп (голуб), ледаруп (ледаруб), зруп (зруб).

2. Перад глухімі зычнымі звонкі б аглушаецца і вымаўляецца як п: галупка (галубка), грыпкі (грыбкі), апсмактаць (абсмактаць), рапскі (рабскі), паапскубваць (паабскубваць), аптрэсьці (абтрэсці), паапсяканыя (паабсяканыя), паапцінаць (паабцінаць).

3. Калі слова заканчваецца на галосны, часціца б аглушаецца і вымаўляецца як п толькі ў тым выпадку, калі яна стаіць перад глухім зычным: напісаліп пісьмо (напісалі б...), узяліп штонебуць (узялі б штонебудзь), кудып пайсьці (куды б пайсці), расказалап сьвекрыві (расказала б свекрыві).

4. Калі слова заканчваецца на галосны, а часціца б стаіць перад звонкім зычным, то яна не аглушаецца: што б з гэтага было, былі б здаровыя, каму б жаніцца, дайшла б дадому, узялі б ды зрабілі, пасьмяялісябзьяго (пасмяяліся б з яго)...

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

ап,эп, іп, оп, уп, ып
п-б, п-б, п-б
б-п, б-п, б-п
ба, бэ, бі, бо, бу, бы
па, пэ, пі, по, пу, пы
пабба, пэббэ, піббі, поббо, пуббу, пыббы
баппа, бэппэ, біппі, боппіо, буппу, быппы
пабаппа, пэбэппэ, пібіппі, побоппо, пубуппу, пыбыппы
бапабба, бэпэббэ, біпіббі, бопоббо, бупуббу, бып ыббы
пеппе, пёппё, пюппю, пяппя
беббе, бёббё, бюббю, бяббя
пебеппе, пёбёппё, пюбюппю, пябяппя
бепеббе, бёпёббё, бюпюббю, бяпяббя

Рамяство плячэй не абцягвае.

У пустой птушкі пустая песня.

Забіла б і баба лося, каб ёй удалося.

Піліпаў Піліп прыпоўз да ліп і да ліпы прыліп.

Булка з бульбай біліся, біліся, бульба булцы як дала, булка сплюшчылася.

Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі.

Пілавалі, перапільвалі, паперапільвалі, паперапілоўвалі, пілавінне перапалавінілі.

Прыйшоў Пракоп — кіпеў кроп, пайшоў Пракоп — кіпеў кроп.

Як пры Пракопе кіпеў кроп, так і без Пракопа кіпеў кроп.

У бубны бубнілі, бубнілі, панабубніваліся.

Хлеб-соль не шкадуй добраму для дабросці, а злому — для злосці.

Што б ні гаварыла, што б ні рабіла, а праўду ўсё адно не сказала.

Абцугі два зубы маюць, цвік за капялюш трымаюць.

Ён абцасам зачапіўся, ды знячэўку паваліўся.

Цыбаты певень дзюбаю пачаў дзяўбці боб. Дзёўб-дзёўб, дзёўб-дзёўб, ды так і не здужаў раздзяўбці.

Белыя галубкі паселі на слупкі. У іх лапкі маюцца, за дрот моцна трымаюцца.

Каб быў здаровы, як дуб скарбовы.

Папрацуй да поту, паясі ў ахвоту.

Была б здаровая бабуся — нікога не баюся!

Што б гэта за чорт, каб не спакусіў.

Пакінуў хлеб, пабег па крошкі.

Каб не было снегу, не было б і следу.

Хоць саву аб пень, хоць пень аб саву — усё саве баліць.

Якая сілка, такая і скібка.

Белыя сыплюцца долу крышталікі,
Белыя крышацца хмаркі ўгары.
Сосны захутаны ў белыя шалікі.
Белая мітусь у белым бары.
Белая, мяккая ціша няхрусткая,
Белай дрымотай спавіты кусты.
Белае белле... Зіма беларуская...
Што ж мне не дорыш снягурачку ты?..

Н. Гілевіч

Я слухаю ізноў ды з прагай... цішу, як спеў сірэн лавіў калісьці Адысей.

І кожны іншы тон чужы мне сёння, лішні, хіба...

каб перапёлкі голас па расе...

Каб косаў звон хіба,

калі размахам цесна, а целу радасна крывёю палымнець...

Ці жніўная туга, заклятая у песнях, празрыстая вада у гладышку на дне.

Дарма...

Пяе прастор аб нудных далягляда х, аб тым, чью яны загойдвалі тугу, аб лабірынтах скал,

Калхідах, лядах абтокаў казачных, аб харастве лагун.

Нат ночы не згасіць аркестры стройнай мора.

Прыслухайся — гудзе смыком віяланчэль, а скрыпак галасы звіняць высока, ўзгорна, як над чыёй труной, аж уваччу пячэ.
Што ж, хай сабе плыве сімфонія ў сутонне...

Н. Арсеннева

На дне свечкі, на зыходзе ночы з веямі абпаленымі вочы.
Чалавек быў дзіўны і бяссонны: не падносьце свечак да іконы...

А. Сыс

Якая часу рыска
З'яднала раптам нас?
Не мела права блізка
Я падысці да Вас,
Хаця б каб пакланіцца
За тое, што усё ж
Падбітую сініцу
Вы абагрэлі ў дождж.

Я. Янішчыц

Зычны Р

Пры вымаўленні цвёрдага санорнага р рот раскрыты адвольна. Пад моцным націскам выдыхаемага паветра кончык языка вібрыруе каля верхніх пярэдніх зубоў. Картавасць часцей за ўсё тлумачыцца адсутнасцю вібрацыі кончыка языка.

Пад моцным націскам выдыхаемага паветра працяжна вымаўляйце:

ззз, ззз, ззз,
аззз, эззз, іззз, оззз, уззз, ыззз
ажжж, эжжж, ожжж, ужжж, ыжжж
ззз-жжжж, ззз-жжжж, ззз-жжжж
жжж-ззз, жжж-ззз, жжж-ззз
за, зэ, зі, зо, зу, зы
жа, жэ, жо, жу, жы
зазза, зэззэ, зіззі, зоззо, зуззу, зыззы
жа-ж-ж-жжа, жэ-ж-ж-жжэ, жо-ж-ж-жжо, жу-ж-ж-жжу, жы-ж-ж-жжы

У наступным практыкаванні больш моцнага націску патрабуе звонкі зычны д, пры вымаўленні якога язык шчыльна прыціскацца да верхніх пярэдніх зубоў, што патрэбна і для правільнага вымаўлення санорнага р:

зжд, зжд, зжд
зжда, зждэ, зждо, зжду, зжды

зжд-д-д-д, зжд-д-д-д, зжд-д-д-д
зжд-зждр, зжд-зждрр, зжд-зждррр
тра, трэ, тро, тру, тры
дра, дрэ, дро, дру, дры
зждра, зждрэ, зждро, зждру, зждры
традра, трэдрэ, тродро, трудру, трыдры
дратра, дрэтрэ, дротро, друтру, дрытры
р-р-р-р-р, р-р-р-р-р-р-р, р-р-р-р-р-р-р-р-р
Руды Рыгор гроб грыбы граблямі.
Варыла не варыла, абы добра гаварыла.
Усе бабры дабры, адна выдра — ліха яе бяры.
Рабая курка клюе крупкі на падворку.
Клюй, курка, крупкі на падворку.
Трыццаць тры дрывасекі дроў трыццаць тры дрывотні надрывасечылі.
Як ні ары, абы чорным дагары.
Якая рада, такая і грамада.
Рыбак рыбачыў, а рыбы не бачыў.
Вароны на балоце — будзе гаспадар на рабоце.
Нявестка порсткая, як сена шорсткае.
Няма роду без выроду.
Трапіцца і найразумнейшаму здурнець.
Хто з разумным у дабры і горы пабудзе, таму розуму прыбудзе.
Караля Карла каранавалі каронаю на каранацыі ў Ёркшырскім каралеўстве.
Штогод на выбарах горад абіраў радцаў у Раду.

Драч,
Драч,
Бяры дзяркач.
Дзяры дзёран.
А драч — у плач:
— Я і так зморан.
Краў дровы ў падваротні,
Занядужаў нешта,
Саслабеў дарэшты.
Не кажы, драч,
Дарэшты —
Горла добра
Дзярэш ты.

В. Вітка

Рагатун Рыгорка родам
З Рагачова горада.
Як захоча, зарагоча
Рагатлівым рогатам.

Э. Агняцвет

Дрэва:
крывыя галіны,
крылатае лісце,
скрытыя карані.
Той абруч,
якім сашчапілі дрэва,
што раскалолася ад цяжару ўраджаю,
увайшоў у сярэдзіну дрэва,
карой зацягнуўся,
стаў дрэвам самім.
У горадзе шэрых
шматпавярховых дамоў,
як найвялікшае дзіва,
я раптам убачыў
барвовы акраец сонца.
Звечарэла.
Зайшло чырвонае сонца,
Выйшаў чырвоны месяц.
Блукаю па вуліцах.
Восень блізка.
Нас рухае нямы
кругазварот нязморйы.
Ў прадчассі плёну мы —
нібы зярняты ў жорнах.

А. Разанаў

Калі памірае каханне... Але каханне не памірае.
Яно вечна застаецца ў грудзях лікуючай тугою слоў,
Безнадзейным болем і непатольнай пяшчотай,
Калі нічым пе дапаможаш, хаця сэрца аб зоры разбі.
Плач дрыядай, рагачы сатанінскай няшчырай усмешкай,
Львом куртатым кроч, слізгай самаахвярным змеем
Або падлай няшчаснай валяйся на ворыве лёсу —
Усё дарэмна. Няма дапамогі. І смерці няма ў кахання.
Чалавек толькі смертны. Але калі дрэвы не помняць,
Гарады не помняць, не помняць нямыя планеты —

Сэрца помніць каханне і полымем стаўшы з агню.
Усё помніць і мёртвае сэрца.
І кружляе з крыкам перадсмяротнай і ўсё ж
бессмяротнай тугі
Над магіламі мёртвых багоў,
над журботным спакоем зрынутых дрэў.
Над жывёламі, кінутымі на раллі,
Над планетамі мёртвымі і гарадамі —
Бессмяротнаю каняй, што моліць аб кроплі вады.

У. Караткевіч

Зычныя М , Н, Л

Пры вымаўленні санорнага зычнага м шчыльна стуленыя губы разрываюцца пад націскам выдыхаемага паветра.

Пры вымаўленні санорнага зычнага н рот раскрыты адвольна, пярэдняя частка языка злёгку прыціскаецца да цвсрдага паднябення. Пад націскам выдыхаемага паветра язык адштурхоўваецца ад цвсрдага паднябення, паветра вырываецца ў шчыліну паміж зубамі.

Пры вымаўленні пярэднеязычнага звонкага зычнага л рот адкрыты адвольна, пярэдняя частка языка злёгку прыціскаецца да верхніх пярэдніх зубоў. Недахопы вымаўлення санорнага л аб'ядноўваюцца пад назвай ламбдацызм.

Людзі, якія няправільна вымаўляюць гэты гук, замяняюць яго іншымі гукамі: ваткі (ладкі), уапа (лапа), віпа (ліпа). У час трэніроўкі практыкаванняў трэба звяртаць асаблівую ўвагу на артыкуляцыю языка. Для пачатку трэба заціснуць кончык языка зубамі і спрабаваць вымаўляць гэты санорны.

1. Санорны зычны н перад зычнымі с, з, в, ф, к, г, л вымаўляецца цвёрда: кансерваторыя, кансіліум, кансервацыя; вензель, гартэнзія, Занзібар; інверсія, канвеер, інвентарызацыя, Грынвіч; дэзінфскцыя, канфідэнцыяльны, канфедэратка, канфігурацыя; ангіна, венгерка, ларынгіт; донкіхоцтва, банкет, анкетаваньне (анкетаванне), зьменлівасць (зменлівасць), гаманлівы.

2. Санорны зычны м перад мяккімі зычнымі н, с, в, ф, к, п, б, л, дз вымаўляецца цвёрда: амністыя, грамніцы, гумнішча, цямнюткі; чымся зьвязаны (звязаны), зьякімсь (з якімсь) дакорам; дуумвір, дуумвірат, трыумвір, трыумвірат; амфітэатр, амфібія, амфібрахій; чымкенцкі, напрамкі, ёмкі, цямкі; Пампея, кампенсацыя, кэмпінх (кэмпінг), пампезны, шампінёны, чэмпіён, імперыя, джэмпер; Чэмберлен, Замбія, імбір, бамбіза, бамбёшка (бамбёжка), выкам-

біноўваць; зямляк, самлець, цямлівы, зазямліць, Гамлет, афармленьне (афармленне); воссмдзссят, семдзесят.

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

амм, эмм, імм, омм, умм, ымм ма, мэ, мі, мо, му, мы анн, энн, інн, онн, унн, ынн на, нэ, ні, но, ну, ны мамма, мэммэ, міммі, моммо, мумму, мыммы нанна, нэннэ, нінні, нонно, нунну, нынны манамам, мэнэмэм, мінімім, мономом, мунумум, мынымым

наманан, нэмэнэн, німінін, номонон, нумунун, нымынын

л-ль, л-ль, л-ль ал, эл, іл, ол, ул, ыл

ла, лэ, лі, ло, лу, лы ель, ёль, юль, яль

лаль, лэль, ліль, лоль, луль, лыль

лалла, лэллэ, ліллі, лолло, луллу, лыллы

ле, лё, лю, ля лелле, лёллё, люллю, лялля

лалля , лэлле, лоллё, луллю, лалля

тла, тлэ, тлі, тло, тлу, тлы дла, длэ, длі, дло, длу, длы

тладла, тлэдлэ, тлідлі, тлодло, тлудлу, тлыдлы

длатла, длэтлэ, длітлі, длотло, длутлу, длытлы

тле, тлё, тлю, тля дле, длё, длю, для

тледле, тлёдлё, тлюдлю, тлядля

длетле, длётлё, длютлю, длятля

лі-лі-лі-лі-ліль, ле-ле-ле-ле-лель, лё-лё-лё-лё-лёль, лю-люлю-лю-люль, ля-ля-ля-ля-ляль

лі-лі-лі-лі-ліллі, ле-ле-ле-ле-лелле, лё-лё-лё-лё-лёллё, люлю-лю-лю-люллю, ля-ля-ля-ля-лялля

Вялікі делам, ды малы дзелам.

Караблі лавіравалі, лавіравалі, ды не вылавіравалі.

Учора гўлі, сёння гўлі — будзеш хадзіць без кашулі.

— Ці лілі алей? Ці не лілі?

— Чаго там цілілікаеш?

— Я не цілілікаю, а пытаю: ці лілі алей, ці не лілі?

— Ці лілі, ці пе лілі, каб яшчэ падлілі.

Зямля — талерка: што пакладзеш, тое і возьмеш. Шумны, думны, ды не разумны. Ні налева, ні паправа, ні направа, ні налева. Адзін еын — не сын, два сыны — паўсына, а толькі тры сыны — сын.

У гаспадарлівай ды руплівай гаспадынькі і накормлена, і напоена, і багата надоена.

Інжынеры нівеліравалі, нівеліравалі, ды так і не вынівеліравалі.

Многа, ну і многа вады плыве на наш млын.

На лета то на лета, ды толькі ж не на гэта.

Так — наліха, а так — напуста.
Ляпівы і санлівы — два браткі.
Тапянёх, танянёх, куды пхнулі, там і лёг.
Ні ладу ні складу, ні ў кола ні ў мяла, ні па кані ні па аглоблях, ні ў салдаты ні ў матросы, а падмазваць калёсы.
Вазьмі, Даніла, што нам няміла.
Млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе.
Свая болька ўсякаму баліць, чужая болька нікому не баліць.
Чые б цяляткі рыкалі, а валы б маўчалі.

Зычныя Ф, В

Пры вымаўленні глухога зычнага ф ніжняя губа злёгку дакранаецца да верхніх пярэдніх зубоў, выдыхаемае паветра з нсвялікім шумам выходзіць у маленькую шчыліну паміж всрхнімі зубамі і ніжняй губой, язык ляжыць плоска.

Пры вымаўленні звонкага зычнага в ніжняя губа злёгку дакранаецца да верхніх пярэдніх зубоў, а ў момант гучання адштурхоўваецца ад іх, выдыхнутае паветра з гукам вырываецца ў шчыліну паміж зубамі.

Уважліва прачытайце (бязгучна, але актыўна артыкулюючы), затым паўтарыце ўслых некалькі разоў умераным тэмпам наступныя спалучэнні гукаў і тэксты:

ф-в, ф-в, ф-в в-ф, в-ф, в-ф
афф, эфф, іфф, офф, уфф, ыфф
фа, фэ, фі, фо, фу, фы
авв, эвв, івв, овв, увв, ывв
ва, вэ, ві, во, ву, вы
фавв, фэвв, фівв, фовв, фувв, фывв
ваффа, вэффэ, віффі, воффо, вуффу, выффы
фавва, фэввэ, фівві, фовві, фувву, фыввы
фе, фё, фю, фя ве, вё, вю, вя
феве, фёвё, фювю, фявя
вефе, вёфё, вюфю, вяфя
фефевве, фёфёввё, фюфюввю, фяфяввя
вевеффе, вёвёффё, вювюффю, вявяффя

Любіць Валодзя валаводы валаводзіць.

Сваяк сваяка па-свойму вітае: будзь здаровы, як дуб скарбовы.

Фатограф сфатаграфаваў фітафага на фоне фінікавай пальмы.

Воўк не выбіраючы авечак бярэ.

У фальварку Фабіяна флёксы расцвілі.

Фарсун фарсіў у фіялетавым фраку і фетравым капелюшы.
Воран ворану вочы не выклюе.

Фосфарам фасфарасцыравалі, фасфарасцыравалі, ды не пафасфарасцыравалі.

Ад віднога да віднога век у век жыў чалавек.

Фламандзец і фламандка сфатаграфаваліся каля фламінга.
Які Сава, такая і слава: здаровы як вол, а халявы дзіравы.
Васіліна і Васіль! Пасівелі вы, як галубы сівыя.

Савось-свавольнік насваволіў: выдраў лысаму валасы.

Воўк ваўчаня авечак браць вучыць.

Званіў звонка-звонка, званіў, перазвоньваў, ды так і не дазваніўся.
Ты мяне вызвалі, а я цябе вывучу.

Сват цікавы, як Марцін да кавы.

А ў свацці вочкі — не вочкі, а званочкі.

Выгадаваць выгадавалі, вывучыць вывучылі, цяпер нашы вучні самі вучняў вучаць.

Падоўжаныя зычныя

Характэрнай асаблівасцю беларускай фанетыкі з'яўляецца наяўнасць падоўжаных зычных. Вымаўляюцца так, як і пішуцца, толькі зацвярдзелыя падоўжаныя зычныя. Падаўжаюцца наступныя зычныя:

з' — граз'зю, маз'зю, рыз'зё, жалез'зе, палоз'зе, Залоз'зе;

л' — гул'лівы, жыл'лсвы, навакол'ле, раздол'лс, эскадрыл'ля, гал'лё;

н' — летуцен'ні, запазычан'не, сён'няшні, ран'не, снядан'не;

с' — Палес'се, міжлес'сс, кас'сё,калос'се, валос'се;

ц' — жыц'це-быц'це, ліц'цё, пачуц'ці, рац'цю, смец'це;

дз' — разводз'дзе, судз'дзя, гладз'дзю, моладз'дзю, чэлядз'дзю;

ж — прыбярэжжа, збожжа, Запарожжа, ружжо, замежжа, падарожжа;

ч — запечча, Случчына, ператплечча (перадплечча), ламачча, прырэчча;

ш — узвышша, зацішша, застрэшша, мышшу, аднадушша;

к — толькі ў слове мяккі і вытворных ад яго, а таксама ў запазычаным слове Мекка.

На Падоллі пірагі на коллі, а мы прыйшлі і там іх не знайшлі.
Ілля наробіць гнілля.
Ліхадзея зеллем не палечыш.

На ранняй ралліцы родзіць жыта ды пшаніца, а на позняй ралліцы родзіць кукаль ды мятліцы.

Усе птушкі крыллі маюць, але не ўсе лятаюць.
У вочы — то «саколю!», а за вочы — то соллю, то смоллю.
Не адкладвай на заўтра, што паспееш зрабіць сёння.
За папытанне не даюць ні ў каршэнь, ні снядання.
Сем Сцяпанаў на міжлессі сеялі пшаніцу.
То граззю, то маззю, ды неяк жа вылечылі.
Не рассыпайся дробным макам — хітрэйшы за ўвесь свет не будзеш.
Скора казка кажацца, ды не скора справа робіцца.
Гара з гарою не сходзяцца, а людзі сходзяцца.
Не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяваецца.
З ваччу сышоў і з памяці зваліўся.
Пабег — адно вецер увушшў засвістаў.
Мякка сцеле, ды мулка спаць.
Няма кахання без прытуляння.
Калі ўлетку дождж рэдка бывае, то ў вуллі мёд прыбывае.
Пасля Іллі вада і з зямлі.
Яду на заўтра адлажы, а справу сёння зрабі.
Прыйдзе тая нядзеля, што будзе і мае вяселле.

Халоднай ноччу я ў шырокім полі
Каля агнішча лёг і сціхнуў у паўсне.
Агонь усё слабеў... урэшце знік паволі...
І ўраз зрабілася вясёла неяк мне!..
Хай, шэры попел, ты агнішча ўсё сабою
Ў нядоўгі час здалеў, як рызаю, пакрыць, —
Я ведаю, што там агопь дрыжыць пад ёю,
Я ведаю, што там чырвоны жар гарыць...

М. Багдановіч

Лета мінула, няўжо ў непагоду,
Ноччу асенняй, бяззорнай,
Трэба чакаць мне каханай прыходу
Тут, у глушы прыазёрнай?
Ты быццам сарна мільгаеш лясная,
Зданню блукаеш начною,
Лепей застанься з тым, хто кахае,
Лепей застанься са мною.

А. Міцкевіч

Як вокам скінуць — сцяг пушчаў сініх...
За пушчай далеч, яшчэ сіней...

А тут, на ўзвышшы, стаіць над намі наш
Крыж прыгожы, нібы у сне...
Шмат чулі свету крыжы маленняў,
шмат просьбаў, выкліканых бядой.
Прыйшлі й мы ў прошчу сагнуць калені,
свяціць не нечы ўжо крыж, а свой.
Тут — дождж імгненна каменне сплямію,
рассыпаў кроплі ў траве, ў лісці...
Няйнакш —
    і Нехта дзесь там, над намі, наш
    Крыж вадою святой хрысціў.

Н. Арсеннева

Жыццё, ты стэп, што выгарэў да краю,
Дрыготкі ліст на восеньскім галлі,
І ўсё адно — цябе я абдымаю,
І ўсё адно цябе я бласлаўляю
За боль і рай на песеннай зямлі.

Я. Янішчыц

Не сплю.
Адліжна.
Поле туманіцца ў акне.
Міжчассе — ў наваколлі.
Міжчассе — ува мне.

А. Разанаў

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

М. Багдановіч

Бы выпаду з сягоння,
з гнязда сэрцабіцця...
Што скажаш мне, бяссонне, —
аскепак небыцця?!.

А. Разанаў

Калі ў ракавіну цёмную жамчужпіцы
Упадзе пясчынка хоць адна, —

Жэмчугам патроху робіцца яна!
Калі ў дух мой западзе і заварушыцца
Там кавалак грубага жыцця, —
Ў жэмчуг звернецца ён сілай пачуцця!

М. Багдановіч

Світанняў я з табой не сустракаў,
Не рассякаў азёрнай хвалі.
І толькі шморгаў носам аб рукаў,
Калі цябе да дошкі выклікалі.

Р. Барадулін

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршчку насення жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

М. Багдановіч

Безгаловая Венера.
Стаю ля яе ў задуменні
І голас пяшчотны чую:
«Прыйдзіце, мужчыны, ад зброі, —
Ўлонне мае сумуе.
Прыйдзіце, мужчыны, ад сечаў,
Ад турмаў, ад страт на світанні.
Адзінае ёсць на свеце:
Сумленне, братэрства, каханне».
І думаю я неадчэпна:
За што ж ты бяду спаткала?
За што галаву ты згубіла?
Якую праўду сказала?

У. Караткевіч

Край свой (цяпер ужо ўласнасць Кароны) калісьці
Я перамераў удоўжкі і ўпоперак пешшу.
Змалку ад бацькі вучыўся ў бясконцых абходах
Крокам нягучпым ступаць, каб нішто не шурхнула,

І спасцігаў, як звяроў прыкмячаць на бярлогах
Нюхам, і вухам, і зрокам.

М. Гусоўскі

Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым. Залатыя
Ззялі аздобы ў харомах, а ў курных халупах
Вёсак, пасадаў — якая ж была пазалота?

М. Гусоўскі

Калі ў зубровым статку
яго мудрасці стане цесна,
Калі яму надакучыць
непатрэбная мітусня,
Ён ідзе ў лістападны шоргат —
у сваю пажоўклую песню,
Дзе дрэвы, нібы стагодцзі,
над кожнай казюркай звіняць.
Ідзе ў свае ён стагоддзі,
дзе дрэвы, як вёрстаў цені,
Вядуць яго далей і далей — у самы ціхі гушчар.
І яму саступаюць дарогу,
бы слугі, дзікі і алені.
Бачаць: ідзе, як філосаф,
іх непадробны цар.

Я. Сіпакоў

Сам справядлівы ва ўсім, ён па гэтай мерцы
Кожнаму мераў і нейкім сваім адчуваннем
Мог здагадацца адразу, дзе праўда, дзе крыўда.
Позіркам жорсткім, што гляне — аж зробіцца млосна,
Ён, як вядзьмак, абяззбройваў усіх ашуканцаў:
«Хлусіш!» — і хлус прызнаваўся, што сведчыць ілжыва.
Кара была неадкладнай, чакала пры замку:
Іх, закруціўшы ў звярыную шкуру, спіхалі
З вала на пляц сабакарні, дзе псы-ваўкадавы
Клычылі ў шмацце асуджаных — ведама ж, псярня.
Так жа бязлітасна, строга караў ён і суддзяў
Княжацкіх вотчын за подкупы, хабар, ліхвярства.
Выпадак быў, ды не ведаю дзе.
Спакусіўся Нейкі суддзя на багаты дарунак, і справу

Выйграў адказчык насуперак княскаму ўказу.
Скарга да князя дайшла; вінаваты прызнаўся.
Кат перабіў яму рукі і ногі, а потым —
Зноў жа ў навуку другім — і суддзю пры народзе,
К конскім хвастам прывязаўшы, пусцілі на волю.
Прагнасць нажыцца пад шыльдай аховы закона,
Сквапнасць — загрэбці кавалак у бліжняга з рота —
Ён тыранічнымі сродкамі так пратараніў,
Што на вякі нават завад іх вывеўся ў княстве.
Кім бы і чым бы ні быў ён пры іншых заслугах,
Нават за гэта адно я пяю яму славу.
Густа ён справамі век насяліў свой, і водгук
Спраў тых вячыстых адклікнецца ў многіх стагоддзях.

М. Гусоўскі

Перазвонамі стазвоннымі
Празваніла восень клёнамі,
Калыхнула сосны сонныя,
Калыхнула засмучоная.
Муць туманная, глыбокая,
Думкі — сцежкі дзеразовыя.
У думках светлых — каравокая,
Шчасце вуснаў — пурпуровае...
Ну, а потым — смуць прадонная:
Развіталіся ў гонях мы...
Перазвонамі стазвоннымі
Празваніла восень клёнамі...

С. Фамін

Раннім ранкам аблокі былі раз'яднаны,
Нібы чорныя птахі ныралі ў туманы
І збіраліся ў стаю. Калі ж сонца ўзбегла
На палудзень, іх стая ўсё неба аблегла
Хмарай чорнаю. Вецер трапаў яе хіжа,
І яна ўсё гусцела, звісала ўсё ніжай,
Аж пакуль яе край, ад нябёс адарваны,
Да зямлі не дастаў, ушыркі распрастаны;
Надулася як ветразь, вятры ўсе ўвабрала,
Злая, чорная з поўдня на захад імчала.
А зямля шчэ на захадзе
ў сонечным ззянні

Скрозь ляжала ў жаўтава-чырвонае цьмяні;
Хмара ж з цешо ўжо сетку пляла і ляцела
Сонцу ўслед,
быццам вылавіць промень хацела,
Быццам мела над-захад злавіць само сонца.
А віхры ўжо свісталі над долам бясконца
І ўжо неслі з сабой
безліч кропляў срабрыстых,
Нібы градзін, гэткіх буйных і зярністых;
А пасля, развінуўшыся ў небе і доле,
З свістам, рэвам,
выццём закружылася ў коле;
Узняліся слупом, агалілі дно става,
Сіганулі ў лугі — лозы нішчаць і травы:
Лоз галінкі ляцяць, травы, як на пакосе,
Нібы выдраў хто жменяй на вецер валоссе;
Пасшыбаны снапы ў полі...
Дзьмуць вятры, выюць,
На раллю апусціўшыся, нішчаць і рыюць,
Глебу ўзносяць угору,
каб шлях адкрыць новай,
Шчэ мацнейшай,
страшнейшай віхуры чарговай.

А. Міцкевіч

Часціца НЕ, прыназоўнік БЕЗ

Калі яны стаяць перад словам з націскам на першым складзе, вымаўляюцца як ня, бяз: някосіць Фецька, бо ў торбе рэцька (Не косіць Федзька, бо у торбе рэдзька); бясквета к (без кветак).
Як не пасееш, то і збіраць не будзе чаго.
Вучыцца ніколі не позна.
Хай вам лес не здрадзіць.
З бядою і сонца не ўбачыш.
Каб дзяды не ведалі бяды, а ўнукі не бачылі мукі.
Хлеб не зяць, добрыя людзі з'ядзяць.
Чужымі дзеткамі не дай бог загадваць.
Ці бі, ці не бі, ці лай, ці не лай, а рады дай.
Не пі, не еж і з хаты не лезь.

Не тое багацце, што цесць з цешчаю далі, а тое, што маладыя самі нажылі.

Не вінна свінка, а вінна дзірка.
Не прошаны, не дзякаваны.
Не плямкай і не чамкай.
Без хлеба няма абеда.
Без сала куса няма беларуса.
Каваль без сякеры, а шавец без ботаў.
Спадзявайся на лепшае, не бойся напаткаць горшае.
Не будзе дуба, не трэба і грыба.
Без скрыпачкі, без дуды ходзяць ногі не туды.
З гэтага квасу піва не будзе.
Хлеб плячэй не горбіць
Да званіцы падняўся, ды без розуму застаўся.
Без працы не будзе шчасця. Без песні — хоць трэсні!

Вы думаеце так, без болю
Песня народзіцца ў маленькай кволай скрыпцы?
О, вам тады яшчэ не біў па еэрцы
Смычок турбот бяссонных і трывог.
Г. Бураўкін

Я без цябе — без рэчышча вада,
Якой ніколі не суетрэцца з морам.
П. Макаль

Не вытрымае сэрца падарожжа —
Заглухне бездакорны мой матор,
Што пыл глытаў, вычыхваў бездарожжа...
Прымі яго без кветак і без зор!
А. Куляшоў

Не закідвай за спіну
Косы шаўковыя — змеі.
Я спаткаў з табой вясну,
Я без слова зразумею.
З. Астапенка

Дзіця вучыцца вымаўляць
свае першыя словы.
Дарослыя слухаюць:
раптам яно скажа тое,
чаго яны ўжо не могуць сказаць.
А. Разанаў

Цяжар не перавальвайце на плечы
Спадручнаму
у век суровай прозы.
Лаўровікі, не думайце пра вечнасць:
І помнікі не ўсе адліты з бронзы!
Не трэба пеўняў разліваць вадою —
Праз пяць хвілін угаманяцца страсці.
Не варта рваць адносіны з бядою,
Бо непадзельна з ёю ходзіць шчасце.

Я. Янішчыц

Блукаю
па незнаемым горадзе.
Ніхто мяне тут не спаткае,
ніхто не пярэйме,
ніхто не скажа:
ты сёння не гэткі,
як звычайна.

А. Разанаў

І ты, адным-адзіная мая,
Кахаеш гэтак жа — без роздуму, вагання,
Як шчыра сам цябе кахаю я.
І то не прывід, а само каханее.

С. Дзяргай

Ніколі не бачыў, ніколі не быў,
Ніколі так моцна зямлю не любіў.

М. Лужанін

Высока слова падымі
Без тостаў лішніх.
... Дарога сцелецца людзьмі, —
Не помню іншай.

Я. Янішчыц

Комплексны трэнінг, або, згодна з К. Станіслаўскім, «настройка акцёрскага інструмента», складаецца з пяці, так бы мовіць, асновавызначальных «Р»: размяцца, раздыхацца, разартыкулявацца, разрэзаніравацца, разгаварыцца. Больш за сорак гадоў педагагічнай дзейнасці, правяраючы самыя розныя методыкі і практыкаванні, аўтар дапаможніка прыйшоў да высновы, што менавіта праз гэтыя пяць «Р» і прыходзіць «полная сосредоточенность духовной и физической природы» студэнта, што дзякуючы гэтым асновавызначальным

«Р» будучым артыстам можна найбольш якасна (прафесійна) падрыхтаваць сваю волю і цела да творчасці ва ўмовах сцэнічнай прасторы.

Практыкаванні комплекснага трэнінгу мэтазгодна выконваць на сцэне Студэнцкага тэатра ці ў прасторным, добра праветраным пакоі, у спартыўных касцюмах, лёгкім і зручным абутку. Займаючыся групавым трэнінгам на сцэне, студэнты неўпрыкмет прывыкаюць да тэатра, паступова навучаюцца бачыць сябе на розных планах сцэнічнай пляцоўкі, а таксама лёгка і нязмушана «пасылаць» голас у любы куток глядзельнай залы. У творчай жа майстэрні (накшталт рэпетыцыйнага пакоя ў тэатры) праводзяцца індывідуальныя заняткі, на якіх выпраўляюцца моўныя недахопы, удасканальваецца дыкцыя, «ставіцца» голас кожнага студэнта, засвойваюцца нормы беларускага літаратурнага вымаўлення.

Ініцыіруе і праводзіць комплексны групавы трэнінг на працягу першага года навучання сам выкладчык, бо студэн гам трэба не толькі расказаць, што ім на сцэне рабіць, але і шмат што паказаць (прадэманстраваць), як гэта зрабіць.. Пачынаючы з другога семестра «кіраваць» трэнінгам можна даверыць найбольш здольным студэнтам. Аднак рабіць гэта трэба толькі пад пільным наглядам (кантролем) выкладчыка сцэнічнай мовы, бо ў студэнтаў якасны ўзровень уменняў пакуль што зусім невысокі. І яшчэ: для псршакурснікаў слова выкладчыка (майстра) больш аўтарытэтнае і пераканальнае, чым слова сяброў. Таму на працягу першых двух семестраў навучання менавіта жывое слова (зразумелае, вобразна-эмацыянальнае, зацікаўлена-даверлівае) і педагагічныя дзеянні выкладчыка сцэнічнай мовы (нязмушаныя і мэтанакіраваныя) павінны ствараць на групавых занятках творча-дзелавую атмасферу і спрыяльныя ўмовы для «настройкі акцёрскага інструмента».

Слухаем — уяўляем — усведамляем — адчуваем — робім.

1. Сядзьце, скрыжаваўшы ногі, спіна прамая (без напружання), рукі свабодна пакладзіце на калені. Заплюшчце вочы, расслабце мышцы шыі. Бязгучна паўтарайце: я спакойны (ая); мне ўтульна; я адчуваю сябе свабодна.

Успомніце што-небудзь прыемнае, які-небудзь выпадак. Не спяшайцеся. Успомніце, дзе гэта было, калі, пры якіх абставінах... Успомніце ваш настрой... Што вы тады адчувалі?

Злёгку паварушыце пальцамі правай рукі, левай... Яшчэ раз. Павольна падымайце рукі да ўзроўню плячэй, мякка згінайце пальцы ў кулак, паспрабуйце пацерці кончыкамі пальцаў далоні. Зрабіце гэта некалькі разоў.

Павольна падыміце галаву, выпрастайце рукі, адплюшчце вочы, расслабце пальцы, рукі пакладзіце на калені.

Заплюшчце вочы, паварушыце пальцамі правай, левай нагі. Напружвайце пальцы правай, левай нагі (трымайце напружанне!). Расслабце пальцы правай, левай нагі.

Вашы рукі, плечы, шыя свабодныя, без заціску. Праверце: апусціце рукі ўздоўж цела, паварушыце плячамі, паківайце галавой.

Бязгучна паўтарайце і выконвайце неабходныя фізічныя дзеянні: мае рукі свабодныя (апусціце); мае плечы свабодныя (паварушыце); мая шыя свабодная (паківайце галавою); мае цела свабоднае (пакладзіце рукі на калені, выпрастайце ногі, апусціце галаву, расслабце мышцы ніжняй часткі цела).

Прыслухайцеся да таго, што адбываецца ў вашых мышцах: лёгкае паколванне, якое паступова змсніцца прыемным цяплом.

Адплюшчце вочы, бязгучна скажыце: мне лёгка; я актыўны (ая); хачу працягваць трэнінг.

Звяртаю ўвагу на бязгучнае прамаўленне формул псіхалагічнай настройкі: спачатку настройваем (уключаем) дух, валявую энергетыку, каб адчуць і ўсвядоміць, якія мышцы і органы задзейнічаны ў працэс дыхання і гукаўтварэння. Каб уключаць, кіраваць і развіваць іх, трэба добра ведаць і ўяўляць, г.зн. адчуваць, механізм дзсяння кожнай «гайкі і шурубкі», адчуваць, калі іх трэба «змазваць», а калі «падкручваць» ці «паслабляць».

2. Уявіце: усходняя лазня, парыльня (ізаляваны пакой з аднымі дзвярамі, у якім кафля нагрэта да 60°). Вы прайшлі ўжо два пакоі, дзе кафля нагрэта да 40° і 50°. Пастаялі пад душам і вось цяпер леглі на прасціну ў апошнім пакоі, дзе тэмпература нагрэтай кафлі 60°. З задавальненнем выцягнуліся на гарачай кафлі, расслабіліся, адчуваеце, як цяпло паступова пранікае не толькі ў мышцы, але і ва ўсе косці ды храсткі; цела ахінае млявасць, павольна паварочваецеся, лежыце на баку (успомніце, як, добра паеўшы, укладваецца (уладкоўваецца) спаць кошка)... Арганізм сам кіруе працэсам удыху-выдыху праз нос. Паварочваецеся і ўкладвасцеся ніцма (адчуйце, які механізм (паміжрэберныя мышцы) пачаў расцягваць-пашыраць грудную клетку, але і ў гэтай позе дыханне спакойнае, даволі глыбокае. Зноў леглі на спіну (цяпер дыяфрагма больш актыўная: кароткі ўдых-выдых праз нос, паўза (арганізм чакае, калі яму спатрэбіцца чарговая «доза» кісларода).

Такім чынам, «вдыхание и выдыхание — как бы микрокосмос нашего существования: вдыхание — рождение, выдыхание — смерть. И как после рождения должна быть смерть, так после вдыхания

должно быть выдыхание; и как смерть не может быть без рождения, так без вдыхания не может быть выдыхания. Такое же соотношение, как между началом и концом: всякое начало должно иметь конец, и не может быть конца без начала. Всякое начало есть действие, усилие, утверждение; всякий конец есть отказ, ослабление, отдохновение; во всяком начале есть элемент самозарождения, во всяком конце — элемент неизбежности» (8, 32).

Вернемся ў парыльню, калі ўжо наступіла поўная рэлаксацыя... Вы пачынаеце засынаць... раптам ў гэтым дзівосным сне на вас вылілі вядро ледзяной вады... Што вы будзеце рабіць? Ваша рэакцыя, дзеянні (псіхічныя, фізічныя, дыхальныя, галасавыя)?

3. З шумным воклічам-удыхам «Ай» ускочце на ногі, ачомайцеся ад ледзянога душа...

Што адбылося? — Усяго толькі: фізіялагічнае дыханне пераўтварылася ў моўнае, ад спакойнага газаабмену да фанацыі (агучанасці), ад стану спакою да ўзбуджанасці (узрушэння).

Паспрабуйце паўтарыць усе гэтыя дзеянні 2-3 разы, каб зафіксаваць (усвядоміць) пачуццёва-эмацыянальныя дзеянні (рэактыўная ўзбудлівасць) і фізічныя дзеянні ніжнсбрушных мышцаў, якія ў момант фанацыі напружваюцца, ствараючы апору для актыўна выдыхаемага паветра. Разам з ніжнебрушнымі мышцамі актывізуюцца і мышачныя валокны дыяфрагмы.

Калі для адчування арганічна народжанага кароткага вокліча «Ай» дастаткова нават і зусім малога аб'ёму дыхання, то для сцэнічнай фанацыі яго (дыхання) спатрэбіцца значна больш. Таму будучым артыстам неабходна развіваць і ўмацоўваць яшчэ і паміжрэберныя валокны, каб яны, разам з ніжнебрушнымі мышцамі маглі «ўзяць» любы, неабходны для якаснай фанацыі аб'ём добра абапёртага дыхання.

4. Станьце роўна і свабодна, пяткі пастаўце разам, наскі трохі развядзіце ў бакі, рукі апусціце ўздоўж цела.

Сканцэнтруйце ўвагу на паміжрэберных і ніжнебрушных мышцах. Кароткі ўдых праз нос, рукі сашчапіце ў «замок» перад сабою на ўзроўні дыяфрагмы, паўза — затрымка дыхання і... рэзкі выдых на «пффф», ад якога рукі разлятаюцца ў бакі і свабодна падаюць уніз — пад націскам выдыхаемага паветра замок разрываецца.

Паўтарыце 3-4 разы.

5. Ногі пастаўце трохі шырэй, чым на шырыню плячэй. Не згінаючы калені, правай рукою дакраніцеся, з нахілам, да наска левай нагі (кароткі ўдых праз нос, расцягнулі паміжрэберныя мышцы,

затрымка-апора) і, разгінаючыся, спакойна выдыхайце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф».

Не згінаючы калені, левай рукою дакраніцеся, з нахілам, да наска правай нагі (кароткі ўдых праз нос, распягнулі паміжрэберныя мышцы, затрымка-апора) і, разгінаючыся, спакойна выдыхайце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф».

Зрабіце па 3 нахілы кожнай рукою папсраменна.

6. Ногі — на шырыні плячэй. Рукі выцягніцс ўперад і ў бакі. Зрабіце па 4-5 махаў, папераменна правай і левай нагамі, стараючыся дакранацца левым наском да правай рукі, правым наском — да левай рукі. Робячы мах нагою, актыўна расцягвайце паміжрэберныя мышачныя валокны і зрабіце кароткі ўдых праз нос. Паўза-апора на ніжнебрушныя мышцы і... спакойна выдыхайце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф».

7. Ногі трохі расстаўлены, рукі апусціце ўздоўж цела. Актыўна расцягвайце паміжрэберныя мышачныя валокны, зрабіце кароткі ўдых праз нос. Псраносячы вагу цела на правую нагу, абапрыце дыханне і, гайдаючы прамую левую нагу, адначасова размахваючы рукамі, спакойна выдыхайце праз рот на гуку «в-в-в-в-в-в-в».

Паўтарыце тое ж самае, толькі на левай назе.

Практыкаванне выконваецца па 3-4 разы на правай і левай назе папераменна.

8. Ногі расстаўце як мага шырэй, рукі трохі сагніце ў локцях і выцягніце ўперад для падтрымання раўнавагі. Расцягваючы (актыўна) паміжрэберныя мышцы, коратка, але даволі аб'ёмна ўдыхніце праз нос, абапрыце дыханне на ніжнебрушныя мышцы, прысядзьце і, не спяшаючыся, рухайце тазам направа, уперад, налева, назад, выдыхаючы (спакойна) на гуку «з-з-з-з-з-з».

Паўтарыце 3-4 разы. Сачыце, каб спіна была прамая, пасадка — даволі нізкая.

9. Захоўвайце ўмовы практыкавання 8, толькі цяпер рухайце тазам у іншым напрамку: налева, назад, направа, уперад.

Зрабіце 3-4 разы. Сачыце за спіной і пасадкай.

10. Павярніцеся направа і, актыўна напружваючы паміжрэберныя і ніжнебрушныя мышцы, коратка ўдыхніце праз нос, «патрусіце» са сцэны ў глядзельную залу — лёгкі бег (два круп) па зале (увага! Толькі на ступнях — абавязкова!). Выдыхніце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф».

Па сігналу выкладчыка (пляскае ў далоні) змянясцца накірунак і тэмп бегу. Наступныя два кругі студэнты вучацца «лятаць» — спружынячы, падскокваюць і рэзка выдыхаюць праз шчыльна стуленыя губы: пффф, пффф...

Яшчэ два кругі, выбягаючы на сцэну, паспрабуйце падскочыць, адштурхнуўшыся дзвюма нагамі, з прагінаннем у таліі, выцягнуўшы рукі ўверх, з доўгім выдыхам на гуку «н-н-н-н-нн-н».

Апошнія два кругі, выбягаючы на сцэну, «тармазніце», каб прайсціся ўмераным тэмпам, перавальваючыся з нагі на нагу, «качкаю». Ход толькі з пяткі, спіна роўная, але не напружаная, рукі, сагнутыя ў локцях, выцягнуты ўперад, выдыхайце на агучаным фрыкатыўным г і глухіх зычных х, к: г-х, г-к, х-к, г-х, г-к, х-к.

Заканчваецца бег «змейкаю» — прабежка бокам (зноў жа толькі на ступнях) паміж крэсламі ў глядзельнай зале Студэнцкага тэатра (15 радоў). Выдыхайце на агучаных санорных: м-мм-м-м-м-м, н-н-н-н-н-н-н (дыханне размяркоўвайце на адлегласць прабежкі аднаго рада, а на павароце на наступны рад рабіце дабор дыхання (імгненны ўдых праз нос).

У другім семестры першага года навучання выпраўляю студэнтаў у «падарожжа» па акадэміі: з залы Студэнцкага тэатра, пасля выканання «змейкі», бяжыце на першы паверх, далей, удыхаючы толькі праз нос, выдыхаючы на гуку «в-в-в-в-в-в-в», умераным тэмпам, цераз адну прыступку, «ускараскваецеся» па левым баку маршавай лесвіцы аж на пяты паверх акадэміі, а затым, па правым баку маршавай лесвіцы, хто цераз адну, а хто і цераз дзве прыступкі, вяртайцеся на сцэну.

Паколькі бег вымагае значных фізічных высілкаў, то, з'явіўшыся ў зале пасля прабежкі, трэба адпачыць, г.зн. супакоіць дыханне. Зрабіць гэта можна наступным чынам: рэзка выкінуць рукі ўверх і з шумам выдыхпуць (пффф), перад гэтым моцна напружыўшы ніжнебрушныя і паміжрэберныя мышцы; затым «зламацца» ў паясніцы, рукі свабодна падаюць уніз (мышцы плечавога пояса, ніжнебрушныя і паміжрэберныя расслабляюцца, а трымаюць цела тазасцегнавыя і мышцы ног), прыпынак у дзеяннях — паўза — чакайце, калі паветра само «зацячэ» праз нос у арганізм.

Зрабіце гэта, не спяшаючыся, 5-6 разоў, чаргуючы рэлаксацыю з актывізацыяй мышачных валокнаў, і вы зможаце супакоіць перарывістае дыханне.

11. Станьце роўна і свабодна, пяткі пастаўце разам, наскі трохі развядзіце ў бакі, рукі апусціце ўздоўж цела. Удыхніце праз нос, абапрыцеся рукамі на калені, прысядзьцс на ступнях. Закончыўшы групіроўку цела, з сілай адштурхніцеся нагамі ад падлогі, выскачыўшы як мага вышэй уверх, з шумам (пффф) выдыхайце праз шчыльна стуленыя губы, развядзіце ногі шырока ў бакі, а рукі -— уверх; прызямліцеся на наскі, упадзіце, імгненна зрабіўшы дабор дыхання

праз нос, на паўсагнутыя ў локцях рукі (пальцы разведзеныя і трохі сагнутыя). Затрымайцеся ў гэтым становішчы і, спакойна выдыхаючы на гуку «в-вв-в-в-в-в», актыўна ўставайце на руках і прамых нагах.

Практыкаванне выконвайце спачатку павольна, затым трохі хутчэй. Калі ў гэтых тэмпах практыкаванне будзе выконвацца лёгка і прыгожа, варта перайсці да трэніроўкі ў хуткім тэмпе.

12. Захоўваецца ўмова і парадак выканання практыкавання 11, але ў той момант, калі вы ўпалі на паўсагнутыя рукі, затрымайцеся ў гэтым становішчы і адціскайцеся ад падлогі (колькі магчыма), адначасова, прыўзняўшы галаву і гледзячы ў залу, прамаўляйце наступныя глухія і звонкія зычныя: п, б, ф, в, х, г, к, т, д; заканчвайце практыкаванне так, як папярэдняе.

13. Захоўваецца ўмова і парадак выканання практыкавання 11, а ў той момант, калі вы ўпалі на паўсагнутыя рукі, затрымайцеся на некалькі секунд у гэтым становішчы, затым, адштурхнуўшыся рукамі ад падлогі сцэны, плясніце ў далоні, прыўзняўшы галаву, гледзячы ў залу, прамаўляйце наступныя санорныя зычныя: м, н, л, р, мь, йь, ль; заканчвайце выкананне так, як практыкаванне 11.

14. Захоўваецца ўмова і парадак выканання практыкавання 11, але ў той момант, калі вы ўпалі на паўсагнутыя рукі, затрымайцеся ў гэтым становішчы на некалькі секунд, затым, адштурхнуўшыся рукамі і нагамі ад падлогі сцэны, плясніце ў далоні, прыўзняўшы галаву, прамаўляйце наступныя спалучэнні гукаў: мам, мэм, мім, мом, мум, мым; заканчвайце так, як практыкаванне 11.

15. Сядзьце на сцэне, абапрыцеся далонямі на падлогу, ногі, стуліўшы, выцягніце ўперад. Кароткі ўдых праз нос (рэберны тып дыхання і апора), надымайце і рухайце правую нагу ўверх — направа — уніз — на зыходную кропку, спакойна выдыхайце на звонкім зычным «з-з-з-з-з-з-з». Пауза.

Зноў кароткі ўдых праз нос, падымайце і рухайце левую нагу ўверх — налева — уніз — на зыходную кропку, спакойна выдыхайце на звонкім зычным «ж-ж-ж-ж-ж-ж-ж». Паўза.

Адразу ж кароткі, але ўжо значна большы па аб'ёму ўдых праз нос, затрымка (апора) дыхання і, рухаючы адначасова абедзвюма нагамі ў розныя бакі — уверх да сутыкнення — уніз (да падлогі сцэны), актыўна, з напорам выдыхайце на падоўжаным зычным гуку «зззззз», не затрымлівайцеся на зыходнай кропцы, працягвайце фанацыйны выдых на суцэльнай дыхальнай плыні падоўжанага зычнага «жжжжжжж».

Зрабіце практыкаванне 4-5 разоў. Сачыце за пасадкай, нельга ўкладвацца на спіну.

16. Ляжце на спіну, рукі выцягніце за галаву і сашчапіце іх у «замок». Актывізуйце мышачныя валокны дыяфрагмы і паміж-рэберныя мышцы, спакойна ўдыхніце праз нос, затрымайце дыханне і павольна перакочвайцеся ўлева. Апынуўшыся зноў на спіне, выдыхніце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф», вытрымайце невялікую паўзу, затым адпусціце ўсе мышцы брушнога прэса — паветра само спакойна «зацячэ» праз нос. Зафіксуйце (апора) удых і перакочвайцеся ўправа. Апынуўшыся на спіне, выдыхніце на гуку «ф-ф-ф-ф-ф-ф-ф».

17. Захоўваецца ўмова практыкавання 16, толькі цяпер коратка ўдыхніце праз нос і, затрымаўшы дыханне, актыўна перакочвайцеся ўлева (5-7 разоў), з напорам выдыхаючы на падоўжаным звонкім зычным «зззззззззз». Апынуўшыся на спіне, адпусціце ўсе мышцы брушнога прэса — паветра само спакойна «зацячэ» праз нос (паўза).

Паўтарыце практыкаванне, актыўна перакочваючыся управа (5-7 разоў), з напорам выдыхаючы на падоўжаным звонкім зычным «жжжжжжжжжж».

18. Сядзьце на сцэне, абапрыцеся далонямі на падлогу, сагніце ногі ў каленях (кароткі ўдых праз нос, апора) — вы едзеце на «веласіпедзе» (спакойна выдыхайце на гуку «фффффффффффф»), Паўза (ногі пакладзіце на сцэну).

Падыміце і сагніце ногі ў каленях, кароткі ўдых праз нос, затрымка (апора) дыхання і, актыўна круцячы «педалі», выдыхайце з напорам на гуку «фффффффффффф», каб выехаць з крутога віражу направа, у наступны раз — налева.

Не дапускайце перабору дыхання і перанапружання мышІ іаў прэса, своечасова адпачывайце.

19. Ляжце на спіну, рукі выцягніце ўздоўж цела і пастаўце на локці. Зрабіце кароткі выдых «пффф», плаўна, але з сілай махніце прамымі нагамі да галавы і ўверх, падапрыце рукамі талію і выцягніце ногі як мага вышэй. Кароткі ўдых праз нос, затрымка, актыўна выдыхайце на гуку «фффффффффффф». На заканчэнне выдыху расслабце рукі — цела свабодна ўпадзе на сцэну, а паветра само «зацячэ» праз нос.

Паўтарыце практыкаванне 3-4 разы. Сачыце за правільнасцю ўдыху і накіраванасцю выдыху праз шчыльна стуленыя губы на адлегласць 1-2-3 м (блізка, вышэй, высока).

20. Ляжце на спіну, рукі выцягніце ўздоўж цела. Кароткі і лёгкі выдых «пффф». Плауна, але з сілай махніце прамымі нагамі да галавы

так, каб наскі ног дакрануліся да падлоп. Кароткі ўдых праз нос, затрымка дыхання і пачынайце «качаць» мышцы прэса — налева, направа, прама (за галаву) — на гуку «фффффффффф».

Сачыце, каб ногі былі прамыя, не згіналіся ў каленях, з выцягнутымі наскамі. Паступова павялічвайце працягласць выдыху.

Паўтарыце 4-5 разоў. Пасля кожнай серыі рухаў — абавязковы адпачынак (лежачы на спіне, з поўнай рэлаксацыяй усіх мышцаў).

21. Ляжце на жывот, зрабіце ўпор на прамыя рукі, падыміце галаву, глядзіце ў залу, кароткі ўдых праз нос, затрымка, праз шчыльна стуленыя губы выдыхніце на адлегласць 3-4 м з гукам «пфффффффф».

Адціскаючыся ад падлогі на прамыя рукі, бясшумна ўдыхніце праз нос, затрымайце дыханне і праз шчыльна стуленыя губы выдыхніце на адлегласць 5—7 м з гукам «пфффффффффффф». Адпусціце ніжнебрушныя мышцы прэса — паветра спакойна «зацячэ» ў лёгкія, затрымайце дыханне, падымайцеся на прамых нагах і руках.

22. Сядзьце на сцэне, абапрыцеся на рукі, ногі прамыя, як «нажніцы», і падняты пад вуглом 45°. Кароткі ўдых праз нос, затрымка і, выдыхаючы на спалучэнні гукаў «чык-чык, чыкчык, чык-чык, чык-чык», спачатку «стрыжыце» вертыкальна, затым — гарызантальна.

Не дапускайце перанапружання мышцаў прэса, своечасова адпачывайце.

23. Сядзьце на сцэне роўна і свабодна; рукі, сагнутыя ў локцях, трымайце на ўзроўні грудной клеткі; ногі, сагнутыя ў каленях, прыўзняты над падлогай. Кароткі ўдых, затрымка. Паварочваючы корпус цела налева, нібы адштурхоўваючы штосьці, выцягвайце абедзве рукі ў левы бок, а ногі — направа; з шумам выдыхайце праз шчыльна стуленыя губы спалучэнне глухіх зычных «пфффффффффф». Паўза.

Вярніцеся ў зыходнае становішча, паўтарыце практыкаванне, толькі цяпер рукі выцягвайце ў правы бок, а ногі — у левы.

Зрабіце практыкаванне па 3-4 разы папераменна: налева, направа.

24. Сядзьце на сцэне роўна і свабодна, абапрыцеся на рукі; ногі, стуленыя, ляжаць на падлозе. Кароткі ўдых, затрымка, стуленыя ногі перавядзіце налева-уверх-направа-уніз-на зыходную кропку (у час руху выдыхайце на спалучэнні гукаў «ббуууууууу»,). Паўза.

Паўтарыце практыкаванне, толькі цяпер пачынайце рух направа-уверх-налева-уніз-на зыходную кропку і на адным фанацыйным выдыху зрабіце два кругі.

Папераменна змяняючы накірунак руху, падаўжайце фанацыйны выдых на спалучэнні звонкага зычнага б з галосным у: «ббуууууууууу...» на 3, 4, 5... кругоў.

25. Прысядзьце на ступні ног, падаючы на паўсагнутыя ў локцях рукі, коратка ўдыхніце праз нос, затрымайце дыханне, выкіньце ногі назад на ступні, прагніцеся ў паясніцы; адштурхоўваючыся рукамі ад падлогі, падскочце на паўсагнутыя ногі і зрабіце фанацыйны выдых на спалучэнні звонкіх зычных з галоснымі: бдабдубдо,бдобдабду, бдубдобда, бдубдубдо; бдабдубдо,бдобдабду, бдубдобда, бдубдабдо; бдабдубдо, бдабдобду, бдобдабду.

Паступова павялічвайце колькасць падскокаў. Сачыце за артыкуляцыйнай выразнасцю прамаўлення спалучэння гукаў, за якаснай напоўненасцю фанацыйнага выдыху.

26. Ляжце на край сцэны так, каб цела ўтрымлівалася ў раўнавазе. Не абапірайцеся рукамі на сцэну.

Уявіце: вы леглі на камень, каб напіцца вады з крыніцы. На вадзе плаваюць лісточкі, травінкі, галінкі. Разганіце іх рукамі, нахіліцеся да вады і праз мякка стуленыя губы павольна «пацягніце» ў рот празрыстую і халодную ваду. Падыміце галаву, затрымайце дыханне (праглыніце ваду), спакойна выдыхніце праз нос. Паўтарыце 2-3 разы.

27. Сядзьце на падлогу, ногі скрыжуйце, правай рукою моцна абшчапіце ступню левай нагі, левай рукою — ступню правай нагі, галаву трохі нахіліце да грудной клеткі і сагніцеся, каб спіна была выпуклая. Кароткі ўдых праз нос, затрымка дыхання і... актыўна перакочвайцеся на правы бок, па спіне на левы бок. Выдыхайце на гуку «фффффффф».

Зрабіце практыкаванне па 3-4 разы направа і налева.

28. Станьце роўна, рукі апусціце ўздоўж цела. Прысядаючы, злёгку адштурхніцеся ступнямі ног ад сцэны, трохі падскочце (кароткі ўдых праз нос, затрымка) і, апускаючыся толькі на ступню левай нагі, выкіньце ўперад і ў бок правую нагу з выцягнутым наском, адначасова выдыхніце (без напору) на гуку «ффф».

Паўтарыце практыкаванне, толькі цяпер з выдыхам «ффф» выкіньце левую нагу з выцягнутым наском, апускаючыся пасля падскоку ўжо на правую нагу.

Зрабіце папераменна па 2-3 падскокі на кожнай назе.

29. Захоўваецца ўмова практыкавання 28, толькі цяпер, пасля апускання на левую нагу, трэба на ёй затрымацца (для ўтрымання раўнавагі выцягніце паўсагнутыя ў локцях рукі ўперад), а правую нагу павольна разгінайце ў калене і падаўжайце выдых на гуку

«фффффффф». На заканчэнне выдыху зноў падскочце (кароткі ўдых праз нос, затрымка), апускайцеся цяпер на правую нагу, а левую павольна разгінайце ў калене і падымайце ўверх, выдыхаючы на гуку «фффффффф».

Зрабіце папераменна па 2-3 падскокі на правай і левай назе.

30. Уявіце: перад вамі вісіць баксёрская «груша». Зыходнае становішча: ногі, трохі сагнутыя ў каленных суставах, пастаўце на ступні і больш чым на шырыню плячэй; левае плячо ўперад; сагнутыя ў локцях рукі трымайце на ўзроўні грудной клеткі, пальцы сцісніце ў кулакі. «Патанцуйце» на ступнях (спружынячы) перад «грушай»: злёгку падскокваючы, пераносьце вагу цела з левай нагі на правую, з правай — на левую, уперад-назад, направа-налева. Прыпынак (паўза).

Сканцэнтруйце ўвагу, нацэльцеся на «грушу». Кароткі ўдых праз нос, затрымка і... удар правай, левай і яшчэ раз правай рукою (адначасова з мэтанакіраваным фізічным дзеяннем (дынамічны рух кулака) — актыўны фанацыйны выдых спалучэння зычных б і м з галосным у: бум, бум, бум).

Папераменна мяняйце «стойку» 2-3 разы.

31. Станьце ў профіль да глядзельнай залы, рукі апусціце ўздоўж цела, галаву павярніце налева і ўбачце перад сабою «грушу». Кароткі ўдых праз нос, затрымка і... падняўшы сагнутую ў калене нагу, рэзка ўдарце ёю «грушу» (дынамічны выкід левай нагі пад вуглом 90° і актыўны фанацыйны выдых спалучэння зычных к і н з галосным у: куннн). Левую нагу апусціце ў зыходнае становішча.

Павярніцеся на 180° і, нацэліўшыся на «грушу», выканайце ўдар правай нагою: куммм. Правую нагу апусціце ў зыходнае становішча.

Сачыце, каб корпус цела як мага менш наліляўся ў бок, процілеглы ўдару.

Паўтарыце па 2-3 разы левай і правай нагою.

32. Станьце роўна і свабодна, ногі трохі расстаўце, рукі апусціце ўздоўж цела, галаву павярніце налева — там «груша». Кароткі ўдых праз нос, затрымка і... падняўшы сагнутую ў калене левую нагу, зрабіце (выканайце) кароткі ўдар і адразу ж два даўжэйшыя (дынамічны выкід левай нагі пад вуглом каля 90° і актыўны фанацыйны выдых спалучэння звонкіх зычных б, дз і санорных л, м з галоснымі е і а: БелДзАМДзА-АМ). Затрымайце на секунду выцягнутую левую нагу ў верхнім становішчы, затым апусціце яе на падлогу і, падстаўляючы да правай нагі, пакладзіце паўсагнутую далонь правай рукі на кулак левай; прыціснуўшы рукі да грудной клеткі, лёгка, без напружання выдыхніце, нахіліўшы галаву: кун-фуфу.

Прыміце зыходнае становішча, толькі цяпер павярніце галаву направа, нацэльцеся на «грушу». Кароткі ўдых праз нос, затрымка («баявы» дух!) і... падняўшы сагнутую ў калене правую нагу, зрабіце кароткі ўдар і тут жа два даўжэйшыя (дынамічны выкід правай нагі пад вуглом каля 90° і актыўны фанацыйны выдых спалучэння звонкіх зычных б, дз і санорных л, м з галоснымі е і а: БелДзАМДзА-АМ). Затрымайце на секунду выцягнутую правую нагу ў верхнім становішчы, затым апусціце яе на падлогу і, падстаўляючы да левай нагі, пакладзіце паўсагнутую далонь левай рукі на кулак правай і, прыціснуўшы рукі да грудной клеткі, лёгка, без напружання выдыхніце, нахіліўшы галаву: кун-фуфу.

Папераменна мяняючы «баявую» стойку, зрабіце практыкаванне 2-3 разы. Сачыце за тым, каб першы ўдар быў кароткі і рэзкі: Бел (секундная затрымка, напор выдыху павялічваецца), другі і трэці зліваліся ў суцэльны дынамічны ўдар: БелДзАМДзА-АМ (прыпячатайце ступню да «грушы»).

33. Станьце роўна і свабодна, ногі трохі расстаўце. Нацэльцеся на «грушу». Згінаючы рукі ў локцях, сціскаючы пальцы ў кулакі, выстаўце трохі сагнутую ў каленным суставе левую нагу ўперад, рэзка ўдыхніце праз нос (актывізуйце паміжрэберныя мышцы), абапрыце дыханне на ніжнебрушныя мышцы і... з левай рукі папераменна пачынаице «калацць грушу» кулакамі — актыўны фанацыйны выдых спалучэння санорнага м, нескладовага й з галоснымі а і я: маааааааааай-йяя. Паўтарыце 2-3 разы.

34. Захоўвайце ўмову практыкавання 33, толькі цяпер выстаўце трохі сагнутую ў каленным суставе правую нагу ўггерад, рэзка ўдыхніце праз нос (актывізуйце паміжрэберныя мышцы), абапрыце дыханне на ніжнсбрушныя мышцы і... з правай рукі пачынайце «калаціць грушу» кулакамі — актыўны фанацыйны выдых сгшучэння звонкага зычнага б, нескладовага й з галосным! а і я: бааааааааа-йяя. Паўтарыце 2-3 разы.

35. Сядзьце свабодна і роўна на сцэне, ногі скрыжуйце, вазьміцс ў рукі маленькае люстэрка, глядзіцс ў яго і выконвайце артыкуляцыйныя практыкаванні:

рот раскрыйце адвольна, з сілаю нацягніце верхнюю губу на зубы, працягніце губу па зубах (умераным тэмпам паўтарыце 3-4 разы);

рот раскрыйце адвольна, з сілаю нацягніце ніжшою губу на зубы, працягніце губу па зубах (умераным тэмпам паўтарыце 3-4 разы);

рот раскрыйце на шырыню вялікага пальца, з сілаю нацягніце на зубы верхнюю і ніжнюю губы адначасова і ўмсраным тэмпам 3-4

разы працягніце па губах абедзве губы, злёгку прыкусіце іх (паўтарыце 2-3 разы);

сківіцы самкніце, губы збярыце ў «пучок» і выцягніце ўпсрад, не расціскаючы сківіцы і губы, павольна рухайце «пучком» направа-кругом, зрабіце 2-3 разы; паўтарыце 2-3 разы налева-кругом;

сківіцы самкніце, губы збярыце ў «пучок» і выцягніце ўперад, не расціскаючы сківіцы, з сілаю расцягвайце губы ва «ўсмешку»;

высуньце ніжнюю сківіцу ўперад і павольна рухайце направа-налева, уніз-уверх, кругом; паўтарыце практыкаванне 3-4 разы мякка, плаўна, асцярожна;

павольна раскрыйце рот на шырыню двух пальцау, пакладзеных адзін на адзін; 3-4 разы бязгучна прамаўляйце галосны о;

моцна націскаючы, правядзіце 2-3 разы языком па зубах і альвеолах спачатку са знешняга, а затым з унутранага боку.

«выва́ліце» язык як мага больш, трохі патрымайце яго напружаным, затым, расслабіўшы мышцы, схавайце ў роце; паўтарыце 3-4 разы;

«завастрыце» пярэднюю частку языка, нібы іголку; хутка, але недалёка яго высоўваючы, зрабіце 4-6 уколаў «іголкай»;

пярэдняй часткай языка, хутка рухаючы, спрабуйце праткнуць левую або правую шчаку;

пакладзіце язык на ніжнія пярэднія зубы, зрабіце на сярэдзіне языка паглыбленне; уявіце: паглыбленне на языку — маленькі сподачак, у які наліта вада ці малако, нектар ці бальзам; баючыся разліць, павольна высуньце «сподачак» уперад, затым схавайце ў рот; паўтарыце 3-4 разы;

высуньце язык уперад і хутка рухайце ім у розныя бакі: направа-налева, уніз-уверх;

перакладваючы язык направа-налева, асцярожна і мякка «жуйце» яго; паўтарыце 3-4 разы;

моцна прыціснуты да верхніх пярэдніх зубоў язык з сілаю працягніце па цвёрдым да мяккага паднябення, затрымайцеся там на секунду, затым абарвіце (з «прыцмокам») пярэднюю частку языка ад маленькага язычка.

36. Шырока, асцярожна і плаўна раскрыйце рот, стуліце губы (паміж зубамі павінна застацца шчыліна на вялікі палец шырынёй), паспрабуйце пазяхнуць пры закрытым роце (спакойна ўдыхніце праз нос). Вялікі, указальны і сярэдні пальцы трымайце на гартані, каб адчуць, як працуюць унутрыглотачныя мышцы. Зафіксуйце раскрыццё глоткі і рота (надалей такое становішча органаў артыкуляцыйнага апарату будзем называць пазіцыяй гукаўтварэнпя;

вымавіце 3-5 разоў спалучэнне зычных гукаў мгм («вначале, при постановке звука, лучше всего тихо мычать в поисках правильного упора для голоса. Первое время я тянул лишь одну, две, три ноты медиума, упирая их во все точки резонаторов маски, которые мне удавалось ощупывать внутри... я мычал, ощупывая новые резонаторы, упоры и всё по-новому приспособляясь к ним. Во время этих поисков я заметил, что когда стараешься вывести звук в самую маску, то наклоняешь голову и опускаешь подбородок вниз. Такое положение помогает пропускать ноту как можно дальше вперёд» (3, 55-56).

37. Станьце свабодна і роўна. Падрыхтуйце пазіцыю. Уявіце: вы лепіце (ствараеце) галосныя а, э, і, о, у, ы. Перш чым выконваць практыкаванні, паглядзіце ўважліва ў люстэрка і зафіксуйце ў памяці артыкуляцыйнае вымаўленне кожнага галоснага, а затым толькі спрабуйце ўвасабляць іх рукамі і голасам.

Тэхніка выканання: спакойна ўдыхніце праз нос, абапрыце дыханне на ніжнебрушныя мышцы, паўсагнутыя ў локцях рукі трымайце на ўзроўні грудной клеткі перад сабою. Сканцэнтруйце ўвагу на іх, а таксама на ўнутрыглотачнай і знешняй артыкуляцыі. Агучванне галосных — у сярэднім рэгістры.

Спачатку выкладчык умераным тэмпам прамаўляе і дэманструе кожны радок табліцы галосных, а студэнты паўтараюць за ім:

а э і о у ы
э і о у ы а
і о у ы а э
о у ы а э і
у ы а э і о
ы а э і о у.

38. Станьце свабодна і роўна. Падрыхтуйце пазіцыю: шырока, асцярожна і плаўна раскрыйце рот, стуліце губы (паміж зубамі павінна застацца шчыліна на вялікі палец шырынёй), паспрабуйце пазяхнуць пры закрытым роце (спакойна ўдыхніце праз нос, але не дапускайце поўнага пазяхання). Уявіце: вы ствараеце ётавыя галосныя (спалучэнні двух гукаў: нескладовага й і адпаведнага галоснага).

Пад час прамаўлення нескладовага й пярэдняя частка языка прыціскаецца да ніжніх пярэдніх зубоў і, злёгку адштурхнуўшыся ад іх, язык займае становішча і прымае форму, якія паспрыяюць утварэнню неабходнага галоснага, а таксама і канкрэтнага ётавага.

Пакладзіце далонь на макаўку (верхняя частка галавы) і, трохі нахіліўшы галаву, нібыта спрабуючы выцягнуць шыю, актыўна

накіроўвайце фанацыйны (вакалізаваны) выдых па ўтвораным у гартані «калодзежы» ўверх, у цэнтр макаўкі, спрабуючы прабіць яе кароткім, але дынамічным нескладовым й. Паўтарыце 3-5-7 разоў:

й-й-й

й-й-й-й-й

й-й-й-й-й-й-й.

39. Падрыхтуйце пазіцыю, пакладзіце руку на верхнюю частку грудной клеткі і, лёгка пастукваючы па ёй, на актыўным фанацыйным выдыху прамаўляйце санорны зычны м. Паўтарыце 5-7-9 разоў:

мммммм

мммммм

мммммммм.

Трымаючы руку на верхняй частцы грудной клеткі, нс мяняючы пазіцыю, на актыўным фанацыйным выдыху, артыкуляцыйна выразна прамаўляйце наступныя галосныя: э, о, у, а. Паўтарыце тры разы.

40. Станьце свабодна і роўна. Сканцэнтруйце ўвагу на «тэхніцы» стварэння ётавых галосных: й + э = е, й + о = ё, й + у = ю, й + а = я.

Падрыхтуйце пазіцыю і актыўным фанацыйным выдыхам, аднак жа не спяшаючыся, пасылайце (выштурхоўвайце) нескладовы й у сярэдзіну макаўкі, затым імгненна (валявым намаганнем) выклічце рэзанацыю ў верхняй частцы грудной клсткі галосным э і, нарэшце, стварыце (спрэсуйце) ставы галосны е ў сярэднім рэгістры (насавыя поласці і купал цвёрдага паднябення).

Такім жа чынам і парадкам стварыце астатнія ётавыя галосныя: ё, ю, я.

и, и, и, и — верхні рэгістр

э, о, у, а — ніжні рэгістр

е, ё, ю, я — сярэдні рэгістр.

Паўтарыце практыкаванне 2-3 разы.

41. Станьце свабодна і роўна. Выстаўляючы перад сабою на ўзроўні грудной клеткі паўсагнутыя ў локцях рукі, зрабіце кароткі ўдых праз нос, абапрыце дыханне на ніжнебрушныя мышцы, адначасова падрыхтуйце пазіцыю і, спакойна разводзячы рукі ў бакі, на суцэльным актыўным фанацыйным выдыху, трохі расцягваючы, прамаўляйцс табліцу галосных ў сярэднім рэгістры:

а-а-а-э-э-э-і-і-і-о-о-о-у-у-у-ы-ы-ы.

Сачыце, каб выдых быў насычана роўны на кожным галосным. Для таго, каб гук «не скакаў» (не дрыжаў), патрэбна раўнамерна

размеркаваць напор дыхання на ўсютабліцу галосных і актывізаваць унутрыглотачную і знешнюю артыкуляцыю.

Паўтарыце практыкаванне 2-3 разы.

42. Захоўвайцс ўмовы і парадак правядзення практыкавання 41, толькі цяпер сканцэнтруйце ўвагу на ніжнім (грудным) рэгістры (пакладзіцс абедзве рукі на верхнюю частку грудной клеткі):

а-а-а-э-э-э-і-і-і-о-о-о-у-у-у-ы-ы-ы.

Паўтарыце практыкаванне 2-3 разы.

43. Паўтарыцс практыкаванне 41, толькі няпер прамаўляйцс табліцу ётавых галосных ў сярэднім рэгістры:

йэ-е-йо-ё-йу-ю-йа-яя.

Паўтарыце практыкаванне 2-3 разы.

44. Захоўвайце ўмовы і парадак правядзення практыкавання 41, толькі цяпер сканцэнтруйце ўвагу на всрхнім (галаўным) рэгістры (для адчування рэзанацыі пакладзіце руку далоняй на макаўку галавы):

а-а-а-э-э-э-і-і-і-о-о-о-у-у-у-ы-ы-ы.

Паўтарыце практыкаванне 2-3 разы.

45. Станьце свабодна і роўна. Падрыхтуйце пазіцыю. Уявіце: вы лепіцс (ствараеце) спалучэнні зычных і галосных гукаў, а таксама цэлыя словы.

Тэхніка выканання: кароткі ўдых праз нос, затрымка (апора); трымаючы перад сабою на ўзроўні грудной клеткі паўсагнутыя ў локцях рукі, пальцамі абедзвюх рук зляпіце ў сярэднім рэгістры невялікае (аднаскладовае) спалучэнне санорнага м і галоснага а: ма.

Калі ўбачылі і пачулі, што спалучэнне па форме і, галоўнае, па гучанні атрымалася такое, якім вы яго ўявілі і чакалі пачуць, то пастарайцеся яго павялічыць: маам, а затым зрабіць больш важкім — мма-а-амма.

Паўтарыце: ма, маам, мма-а-амма.

Будзьце ўважлівыя пад час выканання, бо выкладчык (глядач-слухач) хоча ўбачыць, пачуць і пераканацца, што менавіта той памер і форма, якія вы паказалі, і тая сіла голасу, якой вы напоўнілі гукі м і а, утварылі такія розныя спалучэнні.

Паспрабуйце зляпіць новыя спалучэнні зычных з галоснымі гукамі:

нэ, нээн, ннэ-э-эннэ

ді, лііл, ллі-і-іллі

во, воов, вво-о-овво

ду, дууд, дду-у-удду

зы, зыыз, ззы-ы-ыззы.

Перш чым выконваць практыкаванні, паглядзіце ўважліва ў люстэрка і зафіксуйце ў памяці артыкуляцыйнае прамаўленнс

галосных э, і, о, у, ы, а затым ужо спрабуйце пальцамі і голасам увасобіць само спалучэнне зычных з галоснымі.

Кожны радок спалучэнняў зычных з галоснымі гукамі мэтазгодна паўтарыць 2-3 разы.

Замацаваўшы прамаўленнс пералічаных вышэй спалучэнняў у сярэднім рэгістры гучання, выразна скажыце шэптам, напаўголасу, на поўны голас крылаты выраз славутага нямецкага спевака Эрнста Посарта: Мой голас — мой капітал! Або іншыя фразы, прыказкі.

46. Станьце свабодна і роўна. Сканцэнтруйце ўвагу на ніжнім рэгістры. Падрыхтуйце пазіцыю (кароткі ўдых праз нос, апора), падбародак трохі апусціцца. Умераным тэмпам, лёгка пастукваючы далонню левай рукі па верхняй частцы грудной клеткі, злітна прамаўляйце на роўным фанацыйным выдыху спалучэнне санорнага л з галосным у: ллулулулулулулулулулу.

Імгненна зрабіўшы праз нос дабор дыхання, зафіксуйце яго ўсімі мышцамі брушнога прэса і, не мяняючы пазіцыі гукаўтварэння, папераменна пастукваючы слаба сціснутымі кулакамі правай і левай рукі па верхняй частцы грудной клеткі, злітна прамаўляйце на фанацыйным выдыху спалучэнне звонкага зычнага д з галосным о: ддо-ддо-ддо-ддо-ддо-ддо-ддо-ддо-ддо-ддоддо-ддо.

47. Станьце.свабодна, ногі пастаўце трохі шырэй, чым на шырыню плячэй, рукі свабодна апусціце ўздоўж цела. Рыхтуючы пазіцыю, коратка ўдыхніцс праз нос; пераводзячы абедзве рукі налева, зафіксуйце дыханне, перанясіце вагу цела на прамую левую нагу; выпрастаную правую нагу пастаўце на вялікі палец, затым, актыўна махнуўшы рукамі ў правы бок, перанясіце цераз паўсагнутыя ногі вагу цела на ступню правай нагі, прамаўляючы на фанацыйным выдыху кароткае спалучэнне звонкага зычнага б, галоснага а і санорнага м: бом.

Паўтарыце практыкаванне, толькі цяпер на фанацыйным выдыху прамаўляйце спалучэнне звонкага зычнага д, галоснага о і санорнага н: дон.

Паўтарыце практыкаванне яшчэ раз, а на фанацыйным выдыху прамаўляйце спалучэнне звонкіх зычных з, в, галоснага о і санорнага н: звон.

48. Паўтарыцс практыкаванне 47, толькі цяпер актывізуйце фанацыйны выдых і прамаўляйце спалучэнні зычных і галосных гукаў з большым напорам на санорныя: бо-омм, до-онн, зво-онн, не забываючыся пераносіць цераз паўсагнутыя ногі вагу цела з правай на левую, з левай на правую нагу, адначасова пераводзьце налева-направа і абедзве рукі.

Практыкаванне выконваецца на адным суцэльным фанацыйным выдыху (без дабору дыхання).

Калі гэтыя спалучэнні пачнуць гучаць насычана, важка і сакавіта, паспрабуйце перадаць голасам гучанне вялікага звона:
бо-омм, до-онн, зво-онн.
Пасля прамаўлення кожнага спалучэння зычных з галоснымі рабіце дабор дыхання праз нос, не мяняючы пазіцыі гукаўтварэння.

49. Замацаваўшыгучанне (рэзанацыю) ніжняга(груднога) рэгістра, выразна скажыце:
Мой голас гучыць, як арган — напаўголасу,
...гу-учы-ыць як а-арга-анн — на поўны голас,
..л о-ола-асарга-аннн — на поўны голас.

50. Станьце свабодна і роўна. Падрыхтуйце пазіцыю для гучання ў сярэднім рэгістры (удыхаючы праз нос, паспрабуйце пазяхнуць, зафіксуйце ўдыхнутае паветра і, лёгка пастукваючы вялікім і сярэднім пальцамі правай рукі па ноздрах, прамаўляйце на фанацыйным выдыху санорны м).

Паўтарыце 2-3 разы.

51. Станьце свабодна і роўна. Падрыхтуйце пазіцыю, падбародак трохі апусціце. Лёгка і хутка пастукваючы падушачкамі пальцаў па лобных пазухах, накіроўвайце фанацыйны выдых у сярэдзіну макаўкі, злітна прамаўляючы адно толькі слова: ммоймоймоймоймой-моймоймоймоймой.

Калі вам не адразу ўдасца зафіксаваць гучанне ў верхнім (галаўным) рэгістры, то пастаўце ногі амаль на шырыню плячэй, падрыхтуйце пазіцыю, нахіліцеся на прамых нагах да падлогі і апусціце рукі, расслабце мышцы шыі і пачынайце рэзанацыю. Як толькі пачуеце правільнае гучанне галаўнога рэзанатара, павольна разгінайцеся, працягваючы прамаўляць на фанацыйным выдыху слова ммоймоймоймой...

Замацаваўшы гучанне верхняга рэгістра, выразна скажыце, трохі расцягваючы галосныя гукі: ммо-о-ой (дабор дыхання) гоо-ла-а-ас (дабор) зво-онка-а-а (дабор) зьві-і-ні-і-іць (дабор), даалё-о-ка-а-а (дабор) ля-аці-і-іць.

Імгненна зрабіўшы дабор дыхання, паспрабуйце кожную пару слоў «паслаць» як мага далей (надайце большую дынаміку выдыху):
мойго-ола-а-а-ас (дабор дыхання) звонказьвіні-і-і-іць (дабор)

далёкал я-а-цы-і-іць.

Імгненна зрабіўшы дабор дыхання, не мяняючы пазіцыю, надайце фанацыйнаму выдыху яшчэ большую дынаміку і скажыце выразна (з пасылам) фразу:

мойголасзвонказьвіні-і-і-іць (дабор) —на поўны голас, ...далёкаля-аці-і-і-іць (дабор) —напаўголасу, ...ля-аці-і-і-іць — піяна.

Паўтарыце 2-3 разы. Памятайце пра апору дыхання, пазіцыю гукаўтварэння, сярэдзіну макаўкі.

52. Уявіце: вы ў лесе збіралі грыбы ці ягады і не заўважылі, як... згубіліся. Вашы дзеянні?

а-у-у — дзе гэта я?

а-у-у-у-у — устрывожана (актыўны пасыл), ау-у-у-у-у — са страхам (больш актыўны пасыл), а-у-у-у-у — рэха (напаўголасу адгукнулася), У-У-У — аддаленае (амаль шэптам).

Паўтарыце 3-4 разы. Сачыце за дынамікай фанацыйнага выдыху і насычанасцю пасылу гуку.

53. Уявіце: вы ўгарах (там цудоўная акустыка). Праверце сілу і палётнасць вашага голасу:

оо-ого-го-го-о-о-о — самы актыўны пасыл,

ого-го-го-о-о — рэха (разляцелася хвалямі), о-о-о-о — аддаленае рэха (амаль шэптам). Зрабіце практыкаванне 3-4 разы. Не крычыце, а пасылайце спрэсаванае фанацыйнае дыханне ў прастору... уважліва слухайце і старайцеся дакладна паўтарыць танальныя абрысы рэха і аддаленага рэха.

54. Сядзьце на сцэну, ногі скрыжуйце, рукі пакладзіце на калені, удыхніце праз нос невялікі аб'ём кісларода, абапрыце дыханне і артыкуляцыйна выразна, але бязгучна скажыце: вучыц-цаніколіняпозна (не позна).

Паўтарыце (бязгучна) фразу. Імгненна зрабіце дабор дыхання і, трохі расцягваючы галосныя гукі, злітна, на адным дыханні, артыкуляцыйна выразна скажыце шэптам: ву-учы-ыццаніко-оліняпо-озна.

Паўтарыце (шэптам) фразу, трохі больш расцягваючы галосныя гукі.

Пад час фанацыі шэпту не павінна быць сіпу, хрыпу, а толькі — цёплы шум. Запомніце адчуванне слабой актывізацыі галасавых звязак пад час фанацыі шэпту.

55. Ляжце на спіну, удыхніце праз нос, актывізуючы валокны паміжрэберных мышцаў; зафіксуйце (абапрыце) дыханне мышцамі брушнога прэса і на актыўным фанацыйным выдыху, артыкуляцыйна выразна скажыце напаўголасу: ву-у-учы-ы-ыц цаніко-о-оліняпо-о-ознаа.

Паўтарыце (напаўголасу) фразу, толькі цяпер трохі больш насычана расцягвайце галосныя гукі: ву-учы-ы-ыццаніко-о-ооліняпо-о-о-о-ознаааа.

56. Са становішча лежачы на спіне зрабіце лёгкі мах абедзвюма нагамі да галавы, затым — рэзкі мах нагамі і тулавам уперад — устаньце і павярніцеся тварам у залу; кароткі ўдых праз нос, падрыхтуйце пазіцыю і зафіксуйце (абапрыце) дыханне, без напружання галасавых звязак, злітна, артыкуляцыйна выразна скажыце на поўны голас: вучыццаніколіняпозна.

Паўтарыце фразу 2-3 разы, толькі цяпер прамаўляйце тэкст на поўны голас таварышу, які знаходзіцца на супрацьлеглым беразе даволі шырокай ракі (актыўнасць фанацыйнага выдыху значна павялічваецца): ву-учы-ы-ццані-ко-о-оліняпо-о-ознаааа.

57. Станьце свабодна і роўна, рукі апусціце ўздоўж цела. Скажыце прыказку Грамада за аднаго і адзіп за грамаду на адным дыханні шэпгам на адлегласць 3, 10, 15 метраў. Добры пасыл гуку забяспечыць выразная артыкуляцыя і актыўны мэтанакіраваны фанацыйны выдых.

58. Сядзьце на сцэну, паўсагнутыя ў каленях ногі падагніце да жывата рукамі. Коратка ўдыхнуўшы праз нос, зафіксуйце дыханне, на актыўным фанацыйным выдыху, артыкуляцыйна выразна скажыце прыказку Нябойся (не бойся) зьвяглівага, а бойся кусьлівага напаўголасу на адлегласць да апошняга рада глядзельнай залы, бельэтажа, галёркі. Актыўнасць пасылу павышаецца. Добрай палётнасці паспрыяе канкрэтна вызначаная задача, з якой неабходна прамаўляць гэты тэкст.

59. Ляжце на спіну, удыхніце праз нос, актывізуючы валокны паміжрэберных мышцаў, зафіксуйце (абапрыце) дыханне мышцамі брушнога прэса і на актыўным фанацыйным выдыху артыкуляцыйна выразна скажыце на поўны голас прыказку Згубіўшы большага, не шкадуй меншага. Канкрэтна вызначце, каму, дзе і з якой мэтай вы будзеце голасна прамаўляць гэты тэкст. Старайцеся не крычаць, а з напорам прамаўляць прыказку на адным дыханні. Калі ж яго напачатку не будзе хапаць, то зрабіце пасля слоў згубіўшы большага дабор дыхання. Сачыце, каб голас гучаў насычана і пераканальна.

60. Са становішча лежачы на спіне зрабіце лёгкі мах абедзвюма нагамі да галавы, затым — рэзкі мах нагамі і тулавам уперад — устаньце і павярніцеся тварам у залу; кароткі ўдых праз нос, падрыхтуйце пазіцыю і зафіксуйце (абапрыце) дыханне, без напружання галасавых звязак, злітна, артыкуляцыйна выразна скажыце фразу Званіў звонка-звонка, званіў, перазвоньваў ды так і не дазваніўся ў сярэднім, верхнім і ніжнім рэгістрах.

Задача: паскардзіцеся каму-небудзь, што не змаглі дазваніцца, хаця вам вельмі трэба было, або апраўдвайцеся, што вы не вінаваты ў тым, што так дрэнна працуе тэлефонная сувязь.

Спачатку 2-3 разы актыўна, на пазіцыі, прамаўляйце ўсю фразу на адным дыханні ў сярэднім рэгістры, затым — у всрхнім, пасля яшчэ раз у сярэдшм і абавязкова ў ніжнім.

Паўтарыце 2-3 разы.

61. Сядзьце на сцэну, ногі скрыжуйце, рукі пакладзіце на кален!; кароткі ўдых праз нос, зафіксуйце дыханне і пазіцыю, старайцеся выконваць вызначаную вамі задачу і актыўна прамаўляйце словы званіў звонка-звонка ў всрхнім рэгістры, званіў, перазвоньваў — у сярэднім, ды так і не дазваніўся — у ніжнім.

Паўтарыцс 2-3 разы.

62. Са становішча седзячы на сцэне абхапіце рукамі ногі, зрабіце лёгкі мах усім тулавам па авальнай спіне назад, а затым, развёўшы рукі ў бакі, рэзкі мах уперад — станьце на ногі, рук і апусціце ўздоўж цела; кароткі ўдых праз нос, затрымка дыхання.

На падрыхтаванай пазіцыі, з канкрэтна вызначанай для сябе задачай актыўна прамаўляйце словы званіў звонка-звонка, званіў — у верхнім рэгістры, імгненна зрабіце праз нос дабор дыхання, зафіксуйце (абапрыце) яго мышцамі брушнога прэса, сканцэнтруйце ўвагу на верхняй частцы грудной клеткі (пакладзіце на яе руку) і, не спяшаючыся, выразна і важка скажыце словы неразвоньваў, ды так і не дазваніўся ў ніжнім рэгістры.

Паўтарыце 2-3 разы, сачыце за дакладнасцю выканання дзсйснай задачы, дыкцыйнай выразнасцю, актыўнасцю і мэтанакіраванасцю пасылу голасу.

63. Распеўка па тонах (паўтонах) пры закрытым роце і ўголас. Найбольш мэтазгодна пачынаць з еярэдняга рэгістра, гісраходзіць у всрхні, затым вяртацца ў сярэдні і апускацца да нот ніжняга рэгістра. Распеўку варта праводзіць па трупах — асобна юнакі і дзяўчаты. Памятайце, што «звук, который кладётся на зубы или посылается «в кость», то есть в жёсткое нёбо, носовые раковины, гайморову полость, череп, приобретает металл и силу. Звуки же, которые попадают в мягкие части нёба или в голосовую щель, резонируют, как в вате» (3, 53). мі-соль-сі-соль-мі-соль-сі-соль-мі фа-ля-до-ля-фа-ля-до-ля-фа соль-сі-рэ-сі-соль-сі-рэ-сі-соль фа-ля-до-ля-фа-ля-до-ля-фа мі-соль-сі-соль-мі-соль-сі-соль-мі рэ-фа-ля-фа-рэ-фа-ля-фа-рэ до-мі-соль-мі-до-мі-соль-мі-до сі-рэ-фа-рэ-сі-рэ-фа-рэ-сі ля-до-мі-до-ля-до-мі-до-ля.

Для групавых і індывідуальных заняткаў карысна выкарыстаць спачатку і распеўку па нотах адной актавы, затым індывідуальна

дабаўляць ноты ўверсе і ўнізс, чаргуючы выкананне як легата, так і стаката:
до-рэ-мі-фа-соль-ля-сі-до (дабор дыхання), до-сі-ля-соль-фа-мі-рэ-до.

Пад час распеўкі кантралюйце ўнутрыглотачную артыкуляцыю, аб'ём і апору дыхання, пазіцыю гукаўтварэння, сачыце за адпаведнай рэзанацыяй у сярэднім, верхнім і ніжнім рэгістрах, а таксама — за роўнай насычанасцю гучання кожнай ноты і яе пасылам (палётнасцю голасу).

64. Практыкаванне «Музыка» — храматычная гама і рэчытатыў. Для развіцця меладычнасці, напеўнасці жывога вуснага слова, а таксама музыкальнасці будучых артыстаў выкарыстоўваю (амаль сорак гадоў) верш Г. Сапгіра «Музыка» (у маім перакладзе з рускай мовы), які распісаны па нотах адной актавы.

Практыкаванне выконваецца (абавязкова!) толькі пасля распеўкі. Трэніроўка праходзіць пад «акампанемент» фартэпіяна (спецыяльнай, музычнай адукацыі студэнтам для гэтага не патрэбна). Займацца распрацоўкай вакальна-моўнага практыкавання «Музыка» варта наступным чынам: лёгка ўдарыўшы пальцам па клавішы фартэпіяна, уважліва паслухайце ноту і, зрабіўшы імгненны ўдых праз нос, падрыхтуйце пазіцыю, зафіксуйце (абапрыце) дыханне мышцамі брушнога прэса, трохі расцягваючы галосныя гукі, на роўным фанацыйным выдыху вымаўляйце канкрэтны тэкст, каб гучанне яго адпавядала вышыні гучання ноты.

Аднак гэта толькі тэхнічны бок выканання, Самае ж галоўнае заключаецца ў тым, каб вобразна ўявіць, г.зн. адчуць прыгажосць гучання ноты і, напоўніўшы тэкст уласнай эмацыянальнасцю і ўсхваляванасцю, псрадаць голасам мслодыку паэтычнага слова, увасобіць у жывым гучанні вобраз канкрэтнай ноты.

Музычны інструмент (фартэпіяна) выкарыстоўваецца толькі як дадатковы «настройшчык» пад час трэціроўкі моўнага голасу, бо ні адзін з музычных інструментаў, вынайдзеных чалавскам, як зазначыў К. Станіслаўскі, не можа быць такім дасканалым, як прыродны інструмент чалавека, што служыць яму для ўтварэння голасу і элементаў мовы.

Уважліва прачытайце верш Г. Сапгіра «Музыка», адразу спрабуйце ўявіць, пачуць кожную ноту і кожнае слова, якія ствараюць яе вобраз, характар і адметнасць (своеасаблівасць) гучання.

сі	Пявучыя ноты нам дорыць зямля.
до	До — быццам медныя с[ь]певы чмяля.
до дыез	А гэта пастух зайграў на дудзе —

рэ	Ліецца чароўная нота «рэ».
рэ дыез	Мяўкае кот на двары за дз[ь]вярмі.
мі	Мяўкае кот, а мне чуецца «мі».
фа	Кукуе зязюля, шукае кагосьці...
фа дыез	Чуецца ў «фа» мне сумнае штосьці.
соль	А помніш, с[ь]пявалі вясной капяжы?
соль дыез	Соль-соль — з[ь]віняць ледзяшы.
ля	Ля — быццам сонца прамень залаты,
ля дыез	Калі ас[ь]вятляе ён лу[х] і сады.
сі	Сі — сказаць трэба чыста і звонка.
сі	Апошняя нота гучыць тонка-тонка.
ля	Сем чыстых і звонкіх, куды ні пайду, -
соль	Чую іх блі[с]ка, усюды знайду.
фа	С[ь]пяваюць [й]іх рэчкі, сады і палі.
МІ	І ўсё гэта —
рэ	Музыка
до	Нашай
сі	Зямлі.

На групавых занятках да пачатку калектыўнай распрацоўкі моўна-вакальнага практыкавання «Музыка» неабходна правесці арфаэпічны аналіз і эмацыянальна-вобразную падрыхтоўку студэнтаў: расказваю групе пра ўласныя асацыяцыі і ўражанні, адчувальныя, зрокавыя і слыхавыя вобразы, што з'явіліся, узніклі ў мяне пасля прачытання верша. Такая размінка дапамагае стварыць на занятках творчы настрой, выклікаць у студэнтаў зацікаўленасць аўтарскім тэкстам. Моцны псіхалагічны ўплыў і яшчэ большае эмацыянальна-вобразнае ўздзеянне робіць на будучых артыстаў выкананне практыкавання «Музыка» самім выкладчыкам. Нездарма К. Станіслаўскі сцвярджаў, што «лепшы спосаб пераканаць чалавека — уласны прыклад».

Калектыўную распрацоўку практыкавання мэтазгодна праводзіць у такім парадку: група дзяўчат трэніруецца ў прамаўленні (рэчытатывам) першых двух радкоў верша ўголас, юнакі ў гэты час працуюць артыкуляцыйна, г.зн. прамаўляюць тэкст бязгучна (гэта дапамагае ім арганізаваць дыханне і падрыхтаваць пазіцыю гукаўтварэння). Так адпрацоўваецца гучанне кожнага радка верша. Гэты прыём дае студэнтам магчымасць не толькі самастойна трэніраваць свой голас, але і правяраць гучанне верша ў выкананні аднакурснікаў.

Пачынаецца практыкаванне з ноты «сі» — мякка, трохі ўрачыста, словы прамаўляюцца нараспеў: «Пявучыя ноты нам дорыць зямля». Узяўшы дыханне, на адным фанацыйным патоку трэба свабодна і шырока вымавіць ноту «до-о-о-о-о...», а затым, імгненна дабраўшы дыханне, — сярэднім тэмпам: «Быццам медныя спевы чмяля». Паслухаўшы гучанне ноты «до дыез», на абапёртым дыханні мякка прамаўляйце наступны радок верша: «А гэта пастух зайграў на дудзе». Невялікая паўза, удар па клавішы «рэ»: «Ліецца чаро-оўная нота (непрыкметны дабор дыхання, спачатку ціха-ціха, затым, узмацняючы голас, з добрым напорам фанацыйнага выдыху, нараспеў) «рэ-э-э-э-э...»; пасля гучанне зноў прыцішваецца, утвараючы «рэха». Вытрымаць паўзу, паслухаць ноту «рэ дыез» і выразна, але не спяшаючыся, сказаць: «Мяўкае кот на двары за дзвярмі». Без паўзы ўдар па наступнай клавішы — і такім жа тэмпам вымавіць: «Мяўкае кот, а мне чуецца «мі». Вялікая паўза — прыслухайцсся да мяккага гучання ноты «фа» і, звяртаючыся да групы, скажыце нараспеў: «Ку-ку-уе зязю-уля, шука-ае каго-осьці». Паўза. Лсгкі ўдар па наступнай клавішы, тэкст «Чуецца ў «фа-а-а-а-а» мне сумнае штосьці» прамаўляецца нараспеў, і нота «фа дыез» павінна гучаць мякка, нават пяшчотна. Вытрымайце невялікую паўзу, каб перайсці да наступнай ноты. Два лёгкія ўдары па клавішы з нотай «соль» — чыста і звонка прамаўляйце наступны тэкст: «А помніш, спявалі вясной капяжы?»; удар па клавішы «соль дыез» — «Соль-соль — звіняць ледзяшы». Без паўзы ўдар па клавішах «ля» і «ля дыез» — два радкі верша павінны прагучаць лёгка і чыста: «Ля — быццам сонца прамень залаты. Калі асвятляе ён луг і сады». Невялікая паўза, імгненны дабор дыхання, ноту «сі» прамаўляйце ў сярэднім тэмпе: «Сі — сказаць трэба чыста і звонка. Апошняя нота гучыць тонка-тонка». Вытрымліваецца паўза, затым шырока, нараспеў, прамаўляйце апошнія словы верша з паніжэннем голасу на кожнай ноце: «ля» — «Сем чыстых і звонкіх, куды ні пайду»; дабор дыхання і ўдар па клавішы «соль» — «Чую іх блізка, усюды знайду»; дабор дыхання і ўдар па клавішы «фа» — «Спяваюць іх рэчкі, сады і палі»; дабор дыхання і ўдар па клавішы «мі» — «І ўсё гэта-а-а»; дабор дыхання і ўдар па клавішы «рэ» — «Му-у-узы-ыка-а-а»; дабор дыхання і ўдар па клавішы «до» — «На-аша-ай», імгненны дабор дыхання і ўдар па клавішы «сі» — «Зя-амлі-і-і...».

Абмяжоўвацца нотамі толькі адной актавы неабавязкова. Пасля таго, як будзе натрэніравана гэтая колькасць нот, можна дадаваць па адной ноце ўверсе і ўнізе.

Пры выкананні практыкавання нельга дапускаць перабору дыхання — празмернага напаўнення лёгкіх паветрам, бо гэта

перашкаджае правільнай арганізацыі пасылу голасу і насычанасці гуку. З-за перабору дыхання першыя словы тэксту звычайна «выстрэльваюцца», а астатнія вымаўляюцца даволі невыразна і ціха.

65. Спяванне народных песень. Напеўнасць, шырыня, меладычнасць, сакавітасць слова і фраз беларускіх, рускіх, украінскіх народных песень садзейнічаюць развіццю ўстойлівага дыхання, выпрацоўцы навыку арганічнага і нязмушанага гучання.

Народныя (і не толькі) песні для калектыўнага выканання юнакам і асобна дзяўчатам прапануе выкладчык, а песні для індывідуальнай распрацоўкі студэнты выбіраюць самастойна.

Распрацоўваюцца песні на групавых занятках пасля комплекснага трэнінгу (настройкі) і толькі а капэла (без музычнага суправаджэння).

Студэнтам тэатральнага факультэта, асабліва акцёрскага аддзялення, неабходна распрацоўваць не толькі фактуру, але і аб'ём моўнага голасу. А дасягнуць станоўчых вынікаў у гэтым можна, толькі настойліва трэніруючы, развіваючы ўвесь свой псіхафізічны апарат. Калі займацца трэніроўкай голасу рэгулярна (не толькі на групавых занятках, але і (абавязкова!) самастойна), то за некалькі гадоў слабыя галасы могуць набыць сілу і палётнасць, крыклівыя — стаць мяккімі і мілагучнымі, манатонныя — натуральнымі і выразнымі, хрыплыя і сіплыя — чыстымі і звонкімі, дыяпазон рабочых нот моўнага голасу павялічыцца на паўактавы, а вакальнага — і яшчэ больш.

Усе гэтыя выяўленчыя сродкі і якасці моўнага голасу прафесійна патрэбныя будучым артыстам як для ўвасаблення зместу розных літаратурных твораў у сцэнічнай жывой (дзейснай) мове, так і пад час выканання самых разнастайных роляў.

ТЭКСТЫ ДЛЯ ТРЭНІНГУ

Павслічэнне аб'ёму дыхання; развіццё голасу; паляпшэнне дыкцыі — чысціні і выразнасці прамаўлення; засваенне арфаэпічных нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення

Вядома, што пад час сцэнічнага расповяду мастацкага тэксту або выканання канкрэтнай ролі ў спектаклі артыст карыстаецца рознымі аб'ёмамі дыхання. Аб'ём дыхання ў асноўным залежыць ад таго, якою колькасцю слоў выказана аўтарская думка. Таму, каб набыць навык выкарыстання розных аб'ёмаў дыхання пры сцэнічным расповядзе, неабходна трэніравацца і на тэкставым матэрыяле (можна ўзяць урывак з паэмы або цэлы, але не надта вялікі верш і падзяліць яго на розныя па аб'ёму часткі). У час трэніроўкі старайцеся не толькі палепшыць тэхнічны бок выканання (прамаўляць кожную частку на

адным фанацыйным выдыху), але і данесці да слухачоў змест, што закладзены ў творы.

Пры выкананні тэкставага практыкавання абавязкова захоўвайце паслядоўнасць выдыхаў і ўдыхаў, таму што ад гэтага залежыць аб'ём дыхання. Калі ў час трэніроўкі будзе зблытаны тэкст або паслядоўнасць выдыхаў і ўдыхаў, практыкаванне абавязкова трэба пачынаць спачатку, таму што працэс дыхання ў такім выпадку парушаецца.

Парадак выканання тэкставага практыкавання наступны: стаць роўна, злёгку падцягнуць ніжнебрушныя мышцы, зрабіць спакойны ўдых камбінаваным тыпам дыхання, пасля якога міжволі атрымліваецца секундная затрымка, неабходная для таго, каб перайсці да расповяду аўтарскага тэксту.

Для тэкставага трэнінгу прапаную верш М. Танка «Галінка і верабей».

1. Удых — затрымка — выкананне:
— Галінка-вярбінка, —
Прасіў верабей, —
Мо пакалыхала [п]б
Маіх ты дзяцей?
2. Удых — затрымка — выкананне:
Галінка [ня]не хоча
Дзяцей калыхаць.
— Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!
3. Удых — затрымка — выкананне
Казулі [ня]не хочуць.
4. Удых — затрымка — выкананне:
— Ідзіце, ваўкі,
Лавіці, караці
Казуляў такіх,
Якія [ня]не хочуць
Галінку ламаць,
Якая [ня]не хоча
Дзяцей калыхаць.
5. Удых — затрымка — выкананне:
Ваўкі не схацелі.
6. Удых — затрымка — выкананне:
— Прыхо[ць]дзьце, стральцы,
Ка[п]б непаслухмяных
Ваўкоў правучыць,

Якія [ня]не хочуць
Казуляў караць,
Якія ляняцца
Галінку ламаць,
Якая [ня]не хоча
Дзяцей калыхаць.
7. Удых — затрымка — выкананне:
Пайшлі паляўнічыя
Ў лес па ваўкоў:
Спалохана з[ь]веры
Пабеглі з дуброў,
Пабеглі казуляў
Лавіць і караць;
Казулі пабеглі
Галінку ламаць;
Галінка-вярбінка
Са страху ху[ч]тчэй
Давай калыхаць
Вераб'іных дзяцей.
8. Удых — затрымка — выкананне:
[с]З тых дзён бе[с]з спачынку,
Ка[п]б кожны быў ра[т]д,
Калыша галінка
Усіх птушанят.

Перш чым пачынаць трэніроўку тэкставага практыкавання, прааналізуйце змест літаратурнага матэрыялу, затым вывучыце тэкст на памяць, каб у час выканання практыкавання ваша ўвага была цалкам накіравана на працэс дыхання, а не на прыпамінанне тэксту. Нельга трэніраваць адразу ўвесь верш. Паколькі ва ўсіх частках, на якія падзелены тэкст, розная колькасць слоў, то для іх вымаўлення спатрэбяцца і розныя аб'ёмы дыхання.

Спачатку выконваюцца першыя тры часткі, бо яны патрабуюць меншага аб'ёму дыхання. Калі гэты тэкст будзе вымаўляцца на фанацыйным дыханні лёгка і без напружання, у трэніроўку можна ўключаць наступныя часткі.

Сёмую частку бывае цяжка выканаць на адным дыханні нават пасля працяглых трэніровак, таму рэкамендую пасля слоў галінку ламаць зрабіць дабор дыхання (кароткі, нават імгненны ўдых), каб мець магчымасць сказаць астатнія словы, не парушаючы лагічнай і эмацыянальна-вобразнай выразнасці гучання тэксту.

Пасля таго, як будуць распрацаваны (натрэніраваны розныя аб'ёмы дыхання) усе восем частак верша, мэтазгодна пачаць распрацоўку сцэнічнага расповяду гісторыі пра галінку і вераб'я ў статычным становішчы. У выніку трэніровак гэтая незвычайная гісторыя павінна загучаць арганічна, нязмушана і пераканальна, а слухачы не павінны бачыць і чуць «тэхнікі» — удыхаў і выдыхаў.

Прапаную яшчэ некалькі всршаваных тэкстаў для самастойнай працы, але ўжо над пластычна-галасавым увасабленнсм іх зместу на сцэнічнай пляцоўцы: А. Дзеружынскі «Весні танец жураўлёў» і С. Пагарэльскі «Хто я?», якія прайшлі творчую апрабацыто на тэатральным факультэце БелДзАМ, на спецыялізацыі «Акцёр драматычнага тэатра, кіно, чытальнік».

Прыдумайце цэльныя кампазіцыі разнатэмпавых фізічных дзеянняў, разнастайных поз, падзенняў, кульбітаў, стоек, шпагатаў... Усе гэтыя фізічныя намаганні павінны быць знітаваны са слоўным дзеяннем: трэба зразумела, вобразна, зацікаўлена, лёгка і нязмушана расказваць вершаваны тэкст.

Памятайце: на гэтых практыкаваннях правяраецца ўзровень вашай фізічнай, дыхальна-галасавой, дыкцыйна-арфаэпічнай падрыхтаванасці, ваша акцёрская арганічнасць і заразлівасць.

Весні танец жураўлёў

1. Удых — затрымка — выкананне:
Жураўліхі, жураўлі
Вес[ь]ні танец пачалі
На палянцы журавіннай
Трубным клічам жураўліным.
2. Удых — затрымка — выкананне:
Журавель стары, стары
Ля ялінак у бары
Наглядаў і не ўтрымаўся,
У птушыны кру[х]г падаўся
На [й]імховую палянку,
На вясёлую гулянку.
3. Удых — затрымка — выкананне:
Не шкада старэчых ног,
Умінаў бялявы мох
І прывабіў жураўліху,
Прыгажуню, чапурыху.
4. Удых — затрымка — выкананне:
Журавель маладжавы,

Гэткі спрытны і рухавы,
Трубу ўгору ён узняў,
Дыхту-жару паддаваў.
5. Удых — затрымка — выкананне:
Да яго бягуць мало[т]дкі
Жураўліхі-аднагодкі,
Пара [с]з параю гарцуюць,
Весяляцца і танцуюць.

Хто я?

1. Удых — затрымка — выкананне:
Кім ужо [ня]не быў я толькі!
2. Удых — затрымка — выкананне:
Сто імён з[ь]мяніў [ня]не мен ей.
3. Удых — затрымка — выкананне:
Гэта [ш]ж я адразу:
Школьнік, сын, унучак,
Брат, плямен[ь]нік.
4. Удых — затрымка — выкананне:
Для Міколкі я — дружбак
І таварыш, гэта так.
5. Удых — затрымка — выкананне:
А пайшоў у гастраном —
Стаўся ўраз пакупніком.
6. Удых — затрымка — выкананне:
Ва ўрача быў пацыентам,
У цырульніка — кліентам,
У трамваі — пасажырам
(быў і зайцам, калі шчыра),
Злез з трамвая без прыгод.
Хто цяпер я? — Пешахо[т]д.
7. Удых — затрымка — выкананне:
Дома я за кні[ш]жку ўзяўся,
Чытачом пабыць сабраўся.
Паштальён тут акурат:
— Рас[ь]пішыся, адрасат!
8. Удых — затрымка — выкананне:
Сеўшы ў крэсла, праз гадзіну
Стаўся тэлегледачом.
9. Удых — затрымка — выкананне:
Злазіў спрытна ў халадзільнік

І зрабіўся едаком.
10. Удых — затрымка — выкананне:
Быў турыстам.
І пры гэтым: рыбаловам,
Рыбаедам, запявалам,
Грыбніком і ўвесь час
Веселуном.
11. Удых — затрымка — выкананне:
Быў балельшчык на фу[д]тболе.
12. Удых — затрымка — выкананне:
Быў прагульшчыкам — у школе.
13. Удых — затрымка — выкананне:
І адважны быў арол,
А у парку быў асёл.
14. Удых — затрымка — выкананне:
Быў прамоўца, быў заіка,
Быў свой нос усюды ўтыка.
15. Удых — затрымка — выкананне:
Як улезла ў аднаго
Столькі ўсякага ўсяго?!

Не менш карысна займацца парамі: акрамя сінхроннасці і зладжанасці дзеянняў выпрацоўваецца таксама пачуццё кантактнасці, узаемасувязі і ўзаемазалежнасці партнёраў. Мэтазгодна выкарыстоўваць у трэніровачных тэкставых практыкаваннях і самыя разнастайныя прадметы: скакалкі, гімнастычныя палкі, тэнісныя мячы, стужкі, абручы, паветраныя шарыкі, валейбольныя мячы, эспандэры і інш.

Для трэнінгу прапаную верш А. Бачылы «Пракляты кот».

1. Удых — затрымка — выкананне:
Я расказваць вам [ня]не буду,
Колькі кот пабіў пасуды, —
Хай раскажа вам Валерка...
2. Удых — затрымка — выкананне:
— Чайнік, супнік, тры талеркі,
Слоік, кубачак, тры спо[т]дкі,
Пяць разетак, дзве махоткі...
3. Удых — затрымка — выкананне:
А[ш]ж самому страхата.
Ды ва ўсім вініць ката.
4. Удых — затрымка — выкананне:
Запытаюць — крывіць рот:

— Гэта ўсё праклятый кот.
5. Удых — затрымка — выкананне:
Але вось аднаго разу
Упус[ь]ціў Валерка вазу.
Ваза хрусь — Валерка ў пот:
6. Удых — затрымка — выкананне:
«Як сказаць, што гэта — кот?
Што рабіць?..»
7. Удых — затрымка — выкананне:
Пачаў вагацца:
8. Удых — затрымка — выкананне:
«Не прызнацца ці прызнацца?»
9. Удых — затрымка — выкананне:
Ды адбыўся раптам цу[т]д:
10. Удых — затрымка — выкананне:
«Вінаваты сам я тут!»
11. Удых — затрымка — выкананне:
— Малайчына! — рада мама.
12. Удых — затрымка — выкананне:
І Валерка ра[т]д таксама.
13. Удых — затрымка — выкананне:
Мусіць, з радасці тае
Больш пасуды ён [пя]не б'е.

Такім чынам, цыкл практыкаванняў для развіцця камбінаванага тыпу дыхання і павелічэння яго аб'ёму пабудаваны на паступовым ускладненні, павелічэнні фізічнай нагрузкі, якая чаргуецца, цесна пераплятаецца з мышачным расслаблением.

Ускладненне мізансцэн, а таксама патрабаванне віртуознага валодання прадметам ставяць будучых артыстаў перад неабходнасцю вырашыць даволі няпростыя задачы трэніроўкі дыхання і голасу ў нязвыклай сітуацыі і з пэўнай нагрузкай; развіваць шматаб'ектную ўвагу; выпрацоўваць сілу, палётнасць і выслівасць голасу. Скачкі, кулянні, разнастайныя рухі рук і ног, корпуса садзейнічаюць замацаванню моўным голасам напрацаваных прафесійных якасцяў пры выкананні практыкаванняў любой працягласці і складанасці, дапамагаюць каардынаваць гук і рух.

Для замацавання рэзанацыі і кантыленнасці гучання ў ніжнім (грудным) рэгістры карыснай будзе страфа з цудоўнага верша М. Танка «Ave Maria».

Звон кафедральны кліча на Ave.
[сь]З цесных завулкаў з[ь]лева і справа

Гуртам манашкі ў чорным адзен[ь]ні
Цягнуцца, быццам бы сумныя цені.
Тут і старыя, і маладыя, — Ave Maria...

Для замацавання рэзанацыі і кантыленнасці гучання ў сярэднім, верхнім і ніжнім рэгістрах абавязкова і даўно выкарыстоўваю ўрыўкі з паэмы Я. Купалы «Курган». Прычым тэкст паэмы выкарыстоўваю як на групавых, так і на індывідуальных занятках.

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, —
Ўдзірванелы курган векавечны.
Дуб галлё распусціў каранасты над ім,
Сухазелле ў грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханнем глухім, —
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.
На купалле там птушка садзіцца, пяе,
У піліпаўку воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.
Хмары неба ўсцілалі мо тысячу раз,
Перуны білі з краю да краю, —
Ён стаіць — гэта памяць людская, паказ...
Толькі гутарка ходзіць такая.
На гары на крутой, на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей,
Белы хорам стаяў, недаступнай сцяной
Грозна, думна глядзеў на прыволле.
У нагах у яго рассцілаўся абшар
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары, хат амшалых, як мар,
Хат з сям'ёй душ падданых, пакорных.
Князь у хораме жыў, слаўны свету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў — біў паклоны яму,
Спуску, ласкі не знаў непакорам.
Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваей;
Стражы Князевы — ў полі і дома,
Толькі модлы раслі небу ў сэрцах людзей,
І пракляцце расло пакрыёма.
Раз бяседа вялікая ў князя была:
На пасад дачку княжну садзілі;

За сталом він заморскіх крыніца цякла,
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.
На вяселле-разгул наплыло, як на сход,
Госці знатных зусюль, за паўсвету,
Гэткай гучнай бяседы не помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брыльянтаў, саетаў!..
Дзень, другі ўжо грымела у князя гульня,
І музыкі і чаркі звінелі;
Выдумлялі забаў новых кожнага дня;
Што хацелі — ўсяго госці мелі.
Ажно трэцяга дня князь прыдумаў адну
Для дружыны пацеху-забаву:
Загадаў ён пазваць гусляра-старыну,
Гусляра з яго ведамай славай.
Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;
Вакол гэтай думы дудара-званара
Казак дзіўных злажылась нямала.
Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з неадступнаю песняй, —
Сон злятае з павек, болю цішыцца стогн,
Не шумяць ясакары, чарэсні;
Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сціхае.
Паміж вольхаў рака, як штодзень, не бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хавае.
Прытаіцца да моху русалка, лясун,
Каня вечнага «піць» не заводзіць;
Пад звон-песню жывучых гусляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць.
Прывяла гусляра з яго ніўных сяліб
Дворня Князева ў хорам багаты;
Пасадзіла на ганку, між клёнаў і ліп,
На цагляным парозе магната.
Невыдумная світка — убор на плячах,
Барада, як снег белы — такая,
Незвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях ляглі гуслі-баі.
Водзіць пальцам худым па сталёвых струнах,
К песні-музыцы ладзіцца, строе;
Водклік б'ецца ад струн па сцюдзёных сцянах,

Заміраючы ў сховах пакояў.
Вось настроіў, навёў тон у струнах як след,
Не зірнуўшы на гуслі ні разу,
І сядзіць гэты сумны, як лунь, белы дзед
І чакае ад князя прыказу.
— Што ж маўчыш ты, гусляр, ніў, лясоў песнябай,
Славай хат маіх подданых слаўны?!
Нам сягоння зайграй, нам сваіх песень дай, —
Князь умеее плаціць незвычайна!
Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям —
    Поўны гуслі насыплю дукатаў;
    Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам —
Канапляную возьмеш заплату;
Знаеш славу маю, знаеш сілу маю...
    Многа знаю і чуў пра цябе я, —
    І я сам, як і ты, так табе запяю...
Ну, пара пачынаць, дабрадзею! —
Гэтак слухае, выслухаў князя гусляр
    Заіскрыліся вочы сівыя.
    Патануў у скляпеннях адзін, другі ўдар,
    І заплакалі струны жывыя.
Гэй ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел-свет!
Не такую задумаў ты думу, —
Не дае гуслярам сказу золата цвет,
Белых хорамаў п'яныя шумы.
Скурганіў бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая,
    Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.
    Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, —
    Ім пакорны я толькі з гуслямі,
    Сілеп, княжа, караць, галаву сілен зняць, —
Не скуеш толькі дум ланцугамі.
Славен, грозен і ты, і твой хорам-астрог,
Б'е ад сцен-цэгел лёдам зімовым;
Сэрца маеш, як гэты цагляны парог,
І душу — як скляпоў гэтых сховы.
Глянь ты, слаўны ўладар, на палеткі свае:
Сарачні там сох бачыш, як блудзе;
А ці чуў ты, аб чым там араты пяе,
Дзе і як жывуць гэтыя людзі?

Глянь у лёхі свае, ў падзямеллі глянь, князь,
Што настроіў пад хорамам гэтым:
Брацці корчацца там, табой кінуты ў гразь,
Чэрві точаць жывых іх, раздзетых.
Ты ўсё золатам хочаш прыцьміць, загаціць...
Ці ж прыгледзеўся, хорамны княжа?
Кроў на золаце гэтым людская блішчыць,
Кроў, якой і твая моц не змажа.
Ты брыльянтамі ўсыпаў атласы і шоўк —
Гэта цёртая сталь ад кайданаў,
Гэта вісельні петляў развіты шнурок,
Гэта, княжа, твае саматканы.
Стол ты ўставіў ядой, касцей шмат пад сталом, —
Гэта косці бядноты рабочай;
Пацяшаешся белым, чырвоным віном, —
Гэта слёзы нядолі сірочай.
Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
Адшліфованы цэгла і камень, —
Гэта — памяткі-пліты з няўчасных магіл,
Гэта — сэрцаў скаменепых пламень.
Люба чуці табе скочнай музыкі звон:
Ты, дружына п'яцё асалоду, —
А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
Стогн праклящця табе, твайму роду?!
Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны княжа-ўладар!
Госці хмурны, а дворня знямела...
Ну, што, княжа? пара даць за песню мне дар!
Выбачай, калі спеў мо няўмела.
Кпязь стаіць, князь маўчыць, жуда, помста б'е з воч
Гулі зглухлі: ні жартаў, ні смехаў...
Думаў князь, выдумляў, грымнуў шабляй наўзбоч,
Толькі з лёскатам выбегла рэха.
— Гэй ты, сонцу раўня, не на тое пазваў,
На вяселле цябе сваёй княжны!..
Ты шалёны, старык! хто цябе дзе хаваў?
Ты, знаць, вырадак цемры сярмяжнай
Ты адважыўся мне на сляпы перакор
Вызваняці сусветныя трэлі;
Платы маю шмат я для такіх непакор,
Хто сябе проці мне стаць асмеліў.
Я па-князеўску ўсім і плачу, і люблю!

Ты не хочаш дукатаў — не трэба!..
Ўзяці старца і гуслі жыўцом у зямлю!
Знае хай, хто тут пан: я — ці неба!
Падхапілі, ўзялі гусляра-старыка,
Гуслі разам яго самагуды;
Па-над бераг круты, дзе шумела рака,
Павялі, паняслі па загубу.
Месца выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажпі шырокі, глыбокі;
Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі пасып тры сажні высокі.
Не часалі дамоўкі яму сталяры,
Не заплакалі бліжнія вочы;
Змоўклі гуслі і ён з той пары — да пары;
Сум і сціша залеглі, як ночай.
Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў:
Шлюб-вяселле ўсё княжны гулялі.
Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусляравым наспе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.
Лет за сотню звёў час, ці і болей мо лет,
Зацвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед
З кургана, як снег белы, выходзе.
Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць.
Жменяй водзіць па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.
Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той, —
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веру даць, толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

Здольнасць слухаць, чуць, ацэньваць паводзіны партнёраў, ўздзейнічаць на іх вербальнымі і невербальнымі сродкамі, умение адчуваць і ўваходзіць у сцэнічнае дзеянне, развіваць яго — гэтыя і іншыя ўласцівасці і прафесійныя якасці найлепш выпрацоўваюцца ва ўмовах калектыўнай творчасці. Таму студэнты выконваюць і абавязковыя калектыўныя заданні. Напрыклад, яны атрымліваюць

задание інсцэніраваць беларускую народную песню «Як служыў жа я у пана», прычым забяспечваецца іх поўная творчая самастойнасць. Яны калектыўна рэжысіруюць і ставяць песню на сцэне, а ў дадатак перапрацоўваюць і дадаюць некалькі куплетаў. Такое «сааўтарства» не забараняецца, а, наадварот, ухваляецца і падтрымліваецца, бо гэта таксама выяўляе патэнцыяльныя творчыя магчымасці студэнтаў.

Як служыў жа я у пана
Ды па перша лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Курачку за гэта. Гэй!
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
Ды на друга лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Качачку за гэта. Гэй!
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
Ды на трэце лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Гусачку за гэта. Гэй!
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
На чацвёрта лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Індыка за гэта. Гэй!
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана

Ды на пята лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Целюка за гэта. Гэй!
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
Ды на шоста лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Дзеўчыну за гэта. Гэй!
Тая дзеўка напілася,
Ўпала з печы — разбілася,
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
Ды на сёма лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана
Барана за гэта. Гэй!
А той баран крутарогі
Паламаў паненцы ногі,
Тая дзеўка напілася,
Ўпала з печы — разбілася,
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
Ды на восьма лецейка-лета,
Заслужыў жа я у пана

Хатачку за гэта. Гэй!
Стаіць хатка як стаяла,
Вокны, дзверы адчыняла,
А той баран крутарогі
Паламаў паненцы ногі,
Тая дзеўка напілася,
Ўпала з печы — разбілася,
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Як служыў жа я у пана
На дзевята лецейка-лета, З
аслужыў жа я у пана
Коніка за гэта. Гэй!
А той конік падкаваны
Прыбіў пана капытамі.
Стаіць хатка як стаяла,
Вокны, дзверы адчыняла,
А той баран крутарогі
Паламаў паненцы ногі,
Тая дзеўка напілася,
Ўпала з печы — разбілася
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзіць ды ходзіць,
Куранятак за сабой водзіць.
Не служу я больш у пана
Ні на яка лецейка-лета,
Сам сабе цяпер за пана
З гэтага я лета. Гэй!
А той конік падкаваны
У карэту запраганы,
Стаіць хатка як стаяла,
Людзей ў госці запрашала,

А той баран крутарогі
Да авечак верне рогі,
Тая дзеўка больш не п'е,
Бо за мяне замуж йдзе. Гэй!
Тое целе мякка сцеле,
А той індык дындык-дындык,
Тая гуся сюся-сюся,
Тая кача дробна скача,
Тая кура-шчабятура
Па падворку ходзяць ды ходзяць,
Каго трэба за сабой водзяць. Гэй!

Для ўдасканалення дыкцыі студэнтаў і засваення імі нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення выкарыстоўваго тэксты ўскладненых чыстагаворак і скорагаворак.

Правядзіце арфаэпічны аналіз тэксту чыстагаворкі. Бязгучна або ўголас прачытайце тэкст і адразу алоўкам уносьце ў запісаныя словы патрэбныя арфаэпічныя змены, затым прачытайце тэкст яшчэ раз уголас, каб разабрацца ў змесце чыстагаворкі. Толькі пасля гэтага пачынайце адпрацоўваць чысціню і выразнасць гучання ўсяго тэксту. Звяртайце ўвагу не толькі на тэхніку (артыкуляцыйную выразнасць), але і на мастацкасць расповяду.

Пільшчыкі

Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі. Пілавалі, перапільвалі, паперагіільвалі, напсрапілоўвалі, пілавінне перапалавінілі.

Пасля селі на калодзе, гаварылі, што прыйшоў Пракоп — кіпсў кроп, пайшоў Пракоп — кіпеў кроп. Як пры Пракопе кіпеў кроп, так і без Пракопа кіпеў кроп.

Выходзіць: у пустой птушкі пустая песня. Каб жа ў дамочку, у садочку, у хлявочку, у полсчку ўсё радзіла і пладзіла, то уставай раненька ды жні дапазненька, бо хвасць хлеба не дасць.

Дзямід і Кузьма

Гаварыў Кузьма Дзяміду:

— Эх, жыць бы пажываць ды дабро нажываць.

Гаварыў Дзямід Кузьме:

— Дай божа, каб усе было гожа, а што не гожа, не дай божа, бо даўно вядома: добра будзе — напрацуешея і накрасуешся, кепека будзе — нагаруешея і накукуешея.

— Так то яно так, але каб жа не ежка ды не адзежка, была б грошай поўная дзежка. А яшчэ, каб на дзятла не стралсц, быў бы дзяцел маладзец.

— Ты, братка, як той гусь: пабудзе ў вадзе і не мокры нідзе, — паддзямідзіў Кузьма Дзяміда.

— А ты брашы, брашы, набрэшашея, прыйдзе ліха — павесішся, — падкузьміў Дзямід Кузьму.

— Ну, добра, гудзьма, гудзьма, дый тут будзьма. Глянь на Гарошку: франт — боты ў рант, галава стручком, нос кручком.

— Яго Тадора хваліла сябе сёння і ўчора.

— Ой, братка ты мой! Учора ж Піліпаў Пілін так націлілікаўся, што прыпоўз да ліп і да ліпы прыліп. А потым як закрычыць: «Была б здаровая бабуся — нікога не баюся!»

Дзед і баба

Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі: хто з краю, таму караваю, а хто з сярэдзіны, таму бярэзіны.

Дзеда Лявона прасіў і поп, і Ярошка, і Панас трошка, каб дзяліў усім па сем, гаспадару восем, гаспадыні дзевяць, бо кожны ведае. што ўсс бабры дабры, адна выдра —ліха яе бяры.

Але баба і гэта не ўпадабала і на дзеда зазлавала; пачала сварыцца, а затым і біцца: ці Лявон, ці не Лявон, а з хаты вон!

Дзед спачатку маўчаў (старога вераб'я на мякіне не падманіш), а потым не стрываў: «Цыц! Яшчэ паглядзім, дзе каго пасадзім».

Аднак баба не змаўчала і на дзеда закрычала: «Што будзе, хай тое будзе, але Грышка на куце не будзе!..»

І пачалі яны валаводы валаводзіць: як баба да дзеда, так і дзед да бабы, а як дзед да бабы, так і баба да дзеда...

Ды раптам баба дзеда мяшком — бух, бух! А ён скрывіўся, як серада на пятніцу: «Соль табе ў вочы, перац табе ў нос. Не слухаеш ківа, паслухаеш кія!». Ды яе абушком — цюк!

То сам спалохаўся (а каб цябе, бадай цябе!) ды бягом, а яе, як пані, на насілках панеслі!

Нездарма людзі кажуць: сіла і салому ломіць.

Балбатуха

Ехаў дзедка на кірмаш, з ім на возе баба, якая і казала не сказала, і маўчала не змаўчала, толькі ўвесь час балбатала: «А мой ты дзедка! Твая бабка з маёй бабкай былі сабе дзве бабкі, а ў іх быў шумны, думны ды не разумны Ягнеша, які сем сёл аббрэша, ды назад прычэша. Ён казаў, што кулік ды чайку схапіў за чубайку, а чайка

кігіча: не плач, купіць мама калач, маслам памажа, на дарожку скажа: на чужы раток не накінеш платок і гузіка не нашыеш; хоць гвалту крычы, а на чужы каравай рота не разявай, каравай не праглынеш, а рот да вушэй раздзярэш. А ўсё ж як клёцкі ў малаку, то я па дзве валаку, а як у водзе, то раз-два і годзе, бо ты чуў, відаць, што бульба з булкай біліся! Біліся, біліся, бульба булцы як дала — булка сплюшчылася...»

Хай цябе няхай! Языком малоць — не дровы калоць. Рэж, Мацей, не шкадуй лапцей, бо ўчора на базары лапці новы заказалі.

Пісака

Пісаў пісака, пісаў, перапісваў, ды і напісаў: «Мы самі з вусамі, але калі ўлетку на сонцы не напячэшся, то ўзімку з холаду натрасешся; і ад смерці не адкупішся і не адпросішся, калі пайшлі грошы на раскошы.

А вось хто парасё ўкраў, таму ўвушшу пішчыць (колькі вяровачку не віць, а ўсё кончыку быць), таму салдат не бядак: шапка на макушку, шабелька на брушку, вус закручоны, бот пачарнёны, узяў ды зарібіў на соль салонага селядца пасаліць, а пасля кажа: «Свой сячыся, рубайся, а чужы не мяшайся, бо на чужыне чужы да чужога, як у лесе сляпы да сляпога». Карацей, кошка мышцы не таварыш, калі жабрак жабрака жабраваць вучыць. А ўсё таму, што і тут гу-гу і там гу-гу, і нічога разабраць не магу».

Ціт

Быў наш Ціт суседам пабіт. За тое пабіт, што ўсё жыццё глядзіць, дзе што дрэнна ляжыць. А дзе што дрэнна ляжыць, туды і Ціт бяжыць, ажно ўвесь дрыжыць. А перапала Ціту за пшано і за жыта, за пшано і за жыта, што ўкраў у Мікіты і схаваў пад карыта.

Учапіўся Мікіта ды за тое карыта, малаціў жа ім Ціта, малаціў жа ім Ціга за пшано і за жыта, за пшано і за жыта, што знайшоў пад карытам.

Вось за якую правінку пачасалі Ціту спінку.

Аднак і сёння Ціт Цітовіч па вуліцы шыбуе, па чужых падворках вачыма і носам цікуе: а можа што-небудзь упалюе...

Бабры

Як у лесе, у ляску, у лясочку ды сышліся тры бабры, тры бабры на пясочку. Пачалі ўспамінаць пра старога бабра Бабровіча, пра старую Бабрыху Баброву, пра маладога бабра, пра баброву дочку і яе сыночка.

А баброва дочка гуляла ў лясочку, таксама ў лясочку са сваім сыночкам, са сваім сыночкам і старой бабрыхай, з маленькім сыночкам і старой бабрыхай гулял і паціху і не зналі ліха...

А сарока-стракатуха, стракатуха-балбатуха па ўсім лесе лятала, лятала-стракатала, стракатала-крычала: баброва дочка не проста гуляе ў лясочку, а гуляе ў лясочку са сваім сыночкам ды збірае грыбочкі і кветкі званочкі...

Крылом воран прашумеў і з дакорам паглядзеў: «Ці табе няўежна, ці табе няўлежна, што языком, як атопкам, па цымбалах плешчаш? Лепей слухай многа, а стракачы мала, бо за доўгі язык не пахваляць».

Хлеб

— Без кавалка хлеба кепская бяседа, кепская бяседа без сала і хлеба, — так казаў Адам тром сваім сынам.

— Калі хочаш хлеба мець, то трэба зямліцу глядзець. Зямля ўсяго дасць, але ў яе не паложыш — нічога не дасць, таму пагуляць — смела адкладайце, а зрабіць — і на гадзіну не адкладайце. Помніце, што летнюю гадзінку зімовым тыднем не заменіш, бо так здаўна вядзецца: лета на зіму, а зіма на лета працуе.

Яшчэ памятайце ды на вус матайце: хто рана ўстае, таму бог дае, а хто позна ходзіць — той сам сабе шкодзіць. Так і выходзіць: хто хлеба хоча, той мусіць быць у поце.

— Гутарка гутаркай, ды за працу час, — сказаў старэйшы сын Панас. — Работа, тата, не забота, забота — калі няма работы. Мы ж прыйшлі працаваць, то няма чаго часу каратаць. Трэба зямельку ўгнаіць, потым узараць, потым узбараніць. Хто аддае ніўцы, што яна родзіць, той да суседа па хлеб не ходзіць.

— Карацей, — сказаў сярэдні сын Мацей,—дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста (колас да коласа — не чуваць чалавечага гол аса).

— Дзе дружна, там хлебна, — сказаў Кандрат, малодшы брат, — а праца і рукі — моцныя зарукі таму, што ў нашай гаспадыні будзе сала і масла ў скрыні.

Стукалачкі

Стукалачкі-стукачы,
Стукай, стукай, грукачы, —
Хто застукае каго,
Садзім у каморку,
Разбягаемся тады
Скрозь па панадворку.

Стукалачкі-стукачы,
Як далей бы уцячы!..
Чым далей ад стукача —
Болей засцярогі,
Хто куды ад стукача,
Скуль бяруцца ногі!
Стукалачкі-стукачы,
Застукалі, паскачы,
З крыўдай, болем горкім
Сам лічы да сотні,
Выбягай з каморкі,
Нібы з падваротні.
Стукалачкі-стукачы,
А наўкола ўсё маўчыць,
Стоенасць, трывога,
Не знайсці нікога...
Ўдаль жыццё маё плыве,
А ўсё ў памяці жыве:
«Стукалачкі-стукачы,
Як ад вас мне ўцячы!..»

А. Лойка

Гаварун

Гавары чыстагаворку за чыстагаворкай, цяжкагаворку за цяжкагаворкай, скорагаворку за скорагаворкай, гавары чыста, гавары скора, гавары, гавары, ўсё чыста выгавары, ўсё выскарагавары, ды не заскарагаварыся.

Карп і Пракоп, Пракоп і Карп, то чатыры, а не Карпы, не Пракопы, а Карпавыя Пракопы і Пракопавыя Карпы.

Кузьма падкузьміў Ягора,
Ягор аб'ягорыў Рыгора,
Дзямід паддзямідзіў Мікіту,
Мікіта змікіціў, пачаў валакіту.
Сказаў Фабіяну: — Фабіян, набі Яна.
Ян пабег па Хомку,
Хомка — па Пахомку,
Пахомка — па Піліпа,
Піліп — па Архіпа.
Крычаў Архіп, пакуль ахрып.
У сам сон прыбег Самсон.

От была буча, куча-валакуча, калі трыццаць тры караблі лавіравалі, лавіравалі, ды не вылавіравалі, а інжынеры нівеліравалі, нівеліравалі, ды не вынівеліравалі, бо барабаншчыкі ў барабаны барабанілі, барабанілі, панабарабаньваліся, у бубны бубнілі, бубнші, панабубніваліся, а тады ўзялі ды ўсё фосфарам фасфарысцыравалі, фасфарысцыравалі дый пафасфарысцыравалі.

Пасля гэтага кола выкалесілася, перавыкалесілася, палукашак выпалукашыўся, перавыпалукашыўся, капылы перакапылілі, перавыкапылілі, капыты перакапыцілі, перавыкапыцілі.

Так і атрымалася: гуз на гузе і чатыры каўняры ў кашулі. Або: і мыла, і шыла, і прала, і ткала — і ўсё языком. Стук, грук — абы з рук.

Вось як трэба чыста гаварыць, скора гаварыць, усе чыстагаворкі перачыставыгаварыць, усе скорагаворкі пераскорагаварыць, перавыскорагаварыць, ды не загаварыцца.

НАРАДЖЭННЕ СЛОВА: АД ПСІХАФІЗІЧНАГА ДЗЕЯННЯ ДА СЛОЎНАГА

— У всякого действия есть его внешняя сторона, т.е. то, что видит наблюдатель со стороны (физическое действие), и внутренняя, невидимая (мысли, желания, чувства), т.е. психическая жизнь человека. Физическое действие — это мосток между сознательным и подсознательным. В момент выбора физического действия — это процесс сознательный, в момент же его выполнения процесс становится подсознательным. Только через физическое действие, т.е. через поведение человека, мы можем судить о внутреннем, психическом его состоянии (24, 248).

— Нам труднее определить то, что бы мы чувствовали, чем что бы мы делали в одних и тех же предлагаемых обстоятельствах... Физическое действие легче схватить, чем психическое, оно доступнее, чем неуловимые внутренние ощущения; потому что физическое действие удобнее для фиксирования, оно материально, видимо; потому что физическое действие имеет связь со всеми другими элементами... нет физического действия без хотения, стремления и задач, без внутреннего оправдания их чувствами; нет вымысла воображения, в котором бы не было бы того или иного мысленного действия (3, 445).

— Всё в жизни, а следовательно, и на сцене должно быть логично и последовательно... Только логичное и последовательное действие возбуждает веру в подлинность и в правду того, что делаешь на сцене. Там, где зародилось правильное, логическое, последовательное

физическое действие, одобренное чувством правды, там неизбежно создается и искренняя вера в подлинность и возможность этого действия в реальной жизни (3, 445, 446, 447).

— Важно заготовить в себе «физический путь роли». Какие, например, физические элементы страха? Это — бессилие, непонимание того, что происходит, и ожидание чего-то ужасного. Вот эти ощущения и нужно в себе найти и хорошенько распахать (13, 407).

— Метод физических действий учит, как по словам автора разгадать все условия текущей жизни, поместить в эти условия человека и привести его к такому правдоподобию, которое оправдывает произносимые слова (24, 63).

— Правда и вера — лучшие возбудители чувства... Поверив — почувствуешь. Почувствовав — «я еемь». «Я еемь» подводит к подсознанию; подсознание втягивает в работу природу (3,447).

— Я искал... интересную мизансцену, которая толкала к правде; правда дразнила чувство, а чувство вызывало творческую интуицию (1, 193).

— Чувства требуют для своего выражения слов, слова голоса, голос добавляется иллюстрацией, то есть жестом (4, 45).

— Приём подхода к чувству через правду и веру в физические действия и «я еемь» пригоден не только при создании роли, но и при оживлении уже созданного (2, 454).

— Момент перехода от одного действенного эпизода к другому есть момент оценки... Ряд оценок — это уже схема развития действия, это дорога «сквозного действия» — компаса сценической жизни... Оценка — это качество реагирования на неожиданную смену предлагаемых обстоятельств (24, 250).

— Живой человек для нас — это тот актёр, который создает живого человека, который не представляет, а заражает своими настоящими нервами... Талант заключается именно в способности заражать других людей своими переживаниями (13, 438, 432).

— «Дразнить и схватывать походку и движения», давать «платье и тело роли», говорит Гоголь, может и второстепенный актёр, но «схватить душу роли», стать художественным образом может только истинный талант (1, 196).

Выказванні К. Станіслаўскага, Ул. Неміровіча-Данчанкі, М. Туманішвілі — мэтраў рэжысуры і тэатральнай педагогікі — пераканальна сведчаць: каб студэнты тэатральнага факультэта — будучыя артысты, маглі стварыць на сцэне «жывога чалавека», ім патрэбна шмат чаму навучыцца, шмат чаго выхаваць у сабе. А зрабіць ўсё гэта яны могуць толькі атрымаўшы надежную

прафесійную падрыхтоўку, засвоіўшы асноўныя прынцыпы і патрабаванні школы псіхалагічнага тэатра, г.зн. ім неабходна за гады вучобы ў Акадэміі мастацтваў так «размяць», распрацаваць свой псіхафізічны апарат і творчую інтуіцыю, каб яны маглі хутка, дакладна і пераканальна выконваць самыя разнастайныя жыццёвыя дзеянні ў прапанаваных драматургам і рэжысёрам-пастаноўшчыкам сцэнічных умовах (абставінах). Дарэчы, слова drama (з грэчаскай мовы) якраз і азначае сцэнічны паказ або сцэнічнае дзейства.

Пачынаючы гаворку пра жывое (вуснае) слова на сцэне, нельга не сказаць, што нараджаецца яно з псіхафізічных дзеянняў: унутраных, ці псіхічных, — пачуцці, свядомасць, воля чалавека і знешніх, або фізічных, якія з'яўляюцца дадатковым выразным сродкам выканання псіхічных задач ці існуюць паралельна з гісіхічнай задачай. Студэнт можа заставацца нерухомым на сцэнічнай пляцоўцы, але гледачы (аднакурснікі) адчуюць, што ён дзейнічае, ды толькі не ў знешніх праявах фізічна, а ўнутрана — псіхічна, бо даволі часта фізічная нерухомасць якраз і выклікана насычанымі ўнутранымі дзеяннямі, якія найлепш (наймацней) «цэментуюць» кантактаванне акцёра з партнёрамі і гледачамі.

К. Станіслаўскі падказваў нам: «Прежде чем искать «большую правду» важных и глубоких физических задач своей роли, добейтесь сначала «малой правды» при выполнении простейших физических действий», бо нават самая нязначная (маленькая) няпраўда пры выкананні дзеяння стварае няпраўду і ва ўнутраным (псіхічным) жыцці студэнта. Самае простае фізічнае дзеянне павінна выконвацца дакладна і жыццёва праўдзіва, таму што ад гэтага залежыць, наколькі праўдзівым стане выкліканае ім пачуццё. Вось чаму ў першы год навучання на спецыялізацыі «Акцёрскае мастацтва драматычнага тэатра і кіно» больш мэтазгодна займацца эцюдамі на простая псіхафізічныя дзеянні (яны лягчэй фіксуюцца, больш адчувальныя і ўстойлівыя, да таго ж і бачныя), што выклічуць да жыцця адно, два, тры, але самыя неабходныя і жыццёва апраўданыя словы. Хаця, вядома ж, справа не столькі ў саміх псіхафізічных дзеяннях, а ў той праўдзе і веры, якія гэтыя дзеянні дапамагаюць студэнтам выклікаць і адчуваць у сабе. Калі адна маленькая праўда і імгнсння веры могуць выклікаць у студэнта творчы імпэт, настрой, «гарэнне», то шэраг такіх. імгненняў веры і праўды можа ўжо стварыць жыццёва пераканальную сцэнічную праўду і сапраўдную веру ў магчымасць яе існавання. Пад час выканання эцюда нараджаецца ўзасмадзеянне фізічнага (цела) і псіхічнага (душа), знешняга (дзеянне) і ўнутранага (пачуццё), дзякуючы якому знешняе дапамагае ўнутранаму, а

ўнутранае выклікае (нараджае) слова, напоўненас эмацыянальна-вобразным зместам.

Паставіўшы студэнту канкрэтную фізічную задачу, неабходна «ахінуць» яе цікавымі, хвалюючымі сцэнічнымі (жыццёва праўдзівымі) абставінамі. І студенты (вядома ж, далека не ўсе і не адразу) пачынаюць выконваць гэтыя дзеянні, г.зн. яны пачынаюць жыць у прапанаваных выкладчыкам-рэжысёрам абставінах. Вось тады пачуццё веры, сцэнічнай праўды завалодае імі, а гэта і ёсць адзін з самых важных і істотных (асновавызначальных) момантаў творчага працэсу, да якога падводзіць студэнта акцёрская псіхатэхніка. Ідучы шляхам «размінання» псіхафізічных дзеянняў, студэнты пазбягаюць насілля над сваёй акцёрскай прыродай, а іх пачуцці праяўляюцца ў жывым (вусным) слове арганічна і нязмушана. Занятыя выкапаппем канкрэтных фізічных дзеянняў у прапанаваных выкладчыкам абставінах, студэнты паступова пачынаюць адчуваць, пражываць сцэнічную задачу і ў іх з'яўляецца (зараджаецца) жаданне слоўнага дзеяння, духоўная патрэба выказацца ўслых, падзяліцца з гледачамі-слухачамі сваімі думкамі, перажываннямі, увасобіць (перадаць) у сцэнічным слове ўсё тое, што іх начало ўжо хваляваць, трывожыць, непакоіць, радаваць...

Даўно заўважана: калі студэнты фізічна дзейнічаюць дакладна і мэтанакіравана, то і псражыванні (адчуванні) у іх нараджаюцца «без прынукі», нязмушана. А нараджаюцца яны ад веры ў мастацкі вымысел (прыдуманыя выкладчыкамі ці студэнтамі «жыццёвыя» рэальныя абставіны, сюжэты, падзеі, канфлікты...). Дык вось, менавіта веры многім студэнтам і не хапае, таму яны напачатку больш паказваюць, што «нешта» робяць (ходзяць, размахваюць рукамі, садзяцца-ўстаюць, нахіляюцца, ляжаць, падскокваюць...), а на самой справе бяздзейнічаюць на сцэнічнай пляцоўцы. Аднак «ілюстрацыйнасць» эцюдаў тлумачыцца не толькі адсутнасцю веры ў прапанаваныя абставіны (мастацкі вымысел), але і тым, што многія першакурснікі хаця і слухаюць выкладчыка, дакладней, заданы, якія ён ім вызначае на канкрэтны эцюд, але не ўсе яшчэ могуць (здатныя) пачуць (успрыняць) іх вобразна-эмацыянальны змест (дзейсную ўстаноўку), таму што «делать всякие упражнения — легко, но систематически вырабатывать с их помощью психотехнику, подводящую к подлинному творчеству, — трудно» (2, 467).

Значыць, студэнтам у час выканання нават самых простых фізічных дзеянняў найперш трэба ўлічваць іх псіхалагічны аспект, бо пачуцці, эмоцыі, волю можна ўвасобіць, ажывіць, рэалізаваць на сцэне менавіта праз пластыку (цела) і голас (мову). Псіхатэхніка якраз

і павінна дапамагчы будучым артыстам стварыць патрэбнае ўнутранае сцэнічнае самаадчуванне. «Правильность признания, что двигателями психической жизни является ум (представление, суждение), воля и чувство, подтверждается самой природой, которая нередко создает артистические индивидуальности эмоционального, волевого или интеллектуального склада» (2, 381).

Такім чынам, матэрыял акцёрскага мастацтва — псіхафізічныя дзеянні, «рухавіком» якіх з'яўляецца эмацыянальная экспрэсія. Акцёры на сцэне, як і ўсе людзі ў жыцці, карыстаюцца дзвюма выяўленчымі сістэмамі, якія могуць перадаваць і сэнсавую, і эмацыянальную інфармацыю: вербальнай, або слоўнай, і невербальнай, або «мовай цела», якой мы карыстаемся падсвядома (праз позы, жэсты, міміку перадаюцца эмоцыі, пачуцці, адносіны). Група еўрапейскіх псіхолагаў (С. Блох і яго калегі) вызначылі шэсць базавых эмоцый: шчасце (уключаючы смех, задавальненне і радасць); маркота (плач, смутак, гора); страх (трывога, разгубленасць і паніка); гнеў (агрэсія, варожасць, нянавісць); эратызм (сексуальнасць, пачуццёвасць, пажадлівасць); пяшчота (бацькоўскія, братнія, сястрынскія пачуцці, сяброўства). Ч. Дарвін заўважыў, што «многие особенности внешнего выражения эмоций у человека естественным образом проистекают из характера его поведения. Например, стискивая зубы и сжимая кулаки, человек готовится драться и, следовательно, выражает тем самым свой гнев. Поскольку у такого «крутого парня» зубы стиснуты, то говорить ему приходится уголком рта, а дышать — тяжело и раздувая ноздри, из-за чего он становится похож на храпящего быка... Гневное выражение лица характеризуется низко нахмуренными бровями, плотно сжатыми губами и зубами, выпяченной нижней челюстью, бледностью (кровь отливает от лица в органы более важные для драки, например в бицепсы) и наклоном головы вперед (словно для того, чтобы «боднуть» противника).

Страх и шок выражаются следующими признаками:

— человек замирает и умолкает (как бы не желая быть обнаруженным и пытаясь установить источник опасности;

— глаза широко открыты и насторожённы, голова поворачивается из стороны в сторону (что служит также для более точной локализации звуковых сигналов об опасности);

— мускулы напряжены (готовность немедленно бежать, как только будет установлено безопасное направление);

— дыхание становится чаще и глубже (являясь частью общей адреналиновой реакции, призванной увеличить снабжение мускулов кислородом);

— человек ищет физического контакта с другими людьми или предметами. Если поблизости есть дерево или стена, испуганный человек обопрется на них или прижмется к ним, чтобы почувствовать себя увереннее.

Тревога и волнение обычно выражаются «нервными» движениями: человек расхаживает взад-вперед, почесывает голову, стискивает руки. Эти движения можно связать с сильным желанием решать насущную проблему: они помогают поддерживать необходимый уровень активности мозга. Но вместе с тем беспокойные движения могут указывать на какой-то внутренний конфликт или просто способствовать сжиганию излишков адреналина.

Состояние релаксации — противоположное страху и тревоге, поэтому оно характеризуется отсутствием мышечного напряжения (это означает, что готовности к каким-либо активным действиям не требуется). О релаксации свидетельствует также широкая улыбка, которая, в отличие от смеха с открытым ртом, служит выражением дружелюбия и умиротворенности» (7, 140—141).

Сказаўшы сваё першае «А» (крык) пры народзінах, чалавек пасля даволі доўгі час (бывае, што да года) маўчыць, сузіраючы гэты Свет: углядваецца, услухоўваецца, прыніохваецца, спрабуе на смак і адчувальнасць — знаёміцца з прапанаванымі яму маці-прыродай жыццёвымі абставінамі. На здароўе і сытасць рэагуе спакойным сном, на боль і голад — плачам, на ласку і пяшчоту -— усмешкай і вясёлым «гуленнем». Падрастаючы і развіваючыся фізічна, чалавек мусіць прайсці праз шмат якія адчуванні, перажыванні, эмацыянальныя выбухі і катарсісы, пакуль стане здольным сфармуляваць, скандэнсаваць усе гэтыя пачуццёвыя (эмацыянальныя) дзеянні ў першае — маленькае, але такое ёмістас і жыццятворнае слова — ма-ма.

Псіхафізічныя дзсянні акцёра нараджаюць сцэнічнае слова. У сцэнічных дзеяннях акцёра скандэнсаваны яго эмоцыі, думкі, гшастычныя паводзіны. У сцэнічных дзеяннях удзельнічае ўвесь чалавек-акцёр, таму студэнтам тэатральнага факультэта трэба прыкласці вялікія валявыя намаганні («Актёру без воли нельзя. Первым долгом надо научиться управлять своей волей», — наказвала нам вядомая руская актрыса Г. Фядотава (25, 260), каб на працягу чатырох гадоў навучання займацца «трэнінгам і муштрой» цела і душы, каб развіць, прафесійна падрыхтаваць свой псіхафізічны апарат да самастойнага творчага жыцця на сцэне драматычнага тэатра.

Прапанаваны ніжэй «эцюднік» на нараджэнне слова — адно са звёнаў у ланцугу комплекснага псіхафізічнага трэнінгу будучага акцёра. Эцюды — беспрадметныя дзеянні студэнта ці акцёра ва

ўмовах сцэнічнай адзіноты, рознажанравыя «міні-монап'есы», у якіх ёсць завязка, развіццё, кульмінацыя і развязка. Стварэнне (прыдумванне, «сачыненне») і, галоўнае, выкананне эцюдаў развівае вобразнае мыслснне будучых акцёраў і рэжысёраў, нязмушана «прымушае» іх верыць ва ўласны мастацкі вымысел — у прапанаваныя самім сабою «жыццёва рэальныя» абставіны, выклікае арганічныя псіхафізічныя дзеянні (вынік іх выканальніцкай ацэнкі і пражывання), якія і нараджаюць жывое, напоўненае сэнсам і эмоцыямі, дзейснае сцэнічнае слова. Таму на занятках сцэнічнай моваю за першы год навучання і выхавання будучых артыстаў і рэжысёраў прафесійна неабходна, каб кожны студэнт «прайшоў» праз эцюды, аснову якіх складаюць не толькі дакладныя і вобразныя фізічныя дзеянні, але і адна з шасці базавых эмоцый: шчасце, маркота, страх, гнеў, эратызм, пяшчота ці адна з іх шматлікіх разнавіднасцяў: радасць, задавальнснне, смех, рогат; смутак, гора, плач, рыданні, лямант; трывога, збянтэжанасць, разгубленасць, паніка; недабразычлівасць, варожасць, нянавісць, агрэсія; замілаванасць, пачуццёвасць, пажадлівасць; спагада, ласкавасць, добрасардэчнасць, даверлівасць...

Такім чынам, «только через физическое действие, то есть через поведение человека, мы можем судить о внутреннем, психическом его состоянии... Правда и вера — лучшие возбудители чувства... Чувства требуют для своего выражения слов, слова — голоса, голос добавляется иллюстрацией, то есть жестом. Приём подхода к чувству через правду и веру в физические действия и «я еемь» пригоден не только при создании роли, но и при оживлении уже созданного» (3, 407; 4, 45; 2, 454).

Хаця большасць з прапанаваных у вучэбным дапаможніку эцгодаў на нараджэннс слова прайшлі апрабацыю студэнтамі трох спецыялізацый тэатральнага факультэта Акадэміі мастацтваў (акцсрскае мастацтва драматычнага тэатра і кіно, рэжысура драмы, рэжысура эстрады), разглядаць іх (эцюды) трэба толькі як спробы, варыянты, прыклады творчых пошукаў нараджэння дзейснага сцэнічнага слова. Магчыма, у будучых студэнтаў тэатральнага факультэта гэтыя «монап'есы» разбудзяць уяўленне, фантазію, выклічуць творчы імпэт і накіруюць, падштурыуць іх да стварэння больш цікавых, «закручаных» і захапляльных сюжэтаў.

Аа-у-у... Ве-ра-а-а

Сярэдзіна лета, ліпень месяц. Цсплы сонсчны дзень. З сябрамі пайшла ў лее — не на «шпацыр-праменад», а па ягады. Хадзілі-хадзілі,

патроху збіралі і... разышліся хто куды ў пошуках ягадных сховішчаў. Настрой не вельмі каб добры, бо за тры гадзіны яшчэ і паўвядра не назбірала чарніц. Нарэшце натрапіла на палянку, якая аж «гарыць» чырвона-ружовым полымем суніц (ацэнка: якая прыгажосць! А колькі... ды якія! Змена настрою (усхваляванасць, узбуджанасць «паляўнічага», нават радасць), ацэнка: адкуль лепш пачынаць, каб ніводнай ягадкі не страціць?..). Асцярожна стаўлю вядро паміж кусцікамі сунічніку і... за работу: расхінуўшы лісточкі, зрываю ягады і ссыпаю ў вядро... так крок за крокам... А вось які «шыкоўны» кусцік — усе ягады наверсе, ды такія буйныя, густота чырвонага колеру і, напэўна, сакавітыя. Немагчыма стрымацца, каб не паспытаць іх на смак (сагнуўшы левую далонь «коўшыкам», напаўняю яе суніцамі, удыхаю іх водар, а затым высыпаю гэтую смакату ў рот... і з задавальненнем спажываю жывыя вітаміны лесу... мгм, як смачна!).

Аднак жа іх яшчэ вунь колькі... эх, і пашанцавала ж мне... працягваю больш старанна збіраць «ураджай». І раптам... мільганула думка: а дзе сябры? (Азіраючыся, прыслухоўваюся, углядаюся ў адзін, другі бок, слухаю лес: не відаць і не чуваць нікога... значыць, і яны натрапілі на ягады.) Агледжваю сваю паляну — о-о! колькі ягад! Дык няма чаго марудзіць... працягваю збіраць... ды толькі штосьці змянілася... ці то падалося? (Выпрасталася... агледжваю паляну: чамусьці пацямнелаў лесе... а-а, сонца схавалася за невялікую хмарку... каб хаця дажджу не было. Чаму сяброў не чуваць? Раней жа перагукваліся... Ой, няўжо я заблудзілася? Трэба паклікаць...)

Аа-у-у... (прыслухалася: ніхто не адгукаецца. Чаму? Можа, яны далека?.. Што рабіць?.. клікаць, гукаць...).

Аа-ау-у-у (толькі рэха адгукнулася: а-у-у-у... трывога ўзмацняецца...).

Ого-го-го-о-о-о (рэха адказвае: го-го-о-о-о... Што рабіць?). Ацэнка: хмары засланілі сонца... вецер прашумеў у верхавінах дрэў... страх сціскае сэрца... Дзе ж яны падзеліся?).

Вее-эра-а-а-а (не дачакаўшыся рэха, хапаю вядро з ягадамі і бягу шукаць сяброў).

Як тут і быў

Летам, нядзельным днём, мама выправіла мяне ў лес, што кіламетры за два ад нашай вёскі, за ягадамі (чарніцамі). З дому я выйшла даволі позна і, вядома ж, без асаблівага энтузіязму. Але, хоцькі-няхоцькі, ды дзе ж дзенешся — трэба!

У лесе ўжо шмат людзей — мільгаюць паміж дрэвамі, перагукваюцца... Ягад мала, сустракаюцца рэдка, таму за некалькі гадзін

толькі дно вядра і засыпала імі. Гэта пачынае мяне раздражняць, ды і стамілася ўжо...

Выходжу на адкрытую мясціну (нізінка) — оой, суцэльны чарнічнік (ацэнка-прадчуванне: ну-у, тут павінны быць ягады!), але (расчараванне)... былі ягады, ды толькі іх ужо сабралі, да таго ж працавалі «камбайнам» — многія кусцікі «голыя», амаль што без лістоты... Настрой сапсаваўся яшчэ больш, але хаджу па нізінцы і зрываю па дзве-тры ягадкі з кусціка...

Убачыла стары корч — ай, пара адпачыць. Усаджваюся, выпроставаю ногі, стаўлю вядро на зямлю і... успамінаю, што мама дала мне ў лес «сабойку» — бутэрброд і бутэльку кока-колы. Дастаю з вядра цэлафанавы мяшэчак, разгортваю, дастаю бутэрброд і пачынаю, не спяшаючыся, есці... адначасова аглядваю «плантацыю» чарнічніку: глянула налева — пуста, ну зусім нічога; перад сабою глянула — вунь, здаецца, вытыркнуліся некалькі ягадак, ды такія ж дробненькія; перавяла позірк направа — ой... што гэта там пабліскваe? А-а-а, відаць, шкельца... Захацелася піць... даядаю бутэрброд, нагінаюся да вядра, працягваю правую руку ў вядро, бяру бутэльку кока-колы, дастаю, скручваю «галоўку», падношу бутэльку да рота і... зноў гэты цьмянаваты бляск... зрабіла пару глыткоў кока-колы, закруціла «галоўку» бутэлькі і паставіла яе на зямлю каля вядра, а сама чамусьці неадрыўна гляджу на «светлячка»... І што ж гэта там такое? (зацікаўлена расхінаю галінкі чарнічніку, працягваю руку да «светлячка» і падымаю... залаты пярсцёнак з брыльянцікам... пакручваю яго ў руках... разглядваю... пальцамі абціраю зверху і ў сярэдзіне... здзьмухваю лісточак чарнічніку і некалькі травінак (думка: хто ж гэта яго «пасеяў»?). Азіраюся — углядаюся — прыслухоўваюся: нікога не відаць і не чуваць, ды і, відаць, не сёння гэта здарылася, бо халодны і запацелы... хукаю на пярсцёнак і наводжу бляск (абціраю аб рукаў кофты), затым... прымерваю на свае пальцы: на сярэдні не налазіць, на мезінец — вялікі, на безыменны — якраз!.. Выцягваю руку з пярсцёнкам уперад, з замілаваннем (а мо і радасцю) разглядваю, пакручваючы руку, «ягадную» знаходку і... нязмушана агучваецца адчуванне радасці: «Як тут і быў».

Дапамажыце! Дапамажы-ыце-э!!.. Ну, гады...

Падвал загараднага дома. На столі цьмянее слабенькая лямпачка. У кутку на зямлі сядзіць хлапчына, за нагу прывязаны ланцугом да вялікага прабоя, што вытыркаецца са сцяны. Хлопец, відаць, сядзіць тут ужо даволі даўно... Пад правым вокам яго — вялізны СІНЯК, нос і

губы таксама разбітыя... Хлопец абмацвае свае болькт... языком правярае зубы (ці цэлыя?)... устас і спрабуе вырваць прабой... стамляецца, зноў садзіцца, стогне, скрыгае зубамі, ледзь не плача... Трохі адпачыўшы, спыняе свой позірк на лямпачцы, апускае галаву, аглядвае падвал, затым — сябе, расшпільвае гузікі на сарочцы, устае, сцягвае з сябе сарочку і пачынае размахваць ёю пад столлю, спрабуючы разбіць лямпачку... Безвынікова... апускаецца на зямлю і ў роспачы пачынае крычаць-прасіць: «Дапамажыце! Дапамажы-ыце-э!!! Дапамажы-ыцеээ!!!» Напружана ўслухоўваецца ў цішышо, паглядваючы на дзверы падвала...

Раптам... заўважыў каля сцяны пластмасавы тазік... стаў на калені і рукі, «пайшоў» у накірунку да тазіка, але не дастае яго, бо ланцуг не пускае... Ацаніўшы сваё становішча, ён распластваецца на падлозе, выцягвае ўпсрад правую руку і... падцягвае да сябе тазік, бярэ яго ў рукі, зноў сгановіцца на калені, падымае галаву ўверх, глядзіць на лямпачку і, не размахваючыся, кідае тазік на лямпачку з намерам разбіць яе... Прамахваецца, тазік ударацца аб столь, змесціва яго разлятаецца ва ўсс бакі, пырскі трапляюць і на хлопца... ён выцірасцца сарочкай... шукае вачыма тазік, зноў бярэ яго ў рукі, добра прыцэльваецца і са злосцю кідае тазік... лямпачка «выстрэльвае» (разбіваецца). Хлопец апускаецца на падлогу... на твары яго ўсмешка пераможцы, голас яго дрыжыць...

— Ну, гады!..

Асцярожна мацае рукамі, стоячы на каленях, па падлозе і падбірае асколкі шкла ад лямпачкі, ды трапляюць толькі маленькая... адным нават парэзаў палец... нарэшце, знаходзіць, як яму падалося, даволі вялікі асколак, кладзе яго каля сябе на падлогу... бярэ сарочку, адрывае ад рукава манжэту, абкручвае ёю большую частку асколка лямпачкі, прыладжваецца і пачынае выскрабаць («пісаць») на сцяне... Чуваць, як знадворку адмыкаюць замок... Хлопец рэзка кідаецца на падлогу, робіць выгляд, што спіць... аднак поза яго сведчыць, што ён збіраецца змагацца за сваю свабоду...

Ойй!.. Ма-амачкаа... ма-амма-а-а!

Мінулым летам, адным сонечным і даволі гарачым днём, разам з мамаю я пайшла ў лес за малінаю. Ісці давялося даўгавата, але настрой быў цудоўны, бо летам так хораша ў лесе, так прыгожа, а водар які!.. Дыхаеш, дыхаеш і не можаш надыхацца...

І вось нарэшце добра вядомы маме маліннік. Мама адразу падвязала сабе на шыю вядзерца (літраў на сем!) і начала рваць

пахкую і сакавітую маліну. Я паставіла сваё вядзерца на зямлю і, расхінаючы галінкі малінніка, таксама ўзялася за прыемную работу. Маліннік быў вялікі і мы з мамай неўпрыкмст разышліся ў розныя бакі, але псрагукваліся і дакладна ведалі, як далека знаходзімся адна ад адной.

За нейкія дзве гадзіны мае пяцілітровае вядзерца было амаль што поўнае сакавітых цёмнаі светла-ружовых ягад. Я зусім яшчэ не стамілася, была бадзёрая, толькі страшэнна хацелася піць, бо ў малінніку было душна і горача... Я ведала, што мама ўзяла з сабою літровы тэрмас з халоднай вадою, таму і «прадралася» з малінніка на пратаптаную людзьмі дарожку... гукнула маму, каб ведаць, куды ісці, паставіла на зямлю вядзерца, зняла з галавы касынку, выцерла спацелы твар і шыю... трымаючы ў левай руцэ касынку, нагнулася, каб узяць правай рукою вядзерца з малінаю, і ўбачыла змяю (страх, не, жах працяў мае сэрца). — Ойй! (крык вырваўся з маіх грудзей) мамачка (прашаптала я і скамянела ў вельмі нязручнай позе)... крокі за дватры ад мяне, на купіне, грэлася на сонейку змяя... баючыся нават паварушыцца, я глядзела на яе, як трусок на ўдава... а змяя, відаць, разбуджаная маім крыкам-віскам, падняла галаву, глянула на мяне і... лянотна папаўзла ў траву... Як толькі яна знікла, я схапіла вядзерца і з крыкам «Ма-ама-а» кінулася бегчы.

Прысніцца ж такое

Пасля цяжкага працоўнага дня (заняткаў у Акадэміі мастацтваў) сплю, «як пшаніцу прадаўшы», моцна і соладка. І сніцца мне, што я прачнулася (апынулася) у «райских кущах»... Навокал усё такое прыгожае... цудоўнае надвор'е... трава зялёненькая і мякенькая... кветкі... фантастичных формаў і колераў... кусты і дрэвы з рознымі, зусім мне невядомымі пладамі... Сонейка свеціць надзвычай ласкавае... непадалёку віднеецца возера... на яго блакітна-чысцюткай вадзе плаваюць чароўныя птушкі... ці то фламінга... ці то альбатросы., ды толькі ўсе яны незямной красы і своеасаблівай ганарыстасці.

Хаджу гэта я па «райских кущах», гуляю і трапляю ў гаёк карлікавых дрэў з даволі вялікімі прадаўгаватымі пладамі жаўгавата-залацістага колеру (трохі падобныя на бананы ці на парніковыя агуркі). Як толькі я іх убачыла... дык у страўніку маім так «засмактала»... есці захацелася. Падышла я да бліжэйшага дрэва, прыгледзелася, прынюхалася і... працягнула руку да самага залацістага «агурка» і сарвала... панюхала яго з усіх бакоў (такі апетытны і так смачна пахне... аж слінкі «пацяклі»)... надрываю

скурку (о-о, значна танчэйшая, чым у бананаў) з аднаго боку, з другога... яшчэ раз нюхаю (такі водар!)... лізнула языком і... крышачку адкусіла (ойй... нібыта нектар капнулі мне ў рот)... пачынаю есці (фантастыка!.. гэта ніякі не банан-агурок, а... амброзія!)... глытаю (аж вочы прыжмурваю адзадавальнення)... адкусваю большы кавалак, актыўна і з асалодаю жую... глытаю... зноў адкусваю, яшчэ больш актыўна жую (такой смакаты я на зямлі ніколі не ела)... глытаю апошні кавалачак і... ўсміхаюся (я шчаслівая!). Мне здаецца, што я паздаравела, нават падрасла... ой! Што гэта з маёй галавой?.. глянула на скурку «банана»... яна зрабілася чорная, слізкая і... смярдзіць... з гідлівасцю кідаю на зямлю, нагінаюся і выціраю пальцы аб траву, хачу падняцца, але галаву працінае тупы боль, ашчаперваю яе абедзвюма рукамі і... адчуваю, што пад імі вырастаюць гузакі... яны павялічваюцца.. павялічваюцца і пераўтвараюцца ў рогі (здушаны стогн вырываецца з маіх грудзей)... абмацваю рогі, спрабую іх сарваць... нагінаю галаву, рукамі працягваю ламаць рогі, кручуся на адным месцы (ледзь не вью ад роспачы, злосці, бяссілля...), падаю на падлогу-«ложак» і, знямоглая, заціхаю...

Раптоўна «прачынаюся» і, перапуджаная, саджуся на «ложку»... Некалькі секунд сяджу нерухома, у вачах маіх, відаць, жах... Нарэшце ў зрэнках з'явілася неўразуменне... здзіўленне (дзе я? што са мною здарылася?.. Рогі!!. Хапаюся дзвюма рукамі за галаву, некалькі разоў абмацваю яе — няма!.. нічога няма!). Спадае псіхічнае і фізічнае напружанне, большасць мышцаў расслабляецца, позірк цяплее, пульс нармалізуецца, на твары з'яўляецца іранічная ўсмешка: «Прысніцца ж такое...»

Устаю з «ложка» і іду ў ванны пакой, каб стаць пад халаднавата-падбадзёрлівы душ і змыць з сябе цяжар кашмарнага сну.

Гаа-ах!.. Ну, малы, смерць твая прыйшла

Кожны год мы з братам-блізнюком, які старэйшы за мяне на некалькі хвілін, на летнія канікулы едзем з Мінска ў вёску — да дзеда і бабулі. Вёска знаходзіцца ў чыстай ад радыяцыі зоне — на Віцебшчыне. Жывуць там, у асноўным, толькі старыя людзі ды некалькі сем'яў сярэдняга веку, моладзі зусім няма.

І вось, пераначаваўшы ў дзедавай хаце, раніцай выходжу на ганак... уцягваю праз нос вясковыя пахі... свежасць ранішняга паветра прымушае мяне екурчыцца і скрывіцца, але я раблю некалькі «вялых» махаў рукамі, саекокваю з ганка на траву і пачынаю рабіць

фізічна-дыхальную гімнаетыку, уключаючы прабежку з падскокамі і налётам вакол калодзежа... Павесялелы, бадзёры падыходжу да калодзежа, бяру вядро, што замацавана на пяціметровым ланцугу, і... спускаю яго ў калодзеж... убачыўшы, што вядро патанула ў вадзе, пачынаю выкручваць яго правай рукою наверх, левай прытрымліваючы ланцуг, каб вядро не разгойдвалася ў бакі ды не расплюхвалася вада... Выкруціўшы вядро наверх, падхопліваю яго за дужку спачатку левай, а потым і правай рукою, стаўлю на дошку, што прыбіта на зрубе калодзежа... Трохі нахіліўшы вядро, сёрбаю халодную крышталёва-празрыстую вадзіцу, а затым, наліваючы патроху ў коўшык правай рукі, спалоскваю твар, шыю, грудзі, плечы... І так мне гэта падабаецца, што я перастаю «цыркацца» рукою, хапаю абсдзвюма рукамі вядро з вадою і... выліваю на сябе: тысячы тоненькіх ільдзінак ці іголак працінаюць маё цела, я аж рот разявіў і... знямеў ад задавальнення. Хуценька стаўлю вядро на калодзеж і пачынаю расціраць цела рукамі...

Са скрыпам і рыпам адчыняюцца дзверы дзедавай хаты і на ганку з'яўляецца заспаны мой «старэйшы» брат... Ён пазяхае, пацягваецца, здзіўлена ўсміхаецца, убачыўшы, што я раблю, лянотна спускаецца па прыступках ганка на зямлю, па-ранейшаму гледзячы на мяне... Я жэстам прапаную яму прыняць «душ», але ён, скрывіўшыся і перасмыкнуўшы плячыма, адыходзіць, асцярожна ступаючы босымі нагамі, у бок — да слівы, што красуе сваімі цёмнымі сіне-фіялетавымі пладамі каля самай хаты. Задраўшы галаву ўверх, узіраецца — выглядвае саспелыя і вялікія слівы... падскоквас і правай рукою хапаецца за галінку, нагінае і падцягвае яе да сябе, зрывае левай рукою дзве-тры слівы, адпускае галінку... Выцірае даланёю адну сліву, кладзе яе ў рот, з задавальнсннем разгрызае, пальцамі дастае з рота костачку, паварочваецца, выцягвае ўперад правую руку, прыцэльваецца і пстрыкае костачкаю ў мяне, але яна нават не даляцела да мяне, не тое каб «параніць»...

Я іранічна ўсміхаюся (маўляў: ну і «цэлкі» ж ты, братка!), а ён, з'еўшы астатнія слівы, якія, відаць, прыйшліся яму даспадобы, адварочваецца і пачынае зноў выглядваць на сліве яшчэ лепшыя плады...

І тут маю галаву «азарае» думка: «А ці не асвяжыць яго «душам»? Асцярожна, каб не загрымець ланцугом, бяру вядро і пачынаю апускаць яго ў калодзеж... набіраю вады... выкручваю вядро наверх, падхопліваю яго левай рукою за дужку, а правай пачынаю скручваць з «барабана» ланцуг... затым падымаю вядро, падтрымліваючы яго пад дно правай рукою, і павольна пачынаю падкрадвацца да брата,

які, трымаючы левай рукою галіну, правай зрывае слівы, і... выліваю на яго вядро чысцюткай халоднай вады...

Гаа-хах! (дзікі крык, ды не, нутраны рык параненага мядзведзя скалануў наш сад)... Гэты вокліч быў такі страшны, што я знерухомеў... з пустым вядром у руках... Брат некалькі хвілін (можа, мне толькі так падалося) хапаў вясковае паветра разяўленым ротам, потым абцёр твар рукою і, рэзка павярнуўшыся да мяне, завыў страшным голасам: «Ну, малы, смерць тваи прыйшла!»

Шпурнуўшы вядро разам з ланцугом яму пад ногі, я кінуўся наўцёкі...

Якой халеры лазіш тут?!

Кухня ў вясковай хаце. Гаспадыня, жанчына сярэдняга веку, падмятае венікам падлогу. З сенцаў, бразнуўшы клямкаю, уваходзіць мужчына, на ўсім відаць — гэта гаспадар, да таго ж ужо ў гадах. Патупаў каля парога, абтрасаючы з ботаў снег ці гразь, не здымаючы шапкі, пайшоў да стала, выцягнуў шуфлядку, паглядзеў-пашукаў там нешта і... не знайшоўшы, засунуў шуфлядку ў стол, у роздуме пастаяў каля яго, на твары мужчыны з'явілася грымаса здзіўлення (і чаго я прыходзіў? што гэта мне спатрэбілася?)... пайшоў з хаты, моцна бразнуўшы дзвярмі.

Гаспадыня незадаволена паглядала на яго, пакуль ён таптаўся каля стала і шлэпаў бруднымі ботамі па толькі што падмеценай падлозе, але нічога так і не сказала, а працягвала далей падмятаць...

Зноў шумна адчыняюцца дзверы, зноў уваходзіць гаспадар (твар яго яшчэ больш сур'ёзна-заклапочаны), выцірае падэшвы ботаў аб анучу, што ляжыць каля парога, зноў ідзе цераз увесь пакой і зноў жа чамусьці як раз там, дзе падмятае гаспадыня (яна перастае падмятаць, выпроставецца і ўжо вельмі незадаволена пазірае на мужа). Гаспадар, не заўважаючы яе незадаволенасці, зноў выцягвае шуфлядку стала, бярэ ліхтарык і з лагоднай усмешкай на твары шыбуе міма гаспадыні, якая працягвае падмятаць падлогу (відаць, што цярплівасць яе скончылася, бо гаспадыня рэзка выпрасталася і, амаль што без замаху, лупцанула мужыка венікам... ды па тым самым месцы, што ніжэй спіны: «Якой халеры лазіш тут?!»). Ад нечаканасці нападу гаспадар нават спыніўся, а жонку як «прарвала»: туды-сюды, туды сюды... пайшоў з хаты (зноў замахнулася венікам...).

Гаспадар дабрадушна рагатнуў у адказ: ой-ё-ё-ёй... і выйшаў з хаты, ціха прычыніўшы дзверы.

Чаму людзі не лятаюць?

Я іду з акадэміі... Надвячорак, надвор'е цудоўнае, таму я вырашыла прагуляцца пасля заняткаў. Па дарозе купіла булачку з марцыпанамі, каб супакоіць падстраўнікавую залозу, якая даўно ўжо сігналізуе сваімі імпульсамі-колікамі, што трэба хоць што-небудзь з'есці. Дайшоўшы да плошчы Я. Коласа, усаджваюся на лаўку пад адной з бярозак, каб нежаваць на хаду... Фантаны ўжо ўключылі, і яны рытмічна выкідваюць у паветра зусім невялікія струмені вады, якія з лёгкім шумам падаюць у рэзервуары, каб праз 20-30 хвілін зазіхацець мільярдамі рознакаляровых кропель пад промнямі майскага вечаровага сонца. На бардзюрах рэзервуараў сядзіць студэнцкая моладзь і... прахаджваюцца некалькі пар галубоў. Седзячы пад бярозай, я старанна «знішчаю» булачку і адпачываю... Раптам некалькі кавалачкаўкрошак маёй булачкі ўпалі на зямлю і тут жа адзін з галубоў «кінуўся» іх падбіраць... За ім падляцелі яшчэ некалькі. Я міжвольна адламала кавалачак булкі і, пакрышыўшы яго, сыпанула галубам... Аднекуль «спікіравалі» яшчэ дзве пары і... пачаліся «спаборніцтвы» — хто хутчэй і больш паклюе крошак. А адзін нават пырхнуў да мяне і даволі моцна дзюбнуў булку. Гэта было так нечакана, што ў мяне нават вырвалася: «Ну, бандыт!».

Убачыўшы, што не толькі я згаладалася, хуценька аб'еўшы глазуру з марцыпанамі, пакрышыла рэшткі булкі і кінула галубам — яны спалохаліся, шуганулі ў паветра, ды так імкліва і прыгожа, што ў мяне «выляцела» пытанне: «Чаму людзі не лятаюць?».

Галубы, зразумеўшы, што небяспекі няма, а наадварот, — гэта ежа, вярнуліся на зямлю і пачалі кляваць крошкі, не звяртаючы ўжо на мяне ніякай увагі... На душы пацяплела-пахарашэла, а свядомасць і сэрца працяла радасна-трывожнае прадчуванне нечага нсзвычайнага... І толькі я рушыла міма фантана, каб спусціцца ў метро, як пад маёй левай лапаткай штосьці... варухнулася. Я нават спынілася ад нечаканаеці. Прыслухалася... і адчула, што левая рука пераўтвараецца ў крыло... Тое ж самае адбылося і з правай рукою... Гэта фантастыка... а можа, трызненне і я захварэла? Я баялася глянуць на свае рукі-крылы і... заплюшчыла вочы, але асцярожна варухнула крыламі — страшэнна захацелася ўзляцець у неба... Я адчула, што магу адарвацца ад зямлі... Некалькі ўзмахаў рукамі-крыламі, я ўзлятаю і... падаю, балюча выцяўшы калена...

Ачомаўшыся, устаю і «клыпаю-кульгаю» ў магазін, каб купіць хлеба і пакарміць тых, каму наканавана лятаць у нябёсах.

Мышка... Мышка-нарушка

Я прыйшла з акадэміі пасля заняткаў, всчарам, дадому. Адамкнула дзверы ключом, увайшла ў маю аднапакаёўку, уключыла святло, ключ уваткнула ў замок. Сумку кінула на падлогу; расшпіліла куртку, зняла і павссіла на вешалку; зняла паўбоцікі, паставіла на месца; наткнула на ногі «тапці». Зайшла на кухню, памыла рукі, выцерла іх аб ручнік, вярнулася ў калідор, узяла сумку, адчыніла дзверы ў пакой, увайшла, сумку кінула на канапу, падышла да тэлевізара, узяла «Теленеделю», гартаючы яе, села на дыванок перад канапай, узяла на канапе пульт ад тэлевізара і ўключыла яго... Шукаю патрэбны канал... знайшла, пачала глядзець... Не вельмі, каб цікава... пераключаю на другі канал — рэклама, на трэці — тое самае... Надакучыла — выключыла тэлевізар, кінула на канапу пульт... «Што далей?» — узнікла пытанне... А ці не папіць нам чаю, ды, можа, і перакусіць?

Устаю, іду на кухню, бяру электрачайнік, наліваю з крана свежай вадзічкі, уключаю штэпсельную вілку ў разетку... «Дык, можа, што і з'есці?» — адчыняю халадзільнік і разглядваю яго змесціва... Раптам пачулася нейкае шамаценне... Прыслухоўваюся... зачыняю халадзільнік, стаю нерухома... Шамаценне паўтараецца... Аглядваю кухню і вызначаю, што шамаценне... у шафцы, дзе захоўваюцца ў папяровых і цэлафанавых пакетахмяшэчках сякія-такія запасы розных круп, мукі, солі, цукру... Асцярожна набліжаюся да шафкі, расчыняю дзверцы, а там... «Мышка!» — амаль што радасна выгукнула я. Яна зусім не спалохалася, толькі як бы прыгнулася ці то «згрупавалася», і... спакойна пазірае на мяне. Пагрызеныя пакеты яскрава сведчаць, што яна ўжо амаль усё паспрабавала... «Ах ты, мышка-нарушка, што ж гэта ты нарабіла?..» Але толькі я выцягнула руку ўперад, як мышка скокнула на падлогу і... толькі я і бачыла яе.

Мне адно засталося — парадкаваць у шафцы.

Любовь проснулась

Мы пажаніліся тры месяцы назад. І «мядовы» месяц, і два наступныя «праляцелі» як у цудоўным сне. І нечакана муж «пакінуў» мяне — дзесяцідзённая камандзіроўка за мяжу. Гэтая разлука абрынулася на мяне ўсім цяжарам суму, трывогі, сардэчных пакут... Я нічога не магу рабіць, я не знаходжу сабе мссца ў нашай, як мне здавалася, такой утульнай кватэры...

Заходжу і ў наша гняздзечка — спальню. У пакоі пануе пустэльная адзінота і, здаецца-чуецца, паветра напоўнена шчымліва-трывожнай музыкай... У кутку спальні — адзінокі стул, а на спінцы яго пінжак. Ён, як магніт, прыцягвае мяне да сябе... Падыходжу, пяшчотна праводжу па яго «плячах» рукамі, нібы адчуваю фізічную прысутнасць самага дарагога мне чалавека, удыхаю яго пах. Хваля пяшчоты захліснула мяне, я саджуся на стул... рукавы пінжака ласкава абдымаюць мяне... як рукі каханага, які хоча ахінуць мяне сваім дужым делам, сваім цяплом...

Расчуленая, я заплюшчваю вочы, бо пачуцці абуджаюць думкі, спрасоўваюцца ў словы, набываюць вершаваную форму:

Как много лет во мне любовь спала,
Мне это слово ни о чём не говорило.
Любовь таилась в глубине, она ждала,
И вот проснулась и глаза свои открыла...

Гучыць музыка — музыка маёй душы, майго сэрца. Я шчаслівая, бо каханая.

Ды ўсміхніся ты людзям

Я — артыст-клоун. Кожны дзень у цырку — такая мая работа. Адчыняю дзверы ў сваю грымёрную і спыняюся на парозе, бо разумею, не — адчуваю, што сёння ў мяне няма ніякага жадання працаваць...

Здымаю капялюш, паліто... усе гэта вешаю-кідаю на вешалку. Падыходжу да гардэробнага кутка... скідаю абутак... штаны і кашулю вешаю на стул, што стаіць каля грыміравальнага стала. Вяртаюся да гардэробнай, бяру свой клоунскі касцюм, надзяваю... абуваю мае «скараходы», спрабую прайсціся паходкаю свайго клоунскага вобраза, але адчуваю, што мне гэтага ну... зусім не хочацца... разумею, што не магу «ўключыць» сябе, не магу выклікаць патрэбнае псіха-фізічна-творчае самаадчуванне.

Падыходжу і ўсаджваюся за грыміравальны стол, уключаю святло, пачынаю разглядваць свой твар з надзеяй убачыць, знайсці «фотакартку» клоуна... на сённяшняе цыркавое прадстаўленне.

З верхняй шуфлядкі дастаю карабок з грымам і пачынаю «таніраваць» твар... Бяру растушоўку і малюю сабе зморшчыны, ямку на падбародку... намазваю румяны... падмалёўваю губы, але... ні знайсці аблічча, ні «нажыць» патрэбнае самаадчуванне... не атрымліваецца...

Нацягваю на галаву парык, разглядваю сябе ў люстэрку... ускудлачваю валасы парыка — ой! Дык і нічога ж! Застаецца

дамаляваць нос-бульбіну — і вобраз гатовы. Але... чагосьці не хапае. Спрабую ўсміхнуцца — атрымліваецца грымаса.

Пачынаю злавацца на сябе і голасна загадваю свайму адлюстраванню:

— Ды ўсміхніся ты людзям!

Ад нечаканасці я... разгубіўся, унутранае і фізічнае напружанне знікла, а на твары з'явілася абаяльная ўсмешка.

Стаўлю больш тлустую кропку на нос і... вобраз гатовы, каб з'явіцца на арэне нырка перад публікай.

Устаю, размінаю ногі і... іду весяліць, смяшыць, пацяшаць народ — маленькіх і дарослых людзей.

ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

За першы год навучання на тэатральным факультэце ў Акадэміі мастацтваў студэнты ў большасці сваей добра засвойваюць асноўныя прынцыпы і прыёмы трэніроўкі фізіялагічнага і фанацыйнага дыхання, развіцця моўнага і вакальнага голасу, выпрацоўкі дыкцыйнай выразнасці, авалодваюць нормамі беларускага літаратурнага вымаўлення, а таксама знасмяцца з працэсам нараджэння сцэнічнага слова (ад псіхафізічнага дзеяння да слоўнага).

На другі год навучання і выхавання будучых артыстаў вызначаны наступныя творча-метадычныя задачы:

— выхаваць свядомыя адносіны да трэніроўкі дыхання, развіцця голасу, удасканалення дыкцыі і прафесійную патрэбу самастойных сістэматычных заняткаў «трэнінгам і муштрой»;

— вывучыць і авалодаць (на практыцы) нормамі рускага літаратурнага вымаўлення;

— азнаёміцца з працэсам падрыхтоўкі (распрацоўкі) сцэнічнага расповяду аўтарскага тэксту: пазнанне, пражыванне, увасабленне («пераўтварэнне мёртвых літар у жывыя словы, вобразы»), уздзеянне жывога (сцэнічнага) слова на гледачоў-слухачоў.

КОМПЛЕКСНЫ ТРЭНІНГ — 5 «Р»:

псіхафізічны, дыхальна-галасавы, дыкцыйна-арфаэпічны (разагрэцца, раздыхацца, разаргыкулявацца, разрэзаніравацца, разгаварыцца)

Псіхафізічнай актывізацыяй і рэлаксацыяй («настройка акцёрскага інструмента») пачынаюцца ўсе групавыя і індывідуальныя заняткі сцэнічнай моваю. Кожны студэнт пад кантролем выкладчыка выконвае 5 «Р» — рыхтуе ўвесь псіхафізічны апарат да творчых заняткаў. Якія комплексы мышцаў і як разаграваць («настройваць»), студэнты ведаюць з псршага курса, таму няма патрэбы пералічваць гэтыя практыкаванні зноў.

На другім курсе працягваем трэніраваць (павялічваць аб'ём) камбінаваны тып дыхання ў статыцы і ў руху на вершаваных і празаічных тэкстах з разнатэмпавымі пераходамі: павольны — умераны, умсраны — хуткі, хуткі — павольны, умераны — запаволены... Асаблівая ўвага звяртасцца на замацаванне апоры камбінаванага тыпу дыхання.

Паступова развіваем (павялічваем) дыяпазон моўнага голасу. На групавых і індывідуальных занятках мэтазгодны больш інтэнсіўны як моўны, так і моўна-вакальны трэнінг з абавязковым павелічэннем

фізічных нагрузак. У трэцім семестры развіваем мяшанарэгістравас гучанне (гілаўны псраход з сярэдняга ў ніжні, з груднога ў сярэдні, з сярэдняга ў верхні, з галаўнога ў трудны і наадварот... Трэнірусм цсплы і актыўпы (насыпаны) пасыл моўна-напеўным спосабам у розных тэмпах з фіксацыяй шэпту, напаўголасу, поўнага голасу.

Развіццё голасу ў студэнтаў праходзіць нсаднолькава, таму на другім курсе больш надаецца ўвагі індывідуальным запяткам, каб дапамагчы кожнаму студэнту як найлепш распрацаваць выразна-выяўленчыя якасці яго моўнага і вакальнага голасу. Добрым памочнікам у гэтай справе з'яўляюцца народныя песні. Напеўнасць, шырыня, меладычнасць, сакавітасць слова і фразы народных песень садзейнічаюць развіццю ўстойлівага дыхання, выпрацоўцы навыку арганічнага і нязмушанага гучання. Выбар народных гіесень вядзецца студэнтамі самастойна, з улікам, безумоўна, іх галасавых магчымасцяў. Распрацоўваюцца народныя песні на індывідуальных занятках.

У трэцім семестры працягваецца мэтанакіраваная індывідуальная праца па выпраўленні моўных недахопаў, удасканаленні дыкцыі і засваенні нормаў рускага літарагурнага вымаўлення, у час якой значная ўвага надаецца выпрацоўцы навыкаў разнатэмпавай артыкуляцыі на тэкстах ускладненых чыстагаворак, цяжкагаворак і скорагаворак (на рускай мове).

Читаем — запоминаем — тренируем (отработка дикционной выразительности и усвоение норм современного и классического русского литературного произношения):

— сядьте (станьте) ровно и свободно, без напряжения, спокойно вдохните через нос, задержите дыхание (слегка подтяните нижнебрюшные мышцы), артикуляционпо выразительно, но беззвучно произнесите таблицу гласных звуков:

АЭИОУЫ ЕЁЮЯ

Помните: гласные произносятся ровно и значимо, йотированные гласные — легко и воздушно.

Повторите таблицу три раза:

ЕЁЮЯ АЭИОУЫ
ЫУОИЭА ЯЮЁЕ
АЭИОУЫ ЕЁЮЯ

— Произнесите таблицу гласных вполголоса, чётко артикулируя каждый звук:

АЭИОУЫ ЕЁЮЯ
ЫУОИЭА ЯЮЁЕ
ЕЁЮЯ АЭИОУЫ

АЭИОУЫ ЕЁЮЯ

— Произнесите таблицу гласных в полный голос, чётко артикулируя каждый звук. Не забудьте: йотированные гласные произносятся легко и воздушно:

ЕЁЮЯ ЫУОИЭА
ЯЮЁЕ АЭИОУЫ
АЭИОУЫ ЯЮЁЕ
ЫУОИЭА ЕЁЮЯ

1. В русском литературном языке все гласные под ударением произносятся полновесно, в соответствии с написанием: аист, эскадра, гора; экскурс, эпос, экстренный, город Уэллингтон; импульс, заниженный, духй; облако, духовность, эпизод, яйцо; увалень, упряжь, дума, фрукты, халтура, хапуга; вымолвить, урывками, языческий; евро, ересь, душевность, эстафета, энциклопедия; ёрзать, дурёха, всерьёз; Юрьев день, юноша, хлюпик; ярко, хляби небесные, фляга, компиляция, упрямец, уточнять.

2. Безударные гласные а, о перед ударным и в заударном слогах произносятся как ъ, средний звук между а и ы: въриант (вариант), вършъвянкъ (варшавянка), ьншлак (аншлаг), ънъхрънизм (анахронйзм), фспълъшонный (всполошённый), вяскъ (вязко), зяпкъ (зябко), гълофкъ (головка), зубъчисткъ (зубочистка).

3. В сочетаниях аи, ои безударные гласные а, о произносятся как редуцированный звук ъ, средний между а и ы: нъиграть (наиграть), нъинтуиции (на интуиции), нъинтэрвйдение (на интервидение), пъимпръвизирътать (поимпровизировать), пъискатъ (поискать), пъисът[и^{е}]чении[4] (по истечении) срока, пъименовънный (поименованный).

4. В сочетании ау, оу безударные гласные а, о произносятся как редуцированный звук ъ, средний между а и ы: нъугат (наугад), нъудить (наудить), пъутинка (паутинка), пъучять (поучать), пъупорствъвать (поупорствовать), пъуспъкоиться (поуспокоиться).

5. Окончания прилагательных на -не, -ые произносятся как ни, ыи: раньнии (ранние), лётнии (летние), в[и^{е}]чёрнии (вечерние), старый (старые), цэлъмудр[и^{е}]нныи (целомудренные), сьв[и^{е}]тыи (святые).

6. Если слово оканчивается на твердый согласный, а следующее начинается с гласного и, то и произносится как ы. Если же между

---

[4] [и^{е}] — средний звук между гласными и и с.

словами должна быть пауза, то гласный и произносится так, как пишется: дупыб[и^{е}]рёза (дуб и берёза), хътёльп[и^{е}]р[и^{е}]хътел (хотел и перехотел), бърувикыпъгънка (боровик и поганка), Аист и Цапля, Кот и повар.

7. Безударные гласные я, е в первом предударном слоге произносятся как редуцированный [и^{е}], средний звук между гласными и и е: ъб[и^{е}]зать (обязать), ръзв[и^{е}]зать (развязать), в[и^{е}]сы (весы), в[и^{е}]сьма (весьма), взб[и^{е}]сйть (взбесить), д[и^{е}]с[и^{с}]тичьный (десятичный).

8. Безударные гласные я, е в начале слова и в середине после гласного произносятся как редуцированный звук [и^{б}]: и^{е}зык (язык), и^{е}лозить (елозить), и^{с}дро (ядро), й^{е}сьӯл (есаул), и^{е}жэвика (ежевика), деи^{е}тель (деятель), жэлаи^{е}мае (желаемое), запаи'нный (запаянный).

9. Согласные ж, ш в сочетании с гласными и, е, ё, ю произносятся твёрдо: жызьиь (жизнь), жэлание (желание), жолтый (жёлтый), жэлток (желток), шыповник (шиповник), шэлест (шелест), шолк (шёлк), бръшура (брошюра).

Но в словах жюри, Жюли, Жюльен, Жюльётт сочетания жю, жи произносятся в соответствии с написанием.

10. Согласный ц в сочетании с гласными и, е произносится твердо: цыклон (циклон), цэпь (цепь), Цыцэрон (Цицерон), муха цэцэ (цеце).

В словах Цюрих, цюрихский сочетание цю произносится в соответствии с написанием.

Чётко артикулируя, не торопясь, тренируйте правильное произношение вышеперечисленных сочетаний в пословицах, поговорках, стихотворных текстах:

Живое слово дороже мёртвой буквы.
Кто хочет, тот может.
Кума куму: купи шубу шитую, а избу крытую.
Жизнь прожить — не поле перейти.
Храбрость города берёт, а бдительность бережёт.
У людей шило бреет, а у нас и бритва не бреет.
Паши под озимь глубже — уродится хлеб лучше.
Повеселимся и спляшем, только пашню вспашем.
Снявши голову, по волосам не плачут.
Дисциплина — против беспорядка плотина.
Кто правды не скажет, тот многих свяжет.
Бой красен мужеством, а приятель — дружеством.
Живи не тужи: теперь нет межи.
Кто дрожит, тот и бежит.
Подальше положишь — поближе возьмёшь.

Чужим умом жить — добра не нажить.
Жить широко — хорошо, но и уже не хуже.
Суженое — ряженому, ряженое — суженому.
В живом уголке жили ужи и ежи.

Жужжит над жимолостью жук: я живу и не тужу, потому что я жжужжу, жжужжу, жжужжу.

Инцидент с интендантом.

С интендантом инцидент.

Цыплёнок цапли цепко цепляется за цепь.

За цепь цепко цепляется цыплёнок цапли.

Есть сердце, да закрыто дверцей.

Что в сердце творйтся — на лице не утаится.

Сердце с перцем — нрав с горчицей.

Мягкий съел, так чёрствый цел.

Заглянет солнце и в наше оконце.

Скажешь курице, а она всей улице.

Ошибся — что ушибся.

Спеши, да людей не смеши.

Не спеши языком, спеши делом.

Вы, чьи широкие шинели
Напоминали паруса,
Чьи шпоры весело звенели
И голоса.
Одним ожесточеньем воли
Вы брали сердце и скалу, —
Цари на каждом бранном поле
И на балу.
Вам все вершины были малы
И мягок самый чёрствый хлеб,
О молодые генералы
Своих судеб.

М. Цветаева

Когда в преддверьи чуда мирового
Уже вздохнуть и кашлянуть грешно,
Тогда бесплотный стебель микрофона
Вдруг обретает плоть Жюльетт Греко.

Л. Филатов

Неправедно живём,

Невесело поём.
Уже и не танцуем,
Зато жуём и пьём.

Л. Кондаленко

С тех пор царь перестал его тревожить. И стал он житьпоживать, добро наживать, а худо проживать.

Л. Толстой

Велика птица — соловей! Нас, воробьев, гораздо больше.

К. Чапек

Эта буква широка
И похожа на жука.
Да при этом, точно жук,
Издаёт жужжащий звук:
Жжжж»!..

С. Маршак

11. Согласные ч, щ в сочетании с гласными а, о, у произносятся мягко: чи^{е}стушки (частушки), чи^{с}радей (чародей), чи^{е}лма (чалма); чёпърный (чопорный), нътпли^{с}чём с кумъчём (над плечом с кумачом); чюгкъсьть (чуткость), чюжой (чужой), чюшка (чушка), чюрка (чурка); щи^{е}вёль (щавель), пъщяда (пощада), три^{е}пи^{е}щя (трепеща), тъщя (тоща), ищя (ища), ли^{е}щя (леща); хълщёвый (холщовый); щюка (щука), щюпъльца (щупальца), іцюплый (щуплый).

Чётко артикулируя, не торопясь, тренируйте правильное произношение вышеперечисленных сочетаний в пословицах, поговорках, стихотворных текстах:

Беды мучат, да уму учат.
Понеделышчай, да не бездельничай.
Часом густо, а часом и пусто.
Ученику удача, учителю — радость.
Черепаха, не скучая, сидит за чашечкой чая.
Худо языку кричать, когда руки молчат.
Начинай сначала, где голова торчала.
Хороша кашка, да мала чашка.
Чок, чок, чок — вот точёный каблучок.
Чужие грехи пред очами, а свои за плечами.
Чудо чудное, диво дивное: от чёрной коровки да белого молока.
Плачу, плачу, а горе прячу.
На чужую кучу нечего глаза пучить.
Чукча в чуме на Чукотке. На Чукотке в чуме чукча.

Снявши голову, по волосам не плачут.
Чужим умом умён не будешь.
На чужой роток не накинешь платок.
Белые ручки чужие труды любят.
Прощай, квашня, я гулять пошла.
Щеголь, а рубаха холщовая.
Умерла щука, да зубы остались.
Волки рыщут, пищу ищут.
Тащу, тащу — не дотащу, боюсь, что выпущу.
Стали щуке грозить — хотят щуку утопить.

Час блаженный, час печальный,
Час последний, час прощальный,
Те же лёгкие одежды,
Ты стоишь, склоняя вежды, —
И не нужно мне надежды.
Этот час — он мой!

А. Фет

Щенок такой тщедушный был.
Его я щами всё кормил.
От злющей стужи защищал.
Щенок от радости пищал.

А. Барто

Чудеса всегда доверены минутам.
Чудо трудно растянуть на полчаса.
Но минуты мы неряшливо минуем —
И поэтому не верим в чудеса.

Л. Филатов

Плавниками трепеща,
И зубаста, да тоща,
Пищи на обед ища,
Ходит щука вкруг леща.

М. Горький

Мы чаруемся и чураемся.
Там чаруясь, здесь чураясь,
То чурахарь, то чарахарь,
Здесь чуриль, там чариль.

Из чурыпи взор чарыни.
Есть чуравель, есть чаравель.
Чарари! Чурари!
Чурель! Чарель!
Чареса и чуреса.
И чурайся и чаруйся.

В. Хлебников

Придёшь усталый,
вешаться хочется.
Ни щи не радуют,
пи чая клокотанье.
А чайкой поплещешься —
и мёртвый расхохочется
от этого
плещущего щекотанья.

В. Маяковский

Чай оделся, чай обулся,
Чай, уж чаю напился,
Чай, уж чаю напился,
Чай, гулять уж собрался.

Народная песня

12. Звонкий согласный ж, сочетания шь, жь на конце слова произносятся как согласный ш: дубляш (дубляж), ни^{е}фти^{е}рпёш (невтерпеж), ни^{е}фхош (не вхож); буди'ш (будешь), пъкини^{е}ш (покинешь), бреш (брешь); реш (режь), дрош (дрожь), лош (ложь).

13. Сочетание согласных чт в слове что и его производных произносится как шт: што (что), штобы (чтобы), нёзашта (не за что), шгота (что-то), штонибуть (что-нибудь), низашто (ни за что), ништо (ничто).

Во всех других словах сочетание чт произносится с мягким чь: нечьто, ничьтожный, ничьожэства (ничтожество), ми^{е}чьта (мечта), мачьта (мачта), почьта (почта), пъчьтовый (почтовый), пъчьтенный (почтенный), уничьтъжэние (уничтожение), уничьтожэнный (уничтоженный) и др.

Люби дома, что захочешь, а в гостях, что дают.

Что кому за дело, что у меня болело.

Кстати промолчать, что большое слово сказать.

Бери ношу по себе, чтоб не крякать при ходьбе.

Нет таких трав, чтобы знать чужой нрав.
Так думай, чтобы после не было передумки.
Чтобы ему пи дна, ни покрышки.
Чтобы рыбку съесть, надо в воду лезть.
За ничто ничего не купишь.
Надо что-нибудь и последнему.
Где нет правды, не по что и добра ждать.
Ничто не убеждает людей лучше примера.
Когда что-нибудь лежит возле хорошего, к нему липнет хорошее; когда что-нибудь лежит возле дурного, к нему липнет дурное.
На словах, что на гуслях, а на деле, что на балалайке.

Уж есть за что,
Русь могучая,
Полюбить тебя,
Назвать матерью...
И. Никитин

Со мною вот что происходит:
ко мне мой старый друг не ходит.
Е. Евтушенко

За краткий сон,
что нынче снится, а завтра — нет,
Готов я смерти покориться, младой поэт.
А. Блок

Мы едем, мы едем,
И видите, соседи,
Мы вам чаёк поставили,
Чтоб вас не затруднять.
Л. Петрушевская

Чтоб ты не страдала от пыли дорожной,
Чтоб ветер твой след не закрыл, —
Любимую, на руки взяв осторожно,
На облако я усадил.
М. Светлов

Я расскажу вам быль про мёд.
Пусть кой-кого она проймёт.

Пусть кто-то вроде не поймёт,
Что разговор о нём идёт.
Е. Евтушенко

Застонал я от сна дурного
И проснулся, тяжко скорбя.
Снилось мне — ты любишь другого
И что он обидел тебя.
Н. Гумилёв

Любовник не тщеславный,
Я нечто в ней нашёл мечтою своенравной.
А. Пушкин

14. В сочетаниях согласных стн, здн, стл, стск, ндц согласные т, д не произносятся: лесный (лестный), меснъсьть (местность), месный (местный), выи^{е}зной (выездной), празьничьный (праздничный), шьши^{е}сьливый (счастливый), зъвисьливый (завистливый), пръпъгандисский (пропагандистский), при'лесный (прелестный), страсный (страстный), учясьливый (участливый), позьний (поздний), ниди^{е}рланцы (нидерландцы), бургунцы (бургундцы).

Ранняя птичка носок прочищает, а поздняя — глаза продирает.

Трутням праздник и по будням.

Праздность — мать пороков.

Добрый конь не без седока, а честный человек не без друга.

Белые берёзы, жидкие осины,
Пашни да овраги — грустные картины!
Не пройдёшь без думы, без тяжёлой, мимо.
Что же к ним всё тянет так неодолимо?..
А. Плещеев

Лицо своё скрывает день;
Поля покрыла мрачна ночь;
Взошла на горы черна тень;
Лучи от нас склонились прочь;
Открылась бездна, звёзд полна;
Звездам числа нет, бездне дна.
М. Ломоносов

Прибрежные дубравы

Склонялись к водам,
И стлался кудрявый кустарник
По злачным окрестным холмам.
В. Жуковский

Вы избалованы природой;
Она пристрастна к вам была,
И наша вечная хвала
Вам кажется докучной одой.
А. Пушкин

Он был поэт: беспечными глазами
Глядел на мир и миру был чужой;
Он сладостно беседовал с друзьями;
Он красоту боготворил душой;
Он воспевал счастливыми стихами
Харит, вино, и дружбу, и покой.
Н. Языков

Видит: весь сияя в злате,
Царь Салтан сидит в палате.
На престоле и в венце,
С грустной думой на лице.
А. Пушкин

Небесный свод, горящий славой звёздной,
Таинственно глядит из глубины, —
И мы плывём, пылающею бездной
Со всех сторон окружены.
Ф. Тютчев

На волю птичку выпускаю
При светлом празднике весны.
А. Пушкин

В жёлтый сумрак мёртвого апреля,
Попрощавшись с звёздною пустыней,
Уплывала Вербная педеля
На последней, на погиблой льдине.
И. Апненский

В печальной праздности
Я лиру забывал,
Воображение в мечтах не разгоралось.
А. Пушкин

Слёзы людские, о слёзы людские,
Льётесь вы ранней и поздней порой...
Льётесь безвестные, льётесь незримые,
Неистощимые , неисчислимые, —
Льётесь, как льются струи дождевые
В осень глухую, порою ночной.
Ф. Тютчев

Доблестным сердцам... столь же подобает быть терпеливыми в годину бедствия, сколь и радостными в пору преуспеяний.
М. Сервантес

Пустое вы сердечным ты
Она, обмолвясь, заменила
И все счастливые мечты
В душе влюблённой возбудила.
А. Пушкин

Стыдиться можно и должно не какой-либо работы, хотя бы самой нечистой, а только одного: праздной жизни.
Л. Толстой

Ворвались
на ковры!
    под раззолоченный кров!
    Каждой лестницы
    каждый выступ
брали,
перешагивая
    через юнкеров.
В. Маяковский

Ты сказки давней горестных заметок,
Душа моя, не тронь и не ищи...
Смотрю, блестящих севрских статуэток
Померкли глянцевитые плащи.
А. Ахматова

На Десне на пристани —
Плёсы солнцем выстланы.
На Десне на пристани —
Камешки монистами.

Н. Горбачёв

Несчастная кошка порезала лапу.
Сидит и ни шагу не может ступить.
Скорей, чтобы вылечить кошкину лапу,
Воздушные шарики нужно купить.

Д. Хармс

Мне грустно на тебя смотреть,
Какая боль, какая жалость.
Знать, только ивовая медь
Нам в сентябре с тобой досталась.

С. Есенин

Боль, возвышаясь, делалась прекрасной,
в себе соединив покой и страсть,
и дух казался силою всевластной,
но возникал в душе вопрос бесстрастный —
и так ли уж всевластна эта власть!

Е. Евтушенко

До сих пор мне было невдомёк —
Для чего мне звёздный каталог.

А. Тарковский

На море ночное мы оба глядели.
Под нами скала обрывалася бездной;
Вдали затихавшие волны белели.

А. Фет

У каждого крашены ставни,
По праздникам мясо и квас.
Недаром когда-то исправник
Любил погостить у нас.

С. Есенин

Как правая и левая рука,
Твоя душа моей душе близка.
Мы смежены блаженно и тепло,
Как правое и левое крыло.
Но вихрь встаёт и бездна пролегла
От правого и левого крыла.

М. Цветаева

Ты — женщина, ты — ведьмовской напиток!
Он жжёт огнём, едва в уста проник;
Но пьющий пламя подавляет крик
И словословит бешено средь пыток.
Ты — женщина, и этим ты права,
От века убрана короной звёздной,
Ты — в наших безднах образ божества!
Мы для тебя влечём ярем железный,
Тебе мы служим, тверди гор дробя,
И молимся — от века — на тебя!

В. Брюсов

Будь же счастлива, Мери,
Солнце жизни моей!
Ни тоски, ни потери,
Ни несчастливых дней
Пусть не ведает Мери.

А. Пушкин

Но угасла та нежная дрёма,
Всё истлело в дыму голубом.
Мир тебе — полевая солома,
Мир тебе — деревянный дом.

С. Есенин

15. Сочетание согласных с, з с шипящими ш, ж, щ в словах и на стыке слов произносятся как долгий (двойной) твёрдый или мягкий звук HI IN (шьшь), жж (жьжь): шшабъша (с шабаша), шшалуном (с шалуном), шшалфею (с шалфею), шшытый (сшитый), шшыбать (сшибать), шшэйхъм (с шейхом), шшэльмай (с шельмой), шшэфам (с шефом), шшыкам (с шиком), шшутками (с шутками); жжалъсьти (с жалости), жжымать (сжимать); ишштаба (из штаба), чи^{е}ри^{е}шшынель (через шинель), ишШэпи'тофки (из Шепетовки), вижьжять (визжать),

брюжьжять (брюзжать), ижжога (изжога), ражжалъбить (разжалобить); рашьшепить (расщепить), рашьшедрился (расщедрился), рашыпелина (расщелина), ишьшнжи (из щуки), чіГріГіііыпелн (через щели), би^е^шьШедрина (без Щедрина), би'шынита (без щита).

Людей хулит, а сам так же сшит.
Сшить не сошью, а распороть могу.
Зимой без шубы не стыдно, а холодно.
Ел бы пирог, да в печи сжёг.
Кабы свинье рога — всех бы со свету сжила.
Сжалился волк над ягнёнком — оставил кости да кожу.
Его плачем не разжалобишь.
Поезжай скорее, так будет спорее.
Век изжил, а ума не нажил.
Расщедрился скупой — дал голому верёвку.
Из щепы похлёбку не сваришь.
Муж без жены, что гусь без воды.

Я вся — тон жемчужной акварели,
Я бледный стебель ландыша лесного,
Я лёгкость стройная обвисшей мягкой ели,
Я изморозь зари, мерцанье дна морского.

М. Волошин

Дети, други!
Я помню прежние заслуги:
О, сжальтесь вы над стариком!

А. Пушкин

Себя покорно предавая сжечь,
Ты в скорбный дол сошла с высот слепою.

М. Волошин

Сжала руки под тёмной вуалью...
«Отчего ты сегодня бледна?» —
Оттого, что я терпкой печалью
Напоила его допьяна.

А. Ахматова

Ревнивый трепетный хранитель
Замков безжалостных дверей,

Он только немощный мучитель
Прелестной пленницы своей.
А. Пушкин

Во мне расщеплен атом винограда,
Во мне горит двух разных роз война.
Б. Ахмадулина

С возросшей целью человек взрастает.
Ф. Шиллер

Тот не человек, кто не боролся с жизнью и не оставил в её логове клочьев своей шерсти.

Р. Роллан

Живопись—рядом с поэзией, только её видят, а поэзия — с живописью, только её слышат.

Леонардо да Винчи

Не шути с женщинами: эти шутки глупы и неприличны.

К. Прутков

В них чудится серое безразличье,
Стальная дрёма вод,
Сырой земли угрюмое величье
И горько сжатый рот.
М. Волошин

Он приезжал на рысаке
К семи часам, не позже,
И сам держал в одной руке
Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы.
Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,
Быццам абсыпана промнямі зор.
Пахне чабор, Пахне чабор...
Выйсці б насустрач, | стаць і прызнацца.
Вось яно — блізкае, _L яснае шчасце,
Клікнуць хацелася — | голас замёр.
Пахне чабор, Пахне чабор... V

Магчыма, нясцерпны боль працяў сэрца лірычнага героя, калі ён заўважыў, усвядоміў, што «пастарэў» на «год адзінаццаць, а можа дванаццаць», але так і не сустрэў «сваю», «адзіную, на ўсёй зямлі адзіную». Адсутнасць у студэнтаў падобнага жыццёвага вопыту і звязаных з ім эмацыянальных асацыяцый неабходна кампенсаваць пачуццём мастацкай праўды. Выпрацаваныя навыкі веры ў творчы вымысел дапамагаюць студэнтам-выканаўцам перадаць у жывым слове боль страты чагосьці вельмі дарагога лірычнаму герою. Пасля рэфрэна распавядальнік вытрымлівас паўзу (у падтэксце выразна чуецца: вось і ўсё...), а затым — гучыць першы радок апошняй страфы: «Час той схаваўся за дальняй гарою». Нягледзячы на тое што аўтар паставіў коску, студэнтам прапануецца «прачытаць» кропку, што дае магчымасць (пасля псіхалагічнай паўзы) зноў убачыць дзяўчыну, «абсыпаную промнямі зор», якая ценем праплыла ў маўклівай прасторы, выклікаўшы ва ўспамінах шчымлівы пах чабору.

Год адзінаццаць, _L а можа дванаццаць
Сэрца баліць, І што не здолеў спаткацца,
Сэрца нязменна хвалюе дакор.
Пахне чабор, Пахне чабор... V
Час той схаваўся за дальняй гарою,
V Здасца хвілінай — _L яна прадамнога...
Выйду. Гукаю. V Маўклівы прастор.
Пахне чабор, Пахне чабор...

ТРЭЦІ І ЧАЦВЕРТЫ ГАДЫ ПРАФЕСІЙНАГА ВЫХАВАННЯ АКЦЁРА

Задачы:

— пераўтварыць «трэба» ў «не магу не займацца» ўдасканаленнем акцерскай псіхатэхнікі;

— пераўтварыць уменне ў навык творчага ўвасаблення мастацкага тэксту ў жывое (сцэнічнае) вуснае слова;

— выпрацаваць уменне ствараць вобраз і характар ва ўмовах сцэнічнага расповяду і стварэння ролі ў дыпломных спектаклях.

Уласна «тэхнічная» падрыхтоўка будучых артыстаў у асноўным заканчваецца на другім курсе. На трэцім, пераддыпломным, годзе навучання вядзецца выключна індывідуальная праца па развіцці дыхання, голасу, па ўдасканаленні дыкцыі, замацоўваюцца навыкі самакантролю за прафесійным станам і ўзроўнем псіхафізічнай формы. Тым не менш праводзяцца і групавыя заняткі як па сцэнічнай мове, так і па майстэрству акцёра, якія абавязкова пачынаюцца 20-30-мінутным псіхафізічным трэнінгам.

На трэцім годзе прафесійнай падрыхтоўкі будучых артыстаў працэс навучання пераходзіць у больш высокую «фазу» — выхаваннс, выхаванне творчай асобы. А выхаваць творчую асобу можна толькі на «добрай і высокай» літаратуры. Гэта могуць быць як празаічныя, так і вершаваныя творы (не вельмі вялікае апавяданне ці даволі «ладны» фрагмент (урывак) з аповесці, рамана; паэма або кампазіцыя з вершаў аднаго ці розных паэтаў; маналогі з драматургічных твораў розных жанраў). Галоўнае, каб тэкст быў высокамастацкага кшалту і зместу, каб студэнту было над чым «галаву ламаць і сэрца крывяніць», бо толькі на «багатым на думкі і страсці» літаратурным матэрыяле педагог-рэжысёр можа разварушыць, абудзіць, узгадаваць у студэнце такія мастакоўскія якасці і здольнасці, якія значна «рассунуць, пашыраць» яго выканальніцкі дыяпазон, яго акцёрскія магчымасці.

Таму трэці год прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў акцёрскага аддзялсння па сцэнічнай мове — год педагагічна-рэжысёрскіх пошукаў і спроб, калі даецца, дакладней, выбіраецца матэрыял самы разнастайны, у тым ліку і на «пераадоленне»; год творчых іспытаў на «цягавітасць» і акцёрскую жыццяздольнасць. Выбар літаратурнага матэрыялу, як сведчыць шматгадовая асабістая практыка, трэба пачынаць студэнтам у красавіку-маі месяцы чацвёртага семестра. Да курсавога экзамена па сцэнічнай мове ў летнюю сесію другога года навучання педагогу трэба зацвердзіць усе празаічныя і вершаваныя творы, бо толысі пры ўмове выканання гэтага патрабавання можна

быць упэўненым, што па восені адразу пачынасцца менавіта творчая праца.

Агульнавядома: акцёр прафесійна сталее («расце») на «добрых і розных ролях». Гэта значыць, што ў тэатры ён творча загружаны, мае магчымасць развіваць і ўдасканальваць сваё выканальніцкае майстэрства. Тое самае павінна адбывацца і са студэнтамі, будучымі акцёрамі, на трэцім курсе, дзе закладваюцца асновы прафесійнай працаздольнасці і трываласці. Студэнты таксама павінны быць творча загружаны. Не дзве работы на навучальны год, а па дзве на кожны семестр. Гэта значыць: два месяцы ўвесь курс працуе над «беларускім» матэрыялам і здае яго на восеньскай сесіі; затым студэнты працуюць над «рускім» матэрыялам і здаюць яго ў зімовую сесію. У шостым семестры студэнты таксама працуюць над «беларускім» матэрыялам і здаюць яго ў вясеннюю сесію, затым увесь курс працуе над «рускім» матэрыялам (на рускай мове) і здае яго ў летнюю сесію. Да таго ж выбар і зацвярджэнне літаратурных твораў (тэкстаў) на шосты семестр павінны быць зроблены на палатку зімовай сесіі.

Рэпертуарная «афіша» трэцяга курса цалкам залежыць ад творчага патэнцыялу студэнтаў, але на ёй абавязкова пазначаны творы беларускай, рускай і замежнай літаратуры (у перакладзе на рускую ці беларускую мову). Трэці год прафесійнай падрыхтоўкі — гэта праверка «боем» акцёрскіх здольнасцяў і творчых магчымасцяў кожнага студэнта, які мусіць прайсці праз «ваду, агонь і медныя трубы» чатырох рознажанравых мастацкіх твораў, каб нарэшце зразумець, убачыць на свае вочы, што, які літаратурны матэрыял найбольш пасуе, найлепш «кладзецца» на яго акцёрскую індывідуальнасць, у якім жанры будучы артыст найбольш яскрава і пераканальна засведчыць сваё прафесійнае ўменнс існаваць і мысліць у сцэнічных вобразах жыццёва-праўдзіва, лагічна, эмацыянальна, магнетычна-захапляльна і заразліва. К. Станіслаўскі добра ведаў, што «напечатанная пьеса не является ещё законченным произведением, пока она не будет исполнена на сцене артистами и оживлена их живыми человеческими чувствами... что слово, текст роли ценны не сами по себе и для себя, а тем внутренним содержанием или подтекстом, который в них вложен... Смысл творчества — в подтексте. Без него слову нечего делать на сцене. В момент творчества слова — от поэта, подтекст — от артиста... Артист должен создавать музыку своего чувства на текст пьесы и научиться петь эту музыку чувства словами роли. Когда мы услышим мелодию живой души, только тогда мы в полной мере оценим по достоинству и красоту текста, и то, что он в себе скрывает» (2, 81, 82).

Каб быць здольным стварыць цудоўную «мелодию живой души» і выявіць у ёй уласны падтэкст, будучы артыст мусіць спачатку як след разабрацца ў аўтарскім тэксце. А для гэтага яму разам з аўтарам і рэжысёрам-педагогам неабходна «прайсціся» шляхам выканальніцкага (творчага) асэнсавання і спасціжэння зместу мастацкага тэксту. Аўтар жа прапануе выканаўцу падумаць пра многія «если бы», схаваныя ў яго празаічным ці вершаваным творы: «Если бы действие происходило в такую-то эпоху, в таком-то государстве, в таком-то месте или в доме; если бы там жили такие-то люди, с таким-то складом души, с такими-то мыслями и чувствами; если бы сталкивались между собой при таких-то обстоятельствах и так далее. Режиссёр, ставящий пьесу, дополняет правдоподобный вымысел автора своими «если бы» и говорит: если бы между действующими лицами были такие-то взаимоотношения, если бы у них была такая-то типичная повадка, если бы они жили в такой-то обстановке и так далее, как бы при всех этих условиях действовал ставший на их место артист...

Секрет силы воздействия «если бы» в том, что оно не говорит о реальном факте, о том, что есть, а только о том, что могло бы быть, «если бы»... Это слово ничего не утверждает. Оно лишь предполагает, оно ставит вопрос на разрешение... вызывает у артиста внутреннюю и внешнюю активность и добивается этого без насилия, естественным путём. Слово «если бы» — толкач, возбудитель нашей внутренней творческой активности» (2, 100, 101, 102).

Такім чынам, з такога простага, здавалася б, акцёрскага прыстасавання, «манка» — калі б — пачынаецца творчае асэнсаванне і падрыхтоўка да ўвасаблення мастацкага тэксту ў жывое (сцэнічнае) слова. Менавіта «калі б» уключае фантазію і эмоцыі, а таксама спрыяе развіццю стваральнага працэсу ролі ці сцэнічнага расповяду, спасціжэнню прапануемых аўтарам абставін: сюжэтных калізій твора, фактаў, падзей, эпохі, часу і месца дзеяння гсрояў, іх узасмаадносін і шмат чаго іншага. Будучаму артысту-выканаўцу неабходна шчыра паверыць у рэальную магчымасць створанага аўтарам жыцця, услед за аўтарам перажыць усе падзеі, што адбываюцца ў творы, а затым так прывыкнуць да гэтага жыцця, каб яно стала як бы сваім, уласным. Без назапашаных вобразных бачанняў і адчуванняў, без вызначэння ўласных адносін да фактаў і з'яў, без папярэдняга асэнсавання і ўстанаўлення ўнутраных (псіхалагічных) і лагічных сувязяў (адносін) паміж дзейнымі асобамі «прысвоіць» або «сыграць», увасобіць у сцэнічным слове змсст ролі ці літаратурнага твора немагчыма, бо «творчество на чужую тему

труднее, чем создание собственного вымысла... мы пересоздаём произведения драматургов, мы вскрываем в них то, что скрыто под словами; мы вкладываем в чужой текст свой подтекст, устанавливаем своё отношение к людям и к условиям их жизни; мы пропускаем через себя весь материал, полученный от автора и режиссёра; мы вновь перерабатываем его в себе, оживляем и дополняем своим воображением. Мы сродняемся с ним, вживаемся в него психически и физически; мы зарождаем в себе «истину страстей»; мы создаём в конечном результате нашего творчества подлинно продуктивное действие, тесно связанное с сокровенным замыслом пьесы; мы творим живые, типические образы в страстях и чувствах изображаемого лица... это огромная работа... это большое творчество и подлинное искусство!» (2, 106, 107).

Сапраўды, каб стварыць твор мастацтва, неабходна добра «папацець» — творча папрацаваць. Да таго ж трэба не забывацца, што «жыццё чалавечага духу» ролі і літаратурнага твора — гэта сукупнасць фізічных і псіхічных дзеянняў, якія, пераплятаючыся, узаемадапаўняючы і ўзаеманасычаючы адно аднаго, утвараюць для дзейнасці герояў «рэальна-ўмоўную» атмасферу сцэнічнага жыцця. На шляху стварэння сцэнічнага «жыцця чалавечага духу» ролі ці літаратурнага персанажа выканаўца кантактуе, працуе, звяртаецца да аўтарскіх слоў — мастацкага тэксту, застаючыся самім сабою, спрабус дзейнічаць ад свайго імя, паступова і неўпрыкмет «парадняючыся і псраўвасабляючыся» ў літаратурны вобраз, нязмушана прысвойваючы асобныя рысы характару ствараемага сцэнічнага героя. На думку Г. Пятровай, «работая над содержанием, уходя от слов вглубь текста, исполнитель всё время вновь приближается к тексту. Точнее говоря, вся работа над содержанием — это постоянное возвращение к словам автора. Что означает слово, как строится фраза, как связаны между собой абзацы, как отобраны слова, как употребляет автор метафоры, омонимы, эпитеты, как расставляются знаки препинания — все эти факторы являются подсказками для наиболее глубокого и точного овладения текстом. Очень важно в работе сохранять постоянное внимание к особенностям авторского повествования. Эти особенности проявляются уже в манере рассказывания, в отборе материала и оценке его...

Присвоение текста, сближение с героями и авторской действительностью идёт постепенно. Мир событий и образов наконец начинает принадлежать исполнителю, он рассказывает о том, что так хорошо и точно знает, и тогда слушатель становится взволнованным, искренним и счастливым его собеседником» (16, 172, 175).

Такім чынам, мова кожнай дзейнай асобы п'есы, кожнага персанажа мастацкага твора характарызуецца своеасаблівай маўленчай выразнасцю, якая слова-паняцце пераводзіць у словавобраз, а выканаўца ўжо стварае новы, непаўторны сцэнічны вобраз, напаўняючы яго відавочнасцю, адчувальнасцю, уласнымі думкамі і пачуццямі. І гэтаму сцэнічнаму вобразу павінна быць уласціва не толькі вобразнасць, але і характарнасць, адметная маўленчая выразнасць, бо «у живого организма роли есть и внешний образ, тело, которое надо воплотить в гриме, в типичном для роли голосе, в манере говорить и интонировать, то есть в речи, в типической походке, в манерах, в движениях, в жестах, действиях. Самое лучшее, когда внутренний образ сам собой подсказывает внешний образ и он естественно воплощается, руководимый чувством» (4, 171).

І ўсё ж «цэментуючым» сродкам стварэння жывога арганізма ролі ці сцэнічнага расповяду з'яўляецца д з е я н н е (фізічнае, псіхічнае, слоўнае) — рухавік чалавечага жыцця, выпраменьванне думак, пачуццяў і волі артыста-выканаўцы ў прапанаваных аўтарам і рэжысёрам абставінах. Менавіта ў сцэнічных дзеяннях (паводзінах, учынках, памкненнях...) псрадаюцца найтанчэйшыя перажыванні, якімінапоўнема мапалагічпая і дыялагічная мова герояў літаратурных твораў.

За два гады навучання студэнты ўжо '»разумел і, што па сцэне важна як тое, што г а в о р а ц ь, так і тое, як п р а м а у л я ю ц ь аўтарскі тэкст. На трэцім курсе большасць студэнтаў ведаюць, што натхненне, творчы ўздым найчасцей з'яўляецца, прыходзіць, набягае толькі ў вышку працяглых, карпатлівых творчых пошукаў, спробаў, рэпетыцый з педагогам-рэжыссрам і яшчэ больш — самастойных.

На трэцім курсе (пяты і шосты семестры) студэнтам рэкамендуецца выбіраць для сцэнічнага расповяду празаічныя і вершаваныя тэксты на 10—15 хвілін гучання. Апроч гэтага, некаторыя студэнты працягваюць асвойваць такі драматурпчны матэрыял, як кампазіцыя. Калі на першым і другім курсах гэта былі трэнінгавыя кампазіцыі, то на трэцім — чытальніцкія, акцёрска-выканальніцкія. Гэтыя міні-кампазіцыі, бывае, перарастаюць у сёмым семестры ў монаспектаклі.

Слова к а м п а з і ц ы я «Толковый словарь живаго великорускаго языка» Ул. Даля тлумачыць як «компоновка, сочинение, в музыке и других художествах, как действие, искусство, так и самый предмет, что сочинено» (148). Нарадзіўшыся ў творчасці пачынальніка жанру сцэнічнага расповяду А. Закушняка, атрымаўшы развіццё ў чытальніцкім мастацтве Дз. Жураўлёва, У. Яхантава, С. Качарана і

іншых, кампазіцыя і сёння займае належнае месца ў рэпертуары вядомых чытальнікаў Расіі і Беларусі. Адносная маладосць чытальніцкага мастацтва (хаця першыя спробы вядомыя былі яшчэ ў семнадцатым стагоддзі — Сімяон Полацкі) не паўплывала на шырокае і хуткае распаўсюджанне «жанру» кампазіцыі. Многія майстры мастацкага слова суб'ектыўна і вельмі «па-рознаму» разумеюць і бачаць гэты жанр чыталыпцкага мастацтва. Адны ўяўляюць яго як сінтэз вершаваных і празаічных твораў, аздобленых музыкай; другія — як аб'яднаную адной тэмай чыста літаратурную праграму па творах аднаго ці некалькіх аўтараў; трэція — як цыкл вершаў паэтаў розных эпох і народаў; чацвертыя — як літаратурную праграму на адну тэму па вялікім эпічным творы і... яшчэ шмат іншых варыянтаў, кожны з якіх меў і мае права на творчае жыццё.

Ды ўсё ж, які б з названых варыянтаў ні выбраў будучы артыст для сцэнічнага расповяду, ён павінен найперш улічыць, што «литературная композиция — это сложный процесс, который создаётся на основе какой-нибудь идеи, что пронизывает эту композицию» (Яхонтов, 5). Таму кожнаму, хто распачынае працу па стварэнні кампазіцыі, у першую чаргу неабходна: дакладна акрэсліць, сфармуляваць тэму сваёй працы і, абапіраючыся на яе актуальнасць, вызначыць звышзадачу сцэнічнага расповяду новага драматургічнага твора.

Улічыўшы такую важную акалічнасць, што любы драматургічны твор абавязкова мае завязку, развіццё дзеяння, кульмінацыю і развязку, пажадана на самым пачатку працы знайсці такі літаратурны матэрыял, які мог бы стаць «фундаментам, асновай, стрыжнем» — на яго спатрэбіцца шмат чаго «пакласці, нанізаць».

Складанне кампазіцыі (літаратурнай, літаратурна-музычнай) — справа карпатлівая, даволі марудная і цяжкая, алс заўсёды творчая. Студэнту-складальніку трэба памятаць, што выкарыстанне ў кампазіцыі розных літаратурных тэкстаў не павінна супярэчыць іх зыходнаму зместу, хаця, вядома ж, цалкам абысціся без «купюр» і невялікіх змен, перастановак бывае амаль што немагчыма.

Наступная неабходная ўмова стварэння кампазіцыі — захаванне адпаведнасці паміж колькасцю літаратурнага матэрыялу, зместам тэмы і звышзадачай выканання. Недабор, як і перабор, у гэтай справе недапушчальныя. Нельга празмерна доўга «растекаться мыслью по древу», імкнучыся як мага больш матэрыялу «агучыць». Аднак жа непажадана і бегчы «галопам па еўропам», не раскрываючы сюжэтнай канвы кампазіцыі, пазбаўляючы слухачоў магчымасці ўспрыняць і эстэтычна перажыць змест выкарыстаных у ираграмс фрагментаў разнастайных мастацкіх твораў.

Праца над кампазіцыяй, распрацоўка сцэпічнага расповяду яе зместу вядзецца такім жа чынам, як і асобных разнажанравых твораў, з той толькі розніцай, што тут выканаўца мусіць больш увагі аддаць выяўленню скразнога дзеяння, псрспсктыве яго развіцця, а таксама дасягненню мэты сцэнічнага расповяду. Паколькі аўтар (складальнік) сам задумаў кампазіцыю, затым шукаў, выбіраў, кампанаваў і будаваў яе структуру, то за гэты час ён паспеў ужо, з большага, «зжыцца» з матэрыялам і ў пэўнай меры зрабіць яго «сваім»; таму працэс пазнання зместу праходзіць лягчэй і хутчэй, чым у працы над асобнымі мастацкімі творамі. Працэс ужывання, перажывання і ўвасаблення развіваецца ў творчых пошуках, спробах, «муках». У гэты перыяд творчасці канчаткова высвятляецца (вывяраецца) якасны ўзровень драматургічнага матэрыялу, правяраецца «надзейнасць» і, галоўнае, неабходнасць усіх яго «дэталяў» — асобных фрагментаў мастацкіх твораў, музыкі, святла, бутафорыі і рэквізіту. Вопыт многіх майстроў мастацкага слова сведчыць, што прадуманае, невыпадковае выкарыстанне разнастайных выяўленчых сродкаў пад час сцэнічнага расповяду кампазіцыі не толькі не шкодзіць слову, а, наадварот, дапамагае, напрыклад, «значительно разгрузить текст за счёт музыки, которая эмоционально продолжает мысль, действие... создаёт дополнительное пространство, в котором продолжается и развивается тема, выполняется актёрская задача» (Яхонтов, 400).

І ўсё ж такі будучым артыстам раю асцярожна і беражліва абыходзіцца з выкарыстаннем дадатковых выяўленчых сродкаў пад час сцэнічнага расповяду ўласных міні-кампазіцый і лічу неабходным напомніць (працытаваць) ім словы вядомага майстра мастацкага слова Я. Смаленскага пра ролю распавядальніка ў літаратурным канцэрце: «У нас не принято на литературной эстраде использовать грим и костюм в театральном смысле этого слова. Артист внешне, как правило, сохраняет свой облик. Это давало (и до этого времени даёт многим) основание утверждать, что рассказчик вообще остаётся самим собой и произносит текст от своего имени, присваивая его, как драматический артист присваивает слова роли. Это ошибочно. Точнее, это может быть так в тех редчайших случаях, когда личность автора совпадает с личностью исполнителя хотя бы в главных измерениях: во времени, возрасте, манере думать и др. В преобладающем большинстве случаев, сохраняя внешний облик, артист-чтец обязательно находит внутри себя какие-нибудь черты, те, что только приближают его к авторскому мировосприятию, мироощущению, манере думать и говорить. В результате получается (при удачном сочетании текста и актёрской индивидуальности) фигура,

какую в литературоведены назвали б лирическим героем. Только здесь она материализована в облике артиста. Но это не только он сам, какой он в жизни. Это и не автор — кто-то новый: именно — рассказчик. От его характера зависит и то, как будет произноситься текст, и то, в каком ключе пойдут взаимоотношения со зрительным залом, и др.» (Яхонтов, 81).

Сіла ж эстэтычна-выхаваўчага ўздзеяння кампазіцыі на слухачоў-гледачоў залежыць ад многіх фактараў, якія складаюць поспех ці «правал» выступления артыста-распавядальніка, але асноўнымі і найбольш важнымі з'яўляюцца актуальнасць тэмы і змястоўнасць літаратурнай кампазіцыі, а таксама — прафесіяналізм выканаўцы.

Таму на трэцім курсе (у час рэпетыцый) педагогу-рэжысёру неабходна зрабіць усё, каб студэнт быў «загружаны» высокамастацкім літаратурным матэрыялам, працаваў захоплена і мэтанакіравана, каб будучы артыст пачаў мысліць і жыць тэмай кампазіцыі, каб быў зачараваны «сваім» драматургічным творам (яго словамі, зместам, формай), праца над сцэнічным расповядам якога будзе, безумоўна, садзейнічаць пашырэнню яго творчага дыяпазону, раскрыццю яго выканальніцкіх магчымасцяў, яго своеасаблівай, адметнай акцёрскай індывідуальнасці. Праца над літаратурнай, літаратурна-музычнай кампазіцыяй і «цэльнымі» высокамастацкімі празаічнымі і вершаванымі тэкстамі дапамагае амаль што кожнаму студэнту адчуць, усвядоміць сябе мастаком, творцам жывога, дзейснага сцэнічнага слова — акцёрам-распавядальнікам.

Такія ж выхаваўча-творчыя задачы ставіць (вызначае) сабе выкладчык сцэнічнай мовы, працуючы са студэнтам над спасціжэннем і прысваеннем слоў (іх сэнсава-эмацыянальнага зместу) разнапланавых і рознахарактарных роляў у дыпломных спектаклях. Якраз на трэцім курсе (гэта традыцыя БелДзАМ) і пачынаюцца рэпетыцыі першага дыпломнага спектакля.

Майстры (мастацкія кіраўнікі курсаў) ды і выкладчыкі майстэрства акцёра (прафесійныя акцёры, рэжысёры) вельмі неадназначна і неаднолькава ставяцца да ўдзелу («сопричастности») выкладчыка сцэнічнай мовы ў працы над урыўкамі з драматургічных твораў (на другім-трэцім курсах) і над дыпломнымі спектаклямі (на трэцім і выпускным курсах). Нягледзячы на такія адносіны майстроў, практыка многіх педагогаў розных тэатральных школ пераконвае ў тым, што сумесная, вядома ж не заўсёдная, праца выкладчыкаў майстэрства акцёра, сцэнічнай мовы і пластыкі дае добры плён як пры распрацоўцы ўрыўкаў, так і ў час пастаноўкі дыпломных спектакляў. Шматгадовы рэжысёрска-педагагічны вопыт аўтара

таксама сведчыць аб тым, што не толькі на малодшых курсах, алс і на выпускным усе рэпетыцыі будучым артыстам мэтазгодна пачынаць абавязковым псіхафізічным трэнінгам, які дапамагае маладым выканаўцам «разагрэць» свой акцёрскі апарат фізічна і пачуццёва. Пятнаццаці-дваццацімінутная размінка. ўсіх комплексаў мышцаў, усіх узбуджальнікаў пачуццёва-вобразнай памяці з'яўляецца цудоўным стымулятарам творчага настрою, «манком» творчага натхНення.

Выкладчыкам спецдысцыплін, якія займаюцца выхаваннем будучых прафесійных артыстаў, трэба памятаць, што «в методике обучения речи творческая работа над словами играет особо важную роль ещё и в связи с особенностями речи в эмоциональном состоянии.

Новейшие исследования показывают, что по мере возрастания эмоционального напряжения меняются качественные характеристики речи. Изменения происходят во всех звеньях речевой цепи — на смысловом, логико-грамматическом и моторном уровнях.

Речевые сообщения становятся бедными, активно возрастает роль и разнообразие внеречевых характеристик. И в условиях сцены, несмотря на стабильность текста, данного автором, выразительная сила речи нарастает за счёт высокой эмоциональности, и все качества выразительности, проявляясь в условиях творческой работы, раскрывают потенциальные речевые возможности исполнителя. Создаются органичные условия развития интонационного богатства речи.

При большом нарастании эмоционального напряжения в речи наступает рассогласование между смысловым и моторным звеньями, нарушается контроль за организацией речеобразования, появляются ошибки в произношении, изменения в тонусах мышц, участвующих в голосообразовании, в артикуляционных движениях, разброс в гласных.

Выработать высокую надёжность владения техникой сценической речи возможно лишь в процессе творчества, в условиях органического актёрского поведения в обстоятельствах роли и образа. Эти факторы обусловливают необходимость творческой работы над текстом и делают обязательным участие педагога по речи в занятиях по мастерству актёра.

Работа над ролью служит задачам воспитания внутренней актёрской техники, и задачи чисто речевые отходят на задний план. Специальное внимание к технике речи и голоса поначалу часто мешает организации подлинной правды проживания. Чистота и выработанность речи должна прийти органично, от живого процесса работы над ролью. Здесь вмешательство педагога по речи должно

быть крайне осторожным, умелым и носить косвенный характер» (16, 175, 176).

На выпускным курсе студэнтам яшчэ даводзіцца напамінаць, што ў працэсе акцёрскай творчасці галоўная роля належыць аўтарскаму тэксту, які з'яўляецца крыніцай ведаў пра ролю – без авалодання імі немагчыма стварэнне сцэнічнага вобраза. У сучасным драматычным тэатры выканальніцкае майстэрства ў асноўным грунтуецца на прынцыпах «школы перажывання» К. Станіслаўскага і яго паслядоўнікаў. Прыдуманы драматургам сцэнічны персанаж, дзейная асоба п'есы можа нарадзіцца толькі ў працэсе ўзаемапранікнення, зліцця артыста з персанажам п'есы, у выніку пераўвасаблення выканаўцы ў героя драматургічнага твора. Аднак «сапраўднае пераўнасабленне дасягаецца за кошт назапашвання і ўважлівага адбору прапануемых абставін, авалодваючы якімі артыст арганічна падыходзіць да дыялектнага скачка ад «Я» акцёра да вобраза. Глядач пазнае артыста, не губляе яго з відавоку, але адначасова пазнае і новае — вобраз» (28,122). Стварыць вобраз, жыць і дзейнічаць на сцэне ў вобразе героя — значыць знайсці такія выяўленчыя сродкі акцёрскай выразнасці, выкарыстанне якіх у прапанаваных педагогам-рэжысёрам сцэнічных абставінах дапаможа будучаму артысту стварыць жыццёва пераканальны характар дзейнай асобы п'есы. Калі на малодшых курсах асноўная ўвага на майстэрстве акцёра ды і на занятках сцэнічнай мовай у працы над словам абмяжоўваецца для студэнта задачай: я ў прапануемых абставінах, то на выпускным курсе студэнтам ужо трэба пераўвасабляцца ў вобраз — ствараць канкрэтную ролю, на якую прызначае яго мастацкі кіраўнік курса ці рэжысёр-пастаноўшчык у дыпломным спектаклі.

Маладым выканаўцам нельга прапусціць, пакінуць па-за ўвагай і такі важны этап (перыяд) у стварэнні сцэнічнага вобраза, як пошук і распрацоўка індывідуалізаванай, своеасаблівай х арактарнасці мовы персанажаў п'есы. На жаль, ужо даволі даўно на сцэне драматычных тэатраў Беларусі моўная характарнасць — з'ява надзвычай рэдкая і чамусьці не папулярная. Але ж людзі ў жыцці гавораць так, як яны мысляць, таму, відаць, нсмагчыма сустрэць абсалютна падобныя чалавечыя галасы. Многія таленавітыя акцёры значна збядняюць выяўленчую палітру свайго майстэрства тым, што ва ўсіх спектаклях застаюцца толькі арганічнымі і... аднолькавымі, зусім не выкарыстоўваючы для стварэння вобразаў сваіх герояў індывідуальную характэрную адметнасць іх вуснай мовы. Нават тады, калі рэжысёры-пастаноўшчыкі гавораць «о речевой характерности, которую актёр должен найти при создании того или иного образа, имеют в виду

только характерность орфоэпическую, то есть говор или акцент, или дикционную, то есть какой-либо дикционный дефект (шепелявость, картавость, гнусавость и т. п.).

На самом же деле вопрос речевой характерности — вопрос более широкий. Конечно, могут быть какие-то внешние признаки — особенности дикции, отклонения от норм произношения (может быть акцент, говор, своеобразная речевая манера и т.д.). Может быть характерность лишь голосовая... И всё же основной упор в работе над речевой характерностью нужно делать не на эти внешние признаки характера, а на характерность, рождённую автором, то есть его лексикой: на характерность стиля, характерность эпохи, в которой происходит действие, национальные особенности.

Персонажи пьес А. Островского думают, действуют не так, как герои трагедий Шекспира, даже при схожей, казалось бы, ситуации. Следовательно, они иначе выражают свои чувства и мысли словами.

Речь — это озвученное мышление. Через неё можно найти путь проникновения в характер мышления и действования героя. Если он безапелляционен в мыслях и суждениях, то и манера речи будет у него соответствующая, если же, наоборот, он робок, неуверен по своей природе, он и разговаривать будет робко и неуверенно. Если он конкретен, логичен в мыслях, это непременно скажется и на его речи... Но мысль, оторванная от эпохи, от лица автора, от характера действующего лица, будет пустой, ни на что не опёртой... исполнитель должен разобраться в особенностях мышления своего героя, которые выразятся через слово.

Речевая характерность – это не собрание недостатков речи, а индивидуальное своеобразие живого человека.

Речевой же фон спектакля должен быть нейтральным, то есть выстроенным на нормах общепринятого литературного произношения, актёр обязан владеть н ими нормами. И тогда всякое отклонение, взятое актёром в качестве характерности образа, будет замечено и понято зри телем» (29, 269, 270, 300).

Такім чынам, на трэцім курсе заканчваецца «фармоўка і агранка» ўнутранай і знешняй псіхатэхнікі будучых артыстаў, а на чацвёртым ужо ідзе «прымерка» акцёрскіх «амплуа», а таксама творчыя іспыты іх выканальніцкага «выспявання» і прафесійнай «грунтоўнасці». Бо менавіта ў сёмым семестры, на апошнім экзамене па сцэнічнай мове, студэнты абавязаны паказаць, прадэманстраваць, засведчыць на практыцы свае ўменні і навыкі валодання сродкамі акцёрскай псіхатэхнікі падчас ецэнічнага расповяду, а ў восьмым семестры, на дзяржаўным экзамене па майстэрству акцёра (выкананне роляў у

дыпломных спектаклях), студэнты павінны заявіць «на ўвесь голас» свае прэтэнзіі на кваліфікацыю «Акцёр драматычнага тэатра і кіно».

Джорджо Стрэлер пісаў: «Моя профессия — рассказывать другим истории. Мне всё равно, поймут ли меня. Достаточно того, что люди меня слушают» (30, 517).

У 1981 г., заканчваючы доўгі рэпетыцыйны перыяд, Пітэр Брук гаварыў: «Мы маленькая группа людей. Если наш образ жизни и работа вмещают в себя некие ценности, то эти ценности воспримет публика, покидающая театр, подсознательно испытав влияние того опыта работы, который мы пережили вместе. Может быть, это и есть тот малый вклад, который мы способны внести, то единственное, что нужно передавать другим людям» (30, 517).

На думку Судзукі, «актёр может создать «безмолвие» внутри спектакля и «видение за пределами, доступными зрению» (30, 517).

Інгмар Бергман распрацаваў форму спектакля, у якім дзеянне сканцэнтравана на маленькай пляцоўцы на самай авансцэне блізка да гледачоў. Ён прыйшоў да разумення таго, што «театр ни к чему не призывает. Телевидение включает в себя всё, кино включает в себя всё, там всё показано. Театр должен быть встречей людей с людьми и больше ничем. Всё остальное рассеивает внимание» (30, 517).

Рускі філосаф В. Розанаў лічыў, што «театр есть самое живое выражение жизни. Сцена должна не только артистически очаровывать, но и нравственно волновать зрителей» (17, 19).

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ І РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

1.Станиславский К.С. Собрание сочинений, т. 1. Моя жизнь в искусстве. — М., 1988.

2.Станиславский К.С. Собрание сочинений, т. 2. Работа актёра над собой. Часть 1. Работа над собой в творческом процессе переживания. Дневник ученика. — М., 1989.

3.Станиславский К.С. Собрание сочинений, т. 3. Работа актёра над собой. Часть 2. Работа над собой в творческом процессе воплощения. Материалы к книге. — М., 1990.

4.Станиславский К.С. Собрание сочинений, т. 4. Работа актёра над ролью. Материалы к книге. — М., 1991.

5.Антарова К.Е. Творческие беседы мастеров театра. К.С. Станиславский. — М., 1939.

6. Берри Сисели. Голос и актёр. — М., 2003.

7.Вильсон Гленн. Психология артистической деятельности. — М., 2001.

8.Волконский С.М. Выразительное слово. — СПб., 1913.

9.Козлянинова И.П., Чарели Э.М. Тайны нашего голоса. — Екатеринбург, 1992.

10. Коломинский Я.Л. Человек: психология. —М., 1986.

11. Кох И.Э. Основы сценического движения. — Л., 1970.

12. Куракина К. Основы техники в трудах К.С. Станиславского. — М.,1959.

13. Немирович-Данченко В.И. Рождение театра. — М., 1989.

14. Немирович-Данченко В.И. О творчестве актёра. — М., 1973.

15.Оссовская М.П. Московский говор в жизни и на сцене. — М., 2003.

16.Петрова А.Н. Сценическая речь. — М., 1981.

17. Руднев П. Театральные взгляды Василия Розанова. — М., 2003.

18. Рябчук-Ситко Т.Ф. Звучащее слово. — М., 2003.

19. Саричева Е.Ф. Техника речи. — М. — Л., 1939.

20. Смелянский А., Егошина О. Режиссёрский театр. Разговоры на рубеже веков. Вып. 2. — М., 2001.

21. Смелянский А., Егошина О. Режиссёрский театр. Разговоры под занавес века. Вып. 1. — М., 2004.

22. Смелянский А., Егошина О. Режиссёрский театр. Разговоры в начале века. Вып. 3. — М., 2004.

23.Тарасов В.И. Чувство речи.—,С.-П., 1997.

24. Туманишвили М.И. Введение в режиссуру. — М., 2003.

25. Федотова Г.Н. Воспоминания юности // Малый театр 1824- 1974. Т. 1, — М., 1974.

26. Кнебель М.О. Слово в творчестве актёра. — М., 1970.

27. Товстоногов Г.А. Зеркало сцены. Т. 1. —Л., 1984.

28. Товстоногов Г.А. Круг мыслей. —Л., 1972.

29. Фрид О.Ю. Работа актёра над речевой характерностью // Культура сценической речи. — М., 1979.

30. Иллюстрированная история мирового театра / Под ред. Дж.Р. Брауна. — М., 1999.

Белинский В.Г. Избранные сочинения. — М., 1948.

Гоголь Н.В. Собрание сочинений в 6 томах. Т. 6. — М., 1959.

Даль Вл. Толковый словарь живаго великорусскаго языка в 4 томах. — М„ 1978.

Керн А.П. Воспоминания. Дневники. Переписка. — М., 1989.

Смоленский Я.М. Читатель. Чтец. Актёр // Искусство звучащего слова. Вып. 28, —М., 1983.

Яхонтов В. Театр одного актёра. — М., 1958.

Русские писатели. Библиографический словарь. — М., 1971.

Словарь современного русского языка в 20 томах. — М., 1991—^ 2201.

Слоўнік беларускай мовы / Пад рэд. М.В. Бірылы. — Мн., 1987.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах. — Мн., 1977— 1984.

Русско-белорусский словарь в трёх томах. Изд. 8-е. — Мн., 2002.

Саричева Е.Ф. Сценическая речь. — М., 1955.

Козлянинова И.П. Орфоэпия в театральной школе. — М., 1967.

Леонарди Е.И. Дикция и орфоэпия. — М., 1967.

Линдеман Х. Аутогенная тренировка. — М., 1980.

Динейка К. Движение, дыхание, психофизическая тренировка. — Мн., 1981.

Верещагин В.Г. Физическая культура индийских йогов. — Мн., 1982.

Каляда А.А., Шагідзевіч А.А. Сцэнічная мова. — Мн., 1993.

Шагидевич А.А. Искусство сценической речи. — Мн., 1999.

Сценическая речь / Под ред. И.П. Козляниновой, И.Ю. Промтовой. — М., 2002.

Каляда А.А. Беларускае літаратурнае вымаўленне. Практыкум па дыкцыі і арфаэпіі (кніга і тры кампактдыскі). — Мн., 2006.

ЗМ ЕСТ

Прадмова
Першы год навучання
Настройка акцёрскага інструмснта
Псіхафізічны трэнінг будучага артыста
Псіхафізічная рэлаксацыя і актывізацыя
Пастава
Паходка
Позы
Жэсты
Міміка
Пантаміміка
Фантазія
Вера ў мастацкі вымысел
Воля
Тэмперамент
Дыханне
Голас
Дыкцыя
Арфаэпія
Галосныя А, Э, О
Галосны У
Галосныя Е, Ё, Ю, Я
Зычныя Й, Ў
Зычныя Т, Д
Зычныя С, З
Зычныя Ш, Ж
Зычныя ДЖ, Ч
Зычныя ДЗ, Ц
Зычныя К, Х, Г
Зычныя П, Б
Зычны Р
Зычныя М, Н, Л
Зычныя Ф, В
Часціца НЕ, прыназоўнік БЕЗ
Тэксты для трэнінгу
М. Танк. Галінка і Верабей
А. Дзеружынскі. Весні танец жураўлёў
С. Пагарэльскі. Хто я?
А. Бачыла. Пракляты кот
М. Танк. Ave Maria
Я. Купала. Курган
Як служыў жа я у пана
Чыстагаворкі і скорагаворкі

Пільшчыкі
Дзямід і Кузьма
Дзед і баба
Балбатуха
Пісака
Ціт
Бабры
Хлеб
Стукалачкі
Гаварун
Нараджэнне слова: ад псіхафізічнага дзеяння да слоўнага
Аа-у-у... Ве-ра-а-а
Як тут і быў
Дапамажыце! Дапамажы-ыце-э!!.. Ну, гады
Ойй!.. Ма-амачкаа... ма-амма о а!
Прысніцца ж такое
Гаа-ах!.. Ну, малы, смерць твая прыіішла
Якой халеры лазіш тут?!
Чаму людзі не лятаюць?
Мышка... Мышка-нарушка
Любовь проснулась
Ды ўсміхніся ты людзям
Другі год навучання
Комплексны трэнінг — 5 «р»
Русское литературное произношение
Гласные под ударением
Безударные гласные А, О
Сочетания АИ, ОИ
Сочетания АУ, ОУ
Окончания прилагательных на -ИЕ, -ЫЕ
Гласный И после слова на твёрдый согласный
Безударные гласные Я, Е
Согласные Ж, Ш с гласными И, Е, Ё, Ю
Согласный Ц с гласными И, Е
Согласные Ч, Щ с гласными А, О, У
Согласный Ж, сочетания ШЬ, ЖЬ на конце слова
Сочетание ЧТ
Сочетания СТН, ЗДН, СТЛ, СТСК, НДЦ
Согласные С, З с Ш, Ж, Щ
Согласные С, З с Ч
Сочетание ЖЖ
Сочетание ЖД
Приставки С, ВОЗ, РАЗ, РОЗ, ИЗ, БЕЗ, ЧЕРЕЗ, ЧРЕЗ
Согласный С перед Д, Б, Г
Сочетания ТЦ, ДЦ, ТСЯ, ТЬСЯ

Глухой и звонкий, звонкий и глухой в словах или на стыке слов
Двойные согласные
Твёрдые согласные перед мягкими
Сочетания ТЧ, ДЧ
Сочетание ТЩ
Согласный Т перед Б, Д, Г, Ж, З
Сочетания КТ, ГД
Сочетания СТЦ, ЗДЦ, НТСК, НДСК
Сочетание ЧН
Сочетание ВСТВ
Сочетания и окончания ОГО, ЕГО
Сочетания и окончания СЬ, СЯ
Окончания прилагательных, фамилий на КИЙ, ГИЙ,ХИЙ
Глагольные окончания КИВАТЬ, ГИВАТЬ, ХИВАТЬ
Глагольные окончания АТ, ЯТ
Согласный С перед мягкими согласными Т, Л, М, Н, В, Ф, С, П
Согласный З перед мягкими В, Б, Д, Л, М, Н
Согласный Н перед мягкими Т, Д, С, З, Ч, Щ
Согласные Т, Д перед мягким В
Смягчённый согласный Р
Безударный гласный О
Произношение Э вместо Е
Согласный Г
Окончания прилагательных ИИ, ИЕ
Имена с отчествами
Гласные О, А в словах коль, кони, кабы, хоть, мол, либо, так, чтоб, чтобы, дескать.
Произношение слова ангел
Предлоги НА, ЗА, ПО, ПОД, ИЗ, 1.1 і, О І
Орфоэпическая сказка
Тексты для самостоятельного тренинга
Р. Рождественский. Звуки делятся на
Р. Берне. Дом, который построил Джек
С. Маршак. Мельник и жена
С. Маршак. Багаж
Р. Ахматова. Год висит на лапах ели
Д. Хармс. Миллион
Как растут слухи
Я. Хелемский. Строки гекзаметра
А. Осецка. Чёрный двор
В. Левин. Джим и Билли
Л. Васильева. Имена
Р. Рождественский. Камыш
Э. Межелайтис. Сирень
А. Сологуб. Солнце село

В. Ветрова. Полу
И. Зиедонис. Сахарная сказка
Ф. Рабле. Гаргантюа и Пантагрюэль
Бобы бобыля
М. Твеп. Трагическое родство
Тетерев и тетёрка с тетеревятами
Слесарь
Б. Тимофеев. Сатирическая сказка
Чистоговорки, трудноговорки, скороговорки
Портной Пото и Прокоп
Маланья-болтушка
Дровосеки, дроворубы, дровоколы
Сыворотка из-под простокваши
Сенька
В четверг, четвёртого числа
Маланья-болтунья
Командир
Мчится поезд скрежеща
«Сильное кино»
Говорить, так выразительно
Сцэнічны расповяд аўтарскага тэксту
К. Паустовский. Мещёрская сторона
Н. Гоголь. Тарас Бульба
М. Горький. Песня о Соколе
І. Мележ. Людзі на балоце
К. Крапіва. Саманадзейны Конь
И. Крылов. Квартет
А. Пушкин. Пророк
М. Багдановіч. Я хацеў бы спаткацца з Вамі
А. Пушкин. К***
П. Броўка. Пахне чабор
Трэці і чацвёрты гады прафесійнага выхавання акцёра
Бібліяграфічныя спасылкі і рэкамендуемая літаратура

ПРА АЎТАРА

Андрэй Каляда нарадзіўся 3 чэрвеня 1940 г. у вёсцы Панямонь Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Кандыдат педагагічных навук (1975), прафесар (1993).

Пасля заканчэння СШ № 1 г. Навагрудка ў 1957 г. працаваў токарам на машынабудаўнічым заводзе ў г. Горлаўка Данецкай вобласці, Украіна. У 1958 г. паступіў на акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (мастацкі кіраўнік курса — народны артыст Беларусі, прафесар К. М. Саннікаў), пасля заканчэння якога быў прыняты ў трупу Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Артыстычную дзейнасць (1962-1968) сумяшчаў з педагагічнай — выкладаў выразнае чытанне ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1963-1989), адначасова — курс «Сцэнічная мова» ў БДзТМІ, з 1989 па 2000 г. — прарэктар па вучэбнай рабоце гэтага інстытута. З восені 2000 г. — прафесар кафедры сцэнічнай мовы і вакалу Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Аўтар шматлікіх артыкулаў па праблемах майстэрства вуснай мовы, сцэнічнага слова, методыкі навучання выразнаму чытанню, вучэбных і метадычных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных і тэатральных факультэтаў, а таксама для настаўнікаў беларускай і рускай літаратуры.

У 1970 г. выйшла першая кніга А. Каляды — вучэбны дапаможнік «Выразнае чытанне» (з камплектам з трох грамафонных пласцінак), у 1976 — яе 2-е выданне, у 1989 — 3-е; 1973 — «Выразнае чытанне сатырычных вершаў, баек і драматычных твораў» (з камплектам з пяці грампласцінак); 1976 — «Тэхніка мовы лектара (дыханне, голас, дыкцыя)»; 1978 — «Расказванне і чытанне ўдзіцячым садзе»; 1980 — «Дыкцыя і арфаэпія» (з камплектам з трох грампласцінак); 1982 — «Выразнае чытанне», IV-VII класы; 1989 — «Основы мастерства устной речи», «Художественное чтение на уроках литературы»; 1992 — «Мастацкае чытанне ў школе», 5-11 класы; 1993 — «Сцэнічная мова» (з А. А. Шагідзевіч); 1995 — «Слоўнік акцёра і рэжысёра»; 1998-2000 — чатыры кнігі «Хрэстаматыя па сцэнічнай мове» (з І. Л. Курганам); 2002 — «Практикум по сценической речи»; 2005 — «Выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў»; 2006 — «Беларускае літаратурнае вымаўленне» (з трыма кампактдыскамі).

А. Каляда быў старшынёй секцыі сцэнічнай мовы Беларускага тэатральнага аб'яднання (1971-1987), арганізатарам і мастацкім кіраўніком народнага тэатра чытальнікаў «Жывое слова» (1966-1991), вядучым вучэбнай перадачы «Беларуская літаратура ў школе» на Беларускім тэлебачанні (1971-1991).

У творчай скарбонцы А. Каляды пераклад на беларускую мову ўсіх апавяданняў, чатырох аповесцяў і трох раманаў Ф. Дастаеўскага: «Аповесці і апавядаіші» (2002), «Выбраныя творы» (2004), а таксама асобных твораў Астроўскага, Гогаля, Чэхава, Тургенева, Горкага, Купрына, Буніна, Булгакава, Кабыляпскай, Набокава, Аверчанкі, Тэфі, Ібсена, Цвейга, Барбюса, О'Генры, Пірандэлы, Мрожака, Джойса, Вармы, Сапгіра, Осбарна, Цанева, Малюгіна, Гурнея, М. Каляды...

Каляда А. А.

Сцэнічная мова: вучэб.-метад. дапаможнік / Мінск, Беллітфонд, 2006. — 480 с.

ISBN 985-6819-13-X.

У дапаможніку апісаны змест і методыка прафесійнай падрыхтоўкі будучых артыстаў да самастойнага творчага жыцця ва ўмовах сучаснага драматычнага тэатра. Кніга з'яўляецца вучэбна-метадычным (тэарэтычна-практычным) дапаможнікам-кіраўніцтвам для ўсіх аматараў тэатральнага мастацтва ў самастойным авалоданні асновамі прафілюючай (на спецыяльнасці «Акцёрскае мастацтва») дысцыпліны «Сцэнічная мова».

Для выкладчыкаў, студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры і мастацтва.